Ёан-Аўрэл Поп

ГІСТОРЫЯ РУМЫНАЎ

Ёан-Аўрэл Поп

ГІСТОРЫЯ РУМЫНАЎ

Ёан-Аўрэл Поп

ГІСТОРЫЯ РУМЫНАЎ

Пераклад з румынскай
Зміцера Коласа

Мінск
Выдавец Зміцер Колас
2019

УДК 94(498)
ББК 63.3(4Рум)
П57

INSTITUTUL CULTURAL ROMÂN

Гэтая кніга выдадзеная пры фінансавай падтрымцы
Румынскага Культурнага Інстытута.

This book is published with the financial support
granted by the Romanian Cultural Institute.

Пераклад зроблены паводле выдання:
Pop, Ioan-Aurel. *Istoria românilor*. Bucureşti – Chişinău – Cluj : Litera, 2010.

ISBN 978-985-23-0072-8

© Ioan-Aurel Pop., 2010.
© Зміцер Колас, пераклад на беларускую мову, 2019.
© Афармленне. Выдавец Зміцер Колас, 2019.

ЗМЕСТ

1. Што такое Румынія і хто такія румыны 8

2. Як румыны самі сябе вызначаюць 14

3. «Найадважнейшыя і найсправядлівейшыя сярод фракійцаў...» 17

4. Як жылі гета-дакі 20
4.1. Занятак і жытло 20
4.2. Супольнасць: «бліскучыя» і «калматыя» 22
4.3. «Яны вераць у сваю несмяротнасць…» 23
4.4. Навука, пісьменства, мастацтва 25
4.5. Ад племянных саюзаў да ўтварэння дзяржавы: кіраванне Бурэбісты (82–44 гг. да н. э.) 27
4.6. Дэцэбал (87–106) 31

5. «Мы вядзем сваё паходжанне з Рыма»: утварэнне румынскага народа і румынскай мовы 34
5.1. Раманскія народы 34
5.2. Лёс Дакіі пасля 106 года 37
5.3. Раманізацыя, або Пячатка Рыма 39
5.4. Стасункі паміж дака-рымлянамі (протарумынамі) і качэўнікамі. Працяг раманізацыі 48
5.5. Дунайская, карпацкая і прычарнаморская лаціна: румынская мова 52
5.6. Падсумаванне: калі, дзе і як румыны ўтварыліся як народ 54

6. Свет Сярэднявечча 59
6.1. Як называлі сябе румыны і як называлі іх іншыя 60
6.2. Ад сялянскай грамады да дзяржавы 66
6.3. Першыя сярэднявечныя палітычныя ўтварэнні на тэрыторыі Румыніі 68
6.4. Румынска-балгарскае царства дынастыі Асеняў 73
6.5. Дзяржаўныя ўтварэнні ў Трансільваніі – ад «Краіны Гелу» да «Сяміграддзя» 75
6.6. Іншаземныя «госці»: пасяленцы, манахі, вайскоўцы 77

6.7. «Першая румынская вольніца» ... 78
6.8. «Другая румынская вольніца». Малдова ... 84
6.9. Сярэднявечныя румынскія інстытуцыі ... 89
6.10. Эканамічныя і сацыяльныя структуры ... 100
6.11. Бітва за Крыж: абарона хрысціянства ... 105
6.12. XVI стагоддзе ... 117

7. Уладаранне Міхая Харобрага (1593–1601) і аб'яднанне румынскіх княстваў ... 122

8. XVII стагоддзе: ад Міхая Харобрага да фанарыётаў і Габсбургаў ... 127

9. Эпоха Асветніцтва ... 131
9.1. Новыя палітычныя рэжымы: Габсбургскі і фанарыёцкі ... 131
9.2. Унія трансільванскіх румынаў з каталіцкай царквой ... 133
9.3. Рэфармацыя ... 136
9.4. Спрэчкі вакол «усходняга пытання» ... 138
9.5. Барацьба за нацыянальна-палітычнае вызваленне ... 139

10. Рэформа і рэвалюцыя – першая палова XIX стагоддзя ... 154
10.1. Агульныя рысы ... 154
10.2. Арганічны Рэгламент ... 155
10.3. Абсалютысцкі рэжым Габсбургаў у Трансільваніі і Букавіне ... 157
10.4. Бесарабія пад расійскаю акупацыяй ... 158
10.5. Дабруджа пад панаваннем туркаў ... 159
10.6. Румынская рэвалюцыя 1848–1849 гг. ... 159

11. Нацыянальнае аб'яднанне і пабудова сучаснай Румыніі ... 166
11.1. «Малое аб'яднанне» ... 167
11.2. Кіраванне Аляксандру Ёана I (1859–1866) ... 171
11.3. Кіраванне Караля I (1866–1914) ... 175
11.4. Ад абвяшчэння незалежнасці да «вялікага аб'яднання» (1878–1918) ... 181
11.5. Першая сусветная вайна ... 187
11.6. «Вялікае аб'яднанне» ... 193

12. Румынія паміж дзвюма сусветнымі войнамі ... 197
12.1. Эканоміка і грамадства ... 198
12.2. Унутраная палітыка ... 199
12.3. Знешняя палітыка ... 202

13. Румынія і Другая сусветная вайна (1940–1945) 205
14. Наперад… да камуністычнага таталітарызму (1944–1947) 210
15. «На шляху пабудовы сацыялізму…» (1948–1989) 213
16. Надзеі, мары, дасягненні… 222

1. Што такое Румынія і хто такія румыны

Напэўна, самым простым адказам на першую палову гэтага пытання будзе сказаць, што Румынія – гэта краіна, гэта – дзяржава. Аднак на свеце сёння больш за дзвесце дзяржаваў, размешчаных на пяці кантынентах, ад Сан-Марына, Ватыкана і Маўрыкія да ЗША, Кітая і Бразіліі, і большасць з іх сябры Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, таму такі адказ патрабуе больш дэталёвага ўдакладнення. І перадусім нельга не адзначыць пэўнай супярэчнасці: чаму, калі Румынія – гэта дзяржава, найбуйнейшая арганізацыя, у якую яна ўваходзіць, аб'ядноўвае «нацыі»? Паступова мы з гэтым разбярэмся. А пакуль проста зазначым, што тэрмін «нацыя» не ва ўсіх мовах мае аднолькавае значэнне.

Румынія – гэта еўрапейская дзяржава, якая месціцца ў самым цэнтры старога кантынента, за 2500 км ад Уральскіх гор (усходняй мяжы Еўропы), на такой самай адлегласці ад атлантычнага ўзбярэжжа Партугаліі (заходняй мяжы Еўропы), на такой самай адлегласці ад самага паўночнага пункту Еўропы, што знаходзіцца ў Нарвегіі, і за 900 кіламетраў ад вострава Крыт (Грэцыя), г. зн. самай паўднёвай еўрапейскай тэрыторыі. Такім чынам, калі казаць зусім дакладна, Румынія месціцца ў цэнтры Еўропы, роўнааддалена ад яе ўскрайніх пунктаў на ўсходзе і захадзе і, калі глядзець па восі мерыдыянаў, трошкі бліжэй да яе поўдня. Нягледзячы на такое цэнтральнаеўрапейскае размяшчэнне, Румынію пераважна акрэсліваюць як дзяржаву «на Усходзе», што тлумачыцца двума чыннікамі: першы палягае ў тым, што пачынаючы з XV–XVI ст. рухавіком культуры і цывілізацыі, сапраўднай мадэллю для іншых, стаў еўрапейскі Захад, а тагачасныя краіны, якія збольшага захоўвалі візантыйскія традыцыі, месціліся на ўсходзе кантынента; па-другое, не так даўно да Усходняй Еўропы (*англ.* Eastern Europe) амерыканцы (а за імі і іншыя) залучалі ўсе еўрапейскія краіны, якія пасля заканчэння Другой сусветнай вайны трапілі ў залежнасць ад Масквы. Цяпер пра Румынію ўсё часцей кажуць як пра краіну Цэнтральнай (або Цэнтральна-Усходняй) Еўропы, аднак падобнае разуменне паўстала

нядаўна і таму яшчэ не атрымала ўсеагульнага прызнання. Калі прытрымлівацца строга геаграфічнага пункту погляду, то Румынія не ўваходзіць у краіны Балканскага паўвострава, бо паўночнай мяжой Балканаў з'яўляецца Дунай, а Румынія пераважна размешчана на поўнач ад Дуная, у Карпацкім рэгіёне.



Румынія на карце Еўропы

Аднак для многіх еўрапейцаў Балканы цягнуцца аж да Вены, так што і Румынію разам з Грэцыяй, Албаніяй ці Сербіяй часта адносяць да гэтага вялікага рэгіёна, які называюць «парахавой бочкай Еўропы». І ўсё ж, хоць Румынія і не размешчана на Балканскім паўвостраве, а на поўнач ад яго, яна мае даўнія гістарычныя сувязі з балканскімі краінамі і народамі. Акрамя таго, на Балканах заўсёды жыло і жыве дагэтуль нямала румынаў.

Па еўрапейскіх мерках (не бярэм пад увагу велізарную Расію, чыя плошча перавышае некаторыя кантыненты) Румынія па сваёй тэрыторыі – дзяржава сярэдняга памеру. Яе плошча (амаль 240 000 кв. км) меншая, чым у Францыі, Германіі, Іспаніі ці Украіны, амаль аднолькавая з Аб'яднаным Каралеўствам (Вялікабрытаніяй) і большая, чым у такіх краін, як Швейцарыя, Данія, Бельгія, Галандыя, Аўстрыя і інш. Тэрыторыя Румыніі, напрыклад, займае амаль у восем разоў большую плошчу, чым Бельгія. Па колькасці насельніцтва, якая складае прыблізна 22 мільёны жыхароў, Румынія таксама знаходзіцца пасярэдзіне: Румынія мае амаль столькі ж жыхароў, колькі Бельгія і Галандыя разам, больш, чым разам узятыя Фінляндыя, Нарвегія і Швецыя, але менш, чым Польшча, Іспанія, Італія ці Францыя. Па амерыканскай шкале плошча Румыніі амаль роўная паводле

сваёй тэрыторыі штату Арэгон, а яе насельніцтва да нядаўняга часу можна было параўнаць са штатам Каліфорнія ці з Канадай. Паводле плошчы і колькасці насельніцтва Румынія буйнейшая за ўсе суседнія з ёю краіны за выключэннем Украіны; яна ўдвая большая за Венгрыю, Балгарыю ці Сербію (узятыя паасобку). У Венгрыі і ў Сербіі жыве каля 10 мільёнаў чалавек, а ў Балгарыі – 8 мільёнаў. Румыны з'яўляюцца самым шматлікім народам Паўднёва-Усходняй Еўропы, істотна перавышаючы колькасць балгар, сербаў, грэкаў, албанцаў, харватаў, македонцаў і інш. Турцыя (вялікая краіна з больш як 60 мільёнамі жыхароў) тэрытарыяльна размешчана пераважна ў Малой Азіі, а таму з пункту погляду геаграфіі не можа разглядацца як еўрапейская дзяржава.

Большую частку тэрыторыі Румыніі займаюць Карпацкія горы, якія з'яўляюцца другім пасля Альпаў найбуйнейшым горным масівам у Еўропе. Калі ўявіць карпацкі пояс у выглядзе лічбы «6» (перагорнутай як у люстэркавым адбітку), дык кружок гэтай лічбы будзе прыпадаць якраз на тэрыторыю Румыніі, а яе верхні хвосцік, падобны да коскі, – праходзіць па Украіне, Польшчы, Славакіі і Чэхіі, падаўжаючыся ў Венгрыю. Вышыня Карпатаў дасягае 2700 м, а ў Румыніі яны ў сярэднім вышэйшыя за 2500 м. Астатнюю тэрыторыю краіны складаюць узвышшы і пласкагор'і, з якіх самым вядомым з'яўляецца плато Трансільваніі, а таксама раўніны, размешчаныя па паўднёвых межах (Румынская або Дунайская раўніна), на захадзе (раўніна ракі Цісы) і на ўсходзе (Малдоўская раўніна). Формы рэльефу гарманічна і раўнамерна размеркаваныя амаль пароўну: горы займаюць 31% плошчы, узвышшы і пласкагор'і – 33%, а раўніны – 36%. У цэнтры краіны месціцца Трансільванскае плато, абнесенае, нібы мурам фартэцыі, сцяною Карпацкіх гор – менавіта такое рамантычнае апісанне даў ім у адной з анталогій гісторык і палітык Нікалае Бэлчэску; горы паступова пераходзяць у прыкарпацкія ўзвышшы, а пасля – у даліны, прыпадабняючыся да архітэктурных кантрфорсаў, якія паступова знікаюць у трох раўнінах.

Румынія – дунайская краіна, бо Дунай, найбуйнейшая рака Еўропы (калі не лічыць Волгі), чыя даўжыня дасягае амаль паловы Місісіпі (з Місуры), працякае па яе тэрыторыі сотні кіламетраў і аддзяляе Румынію ад балканскага свету. Прамінуўшы чатыры еўрапейскія

сталіцы – Вену, Браціславу, Будапешт і Бялград, – Дунай упадае ў Чорнае мора шырокаю дэльтай, якой няма аналагаў у свеце. Гэта сапраўдная славутасць прыроды, якая размешчана на тэрыторыі Румыніі. Праўда, у найбуйнейшы румынскі порт Канстанцу караблям хутчэй і зручней заходзіць не праз дэльту, а па канале Дунай – Чорнае мора, які быў пабудаваны некалькі дзесяцігоддзяў таму. Дзякуючы свайму марскому ўзбярэжжу, што распасціраецца прыкладна на 250 км, Румынія, як і Балгарыя, Расія, Турцыя ды яшчэ некаторыя постсавецкія рэспублікі, уваходзіць у лік так званых краінаў Понта (ад *Pontus Euxinus*, «Понт Эўксінскі» – даўняй грэка-рымскай назвы сучаснага Чорнага мора). Выхад Румыніі да Чорнага мора забяспечвае ёй больш шчыльныя кантакты з светам, у прыватнасці з краінамі Міжземнамор'я, і нават выхад у Атлантычны акіян праз Гібралтарскі праліў ці, дзякуючы Суэцкаму каналу, у Індыйскі або Ціхі акіяны. Дунай, а потым і Чорнае мора ўбіраюць у сябе воды шэрагу найважнейшых рэк рэгіёна, якія цалкам або часткова працякаюць па тэрыторыі Румыніі: Прута, Сірэта, Цісы, Мурэша, Олта, Вялікага і Малога Сомеша, Тырнавы, Жыў, Арджэша, Дымбовіцы, Яломіцы і г. д. Іншымі словамі, калі хто хоча знайсці Румынію на геаграфічнай карце, яму трэба шукаць тое месца, дзе сыходзяцца разам Карпаты, Дунай і Чорнае мора.

Румынія – цэнтралізаваная ўнітарная дзяржава (згодна з Канстытуцыяй, федэратыўнага падзелу яна не мае), 90% яе насельніцтва складаюць этнічныя румыны. Астатнія жыхары – гэта венгры (больш за 6%), цыганы, прадстаўнікі розных славянскіх народаў, немцы, туркі і татары, армяне, грэкі, габрэі і інш. Усе васямнаццаць нацыянальных меншасцяў Румыніі (аб'яднаных у свае нацыянальныя суполкі) у адпаведнасці з Канстытуцыяй прадстаўлены ў парламенце Румыніі, венгры трапляюць у яго праз усеагульныя выбары (адпаведна працэнтнаму ліміту, атрыманаму падчас усеагульных выбараў па партыйных спісах), а астатнія нацыянальнасці абіраюць у дэпутаты па адным прадстаўніку з сваіх нацыянальных суполак.

Любая краіна мае ў сваім складзе пэўныя рэгіёны ці гістарычныя вобласці (правінцыі). Калі мы гаворым пра Францыю, то згадваем Бургундыю, Брэтань, Нармандыю ці Эльзас; калі думаем пра Італію, перад нашымі вачыма паўстаюць Таскана, Ламбардыя, Кампанія,

Венета, Калабрыя, Лігурыя і г. д. Румынія з гэтага пункту погляду гістарычна складаецца (без увагі на сучасныя палітычныя межы) з трох вялікіх гістарычных абласцей (рэгіёнаў), а менавіта: Валахіі (Țara Românească), што месціцца на поўдні, Малдовы (Moldova) – на ўсходзе і паўночным усходзе, а таксама Трансільваніі (Transilvania) – на захадзе і паўночным захадзе. У Валахію, у сваю чаргу, уваходзяць Алтэнія, Мунтэнія і Дабруджа; Трансільванія ўлучае ўласна Трансільванію, Банат, Крышану і Марамурэш (Maramureş), а Малдова складаецца з свайго заходняга ядра, размешчанага паміж Усходнімі Карпатамі і Прутам, а таксама Букавіны (паўночная частка якой уваходзіць цяпер ва Украіну) і Бесарабіі (на большай частцы якой з 1991 г. і дагэтуль месціцца Рэспубліка Малдова). Як адзіная ўнітарная сучасная дзяржава Румынія – гэтак сама, як Нямеччына ці Італія – сфарміравалася толькі ў XIX ст. (а завяршыўся гэты працэс ужо ў XX ст.), але сярэднявечныя палітычныя ўтварэнні існавалі на яе тэрыторыі ўжо больш за тысячу гадоў таму, пачынаючы з 850–900 гг.

Адміністратыўны падзел Румыніі на жудэцы

Увогуле кажучы, румынамі можна было б назваць жыхароў Румыніі, але ў сапраўднасці справа гэтая не такая простая. Па-першае, румыны вядомыя ў гісторыі значна раней, чым на геаграфічнай карце з'явілася прызнаная сусветнай супольнасцю дзяржава з афіцыйнаю назвай Румынія. Упершыню назва «румыны» згадваецца ў напісаным румынскаю моваю малдаўскім летапісе яшчэ ў XVII ст., а пазней гаспадар краіны і асветнік Дзімітрый Кантэмір даў гэтай назве навуковае абгрунтаванне. Па-другое, хоць усіх жыхароў Румыніі і можна назваць румынамі, аднак гэта будзе правільна толькі адносна іх грамадзянства, бо паводле нацыянальнасці яны не заўсёды румыны. Так, напрыклад, венгры, якія жывуць на тэрыторыі Румыніі (6% ад усяго яе насельніцтва), нягледзячы на тое, што кожны з іх мае румынскае пасведчанне асобы, не могуць і не хочуць называцца румынамі, бо яны – частка вугорскага этнасу, або, кажучы дакладней, яны – этнічныя венгры, хоць і грамадзяне Румыніі. Патрэцяе, маецца значная частка румынаў, якія жывуць па-за межамі Румыніі і не з'яўляюцца (ці хіба што ў вельмі абмежаваным сэнсе) румынскімі грамадзянамі, але адчуваюць сябе румынамі і, дзе б яны не жылі, складаюць частку румынскага народа. Гэта ў першую чаргу датычыцца большасці жыхароў Рэспублікі Малдова, якія размаўляюць на румынскай мове, якія з'яўляюцца румынамі, але не з'яўляюцца складоваю часткай насельніцтва Румыніі. Як і чаму гэта адбылося, мы высветлім пазней. Тое самае тычыцца румынаў паўночнай часткі Букавіны, поўдня Бесарабіі і часткі гістарычнай вобласці Марамурэш на поўнач ад Цісы (якія знаходзяцца ў складзе Украіны), Заходняй раўніны (у Венгрыі) і сербскай часткі Баната на левым беразе Цімака (у Сербіі), а таксама румынаў Балгарыі, якія кампактна пражываюць пераважна на правым беразе Цімака. Гэтак жа румынамі сябе лічаць і адчуваюць нядаўнія эмігранты з Румыніі ў болей аддаленых краінах Еўропы, у Амерыцы, Аўстраліі і Новай Зеландыі. Спецыфічным з'яўляецца статус старажытных балканскіх румынаў, да якіх адносяцца арумыны, мегленарумыны і істрарумыны і якія маюць толькі ў пэўнай ступені (у асноўным дзякуючы ўласным элітам) румынскую нацыянальную свядомасць. Адзначаецца (хоць канчатковыя даследаванні адсутнічаюць), што колькасць румынаў, якія жывуць па-за межамі Румыніі, можа дасягаць 10 мільёнаў!

2. Як румыны самі сябе вызначаюць

Кожнаму румыну з дзяцінства, з сям'і і школы вядома, што назва яго краіны – Румынія (România) – паходзіць ад Рыма (Roma) і што румыны вядуць свае карані ад старажытных рымлян. Вядома, мы маем тут справу з яўным перабольшаннем і памылковым абагульненнем, хоць сам факт і не далёкі ад ісціны.

Ва ўсіх краінах дзеці вывучаюць у школах паходжанне сваіх народаў, якія насяляюць адпаведныя краіны. У Грэцыі грунтоўна вывучаецца гісторыя старажытных грэкаў, якія перамаглі персаў і стварылі ўнікальную цывілізацыю, чые каштоўнасці былі распаўсюджаныя Аляксандрам Македонскім аж да Цэнтральнай Азіі, у выніку чаго была створаная цывілізацыя элінізму, запазычаная пазней і рымлянамі. Сінтэз гэтых культур, які атрымаў назву грэкараманскага класіцызму, ляжыць у аснове самай развітай сучаснай цывілізацыі. Вучням у грэчаскіх школах тлумачаць, што сучасны грэцкі народ – просты нашчадак старажытнай Элады. Немцы з дзяцінства вучаць, што яны – нашчадкі старажытных германцаў (светлавалосыя, высокія, з блакітнымі вачыма), якія яшчэ дзве тысячы гадоў назад мелі адвагу перамагаць у баях рымскіх вайскаводаў і генералаў, а да 500 г. н. э. захапілі і скарылі нават «караля гарадоў свету» Рым. Амерыканцы са Злучаных Штатаў Амерыкі ведаюць, што большая частка іх – гэта нашчадкі еўрапейцаў (англічан, французаў, немцаў, ірландцаў, галандцаў, жыхароў Усходняй Еўропы і г. д.), якія былі высланы ці проста эміграваді ў Новы Свет, пачынаючы з XVI ст., а таксама афрыканцаў, лацінаамерыканцаў і азіятаў і нават амерыканскіх індзейцаў, якія ўсе разам з цягам часу змаглі сумесна ўжыцца і ўтварыць вялікую нацыю. Паходжанне людзей і народаў схаваць немагчыма, бо па сваёй прыродзе людзі цікаўныя, дапытлівыя і хочуць ведаць, адкуль яны паходзяць, каб вызначыць, у які бок ім рухацца. Урэшце, вызначэнне і зацвярджэнне нацыянальных каранёў – звычайная справа, але да той мяжы, пакуль гэта не абражае нацыянальны гонар іншых народаў і не прыводзіць да ідэі існавання народаў «вышэйшых» ці «ніжэйшых». На працягу

стагоддзяў вельмі часта складаліся і распаўсюджваліся розныя фальшывыя навукападобныя «тэорыі паходжання», у якіх генезіс тых ці іншых народаў выводзіўся з біблейскіх ці міфалагічных часоў – дзеля ўзвышэння славы, гонару ці доказу асаблівых правоў гэтых народаў. Французаў, напрыклад, называлі спадчыннікамі траянцаў (ад Парыса), палякаў выводзілі ад сарматаў, а венграў падавалі як нашчадкаў гунаў і г. д. Румыны таксама не заставаліся ў баку ад падобных тэорый, некаторыя з якіх выглядалі зусім фантастычна.

Даследаванні мінулага сапраўднымі навуковымі гістарычнымі метадамі паказалі, што румыны, як і італьянцы, французы, іспанцы, партугальцы і інш., – нашчадкі старажытных рымлян двухтысячагадовай даўнасці. Гэта не столькі крэўнае сваяцтва, колькі моўная і цывілізацыйная еднасць. У Еўропе, увогуле, маюцца тры вялікія групы народаў: германцы (немцы, англічане, галандцы, нарвежцы, шведы, датчане і інш.), славяне (рускія, украінцы, беларусы, палякі, чэхі, славакі, сербы, харваты, славенцы, балгары і інш.) і раманцы. Румыны, без усялякага сумнення, адносяцца да апошніх. Аднак толькі румыны жывуць у цэнтральна-паўднёва-ўсходняй еўрапейскай зоне, і побач з імі няма ніякага іншага раманскага ці неалацінскага народа. Астатнія раманскія народы жывуць у Заходняй і Паўднёвай Еўропе і ўсе паміж сабою мяжуюць, толькі румыны ў пэўнай ступені ізаляваныя ад іншых «сваякоў»: вакол іх жывуць славяне і венгры. Таму пра румынаў і кажуць, што яны складаюць «лацінскую выспу ў славянскім моры» або «лацінскую выспу каля брамы Усходу».

Сімвал Рыма – ваўчыца з братамі Ромулам і Рэмам

І ўсё-такі, як могуць румыны быць спадкаемцамі рымлян, калі Рым знаходзіцца гэтак далёка ад Румыніі? Варта згадаць, што два тысячагоддзі назад Еўропа, дый не толькі Еўропа, але ўвесь так званы «цывілізаваны» свет быў болей адзіны, чым цяпер, бо ў палітычным плане ўвесь належаў вялікай Рымскай імперыі. Скажам, у часы рымскага імператара Траяна, каля 100 г. н. э., гэтая дзяржава распасціралася на трох кантынентах, ад халоднай туманнай Брытаніі (сёння – Аб'яднанае Каралеўства) да гарачых пяскоў Афрыкі (Егіпет, Лівія, Туніс, Алжыр, Марока і г. д.), ад Атлантычнага акіяна да рэк Тыгр і Эўфрат (дзе цяпер знаходзіцца Ірак). Гэтая цывілізацыя была велізарнаю і вельмі разнастайнаю, але ўсе ў ёй жылі ў адной супольнасці, падпарадкоўваліся адным законам, знаходзіліся пад уладаю аднаго войска і адной падатковай сістэмы і ажыццяўлялі афіцыйная дачыненні на адзінай мове – лаціне. Дзякуючы гэтым аб'яднаўчым чыннікам у шмат якіх еўрапейскіх рэгіёнах Рымскай імперыі адбыўся працэс раманізацыі.

Раманізацыя – гэта феномен, калі народы і народнасці, якія ў выніку заваяванняў увайшлі ў склад Рымскай дзяржавы і жылі на тэрыторыі сучасных Італіі, Францыі, Іспаніі, Партугаліі, Бельгіі, Румыніі і ў іншых месцах, авалодалі лацінай і, паступова страціўшы свае мовы, перанялі рымскія рэлігійныя вераванні, звычаі, традыцыі, заканадаўства і іншыя характэрныя асаблівасці, – адным словам, перайшлі на раманскі лад жыцця. Але мы не здолеем растлумачыць, якім чынам раманізацыя амаль два тысячагоддзі назад адбылася на тэрыторыі Румыніі, калі не будзем ведаць, хто насяляў тэрыторыі паміж Карпатамі, Дунаем і Чорным морам да іх заваявання Рымам.

3. «Найадважнейшыя і найсправядлівейшыя сярод фракійцаў...»

Старадаўнім народам, які тут жыў да прыходу рымлян са сваім пераможным войскам, былі гета-дакі.

Хоць яны і мелі дзве назвы – а нават і больш, – можна казаць, што, у агульных рысах, гэта быў адзіны народ, які грэкі ў сваіх пісьмёнах называлі гетамі, а рымляне – дакамі. Вядома, як і любы народ, у гета-дакаў былі розныя рэгіянальныя адгалінаванні, магчыма, і дыялектныя адметнасці, і адрозныя традыцыі і звычаі. Жыхары Дабруджы, Мунтэніі і Малдовы (называныя гетамі), напэўна ж, маглі мець некаторыя мясцовыя адрозненні ад тымі, хто жыў у Банаце, Трансільваніі, Марамурэшы і г. д. (якіх звалі дакамі), але да пачатку нашай эры ўсе яны размаўлялі на аднолькавай мове, і ўспрымаліся, і выглядалі гэтыя плямёны амаль аднолькава. Упершыню гетаў прыкладна пад V стагоддзе да н. э. згадвае грэк Герадот, якога называюць «бацькам гісторыі». Герадот піша, што ў 514 г. да н. э., калі персідскі цар Дарый на чале велізарнага войска рухаўся заходнім узбярэжжам Чорнага мора на поўнач, каб скарыць скіфаў, у Дабруджы супраць яго выступілі геты – што праўда, беспаспяхова. Грэцкі гісторык адзначае з гэтай нагоды, што геты былі «найадважнейшыя і найсправядлівейшыя сярод фракійцаў». Гэта надзвычай карысная інфармацыя, бо далучае гетаў да буйной этнічнай групы фракійцаў. Што да саміх фракійцаў, то іх Герадот называе самым шматлікім народам у свеце пасля індыйцаў.



Герадот «Гісторыя» (фрагмент)

Фракійцы, у сваю чаргу, належаць да вялікай групы індаеўрапейскіх народаў. Разам з грэкамі і ілірыйцамі яны кампактнымі групамі прыйшлі з усходу і паўночнага ўсходу прыкладна ў 2000-х гг. да н. э. і хутка змянілі ўвесь этналінгвістычны ландшафт Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы, уключаючы ўвесь Балканскі паўвостраў і аж да Італіі, а пазней – і да ўзбярэжжа Малой Азіі. Грэкі аселі пераважна на поўдні ад Балканаў і ў Малой Азіі, ілірыйцы – уздоўж заходняга ўзбярэжжа Балканскага паўвострава, а фракійцы – на шырокай прасторы земляў сучаснай Балгарыі, Сербіі, Харватыі, Македоніі, Румыніі, Малдовы, Венгрыі, Славакіі, часткова Украіны і г. д.

Такім чынам, можна сцвярджаць, што прыкладна 3 тыс. гадоў таму фракійцы ўжо былі падзеленыя на паўночную і паўднёвую галіны, размежаваныя, у агульных рысах, хрыбтом Балканскіх гор, якія тады называліся Гемскімі (*лац.* Haemus). Прыкладна ў той час, калі ў Італіі, згодна з гістарычнымі паданнямі, быў заснаваны Рым (753 да н. э.), гета-дакі ўжо вылучыліся сярод плямёнаў паўночных фракійцаў як найбольш значная этнічная група. Паступова яны сфарміравалі асобны народ, адметнасці іх палітычнай і ваеннай арганізацыі былі апісаныя Герадотам у 514 г. да н. э. Гета-дакі жылі пераважна ў далінах сярэдняга і ніжняга Дуная, ад сучаснай Славакіі і да ўпадзення ракі ў Чорнае мора, а іх арганізацыйны і «дзяржаваўтваральны» цэнтр размяшчаўся ў Карпатах. На такой шырокай прасторы, якая ахоплівала тэрыторыю сучасных Румыніі і Малдовы, а таксама Венгрыі, Славакіі, часткі Балгарыі, Украіны і Польшчы, гета-дакі жылі

Фракійскі ваяр (рэканструкцыя)

не кампактна, а падзяляючы яе з іншымі народамі, народнасцямі або часткамі народаў, паміж якімі яны з цягам часу аселі галоўным чынам у межах згаданай вышэй тэрыторыі. Іхнімі ж суседзямі, у прыватнасці, былі старажытныя грэкі, якія ў VII–VI стст. да н. э. заснавалі некалькі калоній на ўзбярэжжы Чорнага мора (Істрыю, або Істр, Томы – сучасную Канстанцу, Галатыс – сучасную Мангалію, Дыянісопаль – сучасны Балчык, Адэсас – сучасную Варну, Мэсэмбрыю – сучасны Нэсэбр і іншыя), а таксама ілірыйцы, скіфы, кельты, паўднёвыя фракійцы і іншыя.

Гецкі шалом

Фракійцы размаўлялі на мове, якая належыць да вялікай індаеўрапейскай моўнай сям'і. Гэтаксама на мовах індаеўрапейскага тыпу размаўлялі і старажытныя грэкі, рымляне, старажытныя германцы, але гаворка фракійцаў была бліжэйшая да той індаеўрапейскай моўнай групы, у якую ўваходзілі мовы старажытных балтаў і ілірыйцаў; да гэтай самай моўнай групы адносяцца скіфская, персідская і санскрыт. З цягам часу да мяжы I ст. да н. э. і I ст. н. э. дыялект, на якім размаўлялі гета-дакі, моцна перайначыўся і, на думку некаторых спецыялістаў, ператварыўся ў асобную мову, адрозную ад фракійскай, з якой ён вылучыўся.

4. Як жылі гета-дакі

4.1. Занятак і жытло

Звычайнай дакскай сям'і, якая складалася з дзядуляў і бабуль, бацькоў і дзяцей, даводзілася прыкладаць немалыя намаганні, каб утрымліваць усіх 10–12 чальцоў сваёй радзіны – нават пасля таго, як чалавецтва прамінула перыяд, які гісторыкі называюць раннім жалезным векам, г. зн. час на пачатку I тыс. да н. э. Мужчыны тады навучыліся здабываць з нетраў зямлі жалезную руду, плавілі яе ў печах і потым у адмысловых майстэрнях выраблялі розныя працоўныя прылады і зброю. Праўда, сярод дакаў толькі невялікая колькасць займалася гэтым цяжкім рамяством, якое патрабавала пэўных навыкаў і прадугледжвала наяўнасць радовішчаў карысных выкапняў. Пераважная большасць дакаў займалася жывёлагадоўляй і земляробствам, заняткамі, якія дапаўнялі адно адно. Тагачасныя людзі ўмелі ўрабляць зямлю, карыстаючыся сахой, спачатку вельмі простай – драўлянай з каменным нарогам; яны вырошчвалі збожжа, пераважна проса, бабовыя і гародніну, займаліся вінаробствам. Жанчыны ўмелі прасці з авечай воўны ніткі і ткаць тканіну, выробляючы з яе адзенне ды іншыя рэчы гаспадарчага ўжытку. Здаўна практыкавалася і ручное ганчарства, г. зн. выраб са змяшанай з вадою гліны посуду, які высушвалі на сонцы, а потым абпальвалі

Гета-дакійскія ганчарныя вырабы

ў печы. Сваё жытло, асабліва ў горных раёнах, гета-дакі ўзводзілі на паверхні зямлі, будуючы хаты з дрэва і абмазваючы іх зверху глінай. Але шмат будавалася і зямлянак або паўзямлянак. Дрэва было асноўным матэрыялам і ў іншых відах вытворчасці, але выкарыстоўваліся таксама камень, гліна, косці, рогі жывёл, бронза, срэбра і золата, асабліва ў вырабе ўпрыгажэнняў, а таксама, вядома ж, жалеза.

Гецкія срэбныя аздобы са скарба ў Аджыгіёле (жудэц Турча)

З цягам часу, пачынаючы ад 450–400 гг. да н. э., апрацоўка жалеза ўдасканальваецца, выплаўляны метал набывае лепшую якасць, расце разнастайнасць вырабленых з яго працоўных прыладаў і зброі. Настае перыяд, які археолагі называюць познім жалезным векам. Чалавек вынаходзіць ганчарны круг, што дазваляе надаваць прадметам больш акрэсленыя рэльефныя формы і значна павялічыць аб'ёмы вырабаў з абпаленай гліны. Узнікае вытворчасць велізарных круглых судзін дыяметрам некалькі метраў, якія ўкопвалі ў зямлю для захавання ў іх збожжа, і драбнейшых збаноў (кубкаў) пад разнастайныя гаспадарчыя, медыцынскія або рэлігійныя патрэбы. Найбольшай адметнасцю, характэрнай для мясцовага стылю, вылучаліся дакскія кубкі, келіхі з расшыранай верхняю часткай і выгнутымі вонкі краямі, якія маглі мець адно ці два вушкі. Крыху пазней, відавочна, пад уплывам сваіх суседзяў – грэкаў, кельтаў, паўднёвых фракійцаў, – гета-дакі навучыліся вырабляць і выкарыстоўваць сохі з жалезным нарогам. Дзякуючы вырабу лішку прадукцыі, перш за ўсё сельскагаспадарчай – збожжа, жывёлы, шкур, футра, воўны, мёду, – а таксама вырабаў з керамікі, прыладаў працы, зброі ды інш. асобныя мясцовыя жыхары сталі купцамі. Спачатку яны ў якасці пасрэднікаў займаліся натуральным тавараабменам, але потым перайшлі да выкарыстання грэка-пантыйскіх, македонскіх і эліністычных манет. А пасля 300 г. да н. э. гета-дакі пачалі чаканіць і ўласныя манеты ў мясцовых майстэрнях, пераймаючы ўзор эліністычных вырабаў.

4.2. Супольнасць: «бліскучыя» і «калматыя»

Як і ўсе тагачасныя народы-суседзі, дакі складаліся з розных сацыяльных і прафесійных слаёў і груп. Падмурак грамадства, г. зн. самую шматлікую групу насельніцтва, якая займалася вытворчасцю матэрыяльных выгодаў, утваралі свабодныя ў юрыдычным сэнсе людзі. Яны жылі ў сельскіх грамадах, былі земляробамі, пастухамі, рамеснікамі і нават дробнымі купцамі. Вельмі шчыльна звязаныя з апрацоўкай зямлі і жывёлагадоўляй, дакі насілі суконныя штаны, кашулю з дзвюх асобных полак, падперазаную шырокім скураным ці палатняным поясам, а паверх яе надзявалі вопратку з рукавамі ці накідку кшталту мантыі. Узімку яны насілі скураныя ці лямцавыя лапці, да падэшваў якіх часам прымацоўвалі шыпы, каб не пакаўзнуцца на лёдзе. Халоднай ці дажджлівай парой шараговыя гета-дакі надзявалі на галаву башлык ці каптур, каб абараніцца ад непагадзі. Жанчыны таксама насілі кашулі, спадніцы і накідкі кшталту мантыі, а валасы расчэсвалі пасярэдзіне на прабор і збіралі ззаду ў вузел. У мужчын валасы былі доўгія, і, магчыма, таму іх называлі *comati* – «калматымі» (з доўгімі лахманамі) ці *capillati* – «кудлатымі» (з вялікаю грывай). Будучы свабоднымі, гэтыя людзі, тым не менш, мелі пэўныя абавязацельствы перад сваімі правадырамі, а пасля іх – і перад дзяржавай.

Ваяр-дак

У адрозненне ад звычайных свабодных людзей, магнаты (ці арыстакраты) мелі багацейшую вопратку, а на галаве нязменна, як характэрную адзнаку іх рангу, насілі малахай (шапку), якая па-лацінску называлася *pileum*. Таму іх і называлі *pileati* («пільсцёвыя»). Было ў арыстакраты найменне і на сваёй мове, якое да нашага часу дайшло як *tarabostes*, што значыць «абраныя», «бліскучыя». Гэта былі рыцары, святары, кіраўнікі правінцый, ваяводы, адказныя за збор даніны, за гандаль

з кельцкім, грэцкім, элінскім і рымскім светам. Натуральна, што сярод гета-дакаў была і праслойка рабоў, але іх было няшмат, рабы выконвалі пераважна гаспадарчую працу, г. зн. былі кшталту слуг у маёнтках арыстакратаў. Пры пэўных абставінах некаторыя дакі станавіліся рабамі грэкаў і рымлян; з другога боку, дакі прадавалі ваеннапалонных у рабства за мяжу.

Заможныя арыстакраты жылі ў вялікіх і прасторных сядзібах, а некаторыя – у сапраўдных замках. Іх узводзілі на ўзвышэннях і па першым часе будавалі з зямлі й драўніны, абносячы ровам і абаронным валам. Але ў канцы дахрысціянскай эры адбываецца пераход да будаўніцтва буйных мураваных крэпасцяў, асабліва ў Трансільваніі, якая ператвараецца ў цэнтр гета-дакскай дзяржавы.

4.3. «Яны вераць у сваю несмяротнасць...»

Ужо згаданы старагрэцкі гісторык Герадот Галікарнаскі адзначаў, што геты верылі ў неўміручасць: «Геты мяркуюць, што яны не паміраюць, а, развітваючыся з жыццём, выпраўляюцца да бога Залмокса (Замолкса), якога некаторыя з іх называюць яшчэ Гэбэлейзам. Кожныя пяць гадоў яны абавязкова пасылаюць да Залмокса вешчуна – таго, на каго быць вешчуном выпадзе жэрабя, – і ён павінен пераказаць богу пра іхнія патрэбы. А пасылаюць яны вешчуна так: некалькі чалавек стаюць поруч і трымаюць тарчма тры дзіды, другія бяруць за рукі і за ногі вешчуна, які павінен выправіцца да Залмокса, разгойдваюць яго і падкідаюць высока – так, каб ён упаў на вастрыё дзідаў. Калі вяшчун, працяты дзідамі, памірае, яны лічаць, што боства да іх прыхільнае. А калі не памірае, абвінавачваюць вешчуна, называючы яго грэшнікам і бязбожнікам. Пасля гэтага яны выбіраюць іншага вешчуна і даручаюць яму тое самае заданне. А калі бліскаюць маланкі і грыміць гром, фракійцы страляюць у неба з лукаў...»

Бог Залмокс, дэталь роспісу фракійскай магілы ў Аляксандрава (Балгарыя)

Як і ўсе старажытныя еўрапейскія народы, гета-дакі былі мнагабожнікамі (верылі ў мноства багоў), хоць у пэўныя перыяды сваёй гісторыі яны й пакланяліся аднаму галоўнаму богу. Самым вядомым і шанаваным быў вышэйзгаданы Залмокс, бог зямлі, сельскай гаспадаркі і ўрадлівасці, чый дом, на думку дакаў, быў дзесь пад зямлёй. Баством, адваротным Залмоксу, якое адпрэчвала яго аўтарытэт і ўладу, быў Гэбэлейз, бог неба, маланкі і грому. Апроч іх, былі, напрыклад, такія боствы, як Бендыда, багіня месяца і лясоў, падобная да Артэміды ў старажытных грэкаў і Дыяны ў рымлян, а таксама бог вайны, падобны адпаведна да Арэса ці Марса. Раку Дунай (*лац.* Donarius), якую грэкі называлі Істрам, а рымляне Данубіем, таксама лічылі баством. Былі, вядома, і іншыя боствы. Кожнае мела сваё месца для пакланення, святыню ці храм. Храмы ўзводзіліся двух відаў: прастакутныя і круглыя, іх будавалі з дрэва і каменю (мармуру), аздабляючы тонкімі калонамі, і, як правіла, кожны з іх меў некалькі святых залаў. Найбуйнейшыя і найбольш шанаваныя з іх былі знойдзеныя ў цэнтры Дакіі, на поўдні Трансільваніі, дзе, верагодна, і знаходзілася святая гара дакаў Кага́ёнан, нешта накшталт мясцовага Алімпа.

Несумненна, у той час у дакаў і ўзнікла вера ў замагільнае жыццё, ці то ў несмяротнасць, пра што пісаў Герадот. І пакуль неўміручасць у іх думках непарыўна звязвалася з душой і целам, яны трымаліся абраду пахавання (грабакладзінаў), але пачынаючы з III–II стст. да н. э. перайшлі да крэмацыі (спальвання) нябожчыкаў. Гэта адбылося таму, што пераважная большасць дакаў пачала меркаваць, што нематэрыяльнаю й несмяротнаю ёсць толькі душа, і яе трэба як найхутчэй вызваліць з цялеснай абалонкі шляхам я спалення. Памерлых спальвалі або непасрэдна на месцы пахавання, або ў якім іншым месцы, а потым попел, косці і іншыя парэшткі пасля крэмацыі найчасцей складалі ў урны (судзіны, зробленыя з гліны) і закопвалі, а зверху насыпалі з зямлі магілы, якія называюць курганамі. Курганныя пахаванні з найбольш багатым інвентаром (амфарамі, кубкамі, упрыгажэннямі, куфэркамі і да т. п.) належалі племянным правадырам і магнатам.

4.4. Навука, пісьменства, мастацтва

Амаль паўтара тысячагоддзя таму гісторык Ярдан пісаў у сваёй грунтоўнай працы «Аб паходжанні і дзеях гетаў» пра важную духоўную ролю, якую адыграў сярод гета-дакаў іх вярхоўны жрэц Дэкенэй: «Убачыўшы, што іх [дакаў] душы ва ўсім яму падпарадкоўваюцца і што ў іх дапытлівы розум, Дэкенэй пачаў навучаць іх усім тонкасцям філасофіі, а ён быў у гэтай справе настаўнік дасведчаны. Ён заклаў у іх разуменне маралі, чым утаймаваў іхні варварскі нораў; выкладаючы фізіку, змусіў жыць у згодзе з прыродай, [...] навучыўшы логіцы, паставіў вышэй за іншыя народы, бо ў майстэрстве разважаць яны вылучаліся паміж імі; развіваючы практычныя навыкі, навучаў займацца дабрадзейнымі справамі; выкладаючы тэорыю дванаццаці знакаў задыяку, паказаў ім рух планет і раскрыў усе сакрэты астраноміі: растлумачыў, якім чынам расце і памяншаецца месяцовы дыск, прадэманстраваў, наколькі вогненнае сонечнае кола перавышае памерам зямное, пазнаёміў з назвамі і знакамі трохсот сарака шасці зорак, якія, узнікаючы і сыходзячы з небасхілу, хутка прабягаюць свой шлях з усходу на захад. Можна ўявіць, якую велізарную асалоду атрымлівалі адважныя мужы, калі, маючы кароткі пярэдых ад ваенных справаў, убіралі ў сябе філасофскія веды! Вунь адзін вывучае мапу нябесных сфераў, другі – уласцівасці траваў і раслін, гэты пільнуе за тым, як поўніцца ці ідзе на сход месяц, а той назірае за зацьменнямі сонца і тым, як сонечнае свяціла, падхопленае вярчэннем нябёсаў, рухаецца з усходу на захад». Вядома, Ярдан, які імкнуўся паказаць высокую духоўнасць гоцкага народа (які памылкова лічылі спад-

Дакійская культавая маска з бронзы. Лункань, жудэц Хунэдаара

каемцам гецкага), тут перабольшвае. Цяжка ўявіць сабе ваяўнічых дакаў – жорсткіх, барадатых, грубых і непісьменных – прагнымі да навукі. Хоць са словаў Ярдана якраз выходзіць, быццам геты ці не ўвесь свой час бавілі ў тым, што займаліся філасофіяй, этыкай, батанікай і г. д. Вядома, гэта не значыць, што ў дакскім грамадстве не было людзей, якія займаліся навукамі. Такімі былі вешчуны, што карысталіся ў грамадстве вялікай павагай і мелі немалую ўладу. Яны сапраўды валодалі пэўнымі ведамі ў астраноміі, батаніцы і медыцыне, пра што сведчаць як археалагічныя знаходкі, так і пісьмовыя крыніцы. Захаваліся назвы некаторых медыцынскіх раслін на гецкай мове, былі знойдзеныя куфэркі са шмінкаю, мазямі, лекавымі зёлкамі, скрыні з медыцынскімі інструментамі (скальпелямі, пінцэтамі, пліткамі вулканічнага попелу для хутчэйшага загойвання ран). Знойдзеныя нават чарапы, якія былі разрэзаныя (трэпанаваныя) падчас «аперацыі» і пасля сшытыя. Знойдзеныя таксама рэзервуары для назапашвання вады, вадаправоды і трубы каналізацыі, што відавочна сведчыць пра ўвагу, якая надавалася грамадскай гігіене.

Дакам былі вядомыя і грэцкі, і лацінскі алфавіт, але пісьменнасць сярод жыхароў была рэдкасцю і нават выключэннем, як і амаль паўсюль у антычным свеце, асабліва па-за межамі Рымскай дзяржавы. Але вядома, напрыклад, што імператар Даміцыян пасля паразы ў вайне з дакамі пераслаў у рымскім сенат ліст, атрыманы ім ад Дэцэбала і яго саюзнікаў, ці што крыху пазней ужо імператар Траян атрымаў пісьмовае пасланне на вялікім грыбе (відаць, тым грыбам была якая-небудзь губка), у якім гета-дакі прасілі рымскага ўладара аб міры. На датаваным I ст. н. э. культавым сасудзе, які быў знойдзены на тэрыторыі былой дакскай сталіцы, выштампаваны надпіс лацінскімі літарамі, а на амаль 60-ці каменных глыбах Сармізегетузы (дакскай сталіцы) выбіта па адным-два, а тое нават і тры надпісы грэцкімі літарамі. Усё гэта сведчыць, што вярхоўны ўладар, правадыры саюзных плямёнаў, жрацы і асобы, набліжаныя да двара, умелі пісаць і што мусіла існаваць пэўная канцылярыя, тым часам як астатні народ такіх ведаў не меў і нават не адчуваў у пісьменстве патрэбы.

Гета-дакі вызначаліся схільнасцямі да прыгожага. Яны выразалі ўзоры па дрэве, але, паколькі драўніна – матэрыял надзвычай далікатны, узоры драўлянага разьбярства былі страчаныя. Затое

захаваліся ўзоры скульптурных фігурак з каменю, адліванай бронзы, каванага жалеза і срэбра, апрацаванай косткі ў сасудах. Трэба адзначыць таксама арнаментаваныя, інкруставаныя срэбрам фібулы, кольцы, бранзалеты і да т. п. Керамічныя вырабы аздабляліся геаметрычнымі і зааморфнымі (з выявамі жывёл) фігурамі, прычым не толькі контурнымі, але і выпісанымі з вялікім майстэрствам. Маляваная і палітая эмаллю кераміка гета-дакаў, якая атрымала пашырэнне ў I ст. н. э., была цалкам арыгінальнай, што сведчыць пра густ мясцовага насельніцтва і яго цягу да прыгожага.

Срэбны ланцуг. Дакійскі перыяд. I ст. да н. э. Трансільванія.

4.5. Ад племянных саюзаў да ўтварэння дзяржавы: кіраванне Бурэбісты (82–44 гг. да н. э.)

Як і ўсе старажытныя народы, гета-дакі аб'ядноўваліся ў плямёны, на чале якіх стаялі магутныя правадыры, што ў 514 г. да н. э. адважыліся супрацьстаяць самому персідскаму цару Дарыю. Прыкладна з IV ст. да н. э. гэтых ваяўнічых правадыроў у племянных аб'яднаннях часам пачалі называць «базілеямі», або «царамі», хоць яны не кіравалі яшчэ сапраўднымі дзяржаўнымі ўтварэннямі. Іх імёны былі незвычайныя і сёння гучаць містычна: Сіталк (Sitalces), фракійскі правадыр, якому падпарадкоўвалася і частка гетаў; цар істрыйцаў (rex Histrianorum), правадыр дунайскіх гетаў Драміхет (Dromichaites), які ў Ніжнедунайскай раўніне паспяхова супрацьстаяў аднаму з нашчадкаў Аляксандра Македонскага – гэтак сама, як супраць самога Аляксандра раней ваявалі іншыя правадыры гетаў. Потым былі яшчэ і Зальмадэгік (Zalmodegikos), і Рэмакс (Rhemaxos), і Ароль (Oroles), і Рубабост (Rubobostes) – два апошнія з гэтага спісу ўладарылі хутчэй за ўсё ў Трансільваніі, у сярэдняй частцы карпацкага горнага хрыбта, дзе палітычная ўлада дакаў пастаянна

ўмацоўвалася (у II ст. і асабліва ў I ст. да н. э.). Гэтыя правадыры ўзначальвалі ўжо дастаткова магутныя палітычныя ўтварэнні, якія толькі чакалі спрыяльнага выпадку і з'яўлення выключнай асобы, якая аб'яднала б мясцовыя плямёны ў адзіную дзяржаву. Імпульсы да аб'яднання гета-дакійскіх плямёнаў паходзілі як знутры, так звонку. Цэнтр аб'яднання знаходзіўся ў паўднёвай Трансільваніі, у раёне гор Арэштыі (або Шурану), дзе правадыром быў Бурэбіста, які пасля 82 г. да н. э. з дапамогай вялікага жраца Дэкенэя змог за адносна кароткі прамежак часу аб'яднаць плямёны гета-дакаў пад сваёй уладай і стварыць у гарах Арэштыі магутную сістэму ўмацаванняў, пазней дапоўненую і яго нашчадкамі.

Аб'яднальным намаганням Бурэбісты пагражалі дзве знешнія небяспекі, якія адначасова і падштурхоўвалі гета-дакаў да кансалідацыі іх палітычнай і ваеннай улады: з захаду і паўночнага за-

Дакія ў часы Бурэбісты, 81–44 гг. да н. э.

хаду такой небяспекаю былі кельты, якія імкнуліся перамясціцца ў Трансільванію з тэрыторый Славакіі, Дуная і Цісы, а на поўдні ўвесь час насоўвалася пагроза з Рыма. У 72–71 гг. да н. э. рымская армія ўжо ўрывалася на тэрыторыю Дабруджы. Але каля 60 г. да н. э. Бурэбіста са сваім войскам перамог кельтаў, а пасля 55 гг. да н. э. адсунуў рымскую пагрозу і ад Дабруджы, анэксаваўшы ўсё заходняе ўзбярэжжа Чорнага мора і тэрыторыю паміж Дунаем і Балканамі. У выніку Бурэбіста стаў гаспадаром шматлікіх земляў, якія займалі тэрыторыю ад сярэдняга Дуная (цяперашняя Славакія) на захадзе да вусця Буга на ўзбярэжжы Понта Эўксінскага на ўсходзе, ад Балканскіх гор на поўдні да лясістых Карпатаў на поўначы і на якіх жылі шматлікія народы і народнасці. Гэтая дакская дзяржава магла вывесці на бітву войска колькасцю ў 200 000 чалавек (паводле відавочна перабольшанай ацэнкі Страбона) і мела ў старагрэцкіх крыніцах назву *архэ*, г. зн. «імперыя», а яе ўладар характарызаваўся як «самы ўплывовы і першы сярод усіх фракійскіх цароў». Вядома, аднак, што паняцце «дзяржава» ў тым сэнсе, у якім яе разумелі ў рымскім свеце, не можа быць цалкам дастасаванае да палітычнага ўтварэння на чале з Бурэбістам, якое хутчэй за ўсё было, няхай буйным і трывалым, але ўсё ж звычайным племянным аб'яднаннем. І нават калі з практычных меркаванняў нам будзе больш мэтазгодна ўжываць тэрмін «дзяржава», мы павінны ўсведамляць яго пэўную ўмоўнасць.

Рым на той час перажываў пераход ад рэспубліканскага ладу кіравання да імператарскага, і краіна была ахоплена грамадзянскімі войнамі. Звонку спакой Рыма маглі парушыць два народы – галы (кельты) на захадзе і дакі на ўсходзе. Таму Гай Юлій Цэзар скарыў Галію і скіраваў свой пагрозлівы позірк на Дакію. Гэта і стала прычынай таго, чаму ў грамадзянскай вайне, што ўспыхнула ў Старажытным Рыме паміж Цэзарам і Пампеем, Бурэбіста падтрымаў апошняга. У 48 г. да н. э. Пампей, на жаль, пацярпеў паразу. Але правадыр дакаў пазбег пакарання, бо неўзабаве Цэзар быў забіты ў сенаце сваімі палітычнымі супернікамі,

Дакскія манеты

Крэпасці і ўмацаваныя паселішчы ў II ст. да н. э. – I ст. н. э.



прыхільнікамі рэспублікі. У тым самым годзе (44 г. да н. э.) памёр і Бурэбіста – верагодна, таксама з прычыны змовы.

Пасля смерці вярхоўнага правадыра, які ўмацаваў свой народ з дапамогаю «вайсковых практыкаванняў, выхавання вытрымкі і паслушэнства загадам» і навучыў яго «жыць без віна», дакская дзяржава не знікла, хоць і распалася на чатыры-пяць утварэнняў. Найбуйнейшым сярод іх было якраз тое, што мела цэнтр у гарах Арэштыі. Тут кіравалі нашчадкі Бурэбісты і тут заставалася галоўная дакская святыня, што рабіла гэты цэнтр духоўнай сталіцаю ўсіх гета-дакаў.

4.6. Дэцэбал (87–106)

Мінула болей за сто гадоў, перш чым аднаму з нашчадкаў Бурэбісты на імя Дыурпаней (Diurpaneus), пазней больш вядомаму пад мянушкаю Дэцэбал («магутны»), удалося аднавіць адзіную дакскую дзяржаву, надаўшы ёй яшчэ большай трываласці. Краіна ахоплівала ўжо не такія абшары, як пры Бурэбісце, а займала прыкладна тэрыторыю сучаснай Румыніі. Але Дэцэбал надаў свайму дзяржаўнаму ўтварэнню лепшую арганізацыю. Пасля з'яўлення жалеза і шматлікіх жалезных вырабаў хутка развівалася металургічная вытворчасць. Паўсюднае пашырэнне атрымаў плуг з жалезным нарогам, а крыху пазней – ганчарны круг. Свае класічныя формы пры Дэцэбале набыла фартыфікацыйная сістэма з цэнтрам у Сармізегетузе, найважнейшай крэпасці і сталіцы дакскай дзяржавы. Войска было добра арганізаванае і ўзброенае, у тым ліку ваеннымі машынамі; кіраванне краіны стала цэнтралізаваным, на ўздыме знаходзіўся гандаль з Рымскай дзяржаваю. Дзякуючы гэтаму шырокі ўжытак атрымалі рымскія сярэбраныя манеты, і дакі, наследуючы іх узору, неўзабаве пачалі чаканіць свае.

Дэцэбал, кароль дакаў

З цягам часу Рым падпарадкаваў сабе ўвесь Балканскі паўвостраў, і межы імперыі дасягнулі Дуная. У 46 г. н. э. была заваявана Дабруджа, якая ўвайшло ў склад рымскай правінцыі Мёзіі, што месцілася прыкладна на тэрыторыі сучасных Балгарыі і Сербіі. Пасля 85–86 гг. рымскія напады на Дакію ўзмацніліся і з невялікімі перапынкамі адбываліся цягам 20 гадоў, аж пакуль дакскі правадыр Дэцэбал не скарыўся Рыму. Аднак Дэцэбал не адчуваў боязі перад рымлянамі, бо, як пісаў Дыён Касій, «быў дасведчаны ў ваеннай справе, спрытны ў баях, ведаў, калі трэба ісці ў наступ, а калі своечасова адступіць, быў спраўны ў паходах, адважны ў бітвах, умеў правільна скарыстацца з перамогі і ўдала ўратавацца ад наступстваў паразы». Карыстаючыся гэтымі ўменнямі, Дэцэбал паспяхова абараняў свае зямлі аж да пачатку II ст. н. э. і сваімі дзеяннямі нават сам правакаваў

Імператар Траян

рымлян да агрэсіі. Якраз у той час на чале Старажытнага Рыма стаў самы здольны сярод рымскіх імператараў усіх часоў, за кіраваннем якога межы Рымскай імперыі дасягнулі максімальных памераў. Гэтага імператара звалі Траянам; ён нарадзіўся паблізу Севіллі ў Іспаніі і стаў першым рымскім імператарам, народжаным не ў Італіі. У выніку дзвюх бязлітасных войнаў яму ўдалося падпарадкаваць Дакію. Пасля першай вайны (101–102 гг. н. э.), якая завяршылася толькі частковай перамогаю Рыма, Дэцэбал фармальна абвясціў сябе рымскім падданым, але не пакінуў надзеі на хуткі рэванш. Зрэшты, імператар не меў адносна заключанага міру ніякіх ілюзій. Ён загадаў архітэктару Апаладору Дамаскаму спраектаваць і збудаваць непадалёк ад паселішча Драбета мост цераз Дунай. Будоўля стала адной з самых грандыёзных у эпоху Антычнасці, рэшткі таго моста можна ўбачыць дагэтуль на беразе Дуная ў паўднёва-заходняй Румыніі. Па гэтым мосце, а таксама па іншых, у якасці якіх служылі пастаўленыя адзін за адным караблі, рымскае войска колькасцю ў 150 000 ваяроў у розных месцах перайшло цераз Дунай і ў 105 г. уступіла на тэрыторыю Дакіі. Была ўзята ў аблогу сталіца краіны – горад Сармізегетуза. На пачатку лета наступнага 106 года крэпасць, у якой скончыліся вада і харчы, была захоплена і знішчана рымлянамі. Рымляне завалодалі і дакскай скарбніцай, запасы якой ацэньваліся на 165 000 кг чыстага золата і 331 000 кг срэбра. За кошт урачыста дастаўленых у Рым скарбаў імператар наладзіў раздачу хлеба і цыркавыя забавы, каб патрафіць капрызам рымскага плебсу, які прагнуў *panem et circenses* – «хлеба й відовішчаў». Золата дакаў напоўніла апусцелую на той час рымскую казну. Але радасць перамогі ў рымлян была няпоўная, бо Дэцэбал з часткаю сваіх прыхільнікаў уцёк у горы, адкуль збіраўся працягваць барацьбу. І ўсё ж яго супраціў быў нядоўгім: неўзабаве адзін

рымскі атрад здолеў дагнаць уцекачоў. Загнаны ў тупік, Дэцэбал скончыў жыццё самагубствам, а яго галаву і правую руку прывезлі імператару, а пазней выставілі на агульны агляд у Рыме, каб усе пераканаліся, што люты вораг Рымскай імперыі загінуў. Святкаванні з нагоды перамогі над дакамі доўжыліся ў Рыме 123 дні, у іх узялі ўдзел 10 000 гладыятараў і 11 000 дзікіх звяроў, кожнаму падаткаплатніку было падорана па 650 дынараў; былі таксама выпушчаныя новыя манеты, тры памятныя медалі; вырабляліся керамічныя цацанкі, прысвечаныя заваяванню Дакіі. У 113 г. н. э. на ўспамін пра гэту падзею ў новым, пабудаваным на загад імператара Траяна, рымскім форуме быў узведзены велічны помнік, вядомы як «Калона Траяна». Калона выраблена з белага мармуру, мае вышыню амаль 40 і дыяметр 4 метры, а яе ствол апаясваюць рэльефныя выявы эпізодаў вайны рымлян з дакамі. Гэты славуты помнік можна і сёння ўбачыць у Рыме непадалёк ад Венецыянскай плошчы, ён лічыцца сведчаннем аб нараджэнні румынскага народа.



Траянская калона і фрагмент яе барэльефа

5. «Мы вядзем сваё паходжанне з Рыма»: утварэнне румынскага народа і румынскай мовы

5.1. Раманскія народы

Як вядома, Рым называюць «вечным горадам». Ён вечны не толькі таму, што рымская цывілізацыя перажыла сябе і паўплывала на культуру новай Еўропы, але і таму, што яна дала штуршок станаўленню раманскіх народаў, якія дагэтуль захоўваюць лацінскую спадчыну. Найбуйнейшымі раманскімі народамі, якія захаваліся да нашага часу, з'яўляюцца італьянцы, французы, іспанцы, партугальцы і каталонцы ў Заходняй Еўропе і румыны ва Усходняй. У сярэднія вякі і ў Новы час з прычыны вялікіх геаграфічных адкрыццяў і ўтварэння калоній мова і культура некаторых раманскіх народаў распаўсюдзіліся і ў Паўночнай, Цэнтральнай ды Паўднёвай Амерыцы (перш за ўсё датычна вялікай прасторы Лацінскай Амерыкі), а таксама і на пэўныя тэрыторыі Афрыкі і Азіі. Усе раманскія народы сфарміраваліся, увогуле, паводле падобнай схемы. У аснове генезісу ўсіх раманскіх народаў ляжаць два асноўныя элементы: мясцовы (аўтахтонны) дараманскага перыяду, гэта значыць да часу рымскага заваявання, і прышлы – рымскі (лацінскі). Для французаў, напрыклад, якія як нацыя сфарміраваліся на тэрыторыі старажытнай Галіі, мясцовым (аўтахтонным) фактарам этнагенезу сталі галы. А калі казаць пра паходжанне румынаў, то для іх такім элементам сталі гета-дакі, якія да рымскага заваявання жылі ў Дакіі. На месца галаў і дакаў прыйшлі рымляне, узровень развіцця грамадства і культуры якіх быў прыкметна вышэйшы, і ранейшыя жыхары гэтых земляў, перамяшаўшыся з рымлянамі, перанялі лацінскую мову, а таксама рымскія лад жыцця і звычаі. Можна сказаць, што яны раманізаваліся, хоць і захоўвалі некаторыя малаістотныя элементы сваіх даўнейшых традыцый. Такія этнічныя сумесі, якія існавалі на працягу пэўнага гістарычнага перыяду, гісторыкі называюць «гала-раманскай» і «дака-раманскай».

У III–V стст. Рымскую імперыю ахапіў крызіс, і яна паступова распалася. Былыя рымскія правінцыі апынуліся не толькі ізаляванымі адна ад адной, але сталі адасобленымі і ад даўняга цэнтру лацінскасці –

Еўрапейскія дзяржавы, дзе гавораць на раманскіх мовах

Дзяржавы, дзе раманская мова – афіцыйная ці адна з афіцыйных на дзяржаўным узроўні

Дзяржавы, дзе раманская мова – афіцыйная ці адна з афіцыйных на рэгіянальным узроўні

Дзяржавы, дзе раманская мова – не афіцыйная, але на ёй гавораць на дзяржаўным узроўні

Дзяржавы, дзе раманская мова – не афіцыйная, але на ёй гавораць на рэгіянальным узроўні



Рыма. У выніку гутарковая лаціна на тэрыторыі сучаснай Францыі паступова перайначылася і ператварылася ў новую мову, якая атрымала назву французскай, а гутарковая лаціна на тэрыторыі старажытнай Дакіі, дзе пазней паўстала Румынія, паступова трансфармавалася ў румынскую мову. Цалкам натуральна, што разам са станаўленнем моваў з гала-раманцаў і дака-раманцаў сфарміраваліся новыя народы – адпаведна французы й румыны. У перыяд утварэння гэтых новых народаў, калі іх неалацінскі характар ужо відавочна акрэсліўся, ва ўсіх былых рымскіх правінцыях, уключаючы Італію, з'явіліся і пачалі асядаць новыя народнасці, якія сярод гісторыкаў прынята называць «качавымі» (бо на працягу пэўнага часу яны не мелі сваёй сталай бацькаўшчыны). Раманізаванае ж насельніцтва былых рымскіх правінцый называла іх «варварамі», г. зн. іншаземцамі з дзіўнымі, незразумелымі мовамі. У Заходняй Еўропе такімі народнасцямі былі пераважна германцы, а ў Цэнтральнай, Усходняй і Паўднёва-Усходняй Еўропе – старажытныя славяне. Такім чынам сярод гала-раманцаў, якія амаль цалкам ператварыліся ў французаў (або протафранцузаў), з'явіліся і аселі германскія плямёны франкаў і бургундцаў, якія, у сваю чаргу, былі раманізаваныя неалацінянамі.

А сярод дака-раманцаў пасяліліся галоўным чынам старажытныя славяне, якія таксама паступова растварыліся ў колькасна пераважным раманізаваным насельніцтве. Заканамерна, што і франкі, і старажытныя славяне пакінулі ў раманізаваным насельніцтве, якім былі асіміляваны, пэўныя свае сляды – у прыватнасці, пэўныя рысы сваёй цывілізацыі і культуры, але паводле сваёй значнасці гэтыя адметнасці



непараўнальныя з рымскаю спадчынай неалацінян. Такім чынам, можна сцвярджаць, што ў фарміраванні ўсіх раманскіх народаў, акрамя першых двух чыннікаў – дараманскага (аўтахтоннага) і ўласна раманскага (які прыкметна пераважаў), – удзельнічаў яшчэ і трэці, другасны па сваім уплыве, чыннік прышлага (качавога) насельніцтва. Пры гэтым трэба зазначыць, што прапанаваная схема ўзнікнення раманскіх народаў у значнай ступені спрошчаная і ўтварэнне этнічнай сумесі ў кожным выпадку адбывалася нашмат больш складана.



5.2. Лёс Дакіі пасля 106 года

Такім чынам, румыны сфарміраваліся перадусім з гета-дакаў і рымлян з пэўным пазнейшым дамешкам старажытных славян. Узнікае пытанне: чаму мы называем румынаў раманскім народам? Чаму румынская мова адносіцца да раманскіх? З якога часу можна з упэўненасцю казаць аб утварэнні румынскага народа і яго мовы? У нас не было пакуль магчымасці адказаць на ўсе гэтыя пытанні, бо не былі высветлена, з якіх канкрэтна «інгрэдыентаў» склаўся «рэцэпт» фарміравання румынскага

Руіны рымскага форума ў Ульпіі Траяна Сармізегетузе

народа і яго мовы. І зараз нам трэба будзе разгледзець, як дазіраваліся і змешваліся розныя элементы пры ўтварэнні румынскага этнасу, а таксама калі і дзе адбываўся гэты працэс.

Пасля таго, як Дэцэбал і яго войска былі канчаткова пераможаныя рымлянамі ў 106 г., рымскі імператар Траян вырашыў стварыць на тэрыторыі былой дакскай дзяржавы рымскую правінцыю Дакію як складовую частку Рымскай імперыі. Але ў Дакію ўвайшла не ўся тэрыторыя Дэцэбалавага царства. Значная частка Мунтэніі (Валахіі) і поўдзень Малдовы былі ўключаныя ў склад правінцыі Мёзія, як гэта раней адбылося з Дабруджай. Часткамі рымскай Дакіі сталі: уласна Трансільванія, Банат, Алтэнія і заходняя частка Мунтэніі, а вось Крышана, Марамурэш і Паўночная Малдова, якія знаходзіліся далей ад Дуная і таму іх было складаней кантраляваць, засталіся ў руках свабодных дакаў.

Дакія была імператарскаю правінцыяй, г. зн. кіравалася самім імператарам праз яго намесніка самага высокага рангу (раней ён мусіў быць не менш як консулам у Рыме). Сталіцай Дакіі стаў заснаваны Траянам у нізіне Паўднёвай Трансільваніі за некалькі кіламетраў ад былой Дэцэбалавай сталіцы новы горад Ульпія Траяна Сармізегетуза (цяпер сяло Сармізегетуза ў Хунэдаарскім жудэцы). Дзякуючы гэтаму Дакія, стаўшы складовай часткай самай развітай на той час дзяржавы свету, трапіла ў сферу высокай цывілізацыі.

У новую правінцыю рымляне прывялі з сабой воінскія злучэнні і цывільных службоўцаў, служак культу, землеўладальнікаў і рабоў, а галоўнае – каланістаў. Разам з імі прыйшлі і рымскія багі, рымская адміністрацыйная сістэма, рымскі лад жыцця, гаспадарання, правапарадку і, вядома ж, лацінская мова. Новы дзяржаўны механізм пачаў працаваць вельмі хутка. Пасля смерці Траяна (98–117) правінцыя, дзеля таго каб ёю было лягчэй кіраваць, была падзеленая спачатку на дзве (Верхняя Дакія і Ніжняя Дакія), а потым і на тры часткі: Параліскую Дакію, Апуленскую Дакію і Мальвенскую Дакію. Улада Рымскай імперыі захоўвалася ў Дакіі на працягу амаль двухсот гадоў, або роўна столькі часу, колькі мінула паміж узнікненнем першых англійскіх паселішчаў у Паўночнай Амерыцы і «Бостанскім чаяваннем». За няпоўныя два стагоддзі англійскія асаднікі ў Паўночнай Амерыцы практычна ператварыліся ў амерыканцаў. Прыкладна за такі самы прамежак часу перамяшанае насельніцтва Дакіі пачало адчуваць сябе раманскім, і такім чынам «пячатка Рыма» назаўжды пакінула свой след на поўнач ад Ніжняга Падунаўя.

5.3. Раманізацыя, або Пячатка Рыма.

Натуральна, што пасля двух дзесяцігоддзяў амаль пастаянных бітваў (86–106) і асабліва пасля двух цяжкіх войнаў (101–102; 105–106) Дакія была, як выказаўся адзін тагачасны гісторык, «выпатрашаная ад мужчын». Шмат якія дакі загінулі ў бітвах, а тыя нешматлікія, хто выжыў і аказаўся падпарадкаваным, былі вымушаныя супрацоўнічаць з рымлянамі. У іх не было іншага выйсця. Дый, апроч таго, рымская цывілізацыя выглядала прывабнай, рымскі лад жыцця ў параўнанні з дакскім прапаноўваў шмат выгодаў і быў лягчэйшым. З'яўляючыся бліскучымі заваёўнікамі, рымляне былі яшчэ лепшымі адміністратарамі, а як выбітныя адміністратары былі яшчэ лепшымі заканатворцамі. Пасля ўсякай заваёўнай вайны і анэксіі Рымам заваяваных земляў адбывалася ўсеагульнае замірэнне і схіленне мясцовага насельніцтва да супрацоўніцтва. Мясцовыя жыхары ўмелі апрацоўваць зямлю, ведалі, дзе знаходзяцца карысныя выкапні, крыніцы, урадлівыя глебы, таму іх працоўныя рукі карысталіся ў рымлян попытам. Паступова дакі пачалі суіснаваць з рымлянамі,

а з часам і жыць, як рымляне. Археолагі знайшлі больш за паўтары сотні паселішчаў і пахаванняў, у якіх сляды дзейнасці дакаў перамяшаныя з старажытнарымскімі, што сведчыць пра іх супольнае пражыванне. Дакаў пачалі ўключаць у склад дапаможных рымскіх ваенных злучэнняў, побач з уласнымі традыцыйнымі імёнамі яны пачалі насіць рымскія. Вядома, што пасля смерці Траяна дакі пару разоў, асабліва моцна ў 117 г., усчыналі паўстанні супраць рымскага ўладарства, але хутка яны былі ўлагоджаныя. Напружанасць у супольным жыцці паступова слабела, што вяло да ўсё большай інтэграцыі, асіміляцыі і раманізацыі насельніцтва.

Працэс раманізацыі, як было ўжо сказана, адбываўся практычна ва ўсіх частках Рымскай імперыі, але ў кожнай праходзіў па-свойму. У Дакіі раманізацыя азначала трансфармацыю ранейшай краіны і грамадства гета-дакскай супольнасці на ўзор старажытнарымскай. Вядома, раманізацыю можна было праводзіць, засяляючы падпарадкаваныя зямлі рымскім ці лацінамоўным насельніцтвам, прывозячы сюды тавары з імперыі, рымскія прылады працы, рымскія манеты, рымскае адзенне і г. д. Але гэта не азначае, што дакі былі б аўтаматычна раманізаваныя. Дакі маглі араць нарогам рымскага плуга, маглі карыстацца дасканалымі рымскімі керамічнымі вырабамі, будаваць жыллё, як старажытныя рымляне, але ўсё гэта не ператварала іх у рымлян. Калі сучасны румын п'е кока-колу і носіць аўтэнтычныя джынсы, гэта не значыць, што ён аўтаматычна становіцца амерыканцам. Для грунтоўнай, глыбіннай раманізацыі патрабавалася куды больш: дакі павінны былі пераняць мову, культуру, вераванні і звычаі пераможцаў, што з часам і адбылося. Менавіта такая, культурная і духоўная, раманізацыя стала ўрэшце незваротнай і цалкам перайначыла вобраз старажытнай Дакіі. Магчымасць ажыццявіцца гэтаму працэсу надалі як мінімум тры асноватворныя ўмовы, што мелі месца ў Дакіі:

- масавая і арганізаваная каланізацыя правінцыі рымлянамі ці іншымі лацінамоўным элементам;
- шчыльны кантакт паміж перасяленцамі і карэнным насельніцтвам у месцах сумеснага пражывання;
- відавочная перавага рымскай культуры і цывілізацыі над культурай і цывілізацыяй заваяванага народа, прычым гэтая пе-

равага павінна ўспрымацца навочна, бо ў адваротным выпадку ў насельніцтва заваяваных земляў не ўзнікне гатоўнасці і жадання пераймаць нормы жыцця больш развітай цывілізацыі.

Усе гэтыя ўмовы павінны быць выкананыя ў поўнай меры. У Грэцыі раманізацыі не адбылося, бо культура і цывілізацыя ў грэкаў былі болей развітыя, чым у старажытных рымлян, хоць Грэцыю рымляне заваявалі і ў ёй пасяліліся асаднікі, якія жылі супольна з карэнным насельніцтвам. У рымскай правінцыі Афрыка (Паўночная Афрыка) перавагі рымскай цывілізацыі адчувалася відавочна, і тут таксама з'явіліся рымскія каланісты, але яны жылі адасоблена ад мясцовага насельніцтва. А вось у старажытнай Дакіі якраз быў такі шчаслівы збег абставінаў, які меў месца і ў Італіі, Галіі, Іспаніі ды інш., дзе ўсе неабходныя патрабаванні для паспяховай раманізацыі аказаліся ў наяўнасці і супалі.

Раманізацыі спрыялі шматлікія чыннікі:

1. *Каланісты.* Пераважная большасць дакаў лёгка навучаліся лацінскай мове, якую яны засвойвалі ад шматлікіх яе носьбітаў, што прыязджалі на пасяленне ў Дакію. Рымская ўлада праводзіла ў Дакіі шырокую і арганізаваную каланізацыю, сюды прыбывалі жыхары «з усяго рымскага свету», якія пасяляліся ў гарадах і або займаліся земляробствам, або працавалі на рудніках. Рымляне заваявалі Дакію перадусім дзеля таго, каб завалодаць яе багаццямі, яе радовішчамі золата, срэбра, іншых карысных выкапняў, пакладамі солі і г. д. Яны мелі на мэце як мага шырэй скарыстацца гэтымі запасамі. Акрамя таго, носьбіты лацінскай мовы з шматлікіх правінцый ехалі з Дакію і неарганізавана, на свой страх і рызыку, бо іх вяла сюды мара ўзбагаціцца, галоўным чынам прага золата. Дакія была ў той час своеасаблівым «Эльдарада», нечым накшталт антычнае Каліфорніі. У выніку месца дакаў, што загінулі ў войнах, хутка займалі каланісты, колькасць якіх безупынна расла.

Рымскія каланісты

І гэта дазваляе сказаць, што раманізацыя Дакіі адбылася проста шляхам каланізацыі яе шматлікімі носьбітамі лацінскай мовы, якія прыбылі (у значнай меры і добраахвотна) з усёй Рымскай імперыі.

2. *Адміністрацыя.* Кіраванне Дакіяй рымляне наладзілі на свой узор, пачынаючы ад кіравання ўсёй правінцыяй і сканчваючы арганізацыяй жыцця ў самых дробных паселішчах. Рымскія службоўцы прысутнічалі паўсюдна. Яны пільна сачылі, каб дзе прымусам, дзе праз ужыванне сілы, а дзе праз увядзенне жорсткае дысцыпліны грамадства як мага лепш развівалася, як мага больш вырабляла і як мага больш бездакорна функцыянавала. З цягам часу і тая невялікая колькасць дакаў, якая перажыла войны, была вымушаная супрацоўнічаць з новай уладай, каб мець магчымасць вырашаць тыя ці іншыя жыццёвыя праблемы, а для гэтага ім трэба было авалодаць лацінскай мовай. Некаторыя дакі – дзеля захавання і ўмацавання свайго матэрыяльнага становішча ці сацыяльнага статусу, дый проста, каб далей развівацца, бо жыццё рухалася наперад, – нават паступалі да рымлян на дзяржаўную службу.

3. *Войска.* Магутнасць Старажытнага Рыма абумоўлівалася наяўнасцю ў яго добра арганізаванага войска, служба ў якім была часткай штодзённага жыцця рымскага народа. Шматлікія злучэнні рымскай арміі знаходзіліся на сталай аснове і ў Дакіі. Рымскае войска складалася з легіёнаў (рэгулярная армія, эліта) і дапаможных сіл. У легіёнах служылі выключна рымскія грамадзяне, а ў склад дапаможных ваенных злучэнняў (пехацінскіх, конных і змяшаных) дапускаліся і неграмадзяне. У адпаведнасці з дзейным на той час заканадаўствам (паводле рымскага права) не кожны чалавек, які жыў ці нават нарадзіўся ў Рымскай імперыі, аўтаматычна станавіўся рымскім грамадзянінам. Перш за ўсё, не мелі грамадзянства рабы, якіх звычайна называлі «рэчамі, што размаўляюць». Сярод жыхароў заваяваных правінцый таксама ніхто аўтаматычна не станавіўся рымскім грамадзянінам. Уступленне ў рымскае грамадзянства лічылася вельмі ганаровым, яго трэба было заслужыць спраўнай службай на карысць айчыны.

У Дакіі стаялі розныя легіёны, але толькі два размяшчаліся тут амаль увесь час і дзякуючы гэтаму цалкам інтэграваліся ў жыццё правінцыі: XIII Парны легіён (legio XIII Gemina) і V Македонскі легіён

(legio V Macedonica), чые штабы месціліся адпаведна ў Апулуме (цяпер горад Алба-Юлія) і Патаісе (цяпер горад Турда). Кожны легіён налічваў прыкладна 6000 ваяроў. Напачатку дакаў у легіёны не бралі, прыцягваючы іх толькі да службы ў даволі шматлікіх дапаможных частках. А ў цэлым рымская армія ў Дакіі на момант сваёй найвышэйшай магутнасці налічвала каля 40 000 ваяроў, што складала дзясятую частку ўсіх войскаў Рымскай імперыі, якая ў перыяд найбольшага росту сваёй тэрыторыі ўтрымлівала больш за 30 правінцый.

Зразумела, што на вайсковай службе паўсюдна выкарыстоўвалася лацінская мова – пачынаючы ад школ, дзе ваярам даваліся элементарныя веды, і заканчваючы самымі кароткімі камандамі, якія аддаваў дэкурыён (камандзір злучэння з 10 ваяроў). У такіх умовах любы дак, што адбываў вайсковую павіннасць у дапаможных частках, пасля 25 гадоў службы (а менавіта столькі служылі ў рымскай арміі) лёгка размаўляў па-лацінску і нават паводзіў сябе і думаў, як рымлянін.

Старых ваяроў, што пакідалі войска пасля адбыцця вайсковай павіннасці, называлі ветэранамі. Тыя, хто служыў у дапаможных частках, адразу пасля дэмабілізацыі набывалі рымскае грамадзянства, а таксама атрымлівалі афіцыйнае права на шлюб, грашовую ўзнагароду і дзялянку зямлі ў правінцыі, якую абаранялі. А тыя, хто і раней ужо быў грамадзянінам Рыма, карысталіся вялікай павагаю і займалі розныя грамадскія пасады. У Дакіі жыла такая вялікая колькасць ветэранаў, што азначэнне «мужчына ў гадах» і «стары ваяр» змяшаліся; вось жа слова *bătrân* у румынскай мове («пажылы мужчына, дзед») запазычана з лацінскага *veteranus* («стары баец, ветэран»). Усе тыя ветэраны размаўлялі на лацінскай мове і паўсюдна пашыралі яе вакол сябе.

4. *Гарады.* Шмат якія каланісты сяліліся ў вёсках, станавіліся гаспадарамі-латыфундыстамі і займаліся сельскай гаспадаркай, і ўсё ж пераважная іх большасць напаўняла гарады. У сельскай мясцовасці, перадусім у гарах і ў далінах, колькасць дакаў пераважала. Што да гарадоў, то ў грэка-рымскім іх выглядзе гарадоў у дараманскай Дакіі не было: іх ролю выконвалі некаторыя кірмашовыя селішчы (лац. *oppida* «маленькія мястэчкі») і крэпасці. Сапраўднае гарадское жыццё ў Дакію прынеслі рымляне. Гарады, якія яны засноўвалі, былі двух відаў. Буйнейшыя называліся калоніямі (*coloniae*) і ўяўлялі сабой не-



Рэканструкцыя галоўнай брамы рымскай крэпасці ў Паралісуме (жудэц Сэлаж)

шта накшталт Рыма ў мініяцюры, бо іх будавалі на вобраз і падабенства «вечнага горада» (напрыклад, Ульпія Траяна – сталіца правінцыі, Апулум, Напока, Драбета, Патаіса, Рамула ды інш.). Жылі ў калоніях выключна рымскія грамадзяне. Гарадское паселішча ніжэйшага рангу называлася муніцыпій (*municipium*). Гэта былі невялікія гарадкі, якія, аднак, карысталіся самакіраваннем (напрыклад, Д'ерна, сёння горад Оршава ў жудэцы, або павеце, Мехедынцы; Паралісум, сёння сяло Мойград-Паралісум у жудэцы Сэлáж; Тыбіскум, сёння сяло Жупа ў Банаце; Ампелум, сёння горад Златна ў Заходніх Румынскіх гарах, Апусэнях; Албурнус Маёр, сёння камуна Рошыя Мантанэ таксама ў Апусэнях, і інш.). Жылі ў муніцыпіях не толькі грамадзяне рымскай дзяржавы, але і неграмадзяне. Амаль усе назвы рымскіх гарадоў і паселішчаў у Дакіі і ў Мёзіі маюць фракійска-дакскае паходжанне – іначай кажучы іх назвы былі запазычаныя рымлянамі ў даўняга мясцовага насельніцтва. Толькі старажытнагрэцкія гарады-калоніі на ўзбярэжжы Чорнага мора захавалі сваю нацыянальную спецыфіку і за рымскім часам. Спачатку статус калоніі быў нададзены толькі сталіцы Дакскай правінцыі, але з цягам часу, з развіццём гарадскога жыцця і ўступленнем шматлікіх жыхароў правінцыі ў рымскае грамадзянства большасць муніцыпій падвысіліся да рангу гарадоў-калоній. Усё грамадскае жыццё ў гарадах, незалежна ад іх статусу, адбывалася на лацінскай мове.

5. *Рэлігія.* Народ вельмі няпроста адмаўляецца ад сваёй рэлігіі, бо часцяком яна разумеецца як прыкмета ягонай тоеснасці, як яго лад светаўспрымання. З палітыка-ваенных меркаванняў рымскімі

заваёўнікамі была ў значнай ступені разбураная не толькі сталіца незалежнай Дакіі, але і галоўнае свяцілішча дакаў, іх рэлігійны цэнтр, што размяшчаўся тамсама, на вышыні 1200 м. Паўсюль – у гарадах і вёсках, у палях, ваенных лагерах і г. д. – рымляне замянілі мясцовых багоў уласнымі і ўзвялі прысвечаныя ім храмы, у якіх служылі прысланыя з Рыма жрацы. Пэўны час дакі ўсё яшчэ пакланяліся свайму вярхоўнаму богу Залмоксу і іншым боствам свайго пантэона, але паступова пачалі прыстасоўвацца да афіцыйна прынятага рымскага рэлігійнага культу. Перш за ўсё гэта рабілі тыя, хто імкнуўся спадабацца новым гаспадарам: яны пачалі шанаваць і рымскіх, і іншых багоў, бо рэлігійныя культы ў Рымскай імперыі былі вельмі разнастайныя. Новымі багамі ў Дакіі сталі Юпітэр, Юнона, Мінерва, Венера, Апалон, Лібер і Ліберыя, Дыяна і г. д. За бога лічыўся і дзейны імператар, а таксама асобныя яго папярэднікі, пачынаючы з Актавіяна Аўгуста. Пакланенне імператару лічылася грамадскім абавязкам. Усе рэлігійныя цырымоніі адбываліся на лацінскай мове. Асобныя старажытнарымскія сімвалы – напрыклад, культ ваўчыцы і братоў-двайнят Ромула і Рэма – пераймаліся дакамі досыць лёгка і хутка, бо ўшанаванне ваўка адыгрывала значную ролю і ў дакскай міфалогіі. Галоўным элементам на дакскім сцягу была воўчая галава. Асобныя дакі, несумненна, па-ранейшаму пакланяліся Залмоксу і Бендыдзе, але былыя традыцыйныя багі атрымлівалі рымскія імёны. Гэты феномен, які назіраўся і ў іншых рымскіх правінцыях, прынята называць *interpretatio romana* (атаясамліванне рымскіх багоў з мясцовымі).

6. *Эканамічнае жыццё.* Пасля заваявання Дакіі рымлянамі ўся бягучая эканамічная дзейнасць пачала рэгулявацца новымі гаспадарамі. На дакскую тэрыторыю пашырылася рымская сістэма рабаўладання, і ўсё эканамічнае жыццё пачало ажыццяўляцца на той самы ўзор, што і ў іншых правінцыях Імперыі. Сельская гаспадарка, здабыча горных мінералаў і солі, выплаўка жалеза і каштоўных металаў, апрацоўка мармуру, выраб высакаякаснай ганчарнай прадукцыі і г. д. – усё знаходзілася пад кантролем рымскіх уладаў. Дакскія тубыльцы працавалі разам з выхадцамі з Рыма ці іншых лацінамоўных правінцый, уваходзілі з імі ў адны цэхі (аб'яднанні людзей паводле прыналежнасці да аднолькавага рамяства, сацыяльнага стану і нават

рэлігіі) і мелі кантакт з тымі самымі дзяржаўнымі функцыянерамі, якія размаўлялі выключна на лацінскай мове.

7. *Права.* Рымляне былі выдатнымі законнікамі. Класічныя нарматыўныя палажэнні рымскага права спрыялі трываламу і бездакорнаму функцыянаванню дзяржавы, вырашэнне ўсіх прыватных і крымінальных справаў адбывалася паводле прынцыпаў справядлівасці і бесстароннасці. Антоніеў указ 212 г. н. э., вядомы як эдыкт Каракалы, надаў рымскае грамадзянства практычна ўсім свабодным жыхарам Рымскай імперыі. Згодна з гэтым указам і ўсё насельніцтва правінцый Дакія і Мёзія з юрыдычнага пункту погляду ператварала-ся ў паўнапраўных рымлян. І кожны жыхар гэтых тэрыторый, калі ён звяртаўся ў суд, вымушаны быў рабіць гэта на лацінскай мове, на якой былі выкладзеныя ўсе палажэнні рымскага права.



Марк Аўрэлій Антоній, вядомы як Каракала

8. *Адукацыя.* На тэрыторыях, што ўключаліся ў склад імперыі, Рым імкнуўся ўвесці сваю культуру, і яе засваенне пачыналася з адукацыі. Знойдзены шматлікія сведчанні функцыянавання пачатковых школ для дзяцей і моладзі і нават школ для вайскоўцаў у ваенных лагерах (кашарах). Праз вельмі кароткі час пасля заваявання Дакіі дзеці, перш за ўсё ў гарадах, пачалі арганізавана вывучаць лацінскую мову, а разам з лацінай без асаблівага намагання засвойвалі і рымскія духоўныя каштоўнасці. На сённяшні час на тэрыторыі Дакіі і ў Дабруджы (частцы Мёзіі) археолагамі знойдзена каля 4000 надпісаў на лацінскай мове – ад надмагільных камянёў да васковых таблічак, – якія ў сваёй большасці былі зробленыя ў часавым інтэрвале ў дзве сотні гадоў. Гэты факт, разам з тым, што адбывалася ў іншых рымскіх правінцыях, даказвае, што рымская традыцыя наносіць надпісы была вельмі пашыраная і што грамата, уменне пісаць і чытаць, моцна шанавалася, а гэта, у сваю чаргу, спрыяла хуткай раманізацыі. У гарадах Дакіі і Мёзіі

існавалі грамадскія плошчы, якія называліся форумамі, дзе, як і ў Рыме, грамадзяне слухалі прамоўцаў, паэтаў, палітыкаў. Такім чынам слухачы, пераважна плебеі, мелі магчымасць знаёміцца з рымскімі каштоўнасцямі, ацэньваць і лёгка засвойваць іх.

Дака-рымскае сямейнае надмагілле, I ст. н. э. Аюд, жудэц Алба

У выніку на працягу ўсяго некалькіх пакаленняў знаходжання пад рымскай уладай гета-дака-фракійцы былі цалкам і канчаткова раманізаваныя. У іх былі ўсе падставы хацець стаць сапраўднымі рымлянамі, бо, жывучы ў сферы ўплыву самай развітай тагачаснай цывілізацыяй, яны маглі карыстацца перавагамі адной з самых высокіх культур. Пасля Дэцэбалавай смерці і канчатковага зацвярджэння рымскай улады ад Карпатаў да Дуная падпарадкаваныя дакі ўсвядомілі, што асіміляцыя дорыць ім шанец і ім выгадна пераняць рымскі лад жыцця, а галоўнае – авалодаць лацінскаю мовай. Нешта падобнае адбывалася і з эмігрантамі з Румыніі ў Амерыку ў перыяд паміж дзвюма сусветнымі войнамі. Прыбываючы ў Новы свет, такі эмігрант часцей за ўсё не ведаў англійскай мовы, але на працягу некалькіх гадоў больш-менш яе вывучаў і ўрэшце, няхай з акцэнтам, пачынаў на ёй размаўляць, часам з настальгіяй усё яшчэ ўспамінаючы былыя каштоўнасці, сваякоў і сяброў, пакінутых на Радзіме. Ён ніколі так і не ператвараўся ў сапраўднага амерыканца, у ім кожны мог лёгка пазнаць нядаўняга эмігранта. Аднак яго дзеці гаварылі па-англійску ўжо без акцэнту, былі цалкам асіміляваныя, жылі і думалі як сапраўдныя амерыканцы, якія, па сутнасці, усе – эмігранты з розных частак свету (за выключэннем амерыканскіх індзейцаў). Гэтак сама не выклікае сумнення (і гістарычныя крыніцы гэта цалкам пацвярджаюць), што і дакі, трапіўшы ў склад Рымскай імперыі, мелі ўсе падставы цягам двух-трох пакаленняў цалкам раманізавацца. Да гэтага яшчэ трэба дадаць,

што мясцовага насельніцтва ў правінцыі Дакія засталося няшмат, ва ўсякім разе новапрыбылыя, каланісты, чыноўнікі, вайскоўцы і г. д. паводле колькасці значна пераважалі, і ўсе яны былі на службе ў Рымскай імперыі ды размаўлялі на народнай лаціне.

У сярэдзіне III ст. Рымскую імперыю ахапіў глыбокі крызіс, выкліканы неэфектыўным кіраваннем, крахам эканамічнай сістэмы, разбурэннем традыцыйных рымскіх маральных каштоўнасцяў, вонкавым ціскам і набегамі варварскіх плямёнаў і г. д. У гэтых умовах утрымліваць Дакію ў складзе імперыі рабілася ўсё болей складаным. Урэшце паміж 271 і 274 гг. паводле рашэння імператара Аўрэліяна рымскія войскі, адміністрацыя, высокае чыноўніцтва і арыстакратыя – іншымі словамі, усе тыя, хто ўвасабляў сабой рымскую ўладу, – былі выведзеныя на поўдзень ад Дуная. Натуральна, што большая частка насельніцтва засталася на месцы – у вёсках і гарадах, дзе яно і жыло.

5.4. Стасункі паміж дака-рымлянамі (протарумынамі) і качэўнікамі. Працяг раманізацыі

Каля 300 г. у рымскай Дакіі жыло, па ацэнках спецыялістаў, ад 500 тыс. да 1 млн чалавек. Нават калі б Рым і меў жаданне перасяліць іх усіх на поўдзень ад Дуная, ажыццявіць гэта ў яго не было ніякай магчымасці. Перамясціць такую колькасць насельніцтва за кароткі адрэзак часу не здолеў бы ніводзін урад і сёння. Зрэшты, дака-рымляне і самі не мелі намеру рушыць да чужых краёў, дзе ім нічога не належала і дзе жылі іншыя людзі. Тым не менш імператар Аўрэліян, жадаючы пазбегнуць папрокаў, што імперыя пры ім паменшала колькасцю сваіх правінцый, фармальна стварыў з прадстаўнікоў улады і іншых жыхароў, што былі пераселеныя з Дакіі, створанай імператарам Траянам, сваю Дакію – на поўдзень ад Дуная паміж дзвюма Мёзіямі (у заходняй частцы цяперашняй Балгарыі і ўсходняй частцы Сербіі). Што да раманізаванага насельніцтва, якое засталося на поўнач ад Дуная, то яно па-ранейшаму мірна жыло і працавала, ужо не чакаючы прыходу рымскіх зборшчыкаў падаткаў, а набегі качэўнікаў былі яшчэ не надта спусташальнымі. Археалагічныя і гістарычныя даследаванні паказваюць, што рымскі лад жыцця

захаваўся ў старажытнай Дакіі і пасля 275 г.: тут па-ранейшаму карысталіся лацінскаю мовай (у тым ліку на пісьме), хадзілі рымскія манеты, існавалі заснаваныя рымлянамі паселішчы, усё большую колькасць прыхільнікаў заваёўвала хрысціянства. Сведчанні гэтага найчасцей знаходзяцца ў Трансільваніі і ў Банаце. Вось адзін характэрны прыклад: у паселішчы Б'ертан (жудэц Сібіў), што ў цэнтры Трансільваніі, зафіксавана існаванне пасля 300 г. лацінамоўнай хрысціянскай абшчыны. У царкве гэтай сельскай камуны маецца кандэлябр, падораны нейкім Зіновіем, відавочна, чалавекам дастаткова адукаваным, на якім па-лацінску пазначана: «Я, Зіновій, раблю гэты дарунак», – і побач стаіць манаграма Ісуса Хрыста ў выглядзе дзвюх грэцкіх літар: ХР. А лацінамоўную хрысціянскую суполку ў цэнтры старажытнай Дакіі ў той час маглі складаць толькі дака-рымляне.

У Дабруджы, паміж Дунаем і Балканамі, і нават на поўдні Мунтэніі, Алтэніі і Баната рымская ўлада панавала аж да 600 г., будучы асабліва моцнаю ў часы ўладарання імператараў Канстанціна Вялікага (IV ст.) і Юстыніяна (VI ст.). Аднак у большай частцы Траянавай Дакіі рымскія армія і адміністрацыя з канца III ст. ужо адсутнічалі. Гэта стала прычынай узмацнення стасункаў і супрацоўніцтва паміж дака-рымлянамі і свабоднымі дакамі з Крышаны, Марамурэша і Малдовы. Свабодныя дакі адчувалі на сабе моцны ўплыў рымскай цывілізацыі ўжо і ў II ст. н. э. А пачынаючы прыкладна з 300 г., калі мяжа паміж імі зноўку знікла, нямала свабодных дакаў пачалі пераязджаць і сяліцца ў былой рымскай правінцыі, і, наадварот, шматлікія лацінамоўныя дакі пачалі ездзіць з мэтамі гандлю ў землі свабодных дакаў і таксама сяліцца сярод іх. Раманізацыя такім чынам працягвалася, усё больш пашыраючыся на не захопленыя рымлянамі тэрыторыі, дзе жылі гета-дакі. Зыходзячы з даўняга свайго ядра – заснаванай Траянам правінцыі Дакіі, – раманізацыя на працягу некалькіх стагоддзяў безупынна пашыралася на захад, на поўнач і асабліва на ўсход. Сёння дакладна вядома, што ў прыдунайскіх правінцыях, у т. л. Дакіі, першыя хрысціяне існавалі яшчэ з II і III ст. Але калі падчас рымскага панавання хрысціянства ў Дакіі не магло развівацца свабодна, то пасля 274 г. ніякіх перашкодаў яго паступоваму зацвярджэнню ўжо не было. Новы імпульс распаўсюджванню слова Божага з тэрыторый на поўдзень ад Дуная надаў той факт, што ў 313 г.

Імператар Канстанцін Вялікі

рымскі імператар Канстанцін Вялікі абвясціў хрысціянства афіцыйнай рэлігіяй на ўсім абшары імперыі. Для многіх дака-рымлян хрысціянізацыя прыходзіла разам з лацінскай мовай. І паколькі спадкаемцамі фрака-дака-рымлян з'яўляюцца сённяшнія румыны, то і асноўныя хрысціянскія тэрміны ў сучаснай румынскай мове маюць лацінскае паходжанне. Праз пашырэнне Божага слова працэс раманізацыі толькі ўзмацніўся. Пасля 274 г. свабодныя дакі паступова прынялі не толькі хрысціянства, але разам з ім і лацінскую мову, ператварыўшыся ў лацінамоўнае насельніцтва. Працэс раманізацыі, зрэшты, адбываўся не заўсёды лёгка і не быў пазбаўлены складанасцяў, звязаных, галоўным чынам, з набегамі варвараў ці качэўнікаў.

Прывабленыя спакусамі Рымскай імперыі з яе старой і новай сталіцамі (Рымам і Канстанцінопалем), качэўнікі прыходзілі з усходу і паўночнага ўсходу. Перш чым дабрацца да самага сэрца імперыі (калі яны ўвогуле яго дасягалі), яны жылі пераважна рабункамі, несучы шкоду аселым народам, што трапляліся ў іх на шляху. Дакія і Мёзія былі для варвараў ласымі кавалкамі. З 350-га па 600 год цераз Дакію пракаціліся хвалі нашэсцяў готаў, гунаў, гепідаў, аваравў. Як правіла, сярод дака-рымлян і протарумынаў качэўнікі не сяліліся, а калі такое здаралася, то яны хутка асімілявaліся лацінамоўным насельніцтвам. Тым не менш, дака-рымляне былі вымушаныя на працягу больш як стагоддзя пасля таго, як Аўрэліян пакінуў Дакію, супрацьстаяць спусташальным набегам качэўнікаў і змагацца за сваё фізічнае выжыванне. Яны цалкам пакінулі былыя антычныя гарады, абнесеныя мурамі, бо менавіта іх варвары адразу заўважалі і ў першую чаргу рабавалі. Паступова з іх памяці нават зніклі дака-раманскія назвы

гэтых гарадоў. Жыхары пакідалі адкрытыя тэрыторыі, якія можна было лёгка атакаваць, і засноўвалі непадалёк ад ранейшых новыя паселішчы, але ў месцах лепш абароненых і меней прыкметных. Дзе такія месцы можна было знайсці? Не толькі ў гарах і лагчынах, дзе шматлікаму насельніцтву не было б як размясціцца, але і ў пушчах, гаях, на лясных палянах. Лес у той час займаў больш за 70% тэрыторыі сучаснай Румыніі, а гэта значыць, што лясамі былі зарослыя і раўніны. Качэўнікі, людзі стэпаў, адкрытых прастораў, як правіла, асцерагаліся лясоў і горных абшараў, бо гэтыя месцы было складана кантраляваць, тут можна было лёгка стаць ахвярай нападу з засады. Таму, нягледзячы на шматлікія варожыя нашэсці, мясцовыя лацінамоўныя жыхары, а пазней і румыны, здолелі ў значнай меры захаваць сваю нацыянальную тоеснасць. Выстаяць ім дапамог лес, які паслужыў надзейнаю абаронай. Магчыма, з тых часоў і пайшла вядомая ўсім румынам прымаўка: «лес румыну брат».

У VI–VII стст. з усходніх стэпаў хлынулі шматлікія славянскія плямёны. Яны прыходзілі дзеля рабункаў, але, займаючыся таксама прымітыўным земляробствам, шукалі і новыя ўрадлівыя землі з надзеяй асесці на іх. Пасля 602 г. значная колькасць славян перайшла цераз Дунай, рушыла на поўдзень і запоўніла Балканскі паўвостраў, адкуль неаднаразова рабіла напады на Візантыю. З цягам часу славяне стала аселі на поўдзень ад Дуная, сфарміраваўшы такія славянскія народы, як балгары і сербы. Што да фрака-дака-рымлян, якія жылі паміж Балканамі і Дунаем, то яны паступова ператварыліся ў протарумынаў, але іх развіццё было вельмі няроўным і неспакойным: у некаторых раёнах прышлыя славяне пачалі іх колькасна перавышаць; яны забіралі ў іх лепшыя глебы і прымушалі шукаць прытулак на іншых зем-

Германскія седлавыя лямпы, V ст. Апахіда, жудэц Клуж

лях на поўначы, на поўдні ці на паўднёвым захадзе, дзе яны сяліліся пераважна ў гарах, у далінах рэк і ў нізінах. Значная колькасць протарумынаў на поўдзень ад Дуная паступова славянізавалася. А вось на поўначы ад Дуная сітуацыя была іншая. Аселыя тут славяне колькасна значна саступалі дака-рымлянам (протарумынам) і, пражываючы з імі побач на працягу некалькіх стагоддзяў, паступова самі асіміляваліся пад іх уплывам. Зрэшты, і славяне падчас сумеснага пражывання паўплывалі на жыццё мясцовага лацінамоўнага насельніцтва, пакінуўшы некаторыя свае этнічныя прыкметы ў вонкавым выглядзе румынаў і пэўную колькасць славянскай лексікі ў румынскай мове.

5.5. Дунайская, карпацкая і прычарнаморская лаціна: румынская мова

Лінгвісты кажуць, што румынская мова – гэта размоўная лаціна, якою сёння карыстаюцца ў сваіх зносінах румыны, ці то лаціна ў тым перайначаным выглядзе, які яна набыла на працягу стагоддзяў на тэрыторыі Дакіі і Мёзіі пасля таго, як Рым пакінуў на іх свой глыбокі след. Тое самае можна сказаць і пра італьянскую ці французскую мовы, якія сталі варыянтамі размоўнай лаціны ў тым выглядзе, у якім яна атрымала развіццё ў Італіі і, адпаведна, у старажытнай Галіі. Базавы слоўнікавы склад румынскай мовы мае ў асноўным лацінскае паходжанне. Будучы ўспадкаваным пераважна з антычных часоў, ён перажыў натуральную эвалюцыю, якая адбывалася паралельна са станаўленнем румынскага народа, які стварaў сваю мову. Любая мова падобная да жывога арганізма, што нараджаецца, расце, развіваецца і памірае разам з народам, якому аддана служыць як сродак зносін. Пра лацінскае паходжанне румынскай мовы існуюць шматлікія сведчанні, якія ўзыходзяць яшчэ да часоў Сярэднявечча. Адно з самых выразных належыць сакратару вугорскага караля Матэя (Мацьяша) Корвіна (1458–1490) італьянскаму гуманісту Антоніа Банфіні (нар. 1434), добраму знаўцу цэнтральнаеўрапейскіх народаў і, у прыватнасці, румынаў: «*І вось жа, румыны паходзяць ад старажытных рымлян, пра што ад антычных часоў і дагэтуль сведчыць іхняя гаворка, якая, хоць і знаходзіцца ў атачэнні размаітых*

варварскіх народаў, тым не менш не змянілася і ўстояла... Так што сваё паходжанне румыны вядуць ад рымскіх легіёнаў і селішчаў, заснаваных у Дакіі Траянам ды іншымі рымскімі імператарамі... І хоць Дакія і румынскі народ гэтак сама, як і гоцкія землі ў Панонії, неаднакроць цярпелі ад нашэсця варвараў, аднак і яны не здолелі знішчыць вынікі ўплыву рымскіх легіёнаў і паселішчаў, якія атрымалі тут хуткае развіццё за кароткі час. Вытрываўшы ўсе хвалі варварскае навалы, румынская мова па-ранейшаму гучыць на гэтай зямлі, і каб яе не страціць, румыны заўсёды біліся з такою зацятасцю, быццам змагаліся не так за сваё жыццё, як за сваю мову» (Rerum Ungaricarum decades quatuor cum dimidia. – Basel, 1568. – P. 304–305, 542). Як мы бачым, і ў часы Сярэднявечча, і ў перыяд Адраджэння жыла ўпэўненасць, што румыны захавалі ўласныя сваяцкія повязі з Рымам дзякуючы мове.

Рымскія каланісты, легіянеры, дробныя чыноўнікі, адміністрацыйнае кіраўніцтва і інш. неслі з сабой у Мёзію і Дакію не літаратурную лаціну, не правільна ўпарадкаваную мову з нарматыўнымі граматычнымі правіламі, – г. зн. не мову Цэзара, Цыцэрона або Ціта Лівія, – яны прыязджалі, размаўляючы на народнай лаціне і яе мясцовых гаворках, якімі карысталіся штодзённа. І пераважная большасць дака-фракійцаў засвоіла менавіта гэтую лаціну «простага люду» са шматлікімі тэрмінамі вулічнага жаргону і будзённага жыцця. Перасяленцы прыбывалі з розных рымскіх правінцый, у тым ліку з Італіі, і кожны ўносіў гутарковыя «інавацыі» свайго рэгіёна ў лацінскую гаворку на новым месцы жыхарства ў Дакіі і Мёзіі. Потым гэтая лаціна яшчэ больш мянялася пад уплывам розных мясцовых асаблівасцяў, у прыватнасці, дакска-фракійскіх, бо, як мы бачылі, побач з рымскімі каланістамі жыла і некаторая частка аўтахтоннага насельніцтва, ацалелага пасля яго заваявання Рымам. Праз некалькіх стагоддзяў суіснавання і ўзаемаўплыву рымляне ўжо больш не былі ранейшымі рымлянамі, а дакі – дакамі, яны змяшаліся, а пераможцам стала перайначаная лаціна. Гэта была новая лацінская мова, якая адрознівалася ад класічнай. Прыкладна так моўная эвалюцыя адбылася і далей: з пачатковага варыянту лацінскай мовы, які быў, па-сутнасці, народнай лацінай, або вульгатай, паступова ўтварыўся новы варыянт лацінскай мовы, які ўжо і стаў уласна румынскаю

мовай. Трэба адзначыць, што прыкладна 160–170 слоў у румынскай мове маюць фракійска-дакскае паходжанне, складаючы каля 3% з амаль 5000 слоў асноўнага слоўнікавага фонду. Пазней, галоўным чынам паміж VII і VIII стагоддзямі, калі фарміраванне румынскага народа ўжо набліжалася да свайго завяршэння, у слоўнікавы склад новаўтворанай румынскай мовы праніклі шматлікія словы славянскага паходжання, якія былі адаптаваныя ў адпаведнасці з правіламі лацінскай граматыкі. Яшчэ пазней румынская мова ўзбагацілася і словамі з моваў іншых народаў і народнасцяў, з якімі румыны пражывалі сумесна (словамі цюркскага, вугорскага паходжання і г. д.) Але паводле ўсіх асноўных паказчыкаў сваёй моўнай сістэмы (у лексіцы, марфалогіі, сінтаксісе) румынская мова застаецца новалацінскай, раманскай мовай.

5.6. Падсумаванне: калі, дзе і як румыны ўтварыліся як народ

Як і ўсе астатнія раманскія народы, румынскі фарміраваўся на працягу доўгага перыяду, пачынаючы ад падпарадкавання рымлянамі тэрыторый ніжняга Падунаўя і заканчваючы VIII–IX стст. Месцам яго фарміравання стала шырокая прастора на поўнач і на поўдзень ад ракі Дунай, а менавіта: Рымская Дакія, зямлі свабодных дакаў, Мёзія і некаторыя іншыя суседнія рэгіёны.

Легіянер часоў імператара Аўрэліяна (рэканструкцыя)

Вось так на акрэсленай вышэй прасторы і ў акрэслены вышэй прамежак часу ў цэнтры і на паўднёвым усходзе Еўропы сфарміраваліся новы народ і новая мова. Румынскі народ стаў сінтэзам двух этнічных элементаў: аўтахтоннага, фракійска-дакска-гецкага, і прышлага, рымскага, які быў прынесены заваёўнікамі і, з'яўляючыся мацнейшым, перамог

у этнагенезе румынаў. Працэс фарміравання румынскага народа і яго мовы называецца раманізацыяй і мае на ўвазе паступовае засваенне мясцовым насельніцтвам лацінскай мовы, рымскіх звычаяў і вераванняў. Да канца VI ст. галоўным цэнтрам раманізацыі дака-фракійцаў былі рымскія правінцыі Верхняя і Ніжняя Мёзіі, але нашэсце славян ды іх рассяленне на поўдзень ад Дуная прывялі да таго, што асяродак раманізацыі ў прыдунайскім рэгіёне захаваўся толькі ў былой Траянавай Дакіі і на суседніх з ёю землях. Славяне сталі трэцім этнічным элементам, які адыграў прыкметную, хоць і другасную, ролю ў этнагенезе румынаў, падключыўшыся ўжо на пазнейшым этапе, калі фарміраванне румынскага народа знаходзілася на завяршальнай стадыі. Роля славян у гэтым працэсе была прыкладна такая, як роля германцаў у фарміраванні раманскіх народаў на захадзе і поўдні Еўропы. Такім чынам, у VIII ст., калі фарміраванне румынскага народа падыходзіла да завяршэння і асноўны цэнтр этнагенезу румынаў змясціўся на поўнач ад Дуная, тут пачалася асіміляцыя старажытных славян, якая прадоўжылася амаль да XII–XIII стагоддзя. А вось на поўдзень ад Дуная, дзе славяне былі болей шматлікія і згуртаваныя, раманскае насельніцтва (протарумыны), наадварот, было або адціснутае на поўнач, поўдзень і захад, або, у сваю чаргу, зазнала доўгі працэс славянізацыі. У сувязі з гэтымі акалічнасцямі, калі на поўнач ад Дуная і ў Дабруджы румынскі народ паўстаў і ў часы Сярэднявечча канчаткова сцвердзіў сябе як асобная нацыя, то на поўдзень ад найбуйнейшай ракі Еўропы, на Балканах, утварылася некалькі групаў этнічных адгалінаванняў румынаў – арумыны (або македонарумыны), мегленарумыны (або мегленіты) і істрарумыны (або істраўскія ўлахі). Іх колькасць складае сёння некалькі сотняў тысяч, яны гавораць на трох розных дыялектах румынскай мовы, у той час як у Румыніі і Рэспубліцы Малдова гучыць уласна румынская мова, якую часам называюць яшчэ дака-раманскай і якая з'яўляецца

Бронзавы каганец з крыжам, с. Лучу, жудэц Яламіца

Залатыя кулоны-крыжыкі, Істрыя

роднай прыкладна для дваццаці чатырох мільёнаў чалавек (калі не лічыць румынскую дыяспару).

Такім чынам, румынскі народ, як і астатнія раманскія народы, сфарміраваўся на аснове двух галоўных этнічных элементаў, а менавіта: мясцовага аўтахтоннага (фракійскага-дака-гецкага) і прышлага пераможнага (рымляне), у сінтэзе якіх апошні, лацінскі, перамог. Да іх дадаўся яшчэ і трэці этнічны элемент – качэўнікі, старажытныя славяне, – які, аднак, не мог істотна змяніць раманскага паходжання румынаў. Сёння немагчыма сказаць, якім, з пункту погляду біялогіі, быў лёс кожнага з гэтых элементаў у фарміраванні румынаў як народа, аднак безумоўным з'яўляецца факт, што ў духоўным і моўным планах пераможцам аказаўся менавіта раманскі элемент. Яго перамога, несумненна, стала магчымай дзякуючы велізарнай колькасці лацінамоўных каланістаў, якія прыбылі ці былі прывезеныя ў Дакію. Паступовае пераўтварэнне фрака-дака-гетаў і рымлян (як і іншых этнічных элементаў, асіміляваных у працэсе этнагенезу) у протарумынаў, а пазней у румынаў, адбывалася цягам сямі-васьмі стагоддзяў I тысячагоддзя н. э. на шырокіх прасторах ніжняга Падунаўя, сфакусаваўшыся ў VII–VIII стст. на тэрыторыі на поўнач ад Дуная, дзе раманскі элемент перамог, устояўшы і перад нашэсцем качэўнікаў. У выніку румыны – самы шматлікі народ Паўднёва-Усходняй Еўропы – фарміраваліся *не толькі* да поўнач ці *не толькі* на поўдзень ад Дуная, але з абодвух бакоў гэтай ракі, якая стала бар'ерам паміж лацінамоўнымі народамі толькі пасля пазнейшага ўтварэння славянскіх дзяржаў. Сам па сабе Дунай не быў для румынаў і іхніх продкаў перашкодай, якая не дазваляла б ім паасобку ці групамі перапраўляцца з аднаго берага на другі і з тых ці іншых прычын сяліцца на поўнач ці на поўдзень ад гэтай ракі, але ўсе румыны ніколі не перасяляліся з паўднёвага Падунаўя на поўнач ці ў адваротным кірунку, бо не мелі дзеля гэтага ні магчымасці, ні патрэбы. Нават з чыста практычнага гледзішча здзейсніць такое масавае перасяленне было б немагчымым, і ніводзін раманскі народ яго не ажыццяўляў.

Як мы маглі ўбачыць, шмат у якіх аспектах румыны падобныя да астатніх раманскіх народаў. Аднак заходнія народы раманскага паходжання месцяцца ў адным супольным геаграфічным арэале,



Пашырэнне чатырох дыялектаў румынскай мовы

яны заўсёды былі суседзямі, а таму жылі й развіваліся разам. І яны ўзаемаўплывалі адзін на аднаго. Румыны ж – адзіны раманскі народ на ўсходзе былой Рымскай дзяржавы. Іх суседзі – гэта ўсё нелацінамоўныя народы, перадусім славянскія: сённяшнія балгары, сербы, украінцы, рускія, палякі, славенцы, – а таксама венгры. Падобнай была сітуацыя і ў Сярэднявеччы, калі суседзямі румынаў былі нераманскія народы. Таму шмат якія гісторыкі і лінгвісты называлі румынаў гістарычным «цудам» ці «загадкаю» – не так у сувязі з іх этнагенезам, як з той прычыны, што яны як раманскі этнас выжылі ў «славянскім моры», устояўшы перад шматлікімі наваламі качэўнікаў і захопнікаў. Паглядзім, як гэта сталася магчымым.

У выніку нацыяналістычных перакосаў у заключны перыяд панавання камуністычнага рэжыму ў Румыніі і рамантычнай гіпербалізацыі некаторых гістарычных фактаў у эпоху адбудовы нацыянальнай румынскай дзяржавы пасля 1989 года некаторыя публіцысты, карыстаючыся свабодай слова, у сваім памкненні «раз-

вянчаць падставовыя міфы аб утварэнні румынаў» заяўлялі, напрыклад, наступнае: дакі і геты былі нібыта двума цалкам рознымі плямёнамі; пад пытанне ставіўся факт, што румынскі народ узнік у выніку ўплыву рымскай цывілізацыі; раманізацыя была нібыта павярхоўнай; качэўнікі (готы, гуны, гепіды, авары і асабліва славяне) як складовая частка этнагенезу румынаў нібыта адыгралі ў ім вельмі вялікую ролю і да т. п. Усё, чаго румынская гістарычная навука дасягнула на працягу двух стагоддзяў, разглядаліся выключна скрозь прызму нацыяналізму, сцвярджалася, што знакамітыя румынскія гісторыкі толькі і думалі, што апісваць мінулае, падбіраючы адпаведныя «крыніцы» у падтрымку сваіх нацыяналістычных інтарэсаў. Акрамя такіх «санітараў», што хацелі б вычысціць еўрапейскі вектар нашай гісторыі, узнікла таксама нямала аматараў, якія, не маючы неабходнай прафесійнай падрыхтоўкі, сканцэнтравалі ўсю сваю ўвагу на дакскім субстраце і фракаманіі. Пачалі арганізоўвацца «кангрэсы па фраказнаўстве» ці «даказнаўстве» (з разгляданнем разнастайных «табліц», «кодаў», «таемных знакаў»), пішуцца артыкулы, кнігі-«адкрыцці», рассылаюцца інтэрнэт-паведамленні, у якіх румынаў спрабуюць пераканаць, нібыта яны не маюць нічога агульнага са старажытнымі рымлянамі, з лацінскаю моваю, з іншымі раманскімі народамі. Нядаўна ў вялікай кнігарні буйнога ўніверсітэцкага цэнтра мне нават давялося бачыць цэлую вітрыну з дзясяткамі «гістарычных кніг», аб'яднаных пад бяздумнаю назвай «Не мы ад рымлян, а рымляне ад нас!» Ідэя кніжнай «выставы» палягала ў тым, што, маўляў, не дакі былі раманізаваныя, а якраз самі рымляне навучыліся лацінскай мове ад гета-дака-фракійцаў – самага шматлікага і найбольш развітога народа ў свеце! У выніку падобных скрайнасцяў, якія або ўвогуле ўсё адпрэчваюць, або даводзяць да пантагруэлічных маштабаў, шараговы румын аказваецца збітым з панталыку і, натуральна, пытаецца, дзе ж гістарычная праўда і чым займаюцца спецыялісты-гісторыкі.

Што да прафесійных гісторыкаў, то яны імкнуцца разабрацца ў хітрым суплёце падзей мінулага з найбольшай дакладнасцю, з выкарыстаннем адмысловага навуковага інструментарыя і ўзважанага падыходу пры вывучэнні ўсіх наяўных крыніц, без чаго дайсці да гістарычнай праўды немагчыма.

6. Свет Сярэднявечча

Эпоха Сярэднявечча ў румынскай гісторыі ахоплівае перыяд даўжынёю амаль у тысячу гадоў, пачынаючы ад VI–VII стст., калі румыны як народ і іх мова ўступілі ў заключны этап свайго фарміравання, і прыкладна па 1600 год, калі ўсё болей прыкметна пачалі выяўляць сябе элементы сучаснай эпохі. На працягу гэтага доўгага перыяду румыны занялі сваё месца ў шэрагу еўрапейскіх нацый, стварылі свае сярэднявечныя дзяржавы, здолелі стрымаць новую хвалю знешняй агрэсіі і захаваць тэрыторыю свайго пражывання; яны паставілі разам са сваімі суседзямі заслон турэцка-асманскаму ўварванню ў Цэнтральную і Заходнюю Еўропу, яны адкрывалі ў гэты час новыя ўстановы, займаліся апрацоўкай зямлі і гадоўляй жывёлы, здабывалі карысныя выкапні, узводзілі будынкі і цэрквы, пісалі кнігі, у якіх услаўлялі Бога, – адным словам, жылі. Разам з тым, дзякуючы допісам разнастайных неспецыялістаў, пра гэтую эпоху



Карта ранняй Румынскай дзяржавы і Балгарыі (1259)

доўгі час захоўвалася нямала клішэ. Хто з вас не чуў выказванняў кшталту «цёмнае сярэднявечча», «сярэднявечнае варварства», «жывем быццам у сярэднявеччы»?! Усе яны ўзніклі ў сувязі з ідэалогіяй эпохі Адраджэння, калі лічылася, што перайманне антычнасці – найвышэйшая мэта любога арыгінальнага тварэння, і да гэтае тэзы з часам прывыклі, забыўшыся пра арыгінальную творчасць той эпохі, якая не толькі захавала антычныя творы, але і стварыла новую архітэктуру, скульптуру і жывапіс, паэзію трубадураў, схаластыку, музычныя памеры і г. д. Так, напрыклад, у Румыніі Дэнсушская царква святога Мікалая ў жудэцы Хунэдаара, манастыр у мястэчку Курця-дэ-Арджэш ці манастыр Варанец з'яўляюцца бясспрэчнымі сведчаннямі генію тых людзей, што, з'яўляючыся носьбітамі далёкай ад нас ментальнасці, стварылі, тым не менш, бліскучую культуру. Як бы там ні было, Сярэднявечча ёсць першым перыядам у гісторыі, калі румыны выйшлі на палітычную сцэну ўжо як цалкам сфарміраваная неалацінская нацыя.

6.1. Як называлі сябе румыны і як называлі іх іншыя

Этнічныя назвы народаў, як і назвы краін, маюць вялікае значэнне, бо яны захоўваюць у сабе гістарычную памяць. Возьмем, скажам, вострую дыскусію вакол назвы недалёкай ад Румыніі краіны, якая афіцыйна была вымушаная называцца «Былая Югаслаўская Рэспубліка Македонія», хоць, згодна з воляю яе жыхароў, яе называюць проста Македоніяй.

Як ужо адзначалася, у этнічным аспекце Румынію насяляюць у асноўным румыны (90%). Але сказаць, штó гэта канкрэтна значыць, не заўсёды бывае лёгка. Пачнем з рэчаў, якія не выклікаюць сумнення: генетычна румыны адносяцца да раманскіх народаў, хоць, як і ўсе гэтыя народы, з цягам часу яны змяшаліся з іншымі этнасамі, з якімі, як самі яны, так і іх папярэднікі, пражывалі сумесна. Назва румынаў, бясспрэчна, паходзіць ад лацінскага слова *Romanus* (рымлянін, рымскі), запазычанага старарумынскаю мовай у форме *rumân* (румын). Паводле агульнай нормы, уласцівай румынскай мове, лацінская галосная «о» у становішчы паміж двума зычнымі пераходзіць у «u»; так, лацінскае слова *nomen* (імя) ператварылася

ў румынскай мове ў *nume*; *dolor, dolorem* (пакуты) набыло форму *durere*; *color* (колер) – *culoare*; *soror* (сястра) стала *sură* і *surată*, а ў множным ліку – *surori* (сёстры) і г. д. І менавіта так (*rumân*) румыны заўсёды сябе называлі, хоць, акрамя гэтай назвы, у рэгіёнах былі і свае найменні – мунтэнцы, малдаване, алтэнцы ды інш., – аж да XVI ст., калі, верагодна, пад уплывам гуманізму, была зафіксавана лацінізаваная форма з напісаннем праз «о» – *român* (румын). Пэўны час два варыянты (*rumân* і *român*) суіснавалі, але ў інтэрвале паміж XVIII і XIX ст. паступова пад уплывам празаходніх інтэлектуальных плыняў зацвердзілася назва з напісаннем праз «о» – *român*, якая асабліва ярка падкрэслівала генетычную і культурную сваяцкасць румынаў з Рымам, Італіяй і старажытнай Рымскай імперыяй.

Аднак замежнікі доўгі час румынаў румынамі ні праз «u», ні праз «о» не называлі – гэта значыць, што назвы *rumâni* ці *români* імі не выкарыстоўваліся: у агульны ўжытак яны пачалі ўваходзіць адносна нядаўна, галоўным чынам пасля 1862–1866 гг., калі краіна набыла афіцыйную назву Румынія (*România*). Да таго ж румыны для ўсіх сваіх суседзяў (а таксама для французаў, італьянцаў, немцаў ці англічан) былі валахамі, олахамі, улахамі, блахамі – гэтая назва мела шмат фанетычных варыянтаў. Найменне «валах», такое загадкавае і невядомае для саміх румынаў, паходзіць, верагодна, ад старажытнай назвы *volcae*, якою рымляне пазначалі адно раманізаванае кельцкае племя і якая першапачаткова азначала «той, хто гаворыць (на лаціне)», «лацінамоўны», «раманскі» – іначай кажучы той, хто размаўляе на мове, што паходзіць ад лацінскай. А паколькі адзіным лацінамоўным насельніцтвам Цэнтральна-Усходняй і Паўднёва-Усходняй Еўропы былі румыны, а вакол іх жылі выключна нераманскія народы, то натуральна, што менавіта на румынаў замежнікі і перанеслі найменне «валахі». У выніку да нядаўняга часу румыны як народ мелі дзве назвы: саманазву (*români*) у памяць аб Старажытным Рыме і сваім рымскім (раманскім) паходжанні і назву, дадзеную замежнікамі, – валахі, – якая, аднак, таксама адсылае да рымлян, а дакладней – да іхняй мовы. Так ці іначай, абедзве гэтыя назвы – і румын, і валах – маюць прыкладна аднолькавае значэнне, якое гаворыць пра лацінскае паходжанне румынаў. Многіх, зрэшты, такая дваістасць здзіўляла, і некаторыя навукоўцы – па няведанні ці наўмысна – рабілі з яе цал-

кам памылковыя высновы, заходзячы ў іх так далёка, што называлі валахаў і румынаў двума асобнымі народамі, якія, жывучы паміж Дунаем і Карпатамі, паслядоўна змянілі адзін аднаго ў гісторыі! Але гэта цалкам супярэчыць гістарычным фактам і ўсяму працэсу ўтварэння румынскага народа. Як бы там ні было, гістарычныя крыніцы сведчаць, што румыны, яшчэ пачынаючы з XIV і XV стст., называлі самі сябе румынамі (*rumâni*), а сваю мову румынскай (*rumânească*) (ці вельмі блізка да гэтага), і пазней падобныя сведчанні толькі яшчэ больш множацца. Падвойнае найменне румынаў у працэсе гісторыі нікога здзіўляць не павінна: згадаем, напрыклад, што грэкі называюць сябе *элінамі* (толькі замежнікі на іх кажуць «грэкі»), венгры называюць сябе *мадзьярамі* (па-венгерску *magyarok*), немцы пра сябе кажуць *Deutsche*, і падобныя разыходжанні ў саманазвах і назвах замежнікамі можна доўжыць, згадваючы албанцаў, фінаў, ірландцаў, галандцаў і г. д. Увогуле, падвойная назва аднаго народа (свая і чужая) – рэч даволі звычайная, натуральная і сустракаецца ў гісторыі вельмі часта.

Назва «румын» шчыльна звязаная з краінай і землямі, на якіх жывуць румыны. Ужо самыя раннія гістарычныя крыніцы, якія датуюцца памежжам I і II тысячагоддзяў, адназначна сведчаць, што свае дзяржаўныя ўтварэнні румыны называлі «румынскімі землямі», а палацінску – *terrae Valachorum*. Назва «Румынская дзяржава» фіксуецца ў Сярэднявеччы адносна некалькіх гістарычных земляў як на поўнач, так і на поўдзень ад Дуная. Калі ў выніку амаль трохсот гадоў развіцця і станаўлення паміж Дунаем і Карпатамі ўзнікла першая румынская цэнтралізаваная і магутная дзяржава, яна не магла называцца інакш як Румынская дзяржава, а замежнікі не маглі называць яе інакш як Валахія, Вялікая Валахія (ці іншымі варыянтамі гэтай назвы). Другая румынская дзяржава была вядомая пад імем Малдова ці Малдаўскае княства, якое ў іншых краінах называлі Малой Валахіяй або Валахіяй з боку Расеі*. У пісьмовых крыніцах на румынскай мове, якія масава ўзнікаюць з XVI ст., назва Валахія, як правіла, пера-

---

* У дакументах ВКЛ Малдаўскае княства пазначалася як Валоскае ваяводства або Валошчына. – *Заўв. перакладчыка.*

кладаецца па-румынску як «Румынская дзяржава» (Ţara Rumânească або Ţara Românească), што несумненна сведчыць пра тоеснасць двух гэтых пазначэнняў як поўных сінонімаў. Таму было б цалкам натуральна, калі б і сучасная румынская дзяржава, якая сфарміравалася ў сярэдзіне XIX ст., таксама насіла назву «Румынская дзяржава». Аднак гэтаму мелася некалькі перашкод. Па-першае, расчараванне маглі б адчуць малдаўскія румыны, убачыўшы, што новая аб'яднаная дзяржава захоўвае толькі ранейшую афіцыйную назву суседняй, няхай і брацкай, краіны, а старажытная назва іхняй дзяржавы праігнараваная. Падругое, у словаспалучэнні «Румынская дзяржава» адчувалася пэўная доля архаікі: як назва яно гучала дысанансам побач з пазначэннямі і брацкіх румынам раманамоўных краін – Італіі, Францыі, Іспаніі, – і іншых еўрапейскіх дзяржаваў – Англіі, Германіі, Расіі, Аўстрыі і да т. п. А назва Румынія – ва ўсіх яе словаформах у іншых мовах – паказвае на сувязь са Старажытным Рымам і на раманскае паходжанне румынаў нават больш відавочна і непасрэдна. Калі ж улічыць, што румынская мова паводле сваёй структуры адкрытая для любых інавацый і лёгка запазычвае шматлікія неалагізмы, то і назва «Румынія» лёгка ў яе ўвайшла і без цяжкасці была прынятая яе носьбітамі. Але ці дарэчна казаць пра гэтую назву як пра інавацыю ці неалагізм? Мы ставім гэтае пытанне таму, што шмат якія, у асноўным замежныя, спецыялісты, ужо даўно адзначаюць, што назва «Румынія» была прыдуманая грэцкім аўтарам Дзімітрыем (Даніілам) Філіпідзісам, які, апублікаваўшы ў 1816 г. у Ляйпцыгу працы «Гісторыя Румыніі» і «Геаграфія Румыніі», ужыў гэты тэрмін для пазначэння ўсёй у цэлым тэрыторыі старажытнарымскай



Ліст баярына Някшу (1521), першы пісьмовы дакумент на румынскай мове, напісаны кірыліцай

правінцыі Дакія, заснаванай у 106 г. рымскім імператарам Траянам. Але гэта не зусім слушна. Назва «Romania» (Раманія) існавала яшчэ з перыяду позняй Рымскай імперыі, жыхары якой выкарыстоўвалі яе ў штодзённых асабістых зносінах, яна была пашыраная як на Захадзе, так і на Усходзе, асабліва пасля падзення дзвюх уласна рымскіх дзяржаваў – Заходняй Рымскай імперыі, а праз тысячагоддзе і Усходняй Рымскай імперыі. Кожная тэрыторыя, дзе, у адрозненне ад шматлікіх дзяржаўных утварэнняў «варвараў» (качэўнікаў), захаваўся ці ўтварыўся асяродак арганізаванага рымскага ладу жыцця і рымскія палітычныя інстытуцыі, атрымлівала назву «Раманіі» (Romania) або (пераважна на ўсходзе Еўропы) «Валахіі» (Vlahie). У сярэднявечных крыніцах да адной і той самай тэрыторыі фіксуюцца падвойныя назвы, прычым у славянскіх, германскіх і венгерскіх тэкстах на працягу доўгага перыяду перавагу маюць тэрміны «Валошчына» («Валахія», «Влахія»). Трэба зазначыць, што тэрмін *Romania* (Раманія) у форме *rumânie* існаваў і ў сярэднявечнай румынскай мове, але, мяркуючы па ўсім, значэнне ў яго было іншае: ён тычыўся не дзяржавы, а толькі мовы. У перакладных старарумынскіх тэкстах пазначалася: «тлумачана са славянскай (ці з лаціны) на румынскую (pre rumânie)». Урэшце, гэта цалкам натуральна, бо ўсе свае дзяржаўныя ўтварэнні румыны заўсёды называлі «ţări rumâneşti» (румынскімі землямі) і называюць іх так дагэтуль. А цяпер давайце паглядзім, як называюць свае краіны іншыя народы. Усякі англічанін называе сваю краіну *England*, шатландзец – *Scotland*, немец – *Deutschland*, а вугорац – *Magyarország*. Падобныя прыклады можна доўжыць: *Finland, Ireland, Iceland, Nederland, Denmark, Frankreich, Österreich* і г. д. Сёння кожны чалавек у свеце ведае, што ўсё гэта – назвы такіх дзяржаваў, як, адпаведна, Англія, Шатландыя, Германія (Нямеччына), Венгрыя (Вугоршчына), Фінляндыя, Ірландыя, Ісландыя, Галандыя (Нідэрланды), Данія, Францыя, Аўстрыя. Але назвы з першага спісу, пазначанага курсівам, літаральна перакладаюцца на румынскую мову як Ţara Engleză (Англійская зямля), Ţara Scoţiană (Шатландская зямля), Ţara Germană (Нямецкая зямля) (land = зямля, краіна), Ţara Maghiară (Мадзьярскі край) (ország = край, краіна), Ţara Finică (Фінская зямля) і г. д., а таксама Marca Daneză (Дацкая марка), Imperiul Francilor (Імперыя франкаў), Imperiul de Est (Усходняя

імперыя) і г. д. Калі ж гэты перакладзены вышэй шэраг назваў цалкам сінанімічны сучасным назвам адпаведных краін, то падобнае ж павінна датычыцца і назвы Țara Rumânească / Românească (Румынская зямля / край), як сінанімічнай назве Rumânia / România (Румынія). Румыны заўсёды называлі землі, на якіх месціцца сёння Румынія, «румынскімі землямі / румынскім краем», і таму гэтую, старую назву гэтак сама справядліва суадносіць з сучаснаю назвай Румынія, як справядліва Англію называць Англіяй, а не Англійскай зямлёй / краем, Нямеччыну – Нямеччынай, а не Краем / зямлёю немцаў, Венгрыю – Венгрыяй і г. д. Назва Румынія – такая самая «новая», як і назвы Англія, Нямеччына ці Венгрыя, якія ўжываюцца замест даслоўных эквівалентаў іх традыцыйным саманазвам *England* (Англійская зямля), *Deutschland* (Нямецкая зямля) або *Magyarország* (Вугорскі край). У такім выпадку і тэрмін Țara Românească (Румынская зямля / край) павінен разглядацца як традыцыйная саманазва Румыніі, бо ён бесперапынна ўжываўся самімі румынамі, пачынаючы ад Сярэднявечча, і ўжываецца дагэтуль.

Такім чынам, як мы паказалі вышэй, румыны заўсёды называлі самі сябе румынамі (*rumâni* або *români*) – словам, вытворным ад лацінскага *Romanus* (рымлянін, рымскі), а замежнікі аж да XIX ст. называлі румынаў валахамі ці влахамі (або, у залежнасці ад краіны, іншымі вытворнымі ад гэтага імя тэрмінамі – *Valachus, Vlahus, Blacus*), што, паводле свайго агульнага сэнсу, азначала «той, хто гаворыць па-лацінску». Калі ж гэтыя тэрміны, якімі пазначалі румынаў, пачалі фіксавацца ў гістарычных крыніцах? Само сабой, гэта адбылося на завяршальным этапе іх этнагенезу, бо раней крыніцы не маглі фіксаваць тое, чаго яшчэ не было. Такім чынам існаванне румынаў упершыню згадваецца ў пісьмовых крыніцах, пачынаючы з IX–X стст., прычым гэтыя пісьмовыя помнікі – замежныя (лацінскія, візантыйскія, старажытнарускія), бо ў саміх румынаў у той час сваіх гісторыкаў, храністаў ці нават канцылярыстаў яшчэ не было. Прыкладна ў гэты ж перыяд упершыню згадваюцца як асобны раманскі народ і французы. Што да тагачасных румынаў, то пра іх пішуць як пра народ, які жыве на шырокіх прасторах ад сярэдняга Падунаўя (па абодва бакі ракі) і да Чорнага мора. Кампактна засяляючы гэтую велізарную тэрыторыю, румыны жылі побач

з многімі іншымі народамі – старажытнымі славянамі, аварамі, протабалгарамі, грэкамі, старажытнымі германцамі і інш. Венгерскія хронікі XI–XIV стст., напрыклад, адзначаюць, што каля 900 года ў Панноніі (прыкладна на тэрыторыі сучаснай Венгрыі) жылі старажытныя славяне, балгары, грэкі, старажытныя германцы і румыны (*Blachi* або *Ulahi*), а ў Трансільваніі – румыны і славяне. Пра румынаў храністы згадвалі, што яны былі «пастухамі і рымскімі каланістамі-земляробамі, якія добраахвотна» засталіся на гэтых землях і пасля таго, як іх пакінулі афіцыйныя рымскія ўлады. Разам з тым, усе гэтыя крыніцы сведчаць пра раманскае паходжанне румынаў, робячы гэта як ускосна, паводле іх назвы, так і непасрэдна, называючы румынаў нашчадкамі старажытных рымлян, якія засталіся жыць на тэрыторыі старажытных рымскіх правінцый ад Дуная да Карпатаў. Пад 1550 год харвацка-вугорскі гуманіст Антун Вранчыч (Антал Веранчыч) пісаў пра румынаў так: «*Каб цалкам развеяць гэтае пытанне канкрэтнымі доказамі і канчаткова давесці, што валахі вядуць сваё паходжанне ад старажытных рымлян, прывяду ўсяго два аргументы, а рабіць высновы пакіну самім чытачам, асабліва тым, хто ведае розныя мовы. Не гаворачы нават пра тую вялізную колькасць словаў, якія ў мове валахаў маюць тое самае значэнне, што і ў лацінскай або ў італьянскіх дыялектах, зазначу, што, пытаючыся ў чалавека, ці ён ведае валашскую мову, яны кажуць: «Ці разумееш ты па-румынску?» – а <каб даведацца>, ці чалавек валах, пытаюцца, ці ён румын*» [Monumenta Hungariae Historica. – Scriptores. – Vol. II. – Pest, 1857. – P. 135.]. Такім чынам, як відаць з гэтых нататак відавочцы, мясцовыя жыхары, якіх замежнікі называлі валахамі, самі сябе называлі румынамі (а па-лацінску – *romani*, г. зн. рымлянамі), а сваю мову – румынскай (*romani*, г. зн. раманскай), бо рэальныя словаформы *rumân*, *rumână* ці *rumânească* немагчыма было дакладна перадаць на лаціне ці перакласці на іншыя мовы.

6.2. Ад сялянскай грамады да дзяржавы

Пасля таго, як рымскія ўлады пакінулі Дакію (271–274 гг.), а яшчэ больш актыўна пасля таго, як узмацніліся напады качэўнікаў (пасля 350 г.), дака-рымляне былі вымушаныя адмовіцца ад жыцця ў гарадах

на старажытнарымскі ўзор і пачалі аддаваць перавагу маленькім лясным паселішчам, якія лягчэй можна было абараніць, а пры патрэбе й пакінуць. Разам з тым землі, якія раней не былі пад рымскай уладай і дзе раней не было лацінамоўнага насельніцтва – Крышана, Марамурэш, Бераг, Угоча, Цэнтральная і Паўночная Малдова да рэк Днестр і Чарамош ды інш., – але дзе з антычнасці адчуваўся ўплыў рымскай цывілізацыі, цяпер, дзякуючы павелічэнню лацінамоўнага насельніцтва – протарумынаў і румынаў, якія пачалі сюды перасяляцца з рэгіёнаў, што раней уваходзілі ў склад старажытнарымскіх правінцый, – атрымалі моцны штуршок да лацінізацыі. Часткова гэтае перасяленне людзей за Карпацкі масіў абумовалася набегамі качэўнікаў, але яго прычынай былі і звычайныя дэмаграфічныя працэсы (павелічэнне колькасці насельніцтва), патрэба пошуку і апрацоўкі больш урадлівых земляў, сезонная авечкагадоўля, якое прадугледжвала змену зімовых і летніх пашаў.

Пад уплывам новых умоваў дака-рымляне і протарумыны паступова карэнным чынам змянілі свой лад жыцця. Старыя рымскія дзяржаўныя інстытуты былі прыстасаваныя да спецыфікі жыцця ў сельскай абшчыне. На чале такой абшчыны ў кожным сяле (парумынску – *sat*, «вёска», што паходзіць ад лацінскага *fossatum*, «роў з земляным валам вакол паселішча») стаяў жупан – выбарны суддзя (рум. *judele*), якога пазней з прычыны славянскага ўплыву пачалі называць князем (рум. *cnez*). З удзелам «людзей сумленных і паважаных» жупан чыніў суд – спачатку на аснове рымскага права, а пасля – і румынскага. З цягам часу жупанаў (князёў), якія першапачаткова вылучаліся з ліку мясцовых жыхароў ці прышлых качэўнікаў, што аселі сярод тутэйшага насельніцтва, выбіраць перасталі, і яны пачалі перадаваць свае пасаду і тытул у спадчыну. Паступова яны ператварыліся ў сапраўдных правадыроў, шанаваных і ўладных, якія прыўлашчвалі найлепшыя землі, што належалі мясцовай абшчыне, і прымушалі шараговых сялян задарма іх апрацоўваць. З такіх правадыроў склалася ядро будучага баярства (нобіляў), феадалаў. Мяркуючы па ўсім, пачынаючы з VIII–IX стст., некаторыя жупаны-князі ператварыліся ўжо ва ўласнікаў цэлых сёлаў, звычайныя жыхары якіх мусілі на іх працаваць. А некаторым удавалася завалодаць нават усімі сёламі, размешчанымі ў даліне

якой-небудзь ракі ці ў лагчыне (а іх магло быць і пятнаццаць, і дваццаць). Праз патрэбу абароны сваіх уладанняў большая частка князёў пачала аб'ядноўвацца вакол якога-небудзь аднаго найбольш магутнага князя, надзеленага ваенным талентам, якога лацінскія крыніцы называюць *duce* («верхавод, лідар»), а славянскія – «ваявода». Пачынаючы з гэтага перыяду, які прыпадае на IX ст., ужо можна казаць аб узнікненні на тэрыторыі Румыніі першых палітычных утварэнняў, заснаваных румынамі і прадстаўнікамі іншых народаў, з якімі яны жылі супольна. Падобныя малыя дзяржавы былі такімі ж дробнымі, як і англа-саксонскія «каралеўствы» часоў караля Артура, але кожная мела ўласнае войска, драўляныя і земляныя ўмацаванні, свае судаводства і царкоўнае ўладкаванне. У выніку злучэння такіх княстваў і ваяводстваў цягам XIII–XIV стст. паступова паўсталі цэнтралізаваныя, аб'яднаныя румынскія дзяржавы.

6.3. Першыя сярэднявечныя палітычныя ўтварэнні на тэрыторыі Румыніі

Аднойчы ўзнікнуўшы і ўсвядоміўшы сваю супольную ідэнтычнасць, усякі народ ці этнічная група адчувае патрэбу ў выпрацоўцы шэрагу інстытуцый, якія арганізоўвалі б яго побыт і забяспечвалі б яму абарону, гарантуючы такім чынам само яго існаванне. Адной з найважнейшых такіх інстытуцый ёсць дзяржава. Румынскае слова «дзяржава» – *stat* – паходзіць з лацінскай мовы, і паступова румынам удалося стварыць сучасную мадэль дзяржавы з усімі ўласцівымі ёй інстытутамі. Але ў 476 г., калі Заходняя Рымская імперыя спыніла сваё існаванне, на яе руінах паўстаў цэлы шэраг палітычных утварэнняў, заснаваных захопнікамі-варварамі. Калі не паглыбляцца ў іх сутнасць, іх таксама можна назваць дзяржавамі, хоць па сваёй сутнасці яны былі вельмі далёкія ад класічнага старажытнарымскага ўзору. Што да Сярэднявечча, то і тут больш слушна было б казаць пра герцагствы, княствы, царствы, імперыі і да т. п., але ў якасці пэўнага абагульненага паняцця мы будзем карыстацца тэрмінам «сярэднявечная дзяржава». Доўгі час румынам не ўдавалася стварыць уласную дзяржаву (дзяржавы) – перш за ўсё з прычыны нашэсцяў і рабаўніцкіх нападаў качэўнікаў, а таксама таму, што землі,

населеныя румынамі ці іх продкамі, перыядычна ўваходзілі ў тыя ці іншыя «імперыі», утвораныя заваёўнікамі. Пасля таго, як протабалгары, якія ў канцы VII ст. перасяліліся ў паўднёвае Падунаўе, былі ў хуткім часе славянізаваныя, а авары – разгромленыя франкскім каралём Карлам Вялікім (канец VIII ст.), лацінамоўнае насельніцтва Ніжняга Падунаўя атрымала магчымасць на працягу амаль стагоддзя жыць у адносным спакоі. За гэты перыяд яно разам з суседнімі народнасцямі паспела стварыць у Трансільваніі і крыху ад яе на захад першыя протадзяржавы. Але ў X–XIII стст. пракацілася хваля новых нашэсцяў, перадусім вугорцаў, печанегаў, агузаў, полаўцаў (апошнія тры цюркамоўныя народнасці мелі цэнтральнаазіяцкае паходжанне) і татар, якія моцна затрымалі палітычную эвалюцыю румынаў і аб'яднанне іхніх дзяржаў. Больш за ўсё дробныя румынскія дзяржаўныя ўтварэнні пацярпелі ад драпежніцкіх набегаў вугорцаў, якія, пачынаючы прыкладна з 900 г. і на працягу першых двух-трох дзесяцігоддзяў X ст. ажыццяўлялі іх з тэрыторыі Панноніі. Вугорцы – качавы народ фіна-вугорскага паходжання, які, паходзячы з цэнтру Азіі, змяшаўся падчас свайго доўгага перасялення з іншымі этнасамі, перш за ўсё цюркскімі. Вугорскія орды, да якіх далучаліся іншыя ўсходнія качэўнікі, рухаліся на паўночны захад у кірунку Кіева і Уладзіміра, рабуючы ўсё на сваім шляху, а ў 895–896 гг. пераваліліі з паўднёвага захаду цераз лясістыя Карпаты і запаланілі Панонскую раўніну. Тут, пасля некалькіх сутычак з мясцовым насельніцтвам, вугорцы разгарнулі свае намёты, узвялі земляныя крэпасці і пачалі ажыццяўляць шматлікія рабаўніцкія наезды на суседнія народы. Ад вугорскіх нападаў цярпелі перадусім Аўстрыя, Італія, Германія і нават Францыя, пакуль 955 г. іх не спыніла і не разбіла нямецкае войска караля (і будучага імператара) Атона I Вялікага. Пасля той паразы вугорцы скіравалі свае набегі пераважна на Цэнтральную Еўропу, на ўсход, поўдзень і паўднёвы ўсход ад Панноніі. Цягам першага стагоддзя пасля прыходу ў Цэнтральную Еўропу вугорцы не падпарадкавалі сабе вялікіх тэрыторый, бо знаходзіліся на стадыі племяннога саюза, былі паганцамі і яшчэ не мелі ўласнай дзяржавы. Іх мэта палягала перадусім у рабаванні і захопе здабычы, якая складала галоўны сродак іх існавання. З часам, аднак, яны перайшлі да аселасці, пачалі займацца земляробствам, пад уплывам наваколь-

ных народаў і народнасцяў хрысціянізаваліся і ў 1000 г. абвясцілі Вугоршчыну каралеўствам – феадальнай краінай на заходні ўзор з магутным унутраным уплывам племянных кланаў, якія захаваліся з дахрысціянскага мінулага. Стварыўшы дзяржаву, яны з новым

Румынскія землі ў IX–X стагоддзях

імпэтам пачалі палітыка-ваенную экспансію ў цэнтральную частку Еўропы, несучы шкоду суседнім краінам і народам.

Падчас рабаўніцкіх набегаў на тэрыторыю сучаснай Румыніі вугорцы сустрэлі на сваім шляху некалькі дробных дзяржаў, якія былі яшчэ толькі на стадыі фарміравання. У прыватнасці, у Крышане існавала румынска-славянскае ваяводства на чале з некім Менуморутам, васалам візантыйскага імператара. Цэнтр ваяводства знаходзіўся ў крэпасці Біхор (непадалёк ад сучаснага горада Арадзя), і яно мела яшчэ дзве крэпасці – Сату-Марэ і Залэў. Другая дробная дзяржава была ў Банаце, і ўзначальваў яе ваявода Глад, у войску якога служылі печанегі, балгары і румыны, якія пабудавалі магутныя крэпасці ў Аршове на Дунаі, Ковіне і Хораме (апошнія два гарады знаходзяцца ў сучаснай Сербіі). Нарэшце, трэцяе ваяводства месцілася на ўсход ад Крышаны «за лесам», што азначала, па сутнасці, класічную Трансільванію. Яго цэнтр знаходзіўся на рацэ Самеш і яе прытоках: верагодна, у раёне сучаснага Клужа. Насельніцтва дзяржавы складалі румыны і славяне, а «кіраванне» (вярхоўную ўладу) над імі трымаў у руках «Гелу, румын». У краіне мелася ня-



Першая старонка летапісу
Gesta Hungarorum (Дзеі вугорцаў),
у якой згадваюцца Менуморут і Глад

мала крэпасцяў, галоўная сярод якіх стаяла на рацэ Самеш, але ваяводства Гелу было не вельмі моцнае, бо войска ў яго складалася толькі з лучнікаў, а жыхары былі «беднымі», бо ўвесь час цярпелі ад печанежскіх набегаў з усходу. Затое, як пішуць хронікі, краіна была багатая на соль і высакапробнае золата, якое можна было знайсці нават у рачным пяску. Усе тры згаданыя ваяводы і іх войскі былі пераможаныя рознымі вугорскімі правадырамі, якія прыйшлі рабаваць іх краіны, а пасля некаторыя вугорцы там і аселі сярод румынаў, славян ды іншых народаў, што жылі ў Крышане, Банаце і Трансільваніі. Але дзяржавы і пасля паразы засталіся свабоднымі і не падкантрольнымі ўладзе вугорцаў, бо тыя на мяжы IX–X стагоддзяў не мелі яшчэ дзяржавы, не ўяўлялі сабой арганізаванай сілы і не маглі прапанаваць ніякай цывілізацыйнай мадэлі, якая прывабіла б іхніх суседзяў. Аднак з пачаткам XI ст., калі было створана Каралеўства Вугоршчына (Венгрыя), вугорскія войскі зноў прыйшлі і надоўга падпарадкавалі сабе Крышану і Банат (на чале якога тады стаяў нашчадак Глада на імя Ахтум), пасля чаго накіраваліся да прыкарпацкай Трансільваніі. Аднак тут іх прасоўванне было прыпыненае, і заваяванне гэтай тэрыторыі расцягнулася амаль на паўтара стагоддзя.

Пад 943 г. у Дабруджы крыніцы згадваюць кіраўніка краю на імя Дзімітрыэ, пра Малдову ў XII ст. пішуць як пра «краіну валахаў» (што значыць – румынаў), у Алтэніі і Мунтэніі ў XIII ст. існуюць малыя дзяржавы, на чале з такімі ваяводамі, як Літавой і Сенеслаў (Станіслаў), Ёан і Лупу (Фаркаш). У насельніцтве ўсіх

гэтых дзяржаўных аб'яднанняў, якія месціліся як на поўнач, так і на поўдзень ад Дуная, пераважалі румыны, а ў замежных крыніцах яны называліся «валоскімі», што ў перакладзе з іншых моваў на румынскую адпавядае паняццю *Țară românească* (Румынская дзяржава).

6.4. Румынска-балгарскае царства дынастыі Асеняў

На Балканскай паўвыспе перавага ў этнічным і палітычным плане была на баку візантыйцаў (грэкаў) і славян. Пасля масавай славянізацыі, якая пачалася ў VII ст., румыны, або балканскія валахі, былі выцесненыя з месцаў іх першапачатковага пражывання на поўнач ад Дуная і ў Задунаўе або, наадварот, да Балканскіх гор, у Фесалію, Эпір, Цэнтральную Грэцыю, Македонію, Албанію. Там, дзе захавалася іх кампактнае пражыванне, румыны стварылі ўласныя палітычныя ўтварэнні з адпаведнымі дзяржаўнымі інстытуцыямі – утварэнні, якія ў замежнікаў займелі назвы Валошчына, Валахія і да т. п. У 1066 г. адбылося першае паўстанне гэтых румынаў супраць Візантыйскай імперыі і яе празмернага падатковага прыгнёту. 1185 год быў адзначаны ўвядзеннем новых памераў выплат, якія браты Пётр і Асéнь, кіраўнікі валахаў, паспрабавалі, звярнуўшыся да візантыйскага імператара, скасаваць, але беспаспяхова. Тады валахі разам з балгарамі і з дапамогай паўночнадунайскіх валахаў (румынаў) і полаўцаў (куманаў) паўсталі супраць візантыйцаў і заснавалі новую дзяржаву пад назваю «Царства валахаў і балгар» з цэнтрам паміж Балканамі і Дунаем. Візантыя новую дзяржаву не прызнала, але ў 1204 г., калі ў румынаў (валахаў) і балгар кіраваў румын Ёніца Калаян, малодшы брат Пятра і Асеня, яе легітымізаваў Святы Пасад: Папа Рымскі Інакенцій III прызнаў Калаяна законным «царом балгар і румынаў» пры ўмове прыняцця ім рымскага веравызнання. Каб схіліць яго да гэтага кроку, Папа Рымскі ў сваім пасланні Ёніцу пісаў, што ведае пра яго рымскае паходжанне – іначай кажучы, ведае, што гэты румынскі манарх і яго продкі вядуць свой радавод ад старажытнага Рыма. І сам Ёніца, пасылаючы Папу Рымскаму ліст у адказ, ганарыўся сваім раманскім паходжаннем, як і раманскімі каранямі свайго народа, і пагаджаўся з ідэяй вяртання да повязі з «Вечным горадам». Прыняцце рымскай веры было палітычным актам, які забяспечваў незалежнасць і прызнанне

Царства валахаў і балгар за Ёніцам Калаянам, 1197–1207

новай дзяржавы. А для Папы Рымскага гэта было сведчаннем разрыву з візантыйскім абрадам новага этнічнага і палітычнага ўтварэння, для чаго момант быў вельмі спрыяльны: Канстанцінопаль быў якраз захоплены «лацінянамі» (заходнімі крыжакамі), якія пасля ўзяцця візантыйскай сталіцы абвясцілі аб стварэнні на землях старажытнай Візантыі, што трапілі ў рукі заходніх рыцараў і Венецыі, «Усходняй Лацінскай імперыі» (праіснавала з 1204 па 1261 год). Так што перад папствам адкрываліся ўсе ўмовы для пашырэння каталіцызму на Усход, для спробаў навярнуць у сваю веру балгар, сербаў, румынаў, русінаў, якія кампактна засялялі шырокую тэрыторыю ад Канстанцінопаля да Вугоршчыны і Польшчы.

Але цягам XIII стагоддзя румынская дынастыя Асеняў славянізавалася, лацінская царква была адкінутая, доля валахаў у этнічным складзе царства значна паменшала, і краіна стала балгарскай. Таму балгарскія гісторыкі вядуць гаворку пра яе і называюць яе «Другім балгарскім царствам», якое праіснавала да канца XIV ст., а потым, распаўшыся на дзве часткі, было заваяванае туркамі-асманамі.

6.5. Дзяржаўныя ўтварэнні ў Трансільваніі – ад «Краіны Гелу» да «Сяміграддзя»

Як мы ўжо адзначалі, на крайнім паўночным захадзе тэрыторыі, населенай румынамі, у Крышане, Банаце і Трансільваніі, яшчэ пачынаючы з IX ст. існавалі дробныя дзяржавы, узначальваныя Менуморутам, Гладам і Гелу. Усе яны моцна цярпелі ад набегаў вугорскіх ордаў (каля 900 г.), якія суправаджаліся рабункамі і забойствамі. Летапіс сведчыць, што, напрыклад, у Трансільваніі румынскія і славянскія жыхары, убачыўшы смерць свайго ўладара, вымушаныя былі «прызнаць над сабой права» вугорскіх прыхадняў і прынеслі прысягу вернасці іхняму правадыру. На мяжы X і XI стст. за тое, што некаторыя іншыя ваяводы (князі) – Ахтум у Банаце і Дзюла ў Трансільваніі – не хацелі прызнаць цэнтральную вугорскую ўладу з Панноніі, першы кароль Вугоршчыны Стэфан I (1000–1038) прыслаў дзеля іх пакарання войска. Перамогшы, вугорцы Ахтума забілі, а Дзюлу разам з сям'ёй узялі ў палон. У XI ст. некаторыя са згаданых старажытных ваяводстваў, перадусім тыя, што знаходзіліся на раўнінах Крышаны й Баната, тэрытарыяльна ўвайшлі ў склад Каралеўства Вугоршчыны. І пачынаючы з таго ж XI ст. вугорцы прыступілі да метадычнага і сістэматычнага заваявання «краю за лесам», г. зн. Трансільваніі, крок за крокам прасоўваючыся з захаду і паўночнага захаду пераважна па рачных далінах. Мясцовае румынскае насельніцтва, разам з малалікімі групамі славян, печанегаў, полаўцаў і г. д. па магчымасці аказвалі ім супраціў, але вымушаныя былі адыходзіць усё далей, у больш бяспечныя мясціны, лепш прыстасаваныя для абароны. Паступова іх землі былі захопленыя, а там, дзе на іх яшчэ захаваліся муры старажытнарымскіх гарадоў ці крэпасцяў або ўмацаванні, узведзеныя

Стэфан I, першы кароль Вугоршчыны

мясцовым насельніцтвам, захопнікі абсталявалі цяпер ужо свае абарончыя пункты. Да 1200 г. уся Трансільванія была ўжо заваяваная Вугоршчынаю аж да Карпатаў. Першы намеснік, пастаўлены вугорскім каралём над Трансільваніяй, згадваецца адразу ў двух дакументах пад 1111–1113 гг. Звалі яго Меркурый (Mercurius), і ён меў тытул «прынцэпса» (principe). Праўда, ні дакладнае месца яго пасаду, як і ніводзін яго ўказ невядомыя. Ва ўсякім разе паўднёвая і ўсходняя часткі Трансільваніі ў той час – на пачатку XII ст. – яшчэ не падпарадкоўваліся вугорцам. На працягу наступных прыкладна 65 гадоў ніякія іншыя кіраўнікі Трансільваніі не згадваюцца, і толькі пад 1176 годам паведамляецца пра ваяводу Еўстахія. Цалкам можна дапусціць, што гэты перыяд быў напоўнены канфліктамі і супрацьстаяннем, бо падпарадкаванае румынскае і румына-славянскае насельніцтва не хацела мірыцца са сваім становішчам. Каб выклікаць яго прыхільнасць, вугорскія ўлады былі вымушаныя прызнаць за кіраўніком Трансільваніі традыцыйны для гэтых месцаў тытул ваяводы (замест заходняга «прынцэпса»), бо румыны здаўна яго ведалі, прызнавалі і паважалі як частку сваёй славяна-румынскай спадчыны. Увогуле Трансільванія была адзіным краем у складзе сярэднявечнага Вугорскага каралеўства, які заўсёды называўся ваяводствам, а яго кіраўнік – ваяводам. Гэтаксама ваяводамі называліся і правадыры двух румынскіх краінаў на поўдзень і на ўсход ад Карпатаў, якія ўшчыльную падышлі да ўсталявання сваёй дзяржаўнай незалежнасці. Праўда, пасля Трансільваніі Вугорскае каралеўства паспрабавала падпарадкаваць сабе і гэтыя румынскія тэрыторыі, г. зн. Валахію і Малдову. Аднак гэтая спроба практычна пацярпела няўдачу, бо вугорскае «вяршэнства», якое ажыццяўлялася пераважна ў форме сюзерэнітэту, пашырылася толькі на зусім нязначную тэрыторыю і толькі на кароткі час.

Падсумоўваючы вышэй сказанае, можна канстатаваць, што першае дзяржаўнае ўтварэнне ў Трансільваніі пачало фарміравацца пры ваяводзе Гелу-румыне ў IX ст. Далейшыя аб'яднанне і цэнтралізацыя рэгіёна былі спыненыя набегамі вугорскіх войскаў, а пасля і здабыццём вугорцамі ўсяго «краю за лесам». Урэшце пад 1200 год Трансільванія паўстала як асобнае ваяводства з пэўнай доляю самастойнасці ў межах Каралеўства Вугоршчына.

6.6. Іншаземныя «госці»: пасяленцы, манахі, вайскоўцы

Але і пасля заваявання румыны не былі схільныя падпарадкоўвацца і дазваляць кіраваць сабою. У іх не было ніякіх прычын ставіцца да новых прышлых прыязна і супрацоўнічаць з імі. Таму з Вугоршчыны на іх землі пачало пераязджаць усё больш уласна вугорскага люду, якому перадаваліся маёнткі і землі румынаў ды іншага мясцовага насельніцтва і які ператвараўся такім чынам у феадалаў ці нобіляў. Аднак дэмаграфічныя магчымасці ў вугорцаў нават на Панонскай раўніне былі абмежаваныя. Іх колькасць, якая прыбыла туды да 896 г., не перавышала, паводле ацэнак, 120–150 тыс. чалавек, а тэрыторыя, над якой яны хацелі ўладарыць, была занадта вялікая – каля 300 000 кв. км. Каб запоўніць такую прастору і мець на ёй працоўную сілу ў выглядзе паслухмяных падданых, якія былі б ім удзячныя і дапамагалі б кіраваць скоранымі народамі, эксплуатуючы іх землі, вугорскія каралі пачалі рассяляць па ўсім каралеўстве асобныя групы іншаземцаў. Калі ў падпарадкаванага насельніцтва стаўленне да акупантаў, натуральна, было варожае, то новапрыбылыя пасяленцы мусілі быць і заўсёды былі адданымі сваім дабрадзеям – вугорскаму каралю і дзяржаўным структурам Вугорскага каралеўства. Такімі пасяленцамі былі ў асноўным сэкеі, якія, відаць, прыйшлі ў Панонію раней за вугорцаў, але потым хутка схаўрусаваліся з імі. Яны ваявалі ў авангардзе вугорскага войска, каб анэксаваць новыя правінцыі і заваяваць сабе будучую радзіму. З этнічнага гледзішча сэкеі ўяўлялі сабою мяшанку розных азіяцкіх (у тым ліку цюркскіх) плямёнаў, якія ў выніку шчыльных кантактаў і супольнага пражывання з вугорцамі пачалі размаўляць на адным з варыянтаў вугорскай мовы. Але іх этнічная існасць, старажытная племянная структура і адмысловы лад жыцця, адрозныя ад вугорскага, захаваліся і дагэтуль. Прасоўванне сэкеяў на ўсход і паўднёвы ўсход адбывалася разам з перамяшчэннем дзяржаўнай мяжы, абумоўленым вугорскімі заваяваннямі. Так, спачатку іх з'яўленне зафіксавана ў Крышане (у наваколлі сучаснага горада Арадзя), пазней (каля 1150 года) – у цэнтры краю, у раёне ракі Тырна́вы, а ў 1200 г. – на тэрыторыях, дзе яны жывуць і дагэтуль, – на ўсходзе і паўднёвым усходзе Трансільваніі. Узамен на абарону мяжы сэкеі, як і саксы, атрымалі ад караля шырокія прывілеі, якія

гарантавалі ім вольны статус і замацоўвалі падданства непасрэдна вугорскаму венцаносцу.

Другімі іншаземцамі, якія праніклі ў Трансільванію, былі саксы – супольнасць таксама даволі неаднастайная, але складзеная ў асноўным з германцаў, якія ў XII–XIII стст. прыйшлі з Заходняй Еўропы – Германіі, Паўднёва-Усходняй Францыі, сучаснай Бельгіі – і размясціліся (колькасцю прыкладна 40 000 чалавек) на поўдні і ўсходзе краю на землях, дзе ўжо жылі румыны, печанегі, сэкеі і іншыя. У 1224 г. саксы атрымалі ад вугорскага караля значныя прывілеі, якія гарантавалі ім свабоднае пражыванне на гэтых тэрыторыях (называных «каралеўскімі землямі») і непасрэдную залежнасць ад вугорскага венцаносцы, а не ад трансільванскага ваяводы.

Папа Рымскі і каралі Вугоршчыны мелі намер пасяліць у Трансільваніі паблізу горада Брашоў (у вобласці Цара Бырсэй) таксама тэўтонскіх рыцараў – прадстаўнікоў заснаванага ў Святой зямлі рыцарскага манаскага ордэна. У 1211 г. тэўтонцы прыбылі сюды з мэтаю пашыраць рымскую веру сярод паганцаў і «схізматыкаў» (праваслаўных), а таксама змагацца з набегамі полаўцаў. Але засталіся яны тут ненадоўга – адно на чатырнаццаць гадоў, а потым пасварыліся з вугорскім каралём, які іх і запрасіў. Пасля мангольскага нашэсця 1241–1242 гг. падобныя чыннікі абумовілі запрашэнне ў землі Баната і Алтэніі (каля 1247 года) часткі іншага рыцарскага манаскага ордэна – гаспітальераў, або іаанітаў, аднак і гэтая спроба рыцарскай каланізацыі Трансільваніі пацярпела няўдачу.

Такім чынам, ранейшая румынская супольнасць рымска-візантыйскага ўзору са славянскім ухілам адчула ў Трансільваніі ўплыў яшчэ трох рознаэтнічных групаў: вугорцаў, сэкеяў і саксаў. Тры гэтыя групы былі звязаныя агульнымі інтарэсамі, у значнай меры адрознымі ад праблем, якія хвалявалі даўніх жыхароў гэтых земляў.

6.7. «Першая румынская вольніца»

У перыяд Сярэднявечча румынам так і не далі стварыць сваю этнічную дзяржаву ў Трансільваніі, дзе знаходзіліся і былая сталіца Дэцэбала, і цэнтр рымскай правінцыі Дакіі, дзе жыло раманамоўнае насельніцтва і дзе знаходзіўся галоўны асяродак іх фарміравання

як народа. Так сталася ў выніку ўсталявання тут вугорскай улады. Аднак вугорскія каралі і пасля 1200 года, калі Трансільванія была ўжо захопленая, не пакідалі спробаў пашырыць сваю ўладу далей – не толькі на Закарпацце, але і на ўсход і на поўдзень. Сур'ёзнаю перашкодай гэтым агрэсіўным планам і нават прычынаю іх часовага прыпынення стала панаванне на гэтай тэрыторыі полаўцаў (у XII ст.), а яшчэ больш – вялікая татарская (мангола-татарская) навала, якая пракацілася па румынскіх землях, Польшчы і Вугоршчыне ў 1241–1242 гг. Полаўцы, чый цэнтр улады знаходзіўся на ўсходзе, заснавалі свайго роду «імперыю», якая сягала аж да Карпатаў, ахопліваючы, у прыватнасці, і Малдову, але потым яны растварыліся невялікімі групамі сярод славян і румынаў, хоць і паўплывалі на пэўныя палітыка-арганізацыйныя формы іх жыцця. Татары, як і ўсе качэўнікі, таксама прыйшлі з Усходу, выпальваючы ўсё на сваім шляху. Румыны, сэкеі, саксы, вугорцы спрабавалі аб'яднацца дзеля абароны пэўных сваіх агульных культурных каштоўнасцяў, але шкода ад мангола-татарскага нашэсця, у тым ліку ў дэмаграфічным плане, была вельмі значная. У 1242 г. татары адышлі на ўсход, іх вялізная «імперыя» распалася, але тыя з іх, хто асеў у паўночным Прычарнамор'і, утварылі там дзяржаву пад назваю Крымская Арда і яшчэ некалькі стагоддзяў перыядычна нападалі на румынскія тэрыторыі і Вугоршчыну. Як ужо адзначалася вышэй, менавіта дзеля абароны ад гэтых набегаў – у першую чаргу ўсходняга Баната і Алтэніі – вугорскі кароль спрабаваў запрасіць рыцараў-іаанітаў, аднак гэтая спроба аказалася няўдалай.

Нашэсце манголаў у Вугоршчыне, 1285 г. Ілюстрацыя з Вугорскай ілюстраванай Кронікі

Пасля таго, як ціск вугорцаў у выніку нашэсця мангола-татар паслаб, румынская дзяржаватворчасць на поўдзень ад Карпатаў зноў ажывілася і набыла сілу. Пад 1247 год летапісы згадваюць

Бела IV. Ілюстрацыя з Вугорскай ілюстраванай Кронікі

існаванне на гэтай тэрыторыі чатырох дзяржаўных утварэнняў: княства на чале з князем Ёанам – у паўднёвай Алтэніі; княства на чале з князем Фаркашам (так вугорцы літаральна пераклалі яго імя Лупу*) – у паўночна-ўсходняй Алтэніі; ваяводства на чале з Літавоем – у даліне ракі Жыў у Алтэніі і на поўдні Трансільваніі ў Зямлі Хацэгулуй; і ваяводства на чале з Сенеславам – уздоўж рэк Арджэш і Дымбовіца ў Валахіі (Мунтэніі). Вышэйзгаданыя княствы знаходзіліся ў пэўнай васальнай залежнасці ад вугорскага караля, хоць самі іх ваяводы былі амаль незалежныя. Самым магутным з іх, як уяўляецца, быў Літавой. Тым не менш прыкладна ў 1247 г. вугорскі кароль Бела IV забраў у яго Зямлю Хацэгулуй і абклаў яе сваім чыншам. Гэта, таксама як і ў цэлым вугорскі ціск з поўначы, зрабіла канфлікт з Вугорскім каралеўствам непазбежным. І ён выбухнуў пасля 1270 г., калі, відаць, ужо нашчадак Літавоя з такім самым імём (Літавой II) паспрабаваў пакласці канец залежнасці ад караля Вугоршчыны, а можа нават вярнуць сабе Зямлю Хацэгулуй. Аднак у бітве з вугорскім войскам Літавой быў забіты, а яго брат Бэрбат трапіў у палон, з якога вызваліўся толькі дзякуючы вялікаму грашоваму выкупу. Вярнуўшыся на радзіму і ўзначаліўшы ваяводства, ён быў вымушаны прызнаць вугорскі сюзерэнітэт.

Ад канца XII ст. і цягам усяго XIII ст. прыгнёт румынаў вугорцамі ўсё больш мацнее, вугорцы захопліваюць усё новыя землі, раздаючы іх прыхадням-пасяленцам. Асноўная агрэсія ў гэты перыяд (паміж 1200 і 1300 гадамі) скіравана на аддаленыя памежныя тэрыторыі,

---

* Lup (*рум.*) – воўк.

якія па-ранейшаму належалі румынам і захоўвалі румынскае кіраванне. Адным з такіх рэгіёнаў была Зямля Фэгэрашулуй, якая яшчэ ў 1222 г. згадваецца як тэрыторыя «Краіны румынаў». Аднак, акупаваўшы гэтыя землі каля 1200 г., новыя вугорскія ўлады перадалі іх манахам-цыстэрцыянам. Падобныя рабаўніцкія дзеянні падштурхнулі аднаго з незадаволеных румынскіх ваяводаў узняць супраць вугорскага караля паўстанне. Каля 1290 г. ён са сваёю дружынай у некалькі сотняў румынаў і ваяроў іншых народнасцяў перайшоў Карпаты і пэўны час аказваў вугорцам у гарах супраціў. Яго выступленне надало дадатковы імпульс працэсу аб'яднання і палітычнага згуртавання румынаў, які найбольш актыўна ішоў у Мунтэніі (Валахіі). Той ваявода згадваецца пад імёнамі Негру Водэ ці Раду Негру, але яго постаць авеяная легендамі: нямала фактаў, якія яго датычаць, немагчыма спраўдзіць у гістарычных крыніцах. Невядома таксама, у якіх сваяцкіх сувязях гэты ваявода, выхадзец з Трансільваніі, знаходзіўся з сынам Тахаміра ваяводам Басарабам, што стаў першым вядомым кіраўніком аб'яднанай і цэнтралізаванай Румынскай дзяржавы (прыкл. ад 1310 па 1352 г.). За час свайго доўгага кіравання яму ўдалося дасягнуць сама менш трох важных мэтаў: 1) ён здолеў рознымі спосабамі аб'яднаць усе дробныя ваяводствы і княствы на поўдзень ад Карпатаў; 2) ён дамогся поўнай незалежнасці ад Вугоршчыны, знайшоўшы зручны момант і спосаб адрынуць сюзерэнітэт гэтага каралеўства і зацвердзіўшыся як кіраўнік суверэннай дзяржавы; 3) сілаю зброі ён перамог агрэсара, сцвердзіўшы сваю самастойнасць, і здабыў міжнароднае прызнанне краіны, істотна падняўшы яе прэстыж.

Негру Водэ

Аб'яднанне палітычных утварэнняў, якія на той час існавалі паміж Дунаем і Карпатамі, адбывалася, відавочна, як мірнымі, так і збройнымі спосабамі. Найбольш складана было пераканаць алтэнскіх ваяводаў, у якіх тады ўжо склаліся ўласныя палітычныя і дынастычныя традыцыі. Але ўрэшце ўсе мясцовыя ваяводы

прызналі Басараба сваім законным сюзерэнам, і ён атрымаў тытул «вялікага ваяводы». Пад яго ўладаю знаходзіліся зямлі ад Алтэніі да Паўночнай Дабруджы і Паўднёвай Малдовы, г. зн. да вусця Дуная і Чорнага мора. З таго часу ўвесь гэты рэгіён у паўночным ніжнім Падунаўі – паводле імя заснавальніка Валахіі і закладзенай ім дынастыі – пачаў называцца Басарабіяй (Бесарабіяй). Тут дарэчы будзе спыніцца на тым, хто такі быў Басараба і што азначае яго імя. Нядаўна нашу ўвагу прыцягнула адна досыць цікавая кніга пра тое, што сярод нацыятворчых складнікаў у румынаў у немалой ступені прысутнічае і палавецкі, прычым не толькі ў палітычным, культурным і анамастыка-тапанімічным плане, але і ў этнічным. Гэтая ідэя не новая і мае дастаткова грунтоўную аргументацыю, якую пачаў распрацоўваць, пераважна з рамантычных пазіцый, яшчэ Багдан Хашдэу і працягнуў, у значна больш навуковым плане, Нікалае Ёрга. Але падыходзіць да яе трэба вельмі абачліва, каб пэўныя фармальна-кан'юнктурныя элементы ў аргументацыі не сталі асноватворнымі, асабліва калі гэтага не дазваляюць зрабіць крыніцы. Басараба – імя сапраўды цюркскага паходжання (палавецкага ці, дакладней, печанежскага), але ж і тады імёны давалі ў адпаведнасці з пашыранай модаю і не абавязкова ў адпаведнасці з этнічнай прыналежнасцю носьбіта. Імя Басарабавага бацькі – Тахамір / Ціхамір – таксама невядомага паходжання, яно можа быць як цюркскім, так і, што хутчэй за ўсё, славянскім. І самога Басарабу ўсе крыніцы, што дайшлі да нас, называюць румынам, які панаваў над румынамі. Арганізацыя ўлады ў яго ваяводстве мела выразныя рымска-візантыйскія і візантыйска-славянскія рысы са слабым і зусім нязначным уплывам з боку стэпавых «імперый». Няма таксама аніводнага дакладнага ўказання, якое б дазволіла прызнаць імаверную наяўнасць палавецкага складніка ў этнагенэзе румынаў. Пры лагічным аналізе рэчаў такі складнік, мабыць, і павінен быў існаваць, бо шмат у якіх месцах Ніжняга Падунаўя

Басараб I

румыны жылі ўперамешку з полаўцамі, але вызначаць яго вагу ў працэнтных адносінах рызыкоўна. Ва ўсякім разе дакладна вядома, што гэты складнік хутка «раствараўся» ў адмысловай раманскай і візантыйска-славянскай «рошчыне», чый уплыў на румынаў быў значна мацнейшы й, па сутнасці, вызначальны для іхняга лёсу. На маю думку, Басараба меў да цюркаў такое самае дачыненне, як пазнейшыя румынскія ўладары – Драгаш, Багдан, Мірча, Улад, Раду і г. д. – да старажытных славян, чые імёны яны насілі і чыя мова ўжывалася ў канцылярыях. Тут уся справа не ў нацыянальнай прыналежнасці, а ў цюркска-славянскай традыцыі румынскіх імёнаў.

Умацаваўшы ўладу, Басараба адкінуў вяршэнства вугорскага караля і вярнуў некаторыя землі, акупаваныя Вугоршчынай, зрабіўшыся ў выніку незалежным уладаром. У 1330 г. вугорскі кароль Карл Роберт рушыў у ваенны паход на Валахію, каб пакараць Басарабу. Імкнучыся пазбегнуць узброенага канфлікту, Басараба запатрабаваў перамоваў і прапанаваў былому свайму сюзерэну, сярод іншага, 7000 марак срэбрам (г. зн. больш за тону чыстага срэбра!). Вугорскі кароль адмовіўся і ўварваўся са сваім войскам у невядомы і варожы край, дзе ўсё здавалася апусцелым. Зразумеўшы, што не адолее Басарабу, кароль загадаў адыходзіць праз горы. Тут, у вузкай доўгай цясніне, якая ў старажытнай мове мела назву «пасада», вугорцаў атакавалі румыны, якія размяшчаліся на вяршынях. Бой, вядомы як «бітва пры Пасадзе», доўжыўся чатыры дні (9-12 лістапада 1330 г.) і завяршыўся для Карла Роберта сапраўднаю катастрофай:



Бітва пры Пасадзе. Ілюстрацыя з Вугорскай ілюстраванай Кронікі

загінуў «квет вугорскай шляхты», шмат вугорцаў патрапіла ў палон, румыны захапілі немалую здабычу, была страчана галоўная пячатка Вугорскага каралеўства, а сам кароль, пераапрануўшыся, змог выратавацца толькі ўцёкамі.

Пасля гэтай важнай перамогі міжнародны прэстыж Валахіі істотна павялічыўся, і яна сцвердзілася сярод незалежных еўрапейскіх дзяржаваў. У 1359 г., калі на пасад быў узведзены Басарабаў сын Нікалае Аляксандру (1352–1364), у тагачаснай сталіцы, горадзе-крэпасці Курця-дэ-Арджэш была заснаваная мітраполія Валахіі, кіраванне якой ажыццяўлялася непасрэдна з Візантыі. Такім чынам спрэчка паміж заходняй і ўсходняй цэрквамі за іерархічнае падпарадкаванне царквы ў Валахіі была вырашана на карысць Канстанцінопаля. У тагачаснай Еўропе палітычная ўлада любога сюзерэна мусіла быць легітымізаванаю царквой – адным з двух варожых адзін аднаму рэлігійных цэнтраў: Папскай курыяй або Канстанцінопальскай патрыярхіяй. Арыентацыя Валахіі на папскую тыяру магла б выліцца ў палітычнае падпарадкаванне гэтай дзяржавы Вугоршчыне, а якраз гэтага імкнуліся пазбегнуць румынскія ўладары. Таму яны ўрэшце павярнулі свае позіркі да Візантыі, якая магла прызнаць іх палітычную ўладу без навязвання ўласнай палітычнай апекі як непасрэдна, так і з дапамогай іншай краіны. Заснаванне мітраполіі ў Арджэшы было ўспрынята Вугоршчынаю як варожы акт і выклікала яе раздражненне, але справа была зробленая. З цягам часу стасункі з Вугоршчынай нармалізаваліся, перадусім з дапамогай шлюбных хаўрусаў, а таксама ў сувязі з неабходнасцю весці супольную барацьбу супраць татар.

6.8. «Другая румынская вольніца». Малдова

Пачынаючы з XII–XIII стст. на тэрыторыі паміж Карпатамі і Днястром таксама адзначаецца шэраг палітычных утварэнняў. Пры гэтым працэс палітычнага аб'яднання на гэтых землях адбываўся больш павольна, бо мясцовае насельніцтва нашмат часцей і даўжэй цярпела ад набегаў і рабунку качэўнікаў. Яны пачалі нападаць на Малдову раней, чым на Трансільванію і Валахію, – безупынку спусташаючы гэты край, зводзячы люд у палон і сістэматычна спаганя-

ючы даніну, – і спыніліся гэтыя напады значна пазней. Такія набегі рабіліся печанегамі, полаўцамі, а болей за ўсё татарамі.

Вугорскае каралеўства, часцяком супольна з Валахіяй, арганізоўвала супраць татар паходы на землі Малдовы, дзе адчувалася патрэба ў стварэнні магутнага ваеннага плацдарма для барацьбы з качэўнікамі. Утварэнне такога плацдарма магло быць здзейсненае за кошт пашырэння вугорскай палітычнай экспансіі на ўсход ад Карпатаў. Але такую самую мэту мела і Польшча, яшчэ адна каталіцкая дзяржава – гэтак сама, як Вугоршчына. На фоне ж польска-вугорскага суперніцтва ў Малдове працягвалі развівацца мясцовыя палітычныя ўтварэнні. Будучы абвешчанай «апостальскім каралеўствам», Вугоршчына актыўна выкарыстоўвала ў сваёй экспансіянісцкай палітыцы каталіцкую царкву, пасылаючы ў малдаўскія гарады каталіцкіх прапаведнікаў. Яшчэ да татарскага нашэсця, пад 1227 г., у Малдове, якую лічылі «палавецкай», бо пэўны час гэтую тэрыторыю палітычна кантралявалі полаўцы, было створанае каталіцкае біскупства. Але ў 1234 г. Рымскі папа мусіў прызнаць, што тэрыторыю біскупства насяляюць усё-такі румыны, якія непадуладны каталікам, бо маюць сваіх епіскапаў грэцкага (візантыйскага) абраду і свае палітычныя ўтварэнні. Неўзабаве, у сувязі з татарскім нашэсцем гэтае біскупства было знішчанае і адноўленае ўжо значна пазней і пад іншаю назвай. А на пачатку XIV ст. яго ўладанні ў Малдове знаходзіліся пад пагрозай «уладароў мясцовых земляў», якія, безумоўна, належалі да ўсходняга царкоўнага абраду. Відавочна, што рэлігійнае вяршэнства навязанай Вугоршчынаю каталіцкай царквы ў Малдове было немагчымым без палітычнай улады. І вугорскія каралі шукалі вырашэння гэтай праблемы. Рымскі Папа разумеў, што для паспяховай дзейнасці Касцёла ў Малдове, трэба, каб біскупы «адпавядалі мясцовай нацыі» (румынам), ведалі румынскую мову ці абіраліся з саміх румынаў. Вугорскі кароль таксама падзяляў гэтую думку. У Трансільваніі, Банаце, Крышане і Марамурэшы – тэрыторыях, непасрэдна акупаваных Вугоршчынай, – румынаў пражывала нямала. Іх можна было схіліць да супрацоўніцтва і, надзяліўшы місіяй, паслаць у Малдову.

У XIV ст. Марамурэш быў румынскім паветам у паўночнай частцы Трансільваніі, якая межавала з Малдовай, і перажываў пераходную

стадыю інтэграцыі ў склад Вугорскага каралеўства, застаючыся арганізаваным, як і адміністрацыйныя адзінкі Валахіі, у форме ваяводства. Тут па-ранейшаму дзейнічалі румынскія ўстановы, рэгулярна адбываліся агульныя сходы князёў (мясцовых румынскіх феадалаў), якія вырашалі бягучыя праблемы ваяводства і абіралі свайго ваяводу. Так ці іначай, Марамурэш усё яшчэ быў румынскім ваяводствам (як некалі і ўся Трансільванія), і яго поўная інкарпарацыя ў склад Вугоршчыны адбылася значна пазней. Аднак у XIV ст. вугорская каралеўская ўлада зрабіла спробу замяніць румынскія інстытуцыі (структура ваяводства, вярхоўная ўлада княскага сходу, вяршэнства румынскага заканадаўства і г. д.) на новыя, прынесеныя з Захаду (структура камітата, улада набілітэту, вяршэнства каралеўскага заканадаўства і г. д.). Пэўная частка румынскіх феадалаў у Марамурэшы палічыла за лепшае дзеля захавання маёмасці і ўлады прыстасавацца да новых умоваў, але астатнія катэгарычна іх не прынялі і нават выступілі супраць вугорскага караля са зброяй. Тым часам вугорскі ўплыў на ўсход ад Карпатаў перажываў відавочна няпэўны перыяд – як з прычыны незадаволенасці і паўстання румынаў, так і ў сувязі з ціскам Польшчы, якая імкнулася перацягнуць некаторых мясцовых лідараў на свой бок. Тады вугорскі кароль выбраў сярод марамурэшскіх румынаў-прыстасаванцаў, якія былі згодныя на супрацоўніцтва, вядомага мясцовага князя на імя Драгаш і ў сярэдзіне XIV ст. паслаў яго ў Малдову, каб схіліць тамтэйшае насельніцтва на свой бок; кіраваць жа той тэрыторыяй Драгаш павінен быў ад імя вугорскага ўладара. Маючы аднолькавае з мясцовым жыхарствам этнічнае паходжанне, Драгаш быў абраны ў адным з суседніх з Трансільваніяй і Марамурэшам раёне Малдовы

Малдаўскі ваявода Драгаш

ваяводам, заснаваўшы там нават сваю дынастыю, якая, праўда, пратрывала нядоўга. І ўсё ж мясцовыя румыны былі незадаволеныя вугорскім панаваннем і каталіцкім «місіянерствам», што падтрымлівалася Вугоршчынай. Гэтай сітуацыяй скарыстаўся іншы марамурэшскі румын на імя Багдан. У Марамурэшы ён быў ваяводам (г. зн. кіраўніком краю), хоць уваходзіў у групоўку тых, хто быў незадаволены вугорскім панаваннем. Урэшце Багдан падняў у Марамурэшы паўстанне, якое не згасала на працягу двух дзесяцігоддзяў (1342–1362), а потым на чале атрада з адной-дзвюх соцень праваслаўных князёў, пераваліўшы цераз горы, сышоў у Малдову. Малдоўскія жыхары прынялі яго прыхільна і, прагнаўшы Драгашавых нашчадкаў ды сваякоў, абвясцілі незалежнасць Малдовы ад Вугоршчыны. Так узнікла другая незалежная румынская дзяржава, якая захавалася да Новага часу. У 1365 годзе вугорскі кароль, сын таго, што быў разбіты Басарабам у бітве пры Пасадзе, паслаў супраць Багдана войска, але румынскі ваявода выйшаў пераможцам, умацаваўшы тым самым міжнароднае становішча сваёй краіны. Малдоўскія князі прызналі Багдана сваім «вялікім ваяводам», а яго нашчадак Раман I з 1390 года ўзяў сабе ганарлівы тытул гаспадара і «вялікага адзінаўладнага кіраўніка» Малдаўскай дзяржавы «ад горных вяршыняў да марскіх берагоў». Цягам некалькіх дзесяцігоддзяў войску малдоўскага

Багдан I Заснавальнік. Партрэт П'ера Бэле

Роман I Мушат

ўладара дзе мірна, а дзе збройна ўдалося пашырыць тэрыторыю сваёй дзяржавы да натуральных межаў – ад Усходніх Карпатаў да Днястра і ад паўднёвай рысы польскіх уладанняў да Чорнага мора. У 80-я гады XIV ст. у Малдове (з пэўнымі цяжкасцямі) была заснаваная мітраполія, якая падпарадкоўвалася Візантыі і адыгрывала тую ж палітычную ролю, што і адпаведная ўстанова ў Валахіі. Гэтак сама, як і Басараб, Багдан заснаваў у Малдове сваю дынастыю. І дзве гэтыя румынскія дынастыі – Басарабаў у Валахіі і Багданештаў (або Мушацінаў*) у Малдове – кіравалі румынскімі княствамі аж да канца XVII ст. Адносна назвы «Малдова» пасля 1989 года ўзнікла пытанне, бо камуністы ў апошняе дзесяцігоддзе свайго кіравання ўпарта пазбягалі называць яе «румынскай дзяржавай» або «румынскай дзяржавай Малдова». Зрэшты, такое ўдакладненне, можа, і не зусім абавязковае, бо Малдову яшчэ з часоў Сярэднявечча называлі менавіта «румынскай дзяржавай», прычым як ва ўнутраных дакументах, у т. л. у дзяржаўных канцылярыях, так і ў замежных крыніцах. У Польшчы яе называлі нават няйначай як «Румынская дзяржава», а вось дзяржава на поўдзень ад Карпатаў мела ў палякаў назву «Мультан» (*Multany*), што, відавочна, ёсць скажонай формай ад назвы Мунтэнія. Малдова, безумоўна, мела ў Сярэднявеччы шмат розных найменняў, і іх усе можна згадваць, але не робячы пры гэтым упор на нейкіх прапагандысцкіх ці іншых мэтах. Памылка гістарыёграфаў камуністычнага перыяду якраз і палягае ў тым, што, пераследуючы свае палітычныя і нацыяналістычныя мэты, яны пакінулі ва ўжытку толькі адно найменне.

Нягледзячы на набегі качэўнікаў і агрэсію суседзяў румыны здолелі стварыць у IX–XIV стст. дзве ўласныя дзяржавы, якія праіснавалі да нашага часу, стаўшы тым палітычным падмуркам, які дапамог ім абараніць і захаваць сябе, як народ. Да гэтых дзяржаваў цягнуліся і іншыя румыны, якім выпала жыць пад уладай замежнікаў, у першую чаргу – вугорцаў. Арганізацыя румынскіх дзяржаваў грунтавалася на рымска-візантыйскай спадчыне і візантыйска-

---

* Назва дынастыі паходзіць ад мянушкі, дадзенай дачцэ Багдана I Магдалене, – Мушата, што значыць «прыгожая» (*заўв. перакладчыка*).

славянскім досведзе, але таксама і пры пэўным уплыве «імперый» печанегаў і полаўцаў. У сваім канчаткова сфарміраваным у XIV ст. выглядзе дзве гэтыя дзяржавы – ваяводства і «гаспадарства», ці, іншымі словамі, княствы – былі перадусім румынскімі ўтварэннямі, і іх справядліва называлі «румынскімі краінамі», бо імі кіравалі румынскія князі, чыімі падданымі былі галоўным чынам румыны. «Уладаранне над усімі румынскімі землямі», – менавіта так казаў згаданы вышэй Нікалае Ёрга* пра гэтыя румынскія дзяржавы і іх уладароў, перафразуючы традыцыйнае за часамі Рымскай імперыі выслоўе *dominatio totius terrae romanae***, што пазней мела досыць розныя інтэрпрэтацыі, але ў яго вуснах гэта адлюстроўвала рэальнасць, у якой жылі тагачасныя румыны, і сімвалізавала іх здольнасць да палітычнай арганізацыі ў вышэйшай форме.

6.9. Сярэднявечныя румынскія інстытуцыі

Дзяржаўныя інстытуцыі з'яўляюцца падмуркам арганізацыі любога грамадства; у часы Сярэднявечча да іх належалі вышэйшае кіраўніцтва краіны (ваявода, уладар), прыдворная рада і вяльможы, вальны сойм, установы мясцовай адміністрацыі, царква, суд і войска. На тэрыторыі Румыніі гэтыя інстытуцыі фарміраваліся ў рэчышчы рымска-візантыйскай, візантыйска-славянскай і заходняй традыцый. Стваралісь і падтрымліваліся яны прадстаўнікамі новай феадальнай эліты, якая склалася пасля ўтварэння цэнтралізаваных дзяржаваў, трансфармаваўшыся і вылучыўшыся са старажытнай верхавіны, што існавала яшчэ з позднеантычнай эпохі і перыяду качэўніцкіх войнаў. У Валахіі і Малдове феадалаў называлі баярамі, паходзілі яны пераважна з старажытных родаў князёў і ваяводаў. Трансільванскіх жа феадалаў у лацінскіх актах называлі, на ўзор Заходняй Еўропы, нобілямі; паходзілі яны пераважна з эліты вугорскіх заваёўнікаў. З цягам часу і пры выкананні пэўных умоваў да ліку нобіляў («высакародных») пачалі залучаць і кіраўнікоў саксаў і сэкеяў і нават

---

* Нікалае Ёрга (1871–1940) – румынскі гісторык, пісьменнік і дзяржаўны дзеяч, старшыня Палаты дэпутатаў (1919–1920), прэм'ер-міністр Румыніі (1931–1932).

** Рымскае ўладарства над усім светам (*лат.*)

частку румынскіх князёў ды ваяводаў. І гэтая верхавіна, асабліва пачынаючы з XVI ст., пачала лічыцца элітай вугорскай нацыі нягледзячы яе даволі стракатае этнічнае паходжанне.

Ваявода і гаспадар

Тытул ваяводы мелі вярхоўныя кіраўнікі ўсіх трох румынскіх дзяржаваў, да якіх мы адносім і Трансільванію, улічваючы яе пераважна румынскі этнічны склад і прыналежнасць да Румыніі. Праўда, ні ў перыяд Сярэднявечча, ні ў Новы час Трансільванія ў палітыка-адміністрацыйным плане не была румынскай краінай, бо румыны ў ёй афіцыйна не прызнаваліся за асобны складнік дзяржавы і не маглі ўдзельнічаць у яе кіраўніцтве. Што да назвы «ваявода», то яна – славянскага паходжання і азначае вайсковага кіраўніка, які на лацінскай мове называўся «правадыром» (*dux*). Слова «ваявода», разам са шматлікімі іншымі, увайшло ва ўжытак у перыяд супольнага жыцця лацінамоўнага насельніцтва са славянамі, калі вярхоўныя кіраўнікі паходзілі з ліку правадыроў прышлых плямёнаў. Мяркуючы па ўсім, у ранняй румынскай мове існавала і слова *ducă* («дука») – ад лацінскага *ducem* (акузатыў ад *dux* «правадыр»), – але пазней яно было выцесненае іншым тэрмінам («ваявода»), які захаваўся дзякуючы таму, што ў адміністрацыйным справаводстве тады выкарыстоўвалася стараславянская мова. У Трансільваніі, пасля яе заваявання вугорцамі, ваявода ператварыўся з незалежнага кіраўніка проста ў высокага саноўніка (другога ці трэцяга ў дзяржаўнай іерархіі), які прызначаўся каралём Вугоршчыны і быў ягоным васалам. Улада трансільванскага ваяводы пашыралася на сем камітатаў (адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак Вугорскага каралеўства, якія ўваходзілі ў склад Трансільваніі), а ў пэўныя перыяды (ад імя вугорскага караля) – і на землі, дзе жылі саксы і сэкеі, прычым трансільванскі ваявода набываў адначасова і тытул кіраўніка гэтых камітатаў. Разам з тым пад уладу трансільванскага ваяводы не падпадалі іншыя акупаваныя зямлі з румынскім насельніцтвам, якія знаходзіліся на захад і ўсход ад Трансільваніі (Банат, Крышана, Марамурэш і інш.). Трансільванскі ваявода быў надзелены адміністрацыйнымі, судовымі і ваеннымі паўнамоцтвамі, асабіста прызначаў сваіх намеснікаў, найважнейшым сярод якіх

быў віцэ-ваявода; ён меў уласнае справаводства. У канцы XIII ст. некаторыя трансільванскія ваяводы, скарыстаўшыся з крызісу Вугорскага каралеўства, паўставалі супраць сваіх гаспадароў, стваралі свае незалежныя інстытуцыі, уступалі ў сваяцкія сувязі з праваслаўнымі ўладарамі Балканскіх краін, ладзілі свае вальныя сходы (парламенты), незалежныя ад вугорскіх, і рабілі ўсё, каб стаць цалкам незалежнымі. Адным з такіх магутных ваяводаў у пачатку XIV ст. быў Ладзіслаў Кан, які нават, кінуўшы гэтым выклік Папу Рымскаму, сам сябе каранаваў і дзейнічаў як поўны сюзерэн. І ўсё ж у часы Сярэднявечча гэты край уздоўж Карпацкай дугі, які складаўся з сямі пераважна румынскіх камітатаў (з украінамі саксаў і сэкеляў), падпарадкоўваўся вугорскаму каралю, хоць і меў у складзе Вугорскага каралеўства аўтаномны статус і ў гістарычных крыніцах часта пазначаўся як *regnum* (каралеўства).

У Валахіі і ў Малдове цэнтральная ўлада была прыкладна такая самая, як у караля на Захадзе. Найвышэйшы кіраўнік называўся «вялікім ваяводам» – ён стаяў на чале войска і «гаспадарыў» над дзяржаваю і сваімі падданымі. Адпаведна сярэднявечнай ідэалогіі, ён атрымліваў сваю пасаду «з божае ласкі» і з волі нябёсаў дзейнічаў як «памазаннік божы» – роўняй яму мог быць толькі Бог. На гэтым факце трымалася незалежнасць дзяржавы, і боскае паходжанне ўлады, як і ва ўсім сярэднявечным свеце, давала кіраўніку дзяржавы неабмежаваную ўладу (аўтакратыю). Трансільванскі ваявода не мог называцца «ўладаром», бо вышэйшую ўладу ў той дзяржаве меў кароль Вугоршчыны. Менавіта вугорскі кароль быў «гаспадаром», бо ён і быў «памазаннікам Божым». Перадача ўлады ў Малдове і Валахіі была спадчынна-выбарнай. Тэарэтычна на пасад мог узысці любы здаровы «целам і духам» мужчына-прадстаўнік уладаровай сям'і – сын, унук ці пляменнік дзейснага ўладара, – пры ўмове, што яго абвесціць уладаром вальны сойм. Нярэдка найбольш магутныя ўладары самі абвяшчалі сваіх сыноў пераемнікамі яшчэ пры жыцці. Румынскія ўладары ўзначальвалі войска, былі найвышэйшымі суддзямі, старшынявалі на пасяджэннях рады і вальных соймаў, стаялі на чале царквы, прымалі заканадаўчыя акты і пастановы па правах уласнасці, валодалі вярхоўным правам на ўсе землі дзяржавы і г. д. Іначай кажучы, у руках уладара канцэнтравалася ўся ўлада.

Прыдворная рада

Пачынаючы ўжо з XIV ст. уладар меў пры сабе Раду – групу буйных феадалаў, куды ўваходзілі і яго сваякі, якія дапамагалі ўладару ў выкананні разнастайных дзяржаўных функцый. Пасля яны атрымалі канкрэтныя ўрадавыя пасады. Найбольш значнымі ўраднікамі былі:

- падкаморы (vornicul) – ураднік двара, адказны за сядзібу манарха;
- канцлер / лагафет (logofătul) – кіраўнік дзяржаўнай канцылярыі, адказваў і за знешнія зносіны;
- падскарбі (vistierul) – апекаваўся дзяржаўнай скарбніцай і даходамі дзяржавы;
- мечнік (spătarul) – ваенны кіраўнік, як правіла, начальнік конніцы;
- падчашы (paharnicul) – адказваў за напоі, што падаваліся да ўладаравага стала;
- стольнік (stolnicul) – загадваў абслугоўваннем уладаравага стала і падачай страваў пры ўрачыстых трапезах;
- канюшы (comisul) – адказваў за ўладаравыя стайні;
- пасцельнічы (postelnicul) – тайны дарадца ўладара, і інш.

Тытулы ўраднікаў былі агульныя ва ўсіх трох сярэднявечных румынскіх дзяржавах, але рада трансільванскага ваяводы была колькасна меншая і яе функцыі былі абмежаваныя. Часам пры слабым ваяводзе рада практычна кіравала краінай, і наадварот, калі ўладар быў аўтарытарны, рада склікалася збольшага фармальна. Тэарэтычна, калі гаспадар адсутнічаў ці не мог выконваць свае паўнамоцтвы, раду ўзначальваў мітрапаліт дзяржавы, але ў рэальнасці найважнейшая роля ў такім выпадку належала ў Валахіі бану (намесніку) Алтэніі, а ў Малдаўскім княстве – найчасцей кашталяну сучáўскаму*. Прыдворная рада была, па сутнасці, папярэднікам сучасных урадаў, дзе ўраднікі выконвалі ролі міністраў.

---

* Сучáва – былая сталіца Малдаўскага княства (1365–1565), сёння – цэнтр аднайменнага жудэца ў Румыніі.

Вальныя соймы, або агульнадзяржаўныя сходы

Сярэднявечнае грамадства было падзеленае на станы (або прывілеяваныя групы), адасобленыя ад астатняй часткі непрывілеяванага насельніцтва, якая складала большасць. Да прывілеяваных груп ці станаў (саслоўяў) належала знаць (свецкія феадалы), духавенства і вольныя людзі, пераважна гараджане, якія самі зараблялі на сваё жыццё. У румынскіх дзяржавах структура станаў мела пэўную спецыфіку, бо, з аднаго боку, гарады ў іх былі яшчэ не дастаткова развітыя, а з другога, этнічны склад насельніцтва Трансільваніі быў досыць своеасаблівы. Так, у Валахіі і Малдове існавалі станы царкоўнікаў, феадалаў і дзяржаўных службоўцаў – прыдворных, вайскоўцаў і гаспадаравай абслугі. Для вырашэння важных пытанняў уладар і яго рада склікалі вальны сойм, які фарміраваўся якраз з прадстаўнікоў духавенства, феадалаў (баяр) і вайскоўцаў. На сойме выбіраўся кіраўнік дзяржавы, прымаліся важныя гаспадарчыя і фінансавыя рашэнні, абмяркоўваліся мірныя дамовы і магчымасць прызнання васалітэту, вырашаліся пытанні, звязаныя з пачаткам або заканчэннем войнаў, вызначалася знешняя палітыка і да т. п.

Трансільванія не была цалкам незалежнай краінай, але таксама збірала свае асобныя соймы. Спачатку, да канца XIII ст., яны праводзіліся пад старшынствам трансільванскага ваяводы і на іх з'язджалася кіраўніцтва сямі камітатаў для вырашэння эканамічных, адміністрацыйных і, перш за ўсё, юрыдычных пытанняў. Неўзабаве разам са шляхтай на іх пачалі запрашаць і прадстаўнікоў саксаў, сэкеяў і румынаў (упершыню – у 1291 годзе), і яны пачалі праводзіцца пры старшыняванні караля. Такім чынам соймы ў Трансільваніі ўжо ад пачатку мелі пэўную этнічную прыкмету, а з канца XV ст. набылі выразна нацыянальныя рысы. Гэтыя соймы прадстаўнікоў розных станаў называлі таксама агульнымі сходамі. Аднак неўзабаве пасля поўнага заваявання Трансільваніі румыны, стаўшы народам падпарадкаваным, але застаўшыся праваслаўным (у сувязі з чым іх называлі «схізматыкамі»), пачалі дыскрымінавацца і ў XIV ст., за каралём Людвікам I Вялікім (1342–1382), былі ўвогуле выключаныя са складу ўдзельнікаў соймаў. Румынам не дазвалялася займаць кіроўныя пасады, бо яны не належалі да ліку «прывілеяваных», або, кажучы інакш, не мелі засведчаных дакументальна паўнамоцтваў –

так званых «прывілеяў». Кіраванне Трансільваніяй засталося ў руках трох станаў, або «аб'яднаных нацый» (што складаліся з набілітэту вугорцаў, саксаў і сэкеяў), якія спачатку называліся «братэрскім саюзам», а пазней – «уніяй трох нацый».

Соймы з удзелам прадстаўнікоў розных станаў былі тымі інстытуцыямі, якія папярэднічалі сучасным парламентам, хоць іх чальцы не абіраліся, а прызначаліся – згодна са знатнасцю паходжання, сацыяльным статусам і г. д. – з прадстаўнікоў пэўных прывілеяваных груповак.

Адміністрацыйна-тэрытарыяльная будова

Усякая краіна складаецца звычайна з меншых тэрытарыяльных адзінак, якія могуць мець розныя назвы – ад правінцый і дэпартаментаў да дыстрыктаў і камітатаў. Асобныя дзяржавы – федэрацыі – складаюцца нават з некалькіх краінаў, як, напрыклад, Германія, якую ўтвараюць федэральныя землі (*ням.* Land). Румынскія дзяржавы таксама падзяляліся на меншыя ўтварэнні, якія, як правіла, паступова аб'яноўваліся вакол палітычных цэнтраў, што існавалі да фарміравання цэнтралізаваных дзяржаваў. Адны такія ўтварэнні таксама называліся землямі (*рум.* țări ад *лац.* Terrae, землі), другія – княствамі ці ваяводствамі. Пасля іх аб'яднання ў Малдове адзінкі, на якія падзялялася яе тэрыторыя, пачалі называць валасцямі, або цінýтамі (*рум.* Ţinuturi), а ў Валахіі – паветамі, або жудэцамі (*рум.* Judeţe). Цэнтрамі такіх тэрытарыяльных адзінках, як правіла, былі мястэчка (з рынкавай плошчай) ці крэпасць, дзе меў сядзібу прадстаўнік уладара. Адны паветы атрымлівалі сваю назву па імёнах рэк, на берагах якіх знаходзіліся (напр., Арджэш, Дымбовіца, Верхні Жыў (Горж), Ніжні Жыў (Долж), Бузэў, Прáхава, Мотру і г. д.). Другія называліся Жалеш, Вылча, Балтэ, Ілфаў, Брэіла, Пэдурэц і г. д. Сярод воласцяў (цінýтаў) варта згадаць такія, як Бакэў, Баташáнь, Хацíн, Чатáця-Áлбэ (сёння Білгарад-Дністроўскі), Ясы, Нямц, Роман, Тротуш, Сарока, Тутова, Цэціна, Кілія, Чарнаўцы, Лэпушна і г. д.

У Трансільваніі да яе заваявання вугорцамі і «гасцявой» каланізацыі ўсе землі належалі румынам, яны мелі свае княствы і герцагствы. Пазней на гэтых землях, падораных нобілям, вугорскае каралеўства ўтварыла камітаты з цэнтрамі ў старажытных крэпасцях,

якія некалі належалі мясцовым насельнікам, куды вугорскія каралі дасылалі сваіх прадстаўнікоў для кіравання камітатамі. На чале мясцовай улады ў кожным з сямі трансільванскіх камітатаў (Унутраны Сальнок, Дэбыка, Клуж, Ту́рда, А́лба, Хунэдаа́ра і Тырна́ва) стаяў ваявода. На захадзе ж рэгіёна, дзе таксама пераважала румынскае насельніцтва, камітаты непасрэдна ўваходзілі ў склад Вугорскага каралеўства (Біхор, Тыміш, Ара́д, Караш, Заранд, Сату Марэ, Марамурэш і інш.). Камітаты ўтвараліся паступова па меры здабыцця земляў з захаду на ўсход. Найбольш старажытныя камітаты, напрыклад, Біхор (найбліжэйшы да ўласна вугорскіх земляў), узніклі на пачатку XII ст., а найбольш познія, напрыклад, Тырнава (самы ўсходні), вядомыя з XIII ст. Кіравалі імі ад імя караля прадстаўнікі знаці (нобілі), якія і фарміравалі ўласныя ўладныя ўстановы і інстытуцыі. Найважнейшай сярод такіх інстытуцый быў камітацкі сойм, які збіраўся дзеля вырашэння мясцовых пытанняў, пераважна праўнага парадку. Паколькі трансільванскі ваявода склікаў вальны сойм усіх сямі камітатаў, асобныя камітацкія соймы тут пачалі паступова страчваць сваё значэнне і ператварыліся ў звычайныя судовыя паседжанні, а тое і зусім зніклі. Сем гэтых камітатаў былі згрупаваныя такім чынам, што па сутнасці ўтваралі адно тэрытарыяльнае цэлае.

Саксы, што жылі сярод румынаў пераважна на поўдні Трансільваніі, атрымалі ад вугорскага караля адмысловую тэрыторыю, якая пачала насіць назву «Сакскай зямлі», або «Каралеўскай зямлі» (бо была выдзеленая вугорскім каралём – іх найвышэйшым уладцам). Першапачаткова яна была адным вялікім камітатам, але неўзабаве падзялілася на сем цэнтраў, або пасадаў (*лац.* sedes), ад якіх пазней аддзяліліся яшчэ два. Найважнейшым сярод іх быў горад Сібіў (*лац.* Cibinium, *ням.* Hermannstadt). Два сакскія дыстрыкты – Брашоў (*лац.* Corona, *ням.* Kronstadt) і Бістрыца – апынуліся ізаляванымі ад астатніх гарадоў-пасадаў. Вярхоўным кіраўніком саксаў вугорскі кароль прызначаў аднаго з кіраўнікоў камітатаў, што ўваходзілі ў склад Трансільваніі: часам ім мог быць нават трансільванскі ваявода. У кожным горадзе-пасадзе праводзіліся мясцовыя соймы, прадстаўнікі ад якіх накіроўваліся на вальны сойм усіх сакскіх гарадоў. У XV ст. у саксаў ужо была свая згуртаваная грамада, якая

называлася задзіночаннем (*universitas*) і адыгрывала вельмі актыўную ролю ў супольнасці трансільванскіх нацыянальных грамадаў.

Сэкеі, што жылі пераважна на ўсходзе Трансільваніі, таксама называлі сваю тэрыторыю паводле этнічнай прыкметы – «Зямлёю сэкеяў», хоць разам з імі тут жылі і падпарадкаваныя ім румыны. Гэтая зямля таксама падзялялася на сем цэнтраў-«пасадаў», найважнейшым з якіх быў Адархэй (сённяшняя поўная назва – Адархэю-Сэкуеск, Odorheiu Secuiesc, што значыць «Сэкейскі двор»). На чале іх стаяў прызначаны каралём магнат, якога часта выбіралі сярод трансільванскіх ваяводаў. Лад жыцця сэкеяў меў шмат агульнага з сакскім, хоць быў больш архаічным і не такім развітым. Сэкеяў было колькасна менш, чым саксаў; яны жылі ў горнай мясцовасці з халодным кліматам, не мелі гарадскіх паселішчаў і старадаўніх рамесных традыцый.

Румыны жылі ў Трансільваніі паўсюдна, але пасля іх заваявання і падпарадкавання Вугорскім каралеўствам ды наступнага наплыву вугорскага, нямецкага (сакскага) і сэкейскага насельніцтва афіцыйна не валодалі тут ніякімі тэрыторыямі, якія б належалі ім непасрэдна, хоць і спрабавалі стварыць свае аўтаномныя ўтварэнні. Іх шматлікія землі былі канфіскаваныя і раздораныя новым прышлым уладальнікам. Старажытнае тэрытарыяльнае ўпарадкаванне румынаў было перакроенае і пераразмеркаванае паміж навастворанымі камітатамі і гарадамі-пасадамі. І ўсё ж старыя традыцыйныя ўтварэнні – княствы і ваяводствы – не маглі быць знішчаныя хутка і цалкам, шмат якія з іх па-ранейшаму пазначаліся ў лацінскіх актах як «румынскія дыстрыкты» (*лац.* Districtus Valachorum) і захоўваліся ўнутры камітатаў і на землях, падораных саксам і сэкеям на працягу дзесяцігоддзяў і нават стагоддзяў. Цяпер маюцца звесткі пра амаль шэсцьдзясят такіх дыстрыктаў, палова з якіх знаходзілася ў Банаце – напр., Хацэг, Фэгэрáш, Марамурэш (адзінае румынскае ваяводства, цалкам ператворанае ў асобны камітат), Карансэбеш, Лýгаж, Бэюш, Медыэшул-Аўрыт і інш. У гэтых дыстрыктах румыны спрабавалі захоўваць свае адміністрацыйныя і судовыя інстытуцыі, асабліва пасля таго як былі пазбаўленыя тытула дзяржаўнай нацыі. Гарады ў румынскіх землях напачатку выглядалі як вялікія вёскі, хоць часам і яны былі абнесеныя абарончымі валамі і равамі. Але

ў заходнім разуменні гарадское жыццё пачало прыходзіць сюды паступова разам з нямецкімі каланістамі. І таму да сярэдзіны XIV ст. ва ўсіх гарадах і мястэчках, якія на той час існавалі ў Вугошчыне і Трансільваніі (на лаціне іх называлі *civitates*, па аналогіі з бургамі – сярэднявечнымі замкамі), нямецкае насельніцтва пераважала. На чале кожнага горада стаяў галава (суддзя), пры якім існавала рада, складзеная з 12 законнікаў (прысяжных лаўнікаў). Тагачасныя гарады ў Вугоршчыне служылі каралю апорнымі пунктамі ў барацьбе з буйнымі феадаламі. У адрозненне ад Валахіі і Малдовы, дзе амаль ва ўсіх гарадах паступова пачало пераважаць румынскае насельніцтва, у Трансільваніі гарады заставаліся нямецкаю вотчынай, дзе паволі павялічвалася доля вугорскага насельніцтва, а вось румынам у гарадах і асабліва ў цэнтрах камітатаў сяліцца забаранялася.



Фэгэрашская крэпасць

Царква

У Сярэднявеччы чалавек не ўсведамляў жыцця па-за царквою і рэлігіяй. Таму царква мела вялікі ўплыў на грамадства, прычым не толькі ў духоўных, але і ва ўсіх іншых пытаннях – ад права валодання зямлёй да вырашэння судовых зыскаў.

Раней было паказана, як пачынаючы з II–III ст. і цягам некалькіх наступных стагоддзяў сярод румынаў паступова пашырылася хрысціянства. У гэтым плане румыны адрозніваюцца ад сваіх суседзяў, якія прыходзілі з усходу ў розны час і пачыналі знаёміцца з хрысціянскім вучэннем толькі з моманту свайго прыходу. Вугорцы, напрыклад, трапілі ў Панонію ў 896 г. і хрысціянізаваліся збольшага толькі пад 1000 г.; протабалгары прыбылі на Балканы пад 680 г. і пераважная іх большасць прыняла слова Божае прыкладна ў 864 ці 865 гг. Хрысціянізацыя ў гэтых народаў адбывалася зверху ўніз намаганнямі іх уплывовых правадыроў – такіх, як Іштван I Святы

ў вугорцаў ці Барыс I (у хрышчэнні Міхаіл) у балгар. Ні ў румынаў, ні ў іншых аўтахтонных насельнікаў рэгіёна – грэкаў, албанцаў – нічога падобнага не назіралася. Калі на тэрыторыі Румыніі яшчэ толькі фарміраваліся першыя дзяржаўныя ўтварэнні, сярод румынаў ужо існавала народная хрысціянская традыцыя і была свая царкоўная арганізацыя (вядома, неканонічная). З прычыны свайго геаграфічнага становішча і наяўнасці пэўных перашкод у сувязях з Рымам (як Старым, так і Новым – Канстанцінопалем) румыны стварылі сваю царкоўную структуру на ўзор той, што была ў паўднёвых славян (славянізаваных балгар). Так яны сталі адзіным раманскім народам усходняга (візантыйскага) абраду. Іерархічна іх царква падпарадкоўвалася канстанцінопальскаму патрыярху, а мовай набажэнстваў, дзяржаўнага справаводства і кніжнай (пісьмовай) культуры стала старославянская мова. Хрысціянскія епіскапаты на тэрыторыі сучаснай Румыніі існавалі яшчэ з IV ст. (у Дабруджы), аднак структурна арганізаваныя і трывалыя сувязі з Візантыяй ды яе ўладаннямі на Балканах утварыліся толькі ў XI–XIII стст. Маюцца шматлікія сведчанні аб дзейнасці епіскапатаў у Банаце, Крышане, Трансільваніі, але яны не маглі аформіцца дэ-юрэ з прычыны адсутнасці там румынскай дзяржаўнасці. Затое на поўдзень і на ўсход ад Карпатаў з XIV ст. былі створаныя праваслаўныя мітраполіі з цэнтрамі ў Арджэшы, Сучáве, а пазней – у Тыргавíштэ і Бухарэсце (у Валахіі) і ў Ясах (у Малдове).

Канкурэнцыя двух царкоўных цэнтраў (Рыма і Канстанцінопаля) пачалася на тэрыторыі Румыніі здаўна і асабліва ўзмацнілася пасля таго, як Вугоршчына ператварылася ў «апостальскае каралеўства» з місіянерскаю роляй акаталічваць «паганцаў, ерэтыкоў і схізматыкаў». Пасля 1054 г., калі дзве царквы афіцыйна разарвалі адносіны, заходнія хрысціяне пачалі называць усходніх «схізматыкамі» (г. зн. раскольнікамі, якія парвалі адносіны з Рымам). У Трансільваніі каталіцызм падтрымліваўся вугорскай дзяржавай і прышлым з захаду вугорскім насельніцтвам, а таксама саксамі і сэкеямі. У XI–XII стст. тут паслядоўна, па меры падпарадкавання тэрыторыі, паўсталі першыя біскупствы рымскага (каталіцкага) абраду ў Чанáдзе, Арадзе і Алба-Юліі. Пазней было заснавана згаданае вышэй палавецкае біскупства, а крыху яшчэ пазней – біскупствы

ў Бая і Бакэў (у Малдове) і ў Арджэшы (у Валахіі). У XIV ст. Анжуйская дынастыя афіцыйна абвясціла каталіцызм у Вугоршчыне, як сказалі б цяпер, «дзяржаўнай рэлігіяй». Тым не менш і пад 1380 год, нягледзячы на шырокую кампанію навяртання ўсіх у «адзіную веру» (каталіцызм), толькі крыху больш за траціну насельніцтва каралеўства спавядала каталіцызм. Натуральна, у дзяржаве, афіцыйна абвешчанай каталіцкай, як гэта адбылося ў Вугоршчыне, юдэі, мусульмане і праваслаўныя не маглі мець прывілеяў. Так трансільванскія румыны, будучы народам праваслаўным і збройна падпарадкаваным, сталі грамадзянамі «другога гатунку», у якіх быў толькі адзін выбар: або прыняць каталіцтва, або, у адваротным выпадку, жыць у варунках дыскрымінацыі.

Царква ў Рэдэўці, некропаль першых уладароў Малдовы

Правасуддзе

Старажытнае румынскае права (*ius valachicum*) абапіралася на трывалыя старажытнарымскія традыцыі і ўжывалася паўсюдна ва ўсіх румынскіх супольнасцях. З часам асобныя феадальныя ўтварэнні пачалі ўводзіць уласнае заканадаўства, спачатку – у Трансільваніі, на заходні ўзор, потым – у Валахіі і Малдове, на ўзор візантыйскі. Судовыя інстанцыі вызначаліся разнастайнасцю, пачынаючы ад старажытнага, сельскага суда, які складаўся з «людзей добрых і паважаных», суда феадальнага (з прадстаўнікоў баярства, «шляхты») і тэрытарыяльнага (у павеце, краі, камітаце, дыстрыкце і г. д.) да найвышэйшага – у асобе кіраўніка краіны. Найвышэйшым суддзёй быў уладар (кароль), толькі ён зацвярджаў смяротныя пакаранні. Часам, аднак, гэтае права делегавалася прадстаўнікам мясцовай арыстакратыі, якая самастойна выносіла вердыкт пры разглядзе найбуйнейшых злачынстваў.

Войска і сістэма абароны

Ва ўсіх трох сярэднявечных румынскіх дзяржавах ваявода (кіраўнік) быў адначасова і вярхоўным вайскаводам, што і засведчваў яго тытул. Войска складалася пераважна з феадалаў, чыёй асноўнай задачай якраз і быў удзел у войнах і бітвах. У Трансільваніі намаганнямі магнацтва і каталіцкага біскупа з Алба-Юліі набіралася значнае войска, да якога далучаліся атрады саксаў і сэкеяў. Вялікую ролю ў трансільванскім войску мелі і румынскія князі, чые выключныя ваенныя заслугі ў абароне Вугорскага каралеўства пэўным чынам узнагароджваліся (яны маглі афіцыйна атрымліваць шляхецкія прывілеі). У Валахіі і Малдове войска фарміравалася пад сцягам гаспадара і складалася з баярскіх атрадаў, фарміраванняў свабодных сялян і гараджан. Паводле некаторых італьянскіх крыніц, у XV ст. румынскія гаспадаркі маглі разам выставіць дзеля адпору асманскай агрэсіі каля 100 000 чалавек – конніцы і пяхоты. Калі небяспека асабліва ўзрастала, асобныя феадалы прыцягвалі для барацьбы і сваіх прыгонных. Узбраенне войска было тыповым для сярэднявечнай Еўропы. З XV–XVI стст. пачала выкарыстоўвацца і агняпальная зброя – што праўда, яшчэ без прыкметнага поспеху. Важкую абарончую ролю адыгрывалі крэпасці, пабудаваныя на берагах Дуная і Днястра, а таксама ў Карпатах. Яны былі шчыльна звязаныя між сабой і ўтваралі цэласную сістэму абароны, як па Дунаі (ўмацаванні ў Турну, Джурджу, Брэіле, пазней захопленыя туркамі), так і па Днястры (крэпасці ў гарадах Хацін, Архей, Сарока, Бендэр, Чатаця-Албэ, або Белая Крэпасць).

6.10. Эканамічныя і сацыяльныя структуры

У канцы XVI ст. насельніцтва ўсіх трох румынскіх сярэднявечных дзяржаваў складала каля двух мільёнаў чалавек (больш за 800 000 у Трансільваніі, прыкладна 600 000 у Валахіі і каля 500 000 у Малдове). Пераважная большасць з іх займаліся апрацоўкай зямлі й жывёлагадоўляй. Вырошчвалі пшаніцу, жыта, ячмень, авёс, проса, гародніну; гадавалі буйную рагатую жывёлу, коней, авечак, свіней. Фармальна зямля знаходзілася ва ўласнасці караля (у Трансільваніі) і гаспадароў (у Валахіі і ў Малдове), але сапраўднымі яе ўладальнікамі

Румынскія дзяржавы пры канцы XVI стагоддзя

былі феадалы, царква, свабодныя сяляне і некаторыя абшчыны. Такія паняцці, як феадал, феадалізм, феадальны лад і да т. п., даўно ўсталяваныя ў Заходняй Еўропе, паступова пашырыліся для вызначэння сярэднявечных адносінаў і на яе ўсходнюю частку. Аднак яны не ахопліваюць усёй палітры гэтых адносінаў, у значнай ступені адрозніваючыся, скажам, ад «феадальнай лесвіцы» ў Францыі. Сёння існуюць істотныя разыходжанні ў тлумачэнні тэрміна «феадалізм», якім характарызуецца тагачаснае заходнееўрапейскае грамадства, і гэта відавочна, бо чалавечае грамадства само па сабе надзвычай разнастайнае. Але ж ніякага новага ўсёахопнага тэрміну пакуль не прыдумана, і таму мы, з пэўнай умоўнасцю, будзем і далей выкарыстоўваць тут старыя навуковыя тэрміны, памятаючы, аднак, пра спецыфіку румынскіх сярэднявечных рэалій.

На момант утварэння ўнітарных румынскіх дзяржаваў і захопу вугорцамі Трансільваніі (XI–XIII стст.) усе гэтыя землі ўжо былі ва ўласнасці князёў і ваяводаў. Менавіта яны й былі найстаражыт-

Дароўная грамата, якою Раман (Мушат) перадае свайму вернаму слузе тры вёскі на рацэ Сірэт

нейшымі мясцовымі феадаламі. І тут пад феадаламі мы разумеем увогуле землеўласнікаў, якія мелі залежных сялян, што мусілі на іх працаваць і выконваць пэўныя вайсковыя абавязкі. Феадалы, у сваю чаргу, мелі пэўныя абавязкі перад каралём, выплачваючы яму рэальную ці ўмоўную даніну, якая фіксавалася ў дакументах. Такім чынам румынскія гаспадары і вугорскія каралі дакументальна прызнавалі правы асобных князёў, што ўзводзіла іх у ранг баяр, або нобіляў. Іншымі словамі, феадалы ў Валахіі і ў Малдове ўтварыліся як клас з былых князёў і ваяводаў. Што да Трансільваніі, дык тут паноўны клас паходзіў перадусім з адданых свайму каралю вугорцаў, якія атрымлівалі зямлю ў падзяку за службу і за ўпакорванне мясцовых румынаў. Да класа нобіляў былі далучаныя таксама асобныя кіраўнікі сэкеяў і саксаў, і нават некаторыя румынскія князі з аддаленых куткоў, дзе ім удалося захаваць уладу. Каб іх уладанні былі прызнаныя і каб ім афіцыйна быў нададзены шляхецкі статус, румынскія князі павінны былі атрымаць дакумент (дыплом), які пацвярджаў іх даўнюю ўладу над вёскамі, дзеля чаго яны мусілі прысягнуць на «верную службу» вугорскаму каралю і іншым буйным феадалам і вяльможам, а таксама перайсці (хоць бы дэкларатыўна) у каталіцызм. Шмат якія румынскія князі з Хацэга, Марамурэша ці Баната здолелі выканаць гэтыя патрабаванні і сталі нобілямі, але пераважная іх большасць, чые ўладанні месціліся на адкрытых, здаўна заваяваных прасторах, апусціліся па сацыяльнай лесвіцы, бо іх землі былі раздораныя вугорскім нобілям, царкве, саксам і сэкеям. Тым не менш румынскія князі, якія перайшлі ў дваранства, застаўшыся пры гэтым дробнымі сельскімі землеўласнікамі, змаглі захаваць сваю румынскую этнічную ідэнтычнасць, але тыя, што забагацелі і занялі

высокія дзяржаўныя пасады, паступова да XVI ст. змадзярызаваліся. Таму ў часы позняга Сярэднявечча румынаў у афіцыйна прызнаных вярхах грамадства ўжо не было – так, як, напрыклад, вугорцаў, саксаў і сэкеяў, чые нобілі заўсёды былі прадстаўленыя ў кіраўніцтве Вугорскага каралеўства. Гэтая трансфармацыя грамадскага статусу румынскіх князёў адбывалася ў XIII–XV стст. У гэты перыяд яны яшчэ адыгрывалі прыкметныя ролі ў войску, перш за ўсё ў барацьбе з туркамі-асманамі, дзякуючы чаму некаторым князям і ўдалося захаваць свае ўладанні і ператварыцца ў нобіляў. Пэўны час іх яшчэ так і называлі «румынскімі нобілямі», але пачынаючы з XVI ст. вышэйшая арыстакратыя ўжо атаясамліваецца толькі з ядром «вугорскай нацыі», бо слова «шляхціч» стала сінонімам слова «вугорац».

Фармальна ўсе саксы і сэкеі былі свабоднымі грамадзянамі, іх вольніцу гарантавалі вугорскія каралі. Сэкеі займаліся жывёлагадоўляй і апрацоўкай невялікіх надзелаў зямлі, бо падораныя ім землі з гарыстым рэльефам былі не надта ўрадлівыя. У саксаў земляробства было болей развітае: яны перыядычна ўгнойвалі глебу, час ад часу пакідалі пэўныя ўчасткі ў папары, ужывалі абарот культур. Але апроч таго, саксы займаліся гарадскімі рамёствамі, яны былі купцамі, пісарамі, адвакатамі, настаўнікамі і да т. п. Румыны, якія жылі сярод саксаў і сэкеяў, здаецца, мусілі б мець аднолькавыя з імі правы, але з цягам часу пераважная іх большасць ператварылася ў прыслужнікаў тых, хто лічыўся іх новымі гаспадарамі.

Юрыдычна ў часы Сярэднявечча ўсе сяляне былі свабоднымі – калі іншае не вызначалася адмысловымі актамі. Але ж большасць была залежная эканамічна, бо не мела ўласнай зямлі і была вымушаная працаваць на палях феадалаў. Толькі мала каму ўдавалася заставацца незалежнымі і юрыдычна, і эканамічна – дзякуючы ўладанню спадчыннаю зямлёй, якая часцей за ўсё знаходзілася ў супольнай уласнасці абшчыны. Большасць такіх сялян жыла на поўдзень і на ўсход ад Карпатаў, пераважна ў горных раёнах. Аднак і яны выконвалі пэўныя працы на карысць гаспадара ці дзяржавы. Найбольш цяжкае становішча было ў залежных сялян і асабліва ў рабоў. Колькасць рабоў была нязначная – як правіла, гэта былі замежнікі: узятыя ў палон татары ці цыганы, што ў канцы XIV ст. прыйшлі сюды з Індыі. Іх статус быў блізкі да антычных рабоў, з тою розніцай, што гаспадары

Эканамічная карта румынскіх земляў у часы Сярэднявечча

ўжо не мелі права вырашаць пытанне іх жыцця або смерці. Некаторыя з іх рабіліся слугамі, другія – чаляднікамі, і ў такіх выпадках іх умовы былі нашмат лепшыя, чым у класічных рабоў. Шмат хто з іх прыняў хрысціянства; некаторыя нават сталі даверанымі людзьмі сваіх гаспадароў, аднак асабістай свабоды яны не мелі.

Так ці іначай, большасць сялян была эканамічна вымушаная працаваць на гаспадароў, бо зямля, якую яны апрацоўвалі, належала не ім, а знаходзілася ва ўласнасці феадалаў, і таму яны былі абавязаны або адпрацоўваць фізічна, або выплачваць чынш прадуктамі ці грашыма. Усе сяляне былі феадальна залежныя ад караля ці гаспадара, а сяляне Трансільваніі (фармальна – толькі каталікі) мусілі яшчэ й аддаваць дзесяціну свайго даходу Касцёлу. З прычыны шматлікасці накладзеных на іх абавязкаў і розных злоўжыванняў трансільванскія сяляне некалькі разоў уздымалі супраць феадалаў паўстанні – у прыватнасці, у 1437–1438 і ў 1514 гг. Каб запабегчы падобным народным хваляванням, сялян урэшце пазбавілі і асабістай свабоды, абавязаўшы ўсё жыццё служыць аднаму гаспадару. Іншымі

словамі, сяляне страцілі свабоду перамяшчэння і сталі прыгоннымі – «прымацаванымі да зямлі». Ва ўсіх трох румынскіх дзяржавах такая трансфармацыя адбылася ў перыяд паміж XVI – пачаткам XVII ст., хоць не паўсюль прыгон быў аднолькавым і поўным.

Некаторыя жыхары румынскіх сярэднявечных дзяржаваў займаліся здабычай солі і мінералаў (жалеза, золата, срэбра, медзі), мясцовымі промысламі ў сельскай мясцовасці, рамесніцтвам і гандлем у гарадах і г. д. Рамеснікі аб'ядноўваліся ў цэхі (краўцоў, шаўцоў, кавалёў, суконшчыкаў, рэзнікаў і г. д.), гуртаваліся вакол уладальнікаў майстэрняў і вызначалі цану, месцы збыту і інш. Найбольш квітнелі такія гарады, як Брашоў, Клуж, Сібіў, Біструца, Тыргавіштэ, Бухарэст, Сучáва, Ясы, Кілія, Чатаця-Албэ і інш. Аднак асноўнае насельніцтва тагачасных румынскіх дзяржаваў (больш за 90%) жыло ў сёлах і займалася земляробствам і жывёлагадоўляй.

6.11. Бітва за Крыж: абарона хрысціянства

У той час, калі іспанцы былі занятыя «рэканкістай», змагаючыся з маўрамі (г. зн. сарацынамі, або арабамі), а французы з англічанамі вялі між сабою Стагадовую вайну (1337–1453), народы Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы былі вымушаныя абараняцца ад ісламскай навалы ў асобе татар і, у яшчэ большай ступені, туркаў. У XI–XII стст. рымскі папа, заходнееўрапейскія каралі і рыцары, натхнёныя шчырай хрысціянскай пабожнасцю і асабістымі інтарэсамі, беспаспяхова спрабавалі вызваліць «Святую Зямлю» з-пад улады арабаў. Такія паходы атрымалі назву «крыжовых». У XIV ст. ужо іншыя мусульмане (асманы), захапіўшы Малую Азію і Левант, рушылі скараць Еўропу. Усе гэтыя падзеі, у якіх назіраецца дзіўная сіметрыя (калі цягам васьмі стагоддзяў паміж 700 і 1500 гадамі паўднёва-заходні ўскраек Еўропы – Іберыйская паўвыспа – цярпеў ад набегаў арабаў і быў доўгі час непасрэдна імі акупаваны, а паўднёва-ўсходні (Балканская паўвыспа), гэтак сама як большая частка Цэнтральнай Еўропы, знаходзіліся паміж 1350 і 1900 гг. пад трывалым ціскам ваяроў Паўмесяца – турак-асманаў), пакінулі ў памяці еўрапейцаў цяжкі ўспамін. Спачатку асманы напалі на тое, што заставалася ад Візантыйскай імперыі, і каля 1350 г. праніклі на

еўрапейскі кантынент. Стагоддзем пазней (ў 1453 годзе), нягледзячы на адчайны супраціў, захапілі Канстанцінопаль і балканскія хрысціянскія дзяржавы – балгар, албанцаў, сербаў. Каля 1390 г. яны выйшлі да Дуная і паспрабавалі рушыць далей на поўнач і захад, пагражаючы румынскім землям, Вугоршчыне і Польшчы. І з гэтага моманту ўсходнееўрапейскія краіны надоўга ператварыліся ў своеасаблівы «загараджальны хрысціянскі мур», стаўшы, з поўным усведамленнем сваёй місіі, абарончымі бастыёнамі Еўропы. Папа Рымскі і асобныя хрысціянскія манархі Заходняй Еўропы выступілі з ініцыятывай арганізацыі новых «крыжовых паходаў» (якія можна было б акрэсліць паняткам «позніх, або абарончых, крыжовых паходаў») дзеля абароны Еўропы ад заваявання яе мусульманамі, аднак асноўны цяжар барацьбы лёг на грэкаў, балгар, сербаў, албанцаў, а пасля іх заваявання – на румынаў, вугорцаў, саксаў, сэкеяў, палякаў, харватаў і інш. Гэтыя народы, у тым ліку румыны, на працягу доўгіх стагоддзяў змагання жылі ў гаротах і цяжкасцях, што пазней даволі істотна адбілася на іх калектыўнай свядомасці: з аднаго боку, яны адчувалі сябе кінутымі «на скрыжаванні ўсіх нягод», знясіленымі і выпетранымі бясконцымі бітвамі, няспыннай стратай маёмасці, беднасцю і неабароненасцю, а з другога – разумелі, што выконваюць важную місію, бо абараняюць не толькі сваю краіну, але і пэўныя каштоўнасці агульнай Хрысціянскай Справы, якія ў той час супадалі з каштоўнасцямі ўсёй еўрапейскай цывілізацыі. Вось чаму некаторыя гісторыкі і дзеячы мастацтва на хвалі рамантычнага ўздыму адзначалі, што румыны побач з іншымі народамі, якія вялі барацьбу на ўсходнееўрапейскім рубяжы, абаранілі Захад і паспрыялі тым самым «стварэнню заходнееўрапейскага храма», ці, калі казаць іншымі словамі і адкінуць у бок метафары, народы Паўднёва-Усходняй Еўропы зрабілі свой важны ўнёсак у стварэнне ўмоваў дзеля росквіту заходняга свету, які пазней стаў узорам для большай часткі чалавецтва.

Пасля падзення камуністычнага рэжыму пачалі гучаць галасы, якія імкнуліся перагледзець і развянчаць разнастайныя «нацыяналістычныя» погляды, пашыраныя сярод румынаў, у прыватнасці гаварылася, што, маўляў, у той час, калі ў Заходняй Еўропе будаваліся знакамітыя раманскія і гатычныя храмы, туркі былі яшчэ далёка ад

Балканаў і Цэнтральнай Еўропы, а значыць, румыны не маглі паспрыяць іх пабудове. Гэтае сцверджанне можна было б палічыць за жарт, калі б яно не гучала так выкрывальна-трагічна. Вышэйзгаданая метафара мела на мэце ўсяго толькі паказаць агульную абарончую ролю, якую адыгралі балканскія народы, затрымаўшы навалу з Усходу, якая кацілася, каб пахаваць пад сабою Рым, Вену ці Прагу, але была спыненая на Дунаі і ў Карпатах. Дый потым, нават калі, прытрымліваючыся дакладнай храналогіі, на момант пабудовы тых храмаў туркі-асманы сапраўды яшчэ не нападалі, на Еўропу тады адна за адной нахлыналі жорсткія хвалі печанегаў, полаўцаў, татар, якія, паводле наяўных крыніц, таксама былі практычна спыненыя ўсходнімі славянамі, румынамі, вугорцамі, саксамі, сэкеямі і інш. Такім чынам мы прыходзім да высновы, якая не мае нічога агульнага з міфалагізацыяй: ставячы перад нападнікамі заслону, імкнучыся іх спыніць, румыны, вядома, абаранялі перадусім сябе, але тым самым, разам з іншымі ўсходнееўрапейскімі народамі, выканалі ролю абаронцаў хрысціянскай Еўропы, г. зн. заходняй цывілізацыі!

Мірча Стары
(1386–1418)

Захапіўшы амаль усю Балканскую паўвыспу, туркі-асманы пачалі рабіць напады на Валахію, Трансільванію і Вугоршчыну. Першым румынскім ваяводам, які арганізаваў абарону роднай зямлі ад асманскай пагрозы, стаў Мірча Стары. Перад тым ён стварыў моцныя стымулы для эканамічнага росту краіны, спрыяў развіццю земляробства і рамёстваў, умацоўваў гандаль. Маючы добра арганізаванае войска і высокадасведчаных дыпламатаў, ён здолеў далучыць да Валахіі шэраг новых земляў, што знаходзіліся ў Трансільваніі, на поўдні Малдовы і нават на поўдзень ад Дуная. Найважнейшым у гэтым плане стала далучэнне Дабруджы, правінцыі паміж Дунаем і Чорным морам, якая ў XIV ст. была незалежным дзяржаўным утварэннем, а перад тым у розны час уваходзіла ў склад Візантыйскай імперыі або паўднёвых балгарскіх царстваў. З канца XIV ст. Дабруджа апынулася пад пагрозаю заваявання асманамі. Але ўжо ў пачатку свайго валадарання румынскі гаспадар смела ўвайшоў у Дабруджу са сваім войскам і ўключыў яе ў склад Валахіі.

Мірча Стары

Самастойна ці пры збройнай дапамозе іншых хрысціян Мірча здабыў некалькі значных перамогаў над туркамі і дамогся поўнай самастойнасці сваёй краіны. Ён заключыў саюзніцкія дамовы з Вугоршчынай і Польшчай, а пасля смерці султана Баязіда ўварваўся ў межы асманскай дзяржавы, каб узвесці на султанскі пасад свайго фаварыта. У 1394–1395 гг. Мірчам былі здабытыя новыя перамогі над туркамі («бітва пры Равінэ»), а ў 1396-м ён удзельнічаў у крыжовым паходзе супраць туркаў на баку вугорцаў. Праўда, той паход скончыўся паразаю пад балгарскім горадам Нікопалем і захопам туркамі-асманамі апошняга балгарскага царства з цэнтрам у Відзіне. Але на пачатку XV ст. аўтарытэт Мірчы быў настолькі высокі, што ён нават вызначаў палітычную сітуацыю на ўсіх Балканах. Апякуючыся лёсам трансільванскіх румынаў, ён далучыў да Валахіі румынскія землі Усходняга Баната, наваколля Сібіў і Фэгэрашскага краю. Усе праваслаўныя царквы Трансільваніі былі падпарадкаваныя валашскай мітраполіі. Па сваёй смерці Мірча пакінуў вялікую і моцную краіну, яго сучаснік-летапісец назваў гаспадара «самым магутным і нязломным з уладароў-хрысціян». Усё гэта адбывалася прыкладна ў той самы час, калі Генрых IV, змусіўшы Рычарда II адмовіцца ад трона, заснаваў у Англіі дынастыю Ланкастэраў, а ў Італіі – у Фларэнцыі, Венецыі, Мілане, Рыме – пад уплывам ідэяў Дантэ Аліг'еры, Франчэска Петраркі і іх сучаснікаў квітнеў гуманізм, што, зрэшты, не спыняла звады і войны паміж італьянскімі гарадамі-дзяржавамі. На саборы каталіцкай царквы ў Канстанцы (1414–1418) быў пакладзены канец вялікаму расколу і вызначана месца знаходжання адзінага Папы Рымскага – у Рыме (бо перад тым здаралася, што Папам Рымскім аб'яўлялі сябе адначасова і два, а нават і тры іерархі). У час правядзен-

ня сабору 6 ліпеня 1415 года быў абвінавачаны ў ерасі і прыгавораны да спалення чэшскі прапаведнік Ян Гус, што выклікала «рэвалюцыю гусітаў» (1419–1434) – першы значны еўрапейскі канфлікт, які меў нацыянальную афарбоўку.

Янку з Хунэдаары (Янаш Хуньядзі) (1441–1456)

Спадкаемцы Мірчы таксама цвёрда стаялі на абароне краіны, хоць некаторыя былі вымушаныя спалучаць узброеную барацьбу з палітыкай замірэння, ваенны супраціў з дыпламатычнымі захадамі і нават дзеля захавання статусу сваёй дзяржавы і зберажэння міру пэўны час сплачваць даніну султану. Больш за тое, некаторыя румынскія гаспадары станавіліся прыладай асманаў, удзельнічаючы на іх баку ў ваенных кампаніях. Неўзабаве праблема абароны закранула і Трансільванію, на чале якой у 1441 г. стаў румынскі ваявода Янку (Ёан) з Хунэдаары.

Янаш Хуньядзі

Ён быў, як сказалі б сёння, «self-made man», бо паходзіў з сціплай сям'і румынскіх князёў з Зямлі Хацэгулуй – паўднёва-заходняй часткі гістарычнай Трансільваніі. Яго бацька вызначыўся на вайсковай службе ў вугорскага караля, якому тады служылі шмат якія румынскія князі, і за свае заслугі атрымаў зямельны надзел у жудэцы Хунэдаара, дзе пазней яго сын, будучы ваявода, пабудаваў уражвальны замак у гатычным стылі, найбуйнейшы з тых, што дагэтуль захаваліся ў Трансільваніі. Дзеля ўмацавання свайго становішча бацька нашага героя перайшоў у каталіцызм, навярнуўшы ў яго і сваіх сыноў. Але ў сыноў захавалася падвойнае імя – адно румынскае і праваслаўнае

(ужыванае ў праваслаўных колах), а другое – вугорскае і каталіцкае (ужыванае ў вугорскім і заходнееўрапейскім асяроддзі). Таму румыны і прадстаўнікі балканскіх праваслаўных народаў называлі ваяводу Янку (Янка), а вугорцы і заходнееўрапейцы – Янаш (Ёганэс). Янку атрымаў выдатную ваенную адукацыю пры двары караля Сігізмунда I Люксембургскага, ваенны досвед – у гусіцкіх войнах у Чэхіі і ў кампаніях у Італіі, а пачынаючы з 1439 г. здабыў некалькі перамогаў у бітвах з туркамі. У 1441 г. ён разбіў асманскае войска ў Сербіі, а потым – у Трансільваніі і Валахіі. У 1443–1444 гг. ён арганізаваў «доўгую кампанію» – маштабны ваенны паход на Балканы, пагражаючы нават захопам тагачаснай сталіцы Асманскай імперыі. Ашаломленыя туркі запрасілі міру, які і быў заключаны тэрмінам на дзесяць гадоў. Але ў 1444 г. па намаўленні Папы Рымскага быў арганізаваны новы «крыжовы паход» (з удзелам вугорскіх, румынскіх, харвацкіх, баснійскіх і інш. ваенных атрадаў), які, аднак, увосень таго ж года завяршыўся жахлівым разгромам хрысціян у бітве пад Варнай, дзе загінуў і вугорскі кароль Уладзіслаў I. У выніку Янку застаўся самым вядомым і ўплывовым дзеячам Вугорскага каралеўства і ў 1446 г. яго ўзначаліў. У новага кіраўніка ўзнікла ідэя стварыць сумесную антыасманскую кааліцыю, да якой, апроч Вугоршчыны, ён разлічваў далучыць абедзве румынскія дзяржавы, а таксама сербскія і албанскія войскі, аднак значнага поспеху ў гэтым напрамку ён не дасягнуў. У 1453 г. туркі захапілі цэнтр і сімвал усходняга хрысціянства Канстанцінопаль. Не здолеўшы абараніць гэты сімвал, Янку стаў на абарону ўсёй Цэнтральнай і Заходняй Еўропы, якой пагражаў заваёўнік Канстанцінопаля Мехмед II. Янку сабраў усе свае збройныя сілы ў Бялградзе, які ў той час быў магутнаю крэпасцю на памежжы з Вугоршчынай, і яго амаль 30-тысячнае войска (а ў яго ўваходзілі выхадцы з Вугоршчыны, Польшчы, Чэхіі, нямецкіх земляў, а таксама нямала румынаў з Трансільваніі) выратавала Вугоршчыну і Еўропу, разбіўшы турак летам 1456 года. Пасля гэтага Янку стаў героем усіх хрысціян. Папа Рымскі назваў яго «пасланнікам Хрыста» і загадаў, каб у гонар вялікай перамогі і яе натхняльніка ва ўсіх каталіцкіх цэрквах штодня апоўдні білі званы. Але 11 жніўня 1456 г. Янку з Хунэдаары памёр ад чумы: гэта здарылася непадалёк ад Бялграда. Яго смерць аплаквалі ўсе хрысціяне

Еўропы, ён быў пахаваны ў цэнтры роднай Трансільваніі, у Алба-Юліі, і на яго магіле быў выбіты надпіс, які захаваўся да нашых дзён: «Пагасла святло свету...» У Англіі тады якраз толькі ўсчалася вайна Пунсовай і Белай ружы – бойка за трон паміж дамамі Ланкастэраў і Ёркаў, чыімі сімваламі былі ружы, якія яны шчодра абмылі крывёю. Францыя цяжка перажывала наступствы нядаўна скончанай Стагадовай вайны (1337–1453), а на Пірэнейскай паўвыспе праз шлюбны саюз аб'ядналіся Кастыльскае і Арагонскае каралеўствы.

Улад III Цэпеш (Дракула)
(1456–1462)

Як ні дзіўна, але адным з найбольш вядомых румынаў на Захадзе і ў ЗША стаў так званы Дракула, класічны «вампір». Стагоддзе таму ірландскі пісьменнік Брэм Стокер шукаў якога-небудзь страшнага персанажа, каб праз апісанне яго жудасных і скандальных учынкаў дагадзіць густам тагачаснага грамадства. Адзін сябар пісьменніка звярнуў яго ўвагу на крыважэрнага трансільванскага князя XV ст., якога небеспадстаўна ненавідзелі і чые зверствы перабольшвалі немцы, блытаючы іх з лютымі паводзінамі Эржэбэт Бáтары, што жыла на стагоддзе пазней і мела мянушку «Крывавай графіні». Вядома, да сюжэта рамана, які быў у выніку напісаны, трэба дадаць і яркую фантазію аўтара.

Улад Цэпеш

У сапраўднасці Дракула быў князем з румынскай дынастыі Басарабаў і звалі яго Улад Драгула (што азначае «сын Драгула», бо ягоным бацькам быў Улад II Драгул). Бацька Улада Цэпеша быў гаспадаром Валахіі, але калі ў яго нарадзіўся сын, ён разам з усёй сям'ёй быў вымушаны шукаць прытулку ў Трансільваніі, дзе пэўны час жыў у выгнанні. Улада добра ведалі Янку з Хунэдаары і ягоны сын, будучы

вугорскі кароль Мацьяш Корвін. У сталым веку Улад Цэпеш быў энергічным і суровым чалавекам, нават жорсткім, як і большасць ягоных сучаснікаў. Ён імкнуўся ўсталяваць законнасць і парадак, стымуляваць развіццё рамёстваў і гандлю, умацаваць войска. І дасягаў гэтага крывавымі метадамі, памяць пра якія захоўваецца дагэтуль, хоць часам іх бязлітаснасць, мабыць, перабольшваюць. Як бы там ні было, стаўшы, як і яго бацька, гаспадаром Валахіі, ён узняў прэстыж краіны і дамогся яе павагі ад суседніх дзяржаваў. У міжнародных стасунках ён імкнуўся ўкараніць пашыраны сёння прынцып узаемаадпаведнасці. У прыватнасці, Улад Цэпеш дамагаўся, каб купцы з Валахіі мелі ў Трансільваніі такі самы статус, якім карысталіся купцы-саксы, прыязджаючы ў Валахію. Саксы не пагадзіліся выконваць яго пажаданні, за што былі жорстка пакараныя. Тады, не дараваўшы такога стаўлення да сябе, купцы ахрысцілі валашскага гаспадара тыранам і разнеслі славу пра ягоную жорсткасць па краінах Заходняй Еўропы. Відаць, дзякуючы ім ён і стаў вядомы як «Дракула», бо вымаўленне «k» замест «g» характэрна для сакскіх гаворак. Так корань «drag» у ягоным імі змяніўся на «drac». У гісторыі румынаў – асабліва дзякуючы вобразу, які стварылі яму пісьменнікі і гісторыкі ў эпоху рамантызму, – гаспадар Улад застаўся сапраўдным сімвалам справядлівасці і прыкметным змагаром з асманамі – абаронцам незалежнасці сваёй краіны. Ён адмовіўся выплачваць даніну румынскімі дзецьмі, якіх забіралі, каб выхоўваць янычарамі ў султанавым войску, і некалькі разоў удала разбіваў турак, заваблiваючы іх у засады. Палонных ён загадваў саджаць на кол, і таму туркі ды іншыя ворагі далі яму мянушку Цэпеш, што ў перакладзе азначае «саджальнік на кол». Узімку 1461–1462 гг. валашскі гаспадар перайшоў са сваім войскам на паўднёвы бераг Дуная і разбіў турэцкія войскі, пакінуўшы 23 809 туркаў забітымі ў на полі бою і яшчэ 884 – спаленымі ў іхніх дамах (менавіта з такой дакладнасцю ён пісьмова паведамляў пра гэта каралю Мацьяшу Корвіну). Туркі былі ў жаху, баючыся, што румынскі гаспадар захопіць нават Канстанцінопаль. Вяртаючыся, Улад вызваліў з палону і забраў з сабой вялікую колькасць балканскіх хрысціян, каб рассяліць іх у Валахіі. Тады зняважаны султан Мехмет II прыйшоў, як сведчаць крыніцы, з 200-тысячным войскам (хоць гэтая колькасць відавочна

перабольшаная), каб пакараць гяура. Улад не меў дастатковай сілы, каб уступіць у адкрытую бітву з такою армадай, але прыняў тактыку бесперапыннага цвялення ворага хуткімі наскокамі і нават спрабаваў забіць султана. Ён ускладаў спадзяванні на дапамогу караля Мацьяша, але той, відаць, падгавораны саксамі, абвінаваціў валашскага гаспадара ў выдуманай здрадзе і, арыштаваўшы, амаль 12 гадоў пратрымаў у палоне ў Вугоршчыне, пасля чаго зноў вярнуў на валашскі пасад, але гэтым разам зусім на кароткі час і без прыкметнага поспеху.

Штэфан Вялікі
(1457–1504)

У 1457 г. Улад Цэпеш дапамог маладому Штэфану, якога ведаў з дзяцінства, стаць гаспадаром Малдовы. І менавіта з часу кіравання Штэфана Малдова стала трэцяй румынскай сярэднявечнай дзяржавай, якая ўключылася ў вялікую агульную барацьбу супраць асманскай агрэсіі. Застаючыся гаспадаром амаль паўстагоддзя, Штэфан стаў самым значным румынскім уладаром Сярэднявечча, звязаўшы сваё імя і дасягненні з цэлай эпохай – гэтак сама, як каралева Лізавета ў Англіі або Казімір IV у Польшчы. У народзе яго называлі «вялікім і святым» і шанавалі як нацыянальнага героя; яго выяву заўсёды – цягам стагоддзяў – увасаблялі з крыжам і шабляй у руках. Пасля кожнай перамогі над «нехрысцямі» ён згодна з хрысціянскай традыцыяй ставіў у падзяку Госпаду новую царкву, але будаваў царкву нават і тады, калі цярпеў няўдачу. Такім чынам

Штэфан Вялікі

ён заснаваў дзясяткі цэркваў і манастыроў, стаўшы адным з найбуйнейшых будаўнікоў у гісторыі Румыніі. Цяпер яго імя ўнесена ў царкоўны каляндар святых.

Каб узысці на гаспадарскі трон, Штэфану давялося адолець нямала перашкодаў, бо ў яго аказалася шмат супернікаў (якія імкнуліся да ўлады) як з ліку яго сваякоў, так і сярод баяр. Ён паслядоўна і няўмольна перамог усю апазіцыю, «высек» частку баяр і ўмацаваў сваю ўладу. Павялічыўшы гаспадарскія ўладанні і падпарадкаваўшы сабе дзяржаўную раду, ён спрыяў развіццю гарадоў і стварыў добра падрыхтаванае войска. Як гаспадар ён забяспечыў эканамічны росквіт Малдовы, асаблівую ўвагу надаючы падтрымцы гандлю, а за адданую службу гаспадарскаму трону расплачваўся пасадамі і маёнткамі. У сваёй дзейнасці ён абапіраўся галоўным чынам на дробнае і сярэдняе баярства, гараджан і свабодных сялян.

Звонку Малдову таксама атачалі зусім не сябры. Вугоршчына і Польшча спаборнічалі паміж сабой за пратэктарат над краінай, Асманская імперыя імкнулася цалкам яе захапіць. Штэфан спрытна выкарыстаў вугорска-польскае суперніцтва для забеспячэння незалежнасці сваёй краіны. Спачатку гаспадар прызнаў сябе васалам польскага караля і адначасова ўступіў ва ўзброеную барацьбу супраць Вугоршчыны, чые войскі разбіў у бітве пры Баі ў 1467 г. Вугорскі кароль усвядоміў, што Штэфана Вялікага разумней мець за хаўрусніка, і адносіны паміж дзвюма краінамі палепшыліся. Малдова і Вугоршчына заключылі дамову аб саюзніцтве дзвюх хрысціянскіх дзяржаваў, вугорскі кароль падарыў румынскаму гаспадару дзве крэпасці з шырокімі прылеглымі землямі і дзясяткі румынскіх сёлаў у Трансільваніі. Тым часам Польшча пачала праводзіць у дачыненні да Малдовы варожую палітыку і ў канцы XV ст. здзейсніла спробу пасадзіць на гаспадарскі сталец польскага князя. Але палякі, чыё войска прыйшло ў Малдову ў 1497 г., былі разбітыя ў бітве ля Козьмінскага лесу, і толькі пасля гэтага паміж Польшчай і Малдовай быў заключаны саюзніцкі дагавор.

Адносіны з Портай, гэта значыць з Турцыяй, былі больш складанымі й цяжкімі. За год да таго, як Штэфан узышоў на трон, тагачасны гаспадар Малдовы Пятру Арон пагадзіўся выплачваць султану сімвалічную грашовую даніну дзеля міру і неўмяшання



Малдова за часам Штэфана Вялікага

турак у справы Малдоўскай краіны. Штэфан пэўны час працягваў выплачваць даніну, але адначасова рыхтаваўся да барацьбы, бо лічыў сваю краіну «Брамаю Хрысціянства». Заключыўшы саюзніцкія дамовы з суседзямі, ён распрацаваў план барацьбы, паспрабаваўшы далучыць да яго і Валахію, або, як ён называў яе, «другую румынскую краіну». Для малдаўскага гаспадара першай румынскай краінай была менавіта Малдова, гэта значыць дзяржава, кіраўніком якой быў ён сам. Калі ўсё было падрыхтавана для барацьбы з асманамі, Штэфан адмовіўся выплачваць ім даніну, і тады султан накіраваў супраць Малдовы 120-тысячнае войска, у склад якога ўваходзілі і палкі Ва-

Баявая харугва Штэфана Вялікага

лахіі. 10 студзеня 1475 г. Штэфан са сваім 40-тысячным войскам пры падтрымцы некалькіх тысяч трансільванцаў і палякаў уступіў з асманамі ў бітву пад горадам Васлуй і здабыў у ёй бліскучую перамогу. Пасля бітвы румынскі гаспадар накіраваў усім манархам хрысціянскай Еўропы пасланне, у якім паведамляў пра сваю перамогу («мы ўзялі ў рукі меч і з дапамогаю нашага ўсёмагутнага Госпада Бога рушылі на ворагаў хрысціянства, разграмілі іх і паставілі на калені, усе яны адчулі вастрыню нашага меча») і тлумачыў, якая вялікая небяспека пагражае Малдове і ўсёй Еўропе, калі апошняя не прыйдзе на дапамогу. Хутка турэцкі ўладар рушыць на нас з усёй сваёй моцай, – пісаў малдоўскі гаспадар, – і тады «ён заваюе нашу краіну, якая ёсць брамаю ў хрысціянскі свет і дагэтуль ахоўвалася нашым Госпадам Богам», але «калі гэтая брама, якою ёсць наша краіна, будзе захоплена (хай Гасподзь нас бароніць ад гэтага!), тады ўсё хрысціянства апынецца ў вялікай небяспецы». І хоць жаданая дапамога так не прыйшла, Штэфан летам 1476 г. змог сам адолець велізарнае войска, якое асабіста ўзначальваў заваёўнік Канстанцінопаля. У бітве каля Рэзбоеня войска Малдовы пацярпела паразу, але асманы не здолелі скарыстацца са сваёй перамогі, бо малдаване ўжылі тактыку «выпаленай зямлі». Варожае войска вымушанае было адступіць, так і не здолеўшы скінуць малдоўскага гаспадара з трона і скарыць Малдову. Праўда, і Штэфан быў вымушаны заключыць з туркамі мір, перадаць ім дзве важныя крэпасці на Дунаі і Чорным моры (Кілію і Белую Крэпасць) і штогод выплачваць даніну. Прыкладам таго, наколькі значным быў яго аўтарытэт, можа служыць запрашэнне Штэфана ў 1497–1498 гг. увайсці ў таемную змову з «каралём рымлян» Максімільянам Габсбургам для адлучэн-

ня ад улады дынастыі Ягелонаў – перадусім караля Вугоршчыны і Багеміі Уладзіслава.

Пасля сваёй смерці ў 1504 г. гаспадар пакінуў нашчадкам магутную і шанаваную суседзямі краіну, якая захавала незалежную ўладу і стаяла заслонай на шляху асманскага ўварвання. Праз некалькі гадоў пасля смерці Штэфана польскі кароль назваў яго *Stephanus ille magnus* («Штэфан Вялікі»), і менавіта гэтае імя ўвайшло ў гісторыю і зрабіла яго неўміручым.

І ў той самы момант, калі на мяжы XV і XVI стст. тут заканчвалася эпоха Штэфана Вялікага, па той бок Атлантыкі пачынаў паўставаць Новы Свет, які ў будучыні зменіць канфігурацыю Еўропы і ўсёй планеты.

6.12. XVI стагоддзе

Гераічнае XV стагоддзе супраціву асманскай экспансіі скончылася, і разам з ім сышла большасць яго змагароў – легендарных ваяводаў. Пасля 1500 года намаганні захаваць незалежнасць румынскіх дзяржаваў, безумоўна, не спыніліся, але ў іх ужо не было ранейшага размаху і гераізму. На чале туркаў стаў адзін найславуцейшых султанаў – Сулейман I Пышны (1520–1561), вядомы на Захадзе як Сулейман Цудоўны, а на Усходзе – як «Заканадавец». Дзеля захопу ўладанняў Габсбургаў ён заключыў саюз з Францыяй і напаў на Цэнтральную Еўропу. У 1521 г. туркамі быў захоплены Бялград, які некалі так гераічна бараніў Янку з Хунэдаары, а ў 1526 г. было ўшчэнт разгромленае вугорскае войска, у выніку чаго Цэнтральная Вугоршчына разам з яе сталіцай амаль на 150 гадоў ператварыліся ў Асманскую правінцыю. Лёс румынскіх дзяржаваў быў крыху лепшы: яны засталіся хрысціянскімі краінамі, захаваўшы свой грамадскі лад, парадкі і інстытуцыі. Аднак прыкладна з сярэдзіны XVI ст. умовы асманскага пратэктарату пачалі паступова рабіцца ўсё больш адчувальнымі, а павіннасці гаспадароў перад султанам – расці. Аддаленне Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы ад Заходняй павялічвалася адначасова са зменаю гандлёвых шляхоў з Міжземнамор'я на Атлантыку ў выніку вялікіх геаграфічных адкрыццяў. Турэцкая ўлада, якая пашырылася на ўвесь Балканскі

паўвостраў аж да Сярэдняга Дуная, нараджала ў народаў гэтага рэгіёна пачуццё небяспекі. Але румыны, назіраючы за цяжкім лёсам грэкаў, балгар, албанцаў, сербаў, харватаў, вугорцаў і інш., непасрэдна падначаленых асманам, па-ранейшаму супраціўляліся і захоўвалі аўтаномны статус сваіх краінаў. І хоць яны выплачвалі султану даніну ды іншыя падаткі, хоць іх знешнія зносіны былі абмежаваныя і яны вымушаныя былі саступіць на карысць туркаў асобныя тэрыторыі, на чале гэтых дзяржаваў па-ранейшаму стаялі ўласныя гаспадары, туркам было забаронена ў іх сяліцца і мець зямельную ўласнасць, наварочваць мясцовае насельніцтва ў іслам і будаваць мячэці. Іншымі словамі, румыны захавалі ўласныя традыцыі, інстытуцыі і законы, і іх дзяржавы служылі эфектыўным сродкам абароны іх нацыянальнай ідэнтычнасці. З другога боку, з пэўнага часу і для асманаў, мяркуючы па ўсім, было выгодным мець толькі ўскосны кантроль над румынскімі дзяржавамі.

Палітыка і культура

У першыя дзесяцігоддзі XVI ст. гаспадары Валахіі і Малдовы не адмаўляліся ад палітыкі антыасманскіх саюзаў, хоць па-ранейшаму (і яшчэ доўгі час) плацілі даніну туркам. У пошуку саюзнікаў яны скіроўвалі свае погляды да Трансільваніі, Габсбургаў і Польшчы. Пачынаючы ад Петру Рарэша і да Іона Водэ і Арона Водэ (ад 1530-х гг. і па канец стагоддзя), гаспадары Малдовы праводзілі актыўную антыасманскую палітыку збройнага супраціву і вядзення эфектыўных абаронных бітваў. Пры Штэфане Лакустэ (1538–1540) была зроблена спроба адбіць у туркаў захопленыя імі паўднёвыя землі (Буджак). Крыху пазней была ўмацаваная абарончая лінія з шэрагу фартэцый у даліне

Петру Рарэш

Днястра. Пры гэтым не пакідалася па-за ўвагай і развіццё культуры. У Малдове ў часы ўладарання Петру Рарэша распісваліся шматлікія цэрквы і манастыры, будаваліся новыя, Дэспат Водэ заснаваў «грэкалацінскую школу» з выкладчыкамі з Заходняй Еўропы; у Валахіі ў 1508, 1510 і 1512 гадах былі надрукаваныя (на стараславянскай мове) першыя ў гэтай частцы Еўропы кнігі. Нягое Басараб збудаваў у Курця-дэ-Арджэш манументальную царкву і пакінуў свайму сыну й наступным гаспадарам краіны кнігу мудрых парадаў, названую пазней «Настаўленні Нягое Басараба свайму сыну Тэадосію». Гэтыя «Настаўленні» задумваліся як своеасаблівы падручнік для палітычнага кіраўніцтва краіны – кшталту таго, якім быў «Уладар» Макіявэлі ў Італіі. Таксама ў XVI ст. (спачатку ў Сібіў і Брашове, а пазней і ў іншых трансільванскіх гарадах) пад уплывам Рэфармацыі і пры спрыянні гаспадароў дунайскіх княстваў выходзяць першыя друкаваныя кнігі на румынскай мове. З сярэдзіны XVI ст. асманскі ўціск на Валахію істотна ўзмацняецца, безупынна павялічваецца памер даніны, а «непакорлівыя» гаспадары замяняюцца султанам на тых, што прысягаюць яму ў паслухмянасці. Цягам XVI стагоддзя туркамі быў забраны ў румынскіх дзяржаваў шэраг новых земляў і крэпасцяў – такіх, як Тыгіна, або Бендэр (у Малдове), Брэіла (у Валахіі), цэнтральная і паўднёвая часткі Баната.

Манета з выявай Дэспата Водэ

Нягое Басараб і яго сын Тэадосій

Трансільванія – аўтаномнае княства

Найбольшыя змены ў гэты час перажывала Трансільванія (якую мы разглядаем тут у шырокім сэнсе). Крызіс, што ахапіў Вугорскае каралеўства на пачатку XVI ст., пераадолець было ўжо немагчыма. Першыя яго прыкметы выразна праявіліся яшчэ ў 1514 годзе, калі дзясяткі тысяч добра навучаных вайсковай справе сялян сабраліся ў Будзе, каб выправіцца ў крыжовы паход супраць туркаў, але павярнулі зброю супраць сваіх жа гаспадароў і рушылі ў Трансільванію, справакаваўшы тым самым сапраўдную грамадзянскую вайну. Улады разбілі сялян і пакаралі іх самым жорсткім чынам, «пажыццёва прымацаваўшы да зямлі» і пазбавіўшы ўсялякай асабістай свабоды. Таму сяляне былі няздольныя абараніць краіну ў 1526 г., калі султанава войска, пасля заваявання ў 1521 г. Бялграда, які называлі тады «ключом да Вугоршчыны», ушчэнт разграміла войска вугорскіх нобіляў; пры гэтым загінуў і сам вугорскі кароль. Бітва пры Мохачы стала паваротным пунктам у распадзе краіны. У 1526–1541 гг. Вугоршчына мела паралельна двух каралёў: аднаго – з сям'і Габсбургаў, другога – стаўленіка султана. Краіна распалася на два варожыя адзін да аднаго лагеры, што канчаткова падарвала яе сілы. У 1541 г. султан паклаў канец гэтай варожасці, прыйшоўшы ў Вугоршчыну са сваім войскам і захапіўшы яе цэнтральную частку, уключна са сталіцаю.

Бітва пры Мохачы. Атаманская мініятура

Самы цэнтр Вугоршчыны з шырокімі навакольнымі землямі стаў часткай Асманскай імперыі, паўночна-заходнімі раёнамі завалодалі Габсбургі, а ўсходнія правінцыі – Трансільванія, Крышана, Марамурэш, частка Баната і інш. – былі ператвораныя ў асобнае княства, якое знаходзілася пад пратэкта-

ратам султана. Прыкладна такі самы юрыдычны статус мелі і Валахія з Малдоваю, але турэцкі прыгнёт тут адчуваўся мацней.

Унутраныя парадкі ў Трансільваніі зведалі значныя змены. З перыферыйнага раёна Вугорскага каралеўства яна ператварылася ў асобнае амаль незалежнае княства (прынцыпат), у якім расслаенне паводле станаў стала яшчэ больш выразным. Частка вугорскіх нобіляў хацела бачыць у Трансільваніі спадчынніцу разбуранай вугорскай дзяржавы, але гэтую ідэю было цяжка ажыццявіць на практыцы. Па-першае, яе не падзялялі прадстаўнікі іншых станаў, а па-другое, прэтэнзіі лічыцца сапраўднымі пераемнікамі вугорскіх каралёў выказвалі Габсбургі, пагатоў ім таксама належала пэўная частка былога каралеўства. Апроч таго, прыкладна ў тыя самыя гады, калі Генрых VIII заснаваў незалежную ад Папы Рымскага царкву Англіі, у Сяміграддзі пашырыўся такі феномен, як рэлігійная Рэфармацыя, што мела своеасаблівыя наступствы: вугорскія нобілі, саксы і сэкеі, або прадстаўнікі трох паноўных нацыянальнасцяў, зацвердзілі на дзяржаўным узроўні кожны сваё веравызнанне, у выніку чаго з 1570-х гадоў у Трансільваніі было замацавана вяршэнства трох нацый і чатырох афіцыйна прызнаных культаў (кальвінізму, лютэранства, уніяцтва і каталіцызму). Прадстаўнікі гэтых нацыянальнасцяў, якія вызнавалі пералічаныя вышэй веравучэнні, якраз і вызначалі дзяржаўную палітыку Трансільваніі. Некаторыя бачаць у гэтым прыклад рэлігійнай талерантнасці, і ў пэўнай ступені яно так і ёсць. Аднак талерантнасць гэтая была абмежаваная і тычылася толькі меншай часткі насельніцтва, да якой, апроч таго, належалі толькі прадстаўнікі трох прывілеяваных нацый: вугорцы, саксы і сэкеі. Што да румынаў, якія складалі пераважную большасць жыхароў Трансільваніі, чыя праваслаўная вера заставалася паранейшаму афіцыйна не прызнанай, то яны не мелі прадстаўніцтва ў заканадаўчым сходзе і лічыліся ўсяго толькі за танную працоўную сілу, на якую ўскладаўся асноўны цяжар грамадскіх павіннасцяў. Менавіта ў гэты перыяд заканадаўчым сходам Трансільваніі былі прыняты дыскрымінацыйныя законы адносна румынаў, якія ставілі ўсе іх сацыяльныя і прафесійныя катэгорыі на болей нізкую прыступку ў дзяржаўнай іерархіі у параўнанні з такімі самымі катэгорыямі прызнаных нацый.

7. Уладаранне Міхая Харобрага (1593–1601) і аб'яднанне румынскіх княстваў

Напрыканцы XVI ст. з прычыны павелічэння даніны й іншых павіннасцяў цяжар асманскага пратэктарату над румынскімі дзяржавамі стаў празмерным. Асманская «апека» прыгнятала гаспадароў трох румынскіх дзяржаваў, выглядаючы асабліва нясцерпнай для гаспадароў Валахіі, бо нават чыста геаграфічна яна знаходзілася бліжэй да непасрэдных асманскіх уладанняў. Уладары Трансільваніі мелі большую свабоду, асабліва тыя, што паходзілі з роду Баторыяў, адзін з якіх – Стэфан Баторый – стаў нават каралём Рэчы Паспалітай (1576–1586). Трансільванія, абароненая хрыбтом Карпацкіх гор, магла разлічваць і на «пратэкцыю» Габсбургаў. І менавіта таму асманы так ашчадна ставіліся да васалітэту Трансільваніі, – каб не даць яе вярхам падставы шукаць у Габсбургаў дапамогі дзеля сваёй абароны або нават для «вызвалення». Габсбургі, у сваю чаргу, шукалі магчымасці Трансільванію ў туркаў забраць.

Стэфан Баторый

У Валахіі, чыё васальнае становішча было найболей складаным, урэшце з'явіўся яе ратаўнік. Ім стаў ваявода Міхай, які, узыходзячы ў 1593 г.на трон, прысягнуў на вернасць султану і заплаціў у Стамбуле (былым Канстанцінопалі) вялікія грошы, але, стаўшы гаспадаром, умацаваў у княстве сваю ўнутраную ўладу і пачаў рыхтавацца да выступу супраць асманаў. Ён увайшоў са сваёю дзяржавай у антытурэцкую «Свяшчэнную лігу», ініцыятарамі якой выступілі Габсбургі й Папа Рымскі. У Еўропе на той час існавала

ўжо двухсотгадовая традыцыя стварэння падобных кааліцый, звычайна пад пратэктаратам Святога Прастола. Як мы памятаем, яшчэ ў XV ст. супраць турак было праведзена некалькі «крыжовых паходаў». У склад «Свяшчэннай лігі» 1594 г. уваходзілі Іспанія, Венецыя, асобныя італьянскія герцагствы, Малдова і Трансільванія. Уладар Трансільваніі ў гэтым кантэксце выступаў як сюзерэн трох румынскіх дзяржаваў, з якіх у антычныя часы складалася Дакія і жыхароў якіх у духу эпохі Адраджэння паранейшаму так і называлі. Папскі пасол, які на даручэнне Папы Рымскага прыбыў схіліць гаспадара Валахіі да ўступлення ў лігу, меў канкрэтныя інструкцыі нагадаць Міхаю, што ён, як і ўвесь румынскі народ, мае рымскае паходжанне.

Міхай Харобры

Заручыўшыся дапамогаю трансільванцаў і паразумеўшыся з гаспадаром Малдовы, Міхай у 1594 г. узняў у Бухарэсце антыасманскае паўстанне. З уласнай арміяй, якая складалася з наймітаў, і з удзелам саюзнікаў гаспадар Валахіі атрымаў некалькі бліскучых перамог у бітвах з туркамі і татарамі як на поўнач, так і на поўдзень ад Дуная, абудзіўшы ў балканскіх хрысціянскіх народаў надзею на нацыянальнае вызваленне. Дзякуючы сваім дзеянням румынскі гаспадар набыў у Еўропе славу хрысціянскага героя, здольнага вызваліць Балканы і Канстанцінопаль. Найбольш значныя перамогі былі здабытыя ў бітве пры Кэлугэрэні 23 жніўня 1595 г., а крыху пазней, у кастрычніку 1595 г., і ў Джурджу-на-Дунаі, у выніку чаго асманская пагроза была адсунутая. Неўзабаве туркі запрасілі міру і былі вымушаныя зноў прызнаць Міхая незалежным гаспадаром. Але мір быў нядоўгі, бо Асманская імперыя пачала шукаць хаўрусу

Бітва пры Кэлугэрэні

супраць румынскага гаспадара з Польшчай і Трансільваніяй. Дзеля ўмацавання сваіх пазіцый Міхай заключыў пагадненне з Габсбургскай імперыяй (1598), што ў пэўнай ступені ўраўнаважыла сітуацыю. Але патрабавалася нешта яшчэ, былі неабходны пэўныя энергічныя дзеянні, якія ўзмацнілі б уладу гаспадара ў чалавечым, тэрытарыяльным і эканамічным плане, бо толькі гэта давала б рэальную незалежнасць, у першую чаргу адносна турэцкай пагрозы. Міхай вырашыў, выкарыстаўшы саюз з аўстрыйскім імператарам, пашырыць сваю ўладу на ўсе тры румынскія княствы, якія называліся тагачаснымі гуманістамі Дакіяй. Іх аб'яднанню спрыяла і тое, што, у адрозненне ад балканскіх краінаў, румынскія зямлі не былі непасрэдна захопленыя асманамі, што дазваляла гаспадару мець большую свабоду ў дзеяннях. Іх гаспадаркі былі ўзаемадапаўняльныя, праз Карпаты праходзілі асноўныя гандлёвыя шляхі, трансільванскія купцы мелі прывілеі ў Валахіі ды Малдове, гаспадары й асобныя баяры якіх валодалі сотнямі крэпасцяў, кірмашамі і вёскамі ў Трансільваніі, а мітраполія трансільванскіх румынаў (з усімі прыналежнымі ёй епіскапатамі) знаходзілася ў кіраванні мітраполій Валахіі і Малдовы і г. д. Важным чыннікам быў і агульны этнічна-дэмаграфічны падмурак, бо румыны ва ўсіх трох румынскіх дзяржавах складалі

пераважную большасць. У выніку ў 1599 г. войска Валахіі на чале з Міхаем Харобрым (фармальна ад імя імператара з роду Габсбургаў), пераваліўшы цераз Карпацкі хрыбет, увайшло ў Трансільванію і перамагло войска мясцовага ўладара. Гаспадар Валахіі быў абвешчаны й кіраўніком Трансільваніі. Годам пазней войска гаспадара дзвюх аб'яднаных румынскіх земляў зноў перайшло Карпацкія горы, гэты раз ужо кіруючыся на ўсход, у выніку чаго да новага палітычнага ўтварэння была далучаная і Малдова. Такім чынам улетку 1600 года ў Ясах Міхай Харобры прыняў вярхоўны тытул «гаспадара Валахіі, Трансільваніі і ўсяе Малдовы». У духу Рэнесансу сучаснікі ахрысцілі яго «аднаўляльнікам Дакіі» (restitutor Daciae), гэта значыць тым, хто зноўку злучыў землі колішняй Дакіі. Але ён злучыў іх на карысць румынаў, як асцярожна і ненаўпрост пачалі адзначаць сведкі-сучаснікі, а пазней ужо больш адкрыта падкрэслівалі нашчадкі. У Лондане ў гэты час трон па-ранейшаму займала каралева Лізавета, якая стварыла перадумовы аб'яднання Англіі і Шатландыі і заснавала ў Новым Свеце калонію Вірджынія, што пазней стала ядром вялікай амерыканскай федэрацыі.

Але аб'яднанне было нетрывалым, бо памкненні Міхая былі непрымальнымі не толькі для венгерскіх нобіляў – іх зусім не падзялялі ні палякі, ні туркі, ні Габсбургі. Аднаўленне Дакіі ў новых умовах на чале з румынскім кіраўніком не ўпісвалася ў тагачасныя міжнародныя рэаліі, і абставіны для гэтага былі таксама неспрыяльныя. Таму гаспадар-аб'яднальнік у выніку быў па-здрадніцку забіты па змове баяр 19 жніўня 1601 г. паблізу Турды.

Аб'ядноўваючы тры дзяржавы, Міхай Харобры не дзейнічаў у нацыянальным духу, як гэта разумелі б сёння, ён не меў на мэце стварыць тагачасную Румынію, але ім быў закладзены трывалы падмурак у стварэнне будучай Румыніі. У Трансільваніі ён ажыццявіў шэраг захадаў на карысць румынаў, ураўнаваўшы іх у правах з іншымі нацыямі, увёў пэўныя агульныя для ўсіх трох дзяржаваў установы. Апроч таго, захаваўшы ранейшыя ўладныя інстытуты, ён увёў у іх і румынаў, а захаваўшы ранейшыя афіцыйныя мовы, пачаў выдаваць загады і дакументы і на румынскай мове. Ён прымусіў заканадаўчы сход прызнаць права румынаў пасвіць скаціну з румынскіх сёлаў на ўзмежжы з паселішчамі вугорцаў і саксаў, а таксама вызваліць

Забойства Міхая Харобрага. Гравюра 1703 г.

румынскіх святароў ад працоўнай павіннасці (абавязку адпрацоўваць на карысць нобіляў), ён звярнуўся да аўстрыйскага імператара, каб праваслаўе было прызнанае сярод іншых дазволеных рэлігійных культаў, і г. д. Афіцыйныя вярхі Трансільваніі, якія ўяўлялі сабой меншую частку насельніцтва, усведамлялі сур'ёзнасць небяспекі, якую ім несла дзейнасць новага гаспадара, і таму зрабілі ўсё, каб звергнуць Міхая і абсекчы ўсякія сувязі з дзвюма іншымі румынскімі дзяржавамі. Румыны ж, наадварот, «акрыленыя гаспадаром з іх народа» (як адзначыў адзін вугорскі храніст), падняліся на барацьбу супраць нобіляў, атрымалі вялікую надзею на вызваленне ў сваёй краіне і на роўныя правы з прызнанымі нацыямі. Пазней Міхай Харобры стаў для румынаў нацыянальным сімвалам, накшталт бацькі-заснавальніка, якім, скажам, стаў Джордж Вашынгтон для амерыканцаў. Румынскія нацыяналісты перабольшвалі ролю Міхая Харобрага, але яго віны ў гэтым, безумоўна, няма, а вось значэнне яго кіравання ў гісторыі Румыніі і ва ўсёй еўрапейскай цывілізацыі застаецца бясспрэчным.

8. XVII стагоддзе: ад Міхая Харобрага да фанарыётаў і Габсбургаў

Пасля смерці Міхая на працягу трох дзесяцігоддзяў павіннасці румынскіх дзяржаў перад Асманскай імперыяй былі значна зменшаныя, султанава вяршэнства збольшага было фармальным, бо туркі асцерагаліся новых антыімперскіх паўстанняў. Але пазней, асабліва напрыканцы Трыццацігадовай вайны (1618–1648), палітычная залежнасць румынскіх дзяржаваў ад туркаў зноў узрасла, хоць і тады не была поўнай: румыны захоўвалі свае краіны, органы ўлады, свой эканамічны і сацыяльны лад – іначай кажучы, аўтаномію, – у адрозненне ад грэкаў, балгар, албанцаў, сербаў і інш., якія па-ранейшаму жылі пад поўнай акупацыяй. З прычыны войнаў, прыродных катаклізмаў, хваробаў жыццё румынаў заставалася цяжкім. У другой палове XVII ст. Асманская імперыя зноў узмацняе ціск і павялічвае эканамічны прыгнёт, прымушаючы румынскія дзяржавы прадаваць шэраг прадуктаў туркам па зніжаных (прыкладна на 10–15%) цэнах у параўнанні з наяўнымі на еўрапейскіх рынках. Асобныя гісторыкі назвалі гэты феномен «гандлёвай манаполіяй» туркаў, хоць дакладнага вызначэння і акрэслення яму дагэтуль так і не дадзена. Як бы там ні было, ён не спыніў развіцця эканомікі: па-ранейшаму апрацоўваліся палі, сяляне пачалі вырошчваць кукурузу, на знешні еўрапейскі рынак выйшаў продаж прадуктаў жывёлагадоўлі, пашыралася і ўдасканальвалася горная прамысловасць, з'явіліся першыя мануфактуры. Сацыяльныя вярхі – нобілі і баяры – пачалі аб'ядноўвацца ў суперніцкія і нават варожыя адна да адной групоўкі, якія абіралі й змянялі гаспадароў ды вызначалі знешнепалітычную арыентацыю румынскіх дзяржаваў на Габсбургаў або Турцыю, або Польшчу, а потым, крыху пазней, і на Расію. Унутрыпалітычная барацьба паміж гэтымі групоўкамі, а таксама змаганне паміж імі ды гаспадарамі або прэтэндэнтамі на трон нанесла прыкметную шкоду румынскім дзяржавам.

У палітычным плане асобныя пераемнікі Міхая Харобрага спрабавалі працягваць яго палітыку ў Валахіі, трымаліся антыасманскай кааліцыі з хрысціянскімі кіраўнікамі і змагаліся за захаванне

Матэй Басараб

Васіль Лупу

аўтаномнага статусу сваёй краіны. Сярод такіх гаспадароў трэба асобна адзначыць Матэя Басараба (1632–1654) у Валахіі і Васіля Лупу (1634–1653) у Малдове, якія, нягледзячы на ўзаемную варожасць, забяспечылі сваім краінам перыяд росквіту, сацыяльнага прагрэсу і культурнага ўздыму. Імі былі нават зроблены асцярожныя спробы мадэрнізацыі падатковай сістэмы. Нягледзячы на асманскае вяршэнства, румынскія гаспадары мелі самастойныя дыпламатычныя зносіны з хрысціянскімі краінамі і захоўвалі аўтаномію сваіх дзяржаваў. Ва ўтворанай антыасманскай кааліцыі Матэй Басараб лічыўся за «правадыра ўсяго Усходу», а Васіле Лупу ўспрымаўся як нашчадак кіраўнікоў Візантыйскай Імперыі, бо «з выгляду больш нагадваў імператара, а не гаспадара», як пісаў летапісец. У сваім двары ён увёў цырыманіял візантыйскіх базілеўсаў. Большую свабоду дзеянняў, чым у гаспадароў прыдунайскіх княстваў, мелі кальвінісцкія кіраўнікі Трансільваніі – Га-

Георг (Дзьёрдзь) Ракацы I. Малюнак Рэмбранта, 1631

бар Бэтлен (1613–1629), Георг (Дзьёрдзь) Ракацы I (1630–1648) і Георг (Дзьёрдзь) Ракацы II (1648–1657). Яны ўмацавалі цэнтральную ўладу ў духу абсалютызму, спрыялі эканамічнаму росту, падтрымлівалі рамёствы і гандаль. Аднак вынікі гэтага росквіту адчувалі толькі прызнаныя нацыі – вугорцы, саксы і сэкеі, а румыны па-ранейшаму заставаліся адхіленымі ад удзелу ў афіцыйным палітычным жыцці і пазбаўленымі палітычнай улады. Трансільванскія кіраўнікі (прынцэпсы) заключылі некалькі дамоваў з Малдовай і Валахіяй, спадзеючыся на аднаўленне «Дакіі» пад сваім вяршэнствам і вызваленне з-пад турэцкага пратэктарату. У 1659 г. у румынскіх землях выбухнула антыасманскае паўстанне на чале з гаспадаром Міхням III (які натхніўся прыкладам Міхая Харобрага), аднак яго поспех кароткачасовым. На Захадзе ў гэты самы час адбываліся такія падзеі, як рэвалюцыя на чале з Оліверам Кромвэлем, англа-галандскія вайны, захоп англічанамі ў іспанцаў вострава Ямайка і шмат іншага.

У другой палове XVII – на пачатку XVIII ст. пасля некалькіх слабых і кароткачасовых гаспадароў да ўлады прыходзяць Шэрбан Кантакузіна і Канстанцін Брынкавяну (у Валахіі) і Дзімітрый Кантэмір (у Малдове) – тры выбітныя асобы ў гісторыі Дунайскіх княстваў. Пасля правальнага паходу туркаў на Захад ды іх няўдалай аблогі Вены (1683) адносіны паміж румынскімі гаспадарамі сталі шчыльнейшымі. Шэрбан Кантакузіна, а пасля яго і Канстанцін Брынкавяну правялі перамовы з Габсбургамі дзеля ўсталявання незалежнасці краіны, забеспячэння ў ёй рэлігійных свабодаў, захавання мясцовых звычаяў і поўнага выхаду з-пад асманскага ўплыву. Дзімітрый Кантэмір спадзяваўся дасягнуць такой самай мэты (скасаванне султанскага

Дзімітрый Кантэмір

пратэктарату, дасягненне незалежнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Малдовы й спадчыннасць сваёй улады) з дапамогай саюза з расійскім царом Пятром I у 1711 г. Але ўсе гэтыя спробы выйшлі няўдалымі, а гаспадары скончылі сваё жыццё драматычна ці нават трагічна. У прыватнасці, пасля няўдачы расійска-румынскага войска ў бітве пад Стэнілешці (1711) Дзімітрый Кантэмір быў вымушаны падацца ў выгнанне ў Расійскую імперыю, дзе працягнуў навуковую і культурную дзейнасць у духу ранняга Асветніцтва (або перадасветніцтва). Ён стаў адным з найбуйнейшых еўрапейскіх навукоўцаў свайго часу, напісаў пра мінулае і сучаснае свайго народа, пра адзінства ўсіх румынаў, пра іх музычнае мастацтва, рэлігійныя веравызнанні і да т. п. Кантэмір стварыў адну з найлепшых гісторый Асманскай імперыі. Яго імя і сёння можна ўбачыць на франтоне Парыжскай бібліятэкі св. Жэнеўевы побач з прозвішчамі выдатных сусветных навукоўцаў і культурных дзеячаў. Брынкавяну за 26 гадоў свайго кіравання ўмацаваў прэстыж сваёй краіны, захаваў шчыльныя сувязі з Захадам, прытупіўшы пільнасць туркаў з дапамогаю дыпламатычных захадаў і велізарных сум грошай, узвёў манументальныя будынкі ў стылі румынскага барока, якому было нададзена яго імя. Урэшце яго выклікалі з усёй сям'ёй у Стамбул і паставілі перад выбарам: або здрадай нацыі і веры, або смерцю. З цвёрдасцю святога пакутніка Брынкавяну выбраў апошняе: перад яго вачыма былі забітыя чатыры яго сыны, а потым быў абезгалоўлены і ён сам. Пазней Румынская праваслаўная царква далучыла яго імя, як і імя згадванага вышэй Штэфана Вялікага, да ліку святых.

У год трагічнай смерці Брынкавяну трон у Вялікабрытаніі заняла Гановерская дынастыя (Георг I), а незадоўга перад тым англійскі парламент прыняў *Habeas Corpus Act* (1679), здарылася «славутая рэвалюцыя» (1688), быў заснаваны Англійскі банк (1694) і адбылося аб'яднанне Англіі з Шатландыяй пад назвай Вялікабрытанія (1707). У Амерыцы судзілі «салемскіх ведзьмаў» (1692), Нью-Джэрсі стаў «каралеўскай правінцыяй» (1702), быў заснаваны Ейльскі ўніверсітэт (1701), а паўстанне індзейцаў Паўночнай Караліны было задушанае англійскімі войскамі. У Францыі падыходзіў да заканчэння доўгі і яскравы перыяд уладарання Людовіка XIV, якога празвалі «Каралём-Сонцам».

9. Эпоха Асветніцтва

9.1. Новыя палітычныя рэжымы: Габсбургскі і фанарыёцкі

Як ні парадаксальна, Асветніцтва прынесла чалавецтву не толькі здабыткі ў сферы культуры і свабоду ў самых розных яе праявах, але і было адзначана дэспатызмам, тыраніяй, войнамі і незлічонымі пакутамі. Румынскія дзяржавы ўступілі ў новую эпоху сцвярджэння сучаснай нацыі праз барацьбу за палітычнае і нацыянальнае вызваленне. Выразна не акрэсленыя і пераважна раздробленыя нацыі Сярэднявечча ўвайшлі ў новы перыяд актыўнага самасцвярджэння на аснове нацыянальных праграм, якія вялі да свабоды. Несумненна, як ад імя царквы, сям'і ці ўладара, так і ад імя ўсёй нацыі чынілася нямала несправядлівасці і злачынстваў, але гэта не павінна ўводзіць у зман і прыводзіць да асуджэння нацыі ўвогуле як формы чалавечай супольнасці.

Варажнеча паміж вялікімі дзяржавамі за панаванне ў цэнтральна-паўднёва-ўсходнім еўрапейскім рэгіёне прывяла да змены статусу румынскіх дзяржаваў. Так, Трансільванію захапілі Габсбургі, а Малдова і Валахія трапілі ў яшчэ большую залежнасць ад Асманскай імперыі, няхай і з захаваннем сваёй аўтаноміі. Апошнім пранікненнем туркаў у Цэнтральную Еўропу стала няўдалая аблога Вены ў 1683 г. Аблога з Вены была знятая дзякуючы польскім і хрысціянскім войскам на чале з каралём Рэчы Паспалітай Янам Сабескім, але перамогай скарысталіся аўстрыйцы. Яны кінуліся ў пагоню за турэцкім войскам і на падставе здзейсненага вызвалення хрысціянскіх краінаў ад туркаў занялі і далучылі да сваіх земляў Вугоршчыну, Славенію, Харватыю і Трансільванію (1684–1699). Трансільванія, якая была напалову незалежнай дзяржавай, трапіла ў непасрэднае падпарадкаванне, цалкам страціўшы свабоду знешніх стасункаў і апынуўшыся пад апекай аўстрыйскіх уладаў, якія прыйшлі сюды разам з габсбургскім войскам у 1687–1688 гг. і прымусілі мясцовыя ста́навыя сходы, што складаліся з набілітэту вугорцаў, саксаў ды сэкеяў, адмовіцца ад асманскага пратэктарату і прызнаць «імперскі сюзерэнітэт». Дыплом Леапольда 1691 г. (паводле імя аўстрыйскага імператара Леапольда I) стаў асноватворным дакументам, якія вызначыў статус Трансільваніі

Дыплом Леапольда 1691 г.

на наступныя амаль 150 гадоў. Гэты дыплом стаў пэўнага кшталту пагадненнем, заключаным паміж аўстрыйцамі і вярхамі паноўных у Трансільваніі нацый: захоўваліся ўсе іх сярэднявечныя прывілеі і надалей афіцыйна прызнаваліся тры нацыі (вугорцы, саксы і сэкеі) і чатыры «рэлігіі» пры далейшым прыгнёце румынаў, пры гэтым Трансільванія ўключалася ва ўладанні аўстрыйскіх Габсбургаў. У 1699 г. туркаў прымусілі афіцыйна ў выглядзе пісьмовай дамовы прызнаць іх адмаўленне ад любых прэтэнзій на Трансільванію.

Аўстрыйцы выношвалі планы прасунуцца са сваім войскам і за Карпаты – да Дуная і Чорнага мора, але ў гэтым рэгіёне значныя інтарэсы мела ўжо і Расія, дый туркі яшчэ не былі такімі слабымі, каб дазволіць спраўдзіцца падобным задумам Габсбургаў. Пастаянныя «здрады» румынскіх гаспадароў, асабліва Дзімітрыя Кантэміра і Канстанціна Брынкавяну, прымусілі турак шукаць новыя метады кіравання румынамі і захавання іх у арбіце асманскага ўплыву. Таму пачынаючы з 1711 г. у Малдове і з 1716 г. у Валахіі туркі пазбавілі мясцовых румынскіх гаспадароў улады і замянілі іх грэцкімі вяльможамі, якія паходзілі з квартала Фанар у Канстанцінопалі (чаму іх і пачалі называць фанарыётамі), бо канстанцінопальскім грэкам асманы давяралі больш. Фанарыёты прыбывалі ў румынскія землі са світаю грэцкіх баяр, службоўцаў, прыслугі і з вялікім жаданнем як найхутчэй узбагаціцца. Яны не карысталіся павагай сярод румынаў, бо, хоць і былі хрысціянамі, успрымаліся як турэцкія стаўленікі. Насуперак гэтаму нямала фанарыётаў былі культурнымі людзьмі, мелі сімпатыю да асветніцкіх еўрапейскіх і мясцовых румынскіх ідэалаў. Некаторыя нават паходзілі з румынскіх родаў. Перыяд кіравання

фанарыётаў доўжыўся аж па 1821 год, але, нягледзячы на ўзмацненне залежнасці ад асманаў, прыдунайскія румынскія княствы захавалі аўтаномію ва ўнутранай палітыцы, мясцовыя румынскія ўстановы не былі абмусульманеныя, таму і з гэтага гледзішча яны засталіся хрысціянскімі краінамі.

9.2. Унія трансільванскіх румынаў з каталіцкай царквой

Новыя палітычныя перамены, якія завяршыліся ўсталяваннем аўстрыйскай улады, не сустрэлі прыхільнага прыёму ў шматлікіх палітычных колах «вызваленых» краінаў. Асабліва незадаволеным было насельніцтва Трансільваніі й Вугоршчыны, у асяроддзі саксаў і вугорскіх нобіляў шырыліся беспарадкі. Найбуйнейшае антыгабсбургскае паўстанне ўзначаліў Ферэнц II Ракацы (1703–1711), у ім бралі ўдзел самыя шырокія пласты насельніцтва, і, апроч таго, яго падтрымалі Францыя і Расія. Прысутнасць новай улады адчувалася трансільванцамі самым непасрэдным чынам, яна абяцала стаць нават болей жорсткай, чым асманскі пратэктарат, які быў больш фармальным і апасяродкаваным. На пачатку румыны выразна не ўяўлялі, як праявіць сябе новая ўлада, але кожны цешыў сябе надзеяй на пэўныя змены ў старой структуры. Габсбургская імперыя магла стаць чыннікам раўнавагі, адмяніць або паменшыць дыскрымінацыю, прызнаць таксама румынаў за раўнапраўных грамадзян дзяржавы, нароўні з ужо афіцыйна прызнанымі нацыямі. І магчымасць гэтага ўзнікла адразу з увядзеннем у практыку рэлігійнай палітыкі Габсбургаў.

Аўстрыйцы спалучалі вайсковую сілу са сродкамі ідэалагічнага ўздзеяння, бо лічылі, што побач з войскам, дзяржаўным апаратам і кіроўнай дынастыяй важную ролю ў ажыццяўленні ўладных функцый на новых тэрыторыях павінна адыгрываць і царква. Вядома, тут мелася на ўвазе каталіцкая царква, г. зн. рэлігія роду Габсбургаў і большай часткі падданых іхняй імперыі. Але ў Трансільваніі каталіцкая вера была пашыраная менш за астатнія. У каталікоў не было нават біскупства, бо пераважная большасць святароў прыняла Рэфармацыю, і былая маёмасць рымскай царквы была канфіскаваная пратэстанцкай дзяржавай. Езуіцкія манахі (ордэн езуітаў, адмыс-

лова заснаваны Святым Прастолам у XVI ст. дзеля аднаўлення былой магутнасці каталіцызму) растлумачылі імператару стан рэчаў, прапанаваўшы для яго паляпшэння наступныя крокі: любыя намаганні наноў навярнуць пратэстантаў (г. зн. былых каталікоў) у каталіцызм не будуць мець прыкметнага поспеху, бо сапраўдных каталікоў тут мала – менш за траціну насельніцтва, а яго большую частку складаюць дыскрымінаваныя праваслаўныя румыны, якія дзеля атрымання пэўных правоў пагадзіліся б на збліжэнне з каталіцызмам. Такое збліжэнне, на думку яго ініцыятараў, дало б аўстрыйцам як мінімум падвойную перавагу: з аднаго боку, гэта абмежавала б празмерную ўладу і ганарыстасць станавых сходаў, асабліва вугорскіх нобіляў, а з другога – ператварыла б румынаў у вернападданых імперскай кароны. Вярхі станавых сходаў адчувалі небяспеку і выступалі супраць уніі, спрабуючы перацягнуць увагу румынаў да пратэстанцкіх веравызнанняў, асабліва да кальвінізму. Кальвінісцкі пратэктарат над румынскай царквой у Трансільваніі быў даўнім (з 1550 года) і меў на мэце цалкам ліквідаваць візантыйскую традыцыю, якая нараджала апазіцыйны рух. Акрамя таго, далучэнне румынаў да рэфарматарскага руху ішло насуперак жаданню венскага двара, які не быў у гэтым зацікаўлены. Таму ў 1697–1701 гг. у Вене было распрацавана некалькі дакументаў, сярод якіх некаторыя сталі сапраўднымі дамовамі, дзе прадугледжвалася, што румыны прызнаюць прыярытэт Папы Рымскага і прымаюць некалькі дробных пачаткаў каталіцкага веравучэння, а ўзамен за гэта захоўваюць свой візантыйскі абрад, царкоўны каляндар, звыклыя святы ды звычаі

Афанасій Ангел, былы праваслаўны мітрапаліт, першы біскуп Румынскай уніяцкай царквы ў Трансільваніі

й атрымліваюць пэўныя правы: у прыватнасці, румынскія святары-ўніяты (якіх да уніі лічылі рабамі) становяцца раўнапраўнымі са святарамі іншых пашыраных у Трансільваніі веравызнанняў, што забяспечвае таксама роўнасць усёй румынскай нацыі з вугорцамі, саксамі і сэкеямі. Пра гэта абвяшчалася ў двух імператарскіх дыпломах (маніфестах) за 1699 і 1701 гг. Новую царкву, у сваёй аснове праваслаўную, або візантыйскую, з пэўнымі рысамі каталіцкага веравучэння, пачалі называць грэка-каталіцкай (тут «грэцкі» азначае праваслаўны). Яшчэ раней унію прынялі русіны (украінцы) і асобныя румыны з заходніх земляў (асабліва з Біхора і Сатмара). Здавалася б, пасля стагоддзяў прыгнёту і цяжкай дыскрымінацыі гэты фармальны акт нарэшце даваў трансільванскім румынам роўныя правы з іх гаспадарамі і тым самым надзяляў новаю годнасцю. Але пагадненне не было вытрыманае з той простай прычыны, што Аўстрыйскі Двор, сутыкнуўшыся з жорсткай апазіцыяй вугорскага набілітэту, не змог гарантаваць румынскай нацыі абвешчанай роўнасці. І тады расчараваныя румыны, са свайго боку, адмовіліся цалкам пераходзіць у новую веру. Праўда, амаль шэсць дзесяцігоддзяў (1700–1761) трансільванскіх румынаў афіцыйна называлі грэка-каталікамі – «аб'яднанымі з Рымам», – хоць цалкам такога аб'яднання так і не адбылося. У гэты перыяд румыны мелі толькі адну міжкарпацкую епархію ў рангу епіскапства, хоць раней у іх была мітраполія. Там, дзе насельніцтва імкнулася захаваць традыцыйнае праваслаўе, здараліся сутычкі, часам нават даволі жорсткія, што ўрэшце прывяло да паўторнага прызнання царкоўнай іерархіі румынаў-неўніятаў, якіх асабліва шмат заставалася на поўдні Трансільваніі (у раёнах Брашова і Сібіў). У выніку ў 1759–1761 гг. румынская праваслаўная царква ў Трансільваніі адрадзілася ў статусе епіскапату. Разам з тым, што б ні казалася пра румынскіх грэка-каталікоў, іх вярхі, якія атрымлівалі адукацыю ў Вене, Рыме, Будзе або Трнаве (горад у сучаснай Славакіі), падрыхтавалі і распачалі нацыянальна-палітычную барацьбу за сваё вызваленне, заснавалі ў горадзе Блаж вышэйшую школу для адукацыі сваёй нацыі (1754), з асяроддзя ўніятаў-румынаў выйшлі некалькі пакаленняў выдатных інтэлектуалаў і палітычных дзеячаў, выхаваных у тагачасным цэнтральна- і заходнееўрапейскім асветніцкім духу.

9.3. Рэфармацыя

Як аўстрыйцы, так і фанарыёты спрабавалі рэфармаваць вышэйшае грамадства ў адпаведнасці з правіламі асвечанага абсалютызму, часам нават трымаючыся фармулёўкі аднаго з яго галоўных герояў: «усё для народа, нічога за кошт народа».

Трансільванія была прынцыпатам (з 1765 г. – вялікім прынцыпатам) у складзе Габсбургскай імперыі, кіраваў ёю губернатар, бо прынцэпсам цяпер быў сам венскі імператар. Станавыя сходы страцілі сваё значэнне, іх дзейнасць была абмежаваная і склікаліся яны нячаста. У 1740–1790-х гг. імператрыца Марыя Тэрэзія і імператар Ёзэф II ажыццявілі шырокі спектр рэфармацыйных захадаў, якія заключаліся ў рэарганізацыі вытворчых сілаў і вытворчых адносінаў, у рэлігійнай талерантнасці (нават да праваслаўных), у мадэрнізацыі адукацыі, у новым адміністрацыйным падзеле краіны, у ліквідацыі сярэднявечных аўтаномій прывілеяваных нацый (у прыватнасці, вугорскіх, сакскіх і сэкейскіх нобіляў), у аддзяленні выканаўчай улады ад судовай і г. д. Дзяржава ўмяшалася ў адносіны паміж



Імператрыца Марыя Тэрэзія

Імператар Ёзэф II

нобілямі і сялянамі і, спрабуючы абмежаваць панскія злоўжыванні, устанавіла паншчыну (абавязковую працу) тры-чатыры дні на тыдзень, яна ператварыла звычайных грамадзян у спраўных падаткаплатнікаў, пачала прыцягваць іх да вайсковай службы і да т. п. У канцы стагоддзя (1785) імператар адмяняе асабістую залежнасць сялян і гэтым паляпшае іх становішча. Румыны, а большасць з іх адносіліся якраз да самага бяспраўнага сялянства, таксама пачынаюць адчуваць перавагі новых рэфарматарскіх захадаў: аднаўляецца праваслаўная царква, румыны атрымліваюць роўныя правы з саксамі, права сяліцца ў гарадах (пасля стагоддзяў забароны), займацца рамёствамі, жаніцца без згоды гаспадара, яны перастаюць, як прыгонныя, быць «прымацаванымі да зямлі». Уздоўж горнай грады ў Трансільваніі і Банаце пачалі фарміравацца памежныя палкі і батальёны, што было варожа ўспрынята сэкеямі, але станоўча – румынамі, бо паступленне на ваенную службу, калі не вяло да смерці ў баі, магло даць асабістую свабоду (прыгонныя румыны, якіх забіралі ў войска, станавіліся вольнымі людзьмі). Кансерватыўным набілітэтам такія змены ўспрымаліся як «рэвалюцыйныя» і выклікалі ў яго супраціў. Румынам жа асветніцкія рэформы давалі надзею.

Канстанцін Маўракардат, з перапынкамі шэсць разоў гаспадар Валахіі і чатыры разы – Малдовы

Гаспадары-фанарыёты, асабліва з дынастыі Маўракардатаў, таксама былі пачынальнікамі шэрагу рэформаў, упершыню апісаных у парыжскім часопісе «Mercure de France» («Французскі Меркурый») пад назваю *Канстытуцыя*. Праз увядзенне сацыяльных рэформаў дзяржава ўмешвалася ў дачыненні ўласнасці і адмяняла прымацаванасць да зямлі (асабістую залежнасць) прыгоннага селяніна, які зноў набываў права свабоднага перамяшчэння. І ўсё ж за селянінам

захоўваўся абавязак бясплатна адпрацаваць на феадала пэўную колькасць дзён, якая была ў дзесяць разоў меншая, чым у Трансільваніі, і таму шматлікія трансільванскія румыны пераходзілі цераз Карпаты й сяліліся ў Валахіі ды Малдове. У той час у паўднёвых і ўсходніх прыгор'ях Карпатаў было заснавана нямала сёлаў «вугорцаў», г. зн. трансільванскіх румынаў, якія прыбылі з «Вугорскай краіны», і гэты факт сведчыць пра рэальна дамінантную тэндэнцыю перасялення трансільванскіх румынаў у Валахію і Малдову. Падатковая рэформа замяніла шматлікія выплаты адзіным фіксаваным гадавым і індывідуальным падаткам, выплата якога размяркоўвалася на чатыры часткі. Дзякуючы адміністрацыйнай рэформе пачалі аплачвацца службовыя пасады і праведзена мадэрнізацыя дзяржаўных установаў. Часам і Валахіяй, і Малдовай кіраваў адзін і той самы гаспадар-фанарыёт, які праводзіў агульныя (тоесныя ці падобныя) рэформы ў абедзвюх дзяржавах, рыхтуючы такім чынам палітычнае адзінства дзвюх гэтых краін.

9.4. Спрэчкі вакол «усходняга пытання»

Нягледзячы на зацікаўленасць у правядзенні рэформаў і мадэрнізацыі і нават ажыццяўленне канкрэтных крокаў у гэтым кірунку, Цэнтральная і Паўднёва-Усходняя Еўропа па-ранейшаму моцна цярпела ад варажнечы і ўзброеных канфліктаў паміж дзяржавамі. Асманская імперыя ператварылася ў «вялікага хворага Еўропы», яна ўжо не магла ўладарыць над велізарнымі тэрыторыямі й хрысціянскімі народамі, якія яна заваёўвала пачынаючы з XIV ст. Прычынамі гэтага сталі і ўнутраная слабасць Турцыі, і глыбокі крызіс асманскага грамадства, і імкненне заваяваных народаў да нацыянальнага вызвалення, а таксама спрэчкі сярод вялікіх дзяржаваў у барацьбе за перадзел спадчыны асманскіх султанаў. На пярэднім плане канфлікту, які пачалі называць «усходнім пытаннем», стаялі Аўстрыя і Расія, а само пытанне зводзілася да адказу: каму з гэтых дзяржаваў валодаць тэрыторыямі, якія ўжо не магла ўтрымліваць Турцыя? Румыны, як і некаторыя іх суседзі, нямала пацярпелі ў выніку гэтых разборак, але таксама пастараліся атрымаць з іх сякія-такія перавагі. І ўсё ж чарада расійска-аўстрыйска-турэцкіх войнаў 1716–1812 гг., якія

ў значнай меры разгортваліся на тэрыторыі румынскіх дзяржаваў, вылілася ў знішчэнне шматлікіх матэрыяльных каштоўнасцяў і страты чалавечых жыццяў. Румыны ўдзельнічалі ў змаганні хрысціянскіх краін супраць Турцыі у тым ліку і як добраахвотнікі. Цягам доўгага перыяду гэтага супрацьстаяння асобныя румынскія правінцыі рабіліся аб'ектамі захопу і былі акупаваны замежнымі, пераважна хрысціянскімі краінамі, якія такім чынам «дапамагалі» румынам у вызваленні: так, аўстрыйцы захоплівалі Алтэнію (у 1718–1739 гг.), пасля – Букавіну (якой уладарылі з 1775 па 1918 г.), расійцы акупавалі Бесарабію (з 1812 па 1918 г.). Аўстрыйцы, забраўшы Банат у туркаў, валодалі ім з 1718 па 1918 г. Акрамя гэтага, як ужо адзначалася, пад уладай Аўстрыі з 1688–1699 гг. знаходзілася Трансільванія, дзе ў значнай ступені захоўвалася сярэднявечная, дыскрымінацыйная ў дачыненні да румынаў сістэма кіравання. Усё гэта прывяло румынаў да стварэння арганізаванага нацыянальнага руху. Нягледзячы на залежнасць ад Асманскай імперыі, прысутнасць грэкаў у якасці гаспадароў і тэрытарыяльныя страты, дзве румынскія дзяржавы на поўдзень і ўсход ад Карпатаў усё-такі захавалі сваю нацыянальную ідэнтычнасць. Тут гадавалася румынская адукаваная эліта, якая таксама пачала палітычную барацьбу за незалежнасць і палітычнае аб'яднанне румынаў.

9.5. Барацьба за нацыянальна-палітычнае вызваленне

Дзякуючы наступствам аб'яднання румынскіх земляў, ажыццёўленага Міхаем Харобрым, а таксама ў сувязі з узнікненнем новых еўрапейскіх гарызонтаў былая сярэднявечная румынская нацыя ўжо з 1600 г. пачала набываць сучасныя рысы. XVII стагоддзе прынесла нямала дасягненняў на нацыянальнай ніве, прывёўшы румынаў да ўсведамлення свайго нацыянальнага адзінства і старажытнага раманскага паходжання, што паслужыла штуршком да барацьбы за нацыянальнае вызваленне. На сцэну пачала выходзіць сучасная румынская нацыя, якая заяўляла пра сябе актыўнымі дзеяннямі, што ўрэшце мусіла прывесці да ўзнікнення ўнітарнай нацыянальнай дзяржавы. І ў папярэднія XV і XVI стст. былі румынскія знаўцы, якія ведалі, што іх народ паходзіць ад рымлян, «ад імператара Траяна,

які спешыўся тут першым», што амаль усе насельнікі Трансільваніі, Марамурэша, Баната і інш. гавораць на адной мове і складаюць адзін народ, але ўпэўненасць у гэтым яшчэ не была пашыраная і не магла спарадзіць рашучых дзеянняў ад імя нацыянальнай супольнасці. Час для гэтага тады яшчэ не надышоў. Стагоддзю Асветніцтва было наканавана аб'яднаць лацінскасць, даўнасць і еднасць паходжання – тры складнікі аднаго ўраўнення, на другім канцы якога стаяла нацыянальнае вызваленне, – каб з іх вынікла канкрэтнае дзеянне.

Формы нацыянальнай барацьбы былі разнастайныя, але іх можна разбіць на чатыры групы: палітычныя, рэлігійныя, сацыяльныя і культурныя. Разгледзім кожную з іх больш канкрэтна.

1. У канфесійным плане імі былі:

– унія з рымска-каталіцкай царквой;

– асветніцкі рух на чале з грэка-каталіцкім біскупам Інакенціем Міку-Кляйнам;

– супраціў праваслаўнага насельніцтва ў Трансільваніі.

2. У палітычным плане:

– зварот баяр Валахіі і Малдовы да буйных дзяржаваў;

– петыцыі трансільванскіх румынаў (вядомыя пад лацінскаю назвай як *Supplex Libellus Valachorum Transsilvaniae*);

3. У сацыяльным плане:

– паўстанне Хорыі;

– нацыянальна-вызваленчы рух на чале з Тýдарам Уладзімірэску;

4. У культурніцкім плане:

– ваяўнічае асветніцтва, прадстаўленае перадусім Трансільванскаю школай, а таксама аналагічнымі рухамі ў прыдунайскіх княствах.

Канфесійны аспект: праз пасярэдніцтва царквы – да нацыі

Ідэя уніі трансільванскіх румынаў з рымска-каталіцкай царквой была царкоўным актам з палітычным кантэкстам, бо адказ румынаў меў нацыянальную форму: мы аб'ядноўваемся з вамі, калі вы даяце нам нацыянальныя правы! З гэтай прычыны праграма нацыянальнага вызвалення румынаў была выпрацаваная царкоўнікам, уніяцкім біскупам (з 1728 г.) Інакенціем Міку-Кляйнам. Ён звярнуўся да аўстрыйскіх палітычных уладаў і мясцовага трансільванскага кіраўніцтва з некалькімі патрабаваннямі (названымі

Supplex Libellus – «кніжная петыцыя»), у якіх зазначыў, што яны абавязаныя «вярнуць даўжок», бо, хоць румыны і аб'ядналіся з рымска-каталіцкай царквой, але абяцаных палітычных правоў так і не атрымалі. Міку-Кляйн неаднаразова і настойліва паўтараў гэтыя патрабаванні: адмена стаўлення да румынаў як да людзей падпарадкаваных, ураўноўванне іх у правах з іншымі нацыямі; дазвол прадстаўнікам румынскага народа займаць публічныя пасады, уключна з прадстаўніцтвам ва ўрадзе і станавых сходах (дзе на той час быў толькі адзін румын, сам гэты біскуп!), права атрымліваць адукацыю і займацца рамёствамі прапарцыйна з колькасным прадстаўніцтвам у грамадстве; паляпшэнне становішча сялянства і ўсіх іншых сацыяльных катэгорый прыгнечанага румынскага народа. Біскупавы аргументы на карысць надання правоў яго нацыі адпавядалі часу і былі лагічнымі: румыны – самы шматлікі народ Трансільваніі, яны выконваюць большую частку грамадскай працы, карысць ад якой атрымліваюць іншыя, апроч таго, яны і найстаражытнейшыя жыхары краіны, нашчадкі каланізатараў-рымлян яшчэ ад часоў імператара Траяна. Умовы жыцця румынскай нацыі і яе гістарычная спадчына становяцца для Інакенція Міку-Кляйна зброяй у палітычнай барацьбе, адстойванне сваіх нацыянальна-гістарычных правоў ператвараецца ў сапраўдную палітычную праграму нацыянальнага вызвалення ўсіх трансільванскіх румынаў.


SVPPLEX LIBELLVS
VALACHORVM
TRANSSILVANIÆ
IVRA TRIBVS RECEPTIS NATIONIBVS COMMVNIA
POSTLIMINIO SIBI ADSERI
POSTVLANTIVM.

CVM NOTIS HISTORICO - CRITICIS
I. C. E.
CIVIS TRANSSILVANI.

CLAVDIOPOLI.

Sumptibus et Typis Martini Hedmeister, Caes. Reg. Dicaes. Typographi & pr. Bibliopolæ. MDCCXCI.

Першая старонка петыцыі Supplex Libellus Valachorum

Абураны прыгнечаным станам сваёй непрызнанай нацыі, грэблівым стаўленнем і непрыняццем уладаў, упэўнены ў сваёй праўдзе, біскуп ператвараецца ў палітычнага лідара: дзеля абмеркавання надзённых праблемаў нацыі ён склікае сінод у Блажы (цэнтры ўніяцкай царквы), куды запрашае найбольш вядомых прадстаўнікоў румынаў – царкоўных і свецкіх дзеячаў, грэка-каталікоў

Інакенцій Міку-Кляйн

і праваслаўных. Па сутнасці, гэта быў своеасаблівы сход нацыянальнай рады. Імператрыца Марыя Тэрэзія, якую даўно ўжо гнявілі ўчынкі ўпартага біскупа, выклікала яго ў Вену (1744), дзе ён незаконна быў дапытаны і пачуў на свой адрас пагрозы. З гэтай прычыны Інакенцій быў вымушаны таемна пераправіцца ў Рым пад абарону Папы Рымскага, дзе 24 гады (па 1768 год) пражыў у выгнанні, спалучаным з забаронай вяртацца на сваю радзіму, пра якую ён ніколі не пераставаў думаць. Міку-Кляйн дзесяткі разоў звяртаўся пісьмова да прэлатаў і каранаваных асоб, імкнучыся палепшыць лёс сваёй нацыі. Ён памёр у выгнанні, у Італіі, з верай у нацыянальнае абуджэнне румынаў роднай Трансільваніі і з упэўненасцю, што «сапраўднае ўваскрашэнне магчымае толькі на роднай зямлі».

Запавет біскупа-пакутніка быў выкананы толькі праз 230 гадоў, калі ўвосень 1997 г. яго прах быў прывезены з Рыма і перазахаваны ў Блажскім саборы.

Адмова трансільванскіх уладаў і венскага двара (па іх намаўленні) надаць трансільванскім румынам пісьмова абяцаныя імперскімі ўрачыстымі актамі 1699–1701 гг. грамадзянскія правы, пагардлівае стаўленне да зваротаў Інакенція Міку-Кляйна і яго выгнанне выклікалі беспарадкі сярод румынаў і спарадзілі тэндэнцыю да іх вяртання ў праваслаўе. Паміж 1744 і 1763 гг. адбыўся шэраг падзеяў, у якіх часам прысутнічалі і праявы гвалту, у выніку чаго частка трансільванскіх румынаў так і не захацела пакідаць праваслаўную веру або вярнулася назад да праваслаўя. Урэшце венскі двор вымушаны быў пагадзіцца на аднаўленне праваслаўнай царкоўнай іерархіі, і такім чынам з 1761 года ў румынаў афіцыйна стала дзве царквы – праваслаўная і грэка-каталіцкая, абедзве з візантыйскім абрадам.

Румынскія землі пасля Карлавіцкага кангрэса (1699). 1699–1718

Палітычны аспект: прызнанне румынскай нацыі і аднаўленне Дакіі

У трансільванскіх румынаў не было іншай актыўнай і надзейнай эліты, апроч святароў, а Інакенцій Міку-Кляйн паказаў, што і адзін прэлат пры неабходнасці можа стаць палітычным лідарам. Выказаныя ім ідэі былі развітыя іншымі царкоўнымі дзеячамі, яго паслядоўнікамі, якія ўзнялі іх на яшчэ больш высокі ўзровень. Першыя афіцыйныя перапісы насельніцтва Габсбургскай імперыі ясна і недвухсэнсоўна засведчылі, што румыны складаюць дзве траціны насельніцтва Трансільваніі, але ўсімі выгодамі карысталася толькі кіроўная траціна нерумынаў – вугорцы, саксы і сэкеі. Толькі яны прысутнічалі ў кіраўніцтве, з іх складаліся станавыя сходы і мяс-

цовыя органы ўлады, яны вяршылі суд, выдавалі законы, мелі свае школы, культурныя ўстановы і да т. п. Імператар Ёзэф II (1780–1790), які некалькі разоў наведаў Трансільванію, прасякнуўся лёсам сваіх румынскіх падданых, ён іх вітаў як нашчадкаў Рыма, спрабаваў і нават часткова здолеў выправіць сітуацыю, паменшыўшы сярэднявечныя прывілеі трох паноўных нацый і забяспечыўшы прынамсі мінімальнае паляпшэнне жыцця румынаў. Аднак пасля смерці імператара ў 1790 г. паноўны набілітэт адмяніў усе праведзеныя імператарам рэформы й вярнуўся да палітыкі кансерватызму. Тады румынскія падзвіжнікі, спачатку дзеячы царквы, а потым і свецкія – асветнікі, дробная знаць, купцы з Брашова, афіцэры румынскіх палкоў і інш. – разгарнулі шырокі нацыянальны рух. Такія выбітныя асобы, як Ёан Пара, Петру Маёр, Самуіл Міку, Георге Шынкай, Ігнаціе Дарабант, Ёан П'юарыу-Молнар ды іншыя, у пераважнай большасці грэка-каталікі, склалі некалькі бліскучых петыцый, сярод якіх найважнейшай стала «Кніга пажаданняў румынаў» (*Supplex Libellus Valachorum*) 1791 года – прадстаўнічы акт румынскай нацыі (чыя назва сама паказвала, што ён пададзены ад імя ўсіх румынаў), які грунтаваўся на праграме, выпрацаванай Інакенціем Міку-Кляйнам. Канчатковая рэдакцыя дакумента была завершаная ў Арадзе пры двары ўніяцкага біскупа-асветніка Ігнаціе Дарабанта і адтуль была высланая ў Вену імператару Леапольду II. Румынская нацыя прасіла наступнае:

- выключыць ужыванне ў стасунку да румынаў адыёзных і пагардлівых тэрмінаў – «дапушчальны», «прымальны», «непрыналежны да паноўных нацый» – як непрыстойных і несправядлівых;
- аднавіць ва ўсёй паўнаце грамадзянскія правы румынскай нацыі, у тым ліку яе права на ўдзел у кіраванні;
- афіцыйна абвясціць румынскую нацыю раўнапраўнай з усімі астатнімі нацыямі дзяржавы;
- дапусціць прадстаўнікоў румынскай нацыі ў станавыя сходы, іншыя цэнтральныя і мясцовыя ўстановы, адміністрацыю і ўвогуле прызначаць на ўсе грамадскія пасады адпаведна іх колькаснаму складу ва ўсім насельніцтве.

Гэты дакумент, адрасаваны ад імя ўсёй румынскай нацыі і падпісаны абодвума румынскімі біскупамі – уніяцкім і праваслаў-

ным, – абапіраўся на філасофскія, гістарычныя і чыста прагматычныя аргументы. Аўтары звароту патрабавалі інтэграваць румынаў у дзяржаўную канстытуцыйную сістэму і рабілі гэта ў адпаведнасці не толькі з ідэямі Асветніцтва, але і з ідэямі Французскай рэвалюцыі, правоў чалавека і грамадзяніна, прынцыпаў свабоды, роўнасці і братэрства. Ні гэты зварот, ні наступныя, не былі прынятыя да ўвагі ўрадам, бо пагражалі разбурыць сярэднявечную сістэму панавання меншасці над румынскаю большасцю ў Трансільваніі, і іх мэта была сапраўды менавіта такою. Але румынскі нацыянальна-вызваленчы рух ужо не мог быць спынены. Дзясяткі зваротаў у цэнтральныя і мясцовыя органы ўлады ад усё больш шырокіх слаёў румынскага насельніцтва паступова рыхтавалі глебу для рэвалюцыйных рухаў XIX ст.

Георге Шынкай

У гэты самы час кіраўніцтва Валахіі і Малдовы змагалася за свабоду дзвюх іншых частак румынскай нацыі, якія жылі на поўдзень і на ўсход ад Карпатаў. Грунтуючыся на ідэях незалежнасці Шэрбана Кантакузіна і асабліва Дзімітрыя Кантэміра, палітычная эліта гэтых дзяржаваў, не задаволеная рэжымам фанарыётаў, распрацавала палітычную праграму вызвалення з-пад асманскага пратэктарату. Цягам амаль стагоддзя, з 1735 па 1821 год, баяры і інтэлектуалы-асветнікі гэтых краінаў звяртаюцца да кіраўнікоў розных хрысціянскіх дзяржаваў у Еўропе, у першую чаргу Аўстрыі і Расіі, але таксама Францыі, з просьбамі ўзяць прыдунайскія княствы пад сваю апеку, паспрыяць у захаванні іх аўтаноміі і прызнанні незалежнасці ад Турцыі, у аднаўленні на троне гаспадароў-румынаў (замест грэкаў-фанарыётаў) і іх абранні прадстаўнічым сходам краіны, у вяртанні ў іх склад тэрыторый на поўнач ад Дуная, захопленых туркамі (Турну, Джурджу, Брэілы і інш.), і ўстанаўленні мяжы паміж Турцыяй і Валахіяй па Дунаі, а таксама на дазвол для румынскіх купцоў на

свабодны гандаль у Еўропе. Некаторыя даходзяць у сваіх ідэях нават да ўтварэння на аснове трох краінаў, населеных румынамі, «Каралеўства Дакіі» як буфернай тэрыторыі паміж вялікімі дзяржавамі, якая зменшыла б суперніцтва паміж імі. У падтрымку гэтых зваротаў прыводзіліся аргументы, якія фігуравалі ў даўніх дамовах паміж Румынскімі княствамі і Асманскай імперыяй, дзе туркі абавязваліся ў абмен за атрыманне ад румынаў даніны паважаць незалежнасць іхніх дзяржаваў, не ўмешвацца ў іх унутраныя справы, аберагаць іх тэрытарыяльную цэласнасць, не адбіраць у іх новых земляў і г. д. Апроч усяго іншага, гэтыя звароты былі натхнёныя і агульнымі ідэямі, пашыранымі ў той час у Еўропе і Амерыцы, – ідэямі нацыянальнай і індывідуальнай свабоды, павагі да асобы і да народаў.

Культурны аспект: Трансільванская школа

Найбольш значным феноменам румынскага асветніцкага руху стала дзейнасць Трансільванскай школы – групы інтэлектуалаў, якія ператварылі культуру (перадусім такія галіны, як гісторыя, філалогія, літаратура, права і некаторыя іншыя) у зброю палітычнага змагання за нацыянальнае вызваленне. У XVIII ст. у палітычных дыспутах важнае значэнне па-ранейшаму надавалася гістарычнаму аргументу: мець уладу ў дзяржаве і карыстацца ў ёй усімі правамі павінны самыя старажытныя і самыя знатныя яе жыхары. Але, зыходзячы з гэтай логікі, румыны былі аб'ектам поўнага беззаконня, бо, як нашчадкі дака-рымлян, якраз яны й былі самымі старажытнымі і знатнымі жыхарамі Трансільваніі, хоць ніякіх правоў не мелі. Каб абгрунтаваць паходжанне румынаў навуковымі сродкамі, патрабаваліся высокаадукаваныя спецыялісты. Адным з такіх навукоўцаў быў Дзімітрый Кантэмір, але яго голас застаўся адзінокім, і ён не стварыў сваёй школы. Праблему вырашылі выхадцы з асяроддзя румынаў-уніятаў, якія, хоць і не атрымалі ўсіх абяцаных правоў, тым не менш здолелі па пэўных каналах наладзіць культурныя сувязі з Еўропай. Перадусім гэта адбылося дзякуючы намаганням такога вялікага падзвіжніка, якім быў уніяцкі біскуп Інакенцій Міку-Кляйн. Разам з некалькімі сваімі сучаснікамі ён заснаваў у 1754 г. у Блажы вышэйшую школу, з якой пасля выйшла

цэлая плеяда выдатных філолагаў і навукоўцаў. Лепшыя вучні гэтай школы атрымлівалі стыпендыі і накіроўваліся на вучобу ў школы Вены і Рыма, бліскуча закончыўшы якія, яны вярталіся дадому, каб стаць святарамі, пратапопамі, вышэйшымі іерархамі, прафесарамі, службоўцамі, юрыстамі і г. д. У канцы XVIII ст. з іх асяроддзя вылучылася група навукоўцаў і пісьменнікаў, сярод якіх найбуйнейшымі сталі Самуіл Міку, Георге Шынкай, Петру Маёр і Ёан Будай-Дэляну. Імі былі створаныя змястоўныя працы па гісторыі ды філалогіі, у якіх яны даказалі, што румынскі народ паходзіць ад рымлян, што ён заўжды і бесперапынна жыў на прасторах старадаўняй Дакіі, што ўсе румыны незалежна ад таго, у якіх дзяржавах ці землях яны жывуць, з'яўляюцца адзіным народам, што румынская мова вядзе радавод ад лаціны і яе захаваннем трэба апекавацца. Яны спрыялі друкаванню асветніцкіх твораў для народа, змагаліся з невуцтвам, выступалі за пераадоленне забабонаў. Вынікам іх неверагодна шматбаковай дзейнасці стала навуковае абгрунтаванне паходжання румынаў ад рымлян, што значыць ад аднаго з найбольш высакародных і цывілізаваных народаў у гісторыі. Яны свядома пакінулі ўбаку дакскі складнік ва ўтварэнні румынскага народа, бо дакі былі «варварамі», і таму – у меншай ступені «нобілямі». І гэта яскрава падкрэслівае нацыянальную і палітычную скіраванасць іх намаганняў у плоскасці культуры. Ідэі, закладзеныя ў творах навукоўцаў Трансільванскай школы, былі ўспрынятыя ў штыкі прадстаўнікамі прыўладных нацый у Трансільваніі й афіцыйнай Венай, і іх публікацыя, безумоўна, не прынесла румынам ні раўнапраўя, ні нацыянальнага вызвалення, але яны стварылі ідэалагічны падмурак нацыянальнага руху XIX ст.

Сацыяльны аспект: сяляне або народ

Вялікія навуковыя намаганні эліты, скіраваныя на вызваленне нацыі, былі мала вядомыя простаму люду, бо падзел паміж элітаю і народам быў яшчэ відавочным. Інтэлектуалы ставіліся з сімпатыяй да сялян, смуткавалі з іх гаротнага стану, але лічылі, што справядлівасць можа настаць толькі праз апеляцыю да чалавечага розуму, праз законны шлях падачы петыцый і праз «асвету» – гэта значыць праз навучанне і культурніцкую дзейнасць. Народ бачыў,

што ў яго цяжкім паднявольным становішчы не адбываецца ніякіх зменаў. Павіннасці сялян перад памешчыкамі і дзяржавай няўхільна раслі, праца шахцёраў у Заходніх Румынскіх гарах (Апусэнях) станавілася ўсё болей цяжкай, прычым нярэдка за яе нават не плацілі; аўстрыйскія ўлады забіралі ў вяскоўцаў лясныя і пашавыя ўгоддзі, пазбаўлялі іх права займацца лядавым земляробствам і г. д. Але галоўную незадаволенасць выклікалі вугорскія нобілі, якія панавалі паўсюдна і асабіста кіравалі ўсім, карыстаючыся з вынікаў сялянскай працы. Калі сяляне былі пераважна румынамі, то клас нобіляў складаўся амаль цалкам з вугорцаў. Усе сяляне былі залежнымі, або, кажучы іначай, прыгоннымі, і працавалі на землях памешчыкаў ці, значна радзей, апрацоўвалі зямлю, што знаходзілася ў дзяржаўнай уласнасці. Надзеі на вызваленне з добрай волі памешчыка ў сялян не было. Таму калі аўстрыйскі імператар у 1784 г. выдаў дэкрэт, згодна з якім прыгонныя сяляне з пэўных трансільванскіх тэрыторый, паступаючы ў памежныя палкі на вайсковую службу, атрымлівалі свабоду, а адначасова – свой дом і зямельны надзел, гэта выклікала вялікі пярэпалах. Амаль усе сяляне-румыны рушылі да Алба-Юліі запісвацца ў войска, каб выратавацца тым самым ад прыгоннай залежнасці. Ніхто больш не хацеў апрацоўваць абшарніцкія землі. Тады, на просьбу нобіляў, набор у войскі быў адменены, а да непаслухмяных прыняты жорсткія меры.

У гэты час з'явіўся адзін селянін, які карыстаўся шырокім аўтарытэтам, бо шмат разоў ездзіў да імператара ў Вену, і ён пачаў распускаць чуткі, нібыта існуе імператарскі ўказ аб змяншэнні прыгонных павіннасцяў, але «памешчыкі» супраціўляюцца яго правядзенню. Звалі таго селяніна Нікула Урс, а мянушка ў яго была Хора. Да яго далучыліся яшчэ некалькі сялян – Крышан, Клошка ды іншыя – і яны вырашылі падняць паўстанне, але спачатку разам з іншымі прадстаўнікамі сялянства (а ўсяго набралася некалькіх соцень вяскоўцаў) пайсці зноў да Алба-Юліі, каб паспрабаваць запісацца ў войска і атрымаць зброю. Па дарозе 1 лістапада 1784 г. на іх напалі пасланыя ўладамі жаўнеры. Пасля гэтага паўстанне было ўжо не стрымаць, і з горных раёнаў яно пашырылася амаль на ўсю Трансільванію. 11 лістапада 1784 г. паўстанцы атакавалі замак Дэва, у якім схаваліся памешчыкі, і выставілі ім ультыматум:

• памешчыкі мусілі прысягнуць румынскаму крыжу (як праваслаўныя);

• крыніцаю існавання памешчыкаў мусіла быць толькі служба на пасадах, дадзеных імператарам;

• памешчыкі не павінны былі мець землеўладанняў і мусілі плаціць падаткі, як звычайныя грамадзяне;

• землі памешчыкаў мусілі быць размеркаваныя паміж усім народам адпаведна з імператарскім указам.

Па сутнасці гэта была даволі перадавая сацыяльная праграма, якая адпавядала тагачасным ідэям роўнасці і свабоды, хоць яна і адлюстроўвала чыста сялянскі пункт погляду. Улады былі напалоханыя, яны пайшлі на перамовы з паўстанцамі і паспрабавалі ўлагодзіць іх абяцаннямі. Гэтым яны імкнуліся выйграць час, каб потым абрынуцца на сялян з рэпрэсіямі. І неўзабаве баі аднавіліся з новай сілай. Сяляне змагаліся з войскам, але за галоўнага ворага лічылі перадусім памешчыкаў. З разрастаннем паўстання сацыяльныя лозунгі трансфармаваліся ў нацыянальныя, сялян усё часцей пачалі называць румынамі (валахамі), а памешчыкаў – вугорцамі. У выніку сацыяльны рух набыў нацыянальную афарбоўку і стаў ужо не толькі барацьбою сялян з памешчыкамі, але і паўстаннем прыгнечаных румынаў супраць паноў-вугорцаў. У якасці сімвалу сацыяльнай і нацыянальнай роўнасці памешчыкаў прымушалі апранацца ў румынскія строі і хрысціцца па-праваслаўнаму, а высакародныя дзяўчаты павінны былі выходзіць замуж за румынскіх сялян. Натуральна, супольнымі намаганнямі памешчыкаў і ўладаў паўстанне было ўрэшце задушанае. У 1785 г. Хору, Клошку і Крышана схапілі,

Хора і Клошка на чале групы паўстанцаў

закавалі ў кайданы і, правёўшы сёламі да Алба-Юліі, калесавалі там у прысутнасці тысяч сагнаных гвалтам сялян. Пасля гэтага целы паўстанцкіх правадыроў былі пасечаныя на кавалкі і раскіданыя ўздоўж дарог. Падчас паўстання загінула каля пяцісот сялян і было забіта каля ста пяцідзесяці памешчыкаў.

Паўстанне Хоры атрымала магутны водгук не толькі ў Еўропе, але і ў Амерыцы. Гэта была эпоха высакародных ідэй амерыканскай і французскай рэвалюцый. Выбітныя асветнікі таго часу – такія, як, напрыклад, француз Жак-П'ер Брысо – выступілі ў абарону румынскіх сялян. І гэтыя дзеячы, і прэса таго перыяду ўсведамлялі румынскі характар паўстання. Менавіта за нацыянальны яго каларыт пакутніка Хору назвалі «каралём Дакіі». Фактычна, паўстанне 1784 г. было сялянскаю спробай рашэння нацыянальнай праблемы – вызвалення румынскай нацыі. Калі б сяляне атрымалі свабоду, то вольнай стала б і ўся румынская нацыя, бо больш за 90 яе адсоткаў складалася менавіта з сялян. Такая самая сітуацыя будзе ў 1789 г. у Францыі, дзе трэці стан скліча агульнанацыянальны сход, бо ён адзін будзе рэпрэзентаваць 90% нацыі. Венскі двор не стаў ужываць сярэднявечныя меры застрашэння сялянства, як таго хацелі памешчыкі, а наадварот, прыняў шэраг рашэнняў, якія палягчалі долю сялян, адным з найважнейшых сярод якіх стала аднаўленне асабістай свабоды селяніна (які быў пазбаўлены яе ў 1514 г.). Але ў астатнім жыццё сялян – і, адпаведна, румынаў – не надта змянілася да лепшага.

Нягледзячы на шматлікія петыцыі ды звароты, з дапамогай якіх асобныя валашскія і малдаўскія баяры-асветнікі імкнуліся прыйсці да нацыянальнага вызвалення, незалежнасці сваіх краінаў, адмены фанарыёцкака рэжыму і г. д., дасягнуць прыкметных вынікаў у жаданым напрамку ім не ўдалося. Ніводная з вялікіх дзяржаваў-суперніц – ні Турцыя, ні Аўстрыя, ні Расія, якой карцела ўзяць на сябе ролю «дзяржавы-апякункі» румынаў і іншых праваслаўных хрысціян Асманскай імперыі – не ішлі на тое, каб прыняць захады, якія адпавядалі б жаданням, выказаным у асветніцкіх баярскіх зваротах. Больш за тое, з прычыны росту падаткаў і празмернай панщчыны ў памешчыцкіх маёнтках становішча простага люду, асабліва сялян, нават пагоршылася. І хоць Асманская імперыя перажывала

глыбокі заняпад, гаспадары-фанарыёты й іх атачэнне па-ранейшаму «высмоктвалі ўсе сокі» з дзвюх румынскіх дзяржаваў. Пасля 1780 года «грэцкі ўплыў» у эканамічнай і царкоўнай палітыцы фанарыётаў нават узмацніўся. Румынам стала складаней займаць пэўныя дзяржаўныя пасады. Аднак ні прыход аўстрыйскіх ці расійскіх акупацыйных войскаў, ні спусташальныя войны не змусілі румынаў кінуцца ў роспач, а наадварот – падштурхнулі да актыўных дзеянняў. Шмат якія румыны запісваліся добраахвотнікамі ў расійскую армію, каб ваяваць супраць асманаў, спадзеючыся на вызваленне сваіх краінаў. Але хутка яны з расчараваннем убачылі, што хрысціянскія «дзяржавы-вызваліцелькі» толькі адрываюць часткі румынскай зямлі на сваю карысць, акупуючы іх, як гэта ў 1775 г. зрабіла Аўстрыя, захапіўшы Букавіну, а ў 1812 г. – Расія, гвалтам забраўшы Бесарабію.

У сувязі з узнікненнем у Еўропе агульнага клімату нацыянальнага адраджэння, калі ў барацьбу за сваю свабоду ўключыўся цэлы шэраг народаў (сербы, грэкі, італьянцы), румыны таксама перайшлі да актыўных дзеянняў. На іх чале стаў Тудар Уладзімірэску – дробны землеўладальнік з Алтэніі, былы салдат-добраахвотнік і афіцэр расійскай арміі, былы купец і чыноўнік, гэта значыць – цэласная асоба з вялікім жыццёвым досведам. Тудар усталяваў сувязі з таемным грэцкім таварыствам «Філікі Этэрыя» («Братэрствам сяброў»), створаным грэкамі Расійскай імперыі з мэтаю вызвалення Балканаў ад туркаў супольнымі намаганнямі мясцовых народаў. Але натуральна, што канчатковай мэтай «Этэрыі» было вызваленне ўласна Грэцыі, у дасягненні якога яны спадзяваліся на дапамогу Расіі.

У студзені 1821 г. у Бухарэсце памірае гаспадар-фанарыёт Аляксандр Суцу. Скарыстаўшыся з гэтага, Тудар і яго паплечнікі ўздымаюць паўстанне ў Алтэніі, дзе арганізуюць шэраг умацаваных раёнаў. У Падэшы яны склікаюць «Усенародны сход», які становіцца кіраўнічым органам – свайго кшталту парламентам, пры якім фарміруецца нацыянальнае войска. На чале гэтага войска Тудар Уладзімірэску рушыць на Бухарэст і, увайшоўшы ў яго ў сакавіку 1821 года, бярэ ўладу. Праграма рэвалюцыйнага руху 1821 г., якая была зафіксавана ў некалькіх дакументах, уключала ў сябе: права народа на барацьбу з прыгнётам; прынцып нацыянальнага суверэнітэту; скасаванне несумленна набытай маёмасці; ліквідацыю замежнага

Тудар Уладзімірэску

панавання; скасаванне феадальных прывілеяў; прызначэнне на пасады з улікам заслуг, а не маёмаснага становішча, займанне пасадаў пераважна румынамі, а не фанарыётамі; судовую, адміністрацыйную, падатковую і школьную рэформы; фарміраванне нацыянальнага войска; ліквідацыю ўнутраных мытняў; захаванне поўнай аўтаномнасці краіны. Рухавіком рэвалюцыі сталі вольныя і прыгонныя сяляне, вайскоўцы, гараджане, дробныя чыноўнікі й баяры, гэта значыць у большасці сваёй – румыны, якія прáгнулі свабоды. Два наступныя месяцы, красавік і травень 1821 г., калі ўлада знаходзілася ў руках рэвалюцыянераў, былі прысвечаныя ператварэнню гэтай перадавой праграмы ў жыццё. Рэха барацьбы валашскіх паўстанцаў дасягнула Малдовы і Трансільваніі.

Разгортванню румынскай рэвалюцыі перашкодзіла некалькі чыннікаў: імкненне грэкаў-этэрыстаў падпарадкаваць змаганне іншых народаў сваім мэтам, іх няздольнасць сваімі сіламі перайсці цераз Дунай і пранікнуць на Балканы і ў Грэцыю, страта дапамогі Расеі, якую турбавалі толькі ўласныя вялікадзяржаўныя інтарэсы, пэўныя разыходжанні ў кіраўніцтве румынскага руху, інтэрвенцыя асманскіх войскаў на тэрыторыі на поўнач ад Дуная. Уначы з 26 на 27 траўня 1821 г. грэкі забілі Тудара Уладзімірэску, а яго войска было паступова разбітае туркамі. Прыкладна тады ж пацярпела паразу і войска грэкаў-этэрыстаў. Аднак паўстанне 1821 года не прайшло марна. Дзякуючы яму румынская праблема трапіла ў цэнтр увагі вялікіх дзяржаваў, якія пачалі шукаць магчымасці яе вырашэння. У выніку, пачынаючы з 1822 года гаспадары-фанарыёты ў Малдове і Валахіі былі замененыя на гаспадароў-румынаў, што стала

вялікай перамогай румынскага народа ў міжнацыянальнай гульні. Рэвалюцыйная праграма 1821 года, якую ўдалося рэалізаваць толькі ў малой ступені, была адноўленая і ўзятая на ўзбраенне рэвалюцыяй 1848–1849 гг., якая абапіралася на досвед, здабыты паплечнікамі Тудара Уладзімірэску.

Румынскія землі пасля падпісання Бялградскай мірнай дамовы (1739). 1739–1774

10. Рэформа і рэвалюцыя – першая палова XIX стагоддзя

10.1. Агульныя рысы

Пасля 1815–1820 гг. у Еўропе аднавіліся спробы вялікіх дзяржаваў рэстаўраваць старыя парадкі і спыніць хвалю нацыянальна-вызваленчых рухаў, абуджаных паўсюдным пранікненнем ідэяў Французскай рэвалюцыі і вайною за незалежнасць Злучаных Штатаў Амерыкі. Велізарны энтузіязм у лібералаў і рамантыкаў выклікала думка аб вызваленні з-пад турэцкай улады грэкаў – стваральнікаў самай старажытнай дэмакратыі. У сувязі з гэтым заходнія краіны й Расія пачалі праяўляць інтарэс і да іншых хрысціянскіх народаў на Балканах, а таксама да таго становішча, у якім апынуліся румыны, вугорцы, палякі.

У 1821–1822 гг. пасля стагоддзя кіравання фанарыётаў (г. зн. турэцкіх стаўленнікаў-грэкаў) на чале Валахіі й Малдовы, як мы ўжо згадвалі, зноў сталі гаспадары-румыны. На той час у межах Валахіі заставалася ¾ яе былой тэрыторыі, бо Дабруджа і некалькі партоў на Дунаі (Турну, Джурджу, Брэіла) былі захопленыя туркамі, а Малдова пасля таго, як Букавіну ў яе забралі аўстрыйцы, а Бесарабію – расійцы, займала ўсяго каля $^2/_5$ сваіх колішніх земляў. Трансільванія, як ужо згадвалася, мела статус вялікага прынцыпату, які знаходзіўся пад аўстрыйскаю акупацыяй. Агульнае насельніцтва трох румынскіх дзяржаваў у гэтыя гады налічвала прыкладна шэсць-сем мільёнаў чалавек і мела найбольшую шчыльнасць у Трансільваніі, дзе ⅔ жыхароў (паводле перапісу 1844 г.) былі румынамі, прычым на поўдзень і на ўсход ад Карпатаў доля румынаў была значна большай. Сялянства ў румынскіх дзяржавах складала 80–90% насельніцтва. Іх эканоміка паступова развівалася, узніклі першыя сельскагаспадарчыя машыны, некаторыя з іх вырабляліся на месцы ў румынскіх дзяржавах. Расла колькасць мануфактур і прамысловай прадукцыі, пашыраўся гандаль і шляхі зносінаў.

Расея ўсё мацней праяўляе зацікаўленасць узяць пад свой пратэктарат Малдову й Валахію, што ўрэшце ёй і ўдаецца ў выніку пагадненняў, заключаных у 1826 г. у Акермане (Белай Крэпасці) і ў 1829 г. –у Адрыянопалі. Апошняе з іх, падпісанае пасля заняцця

Мірныя перамовы паміж расійцамі і туркамі ў 1828 годзе

расійскімі войскамі ў 1828 г. румынскіх дзяржаваў, мела далёкія наступствы, хоць акупацыя прадоўжылася шэсць гадоў. Адрыянопальскае мірнае пагадненне ўтрымлівала асобны пункт, які тычыўся румынскіх княстваў і ў значнай ступені забяспечваў ажыццяўленне нацыянальнай палітычнай праграмы, сфармуляванай румынскім баярствам, а менавіта: пацвярджэнне і пашырэнне аўтаноміі абодвух княстваў, пажыццёвае абранне іх гаспадароў з ліку румынаў, поўную свабоду гандлю (ліквідацыю асманскай манаполіі на гандаль), вяртанне Валахіі земляў з партамі на Дунаі (Турну, Джурджу, Брэілы). Апроч таго, падчас расійскай акупацыі быў распрацаваны шэраг дакументаў канстытуцыйнай значнасці, якія атрымалі назву «Арганічны Рэгламент» і якія Турцыя абавязвалася паважаць. З гэтай пары румынскія княствы афіцыйна знаходзіліся пад падвойным – турэцкім і расійскім – пратэктаратам.

10.2. Арганічны Рэгламент

Арганічны рэгламент стаў зборам тых дакументаў, згодна з якімі ва ўнутраным жыцці румынскіх княстваў быў праведзены шэраг неабходных сучасных зменаў, прадугледжаных Адрыянопальскім пагадненнем. Дакументы былі распрацаваныя ў перыяд расійскай акупацыі дзвюма камісіямі, якія складаліся з валашскіх і малдаўскіх баяр, і ўступілі ў сілу ў 1831–1832 гг. Абодва варыянты Рэгламен-



Вокладкі Арганічных Рэгламентаў Валахіі і Малдовы

ту – адзін для Валахіі і адзін для Малдовы – былі амаль тоеснымі і закладалі ўмовы для іх палітычнага і адміністрацыйнага аб'яднання. Рэгламент упершыню ўводзіў прынцып падзелу дзяржаўнай улады: гаспадар, які абіраўся пажыццёва надзвычайным агульным соймам, надзяляўся выканаўчай уладай, у ажыццяўленні якой яму дапамагаў урад з шасці міністраў; заканадаўчая ўлада належала грамадскаму сходу (парламенту), а судовую забяспечвалі мясцовыя суды і апеляцыйныя інстанцыі. Былі заснаваныя пракуратура і корпус адвакатаў,

Аляксандру Дзімітрые Гіка

Георге Бібэску

Міхаіл Стурдза

асучасненая падатковая сістэма, уведзены дзяржаўны бюджэт і адмененыя ўнутраныя мытні, рэарганізаваная нацыянальная армія, праведзеная школьная рэформа і закладзеныя нацыянальныя архівы; на заканадаўчым узроўні аб'ядноўваліся дзяржаўныя ўстановы і юрыдычныя сістэмы двух княстваў – як пралог іх палітычнага аб'яднання, якое мела неўзабаве адбыцца.

Арганічны Рэгламент меў супярэчлівы характар для далейшага развіцця румынскіх княстваў: з аднаго боку, ён несумненна спрыяў мадэрнізацыі румынскага грамадства, але з другога, захоўваючы старую сістэму прывілеяў баярства і жорсткія ўмовы расійскага «пратэктарату», ствараў пэўныя перашкоды для яго прагрэсу ўвогуле. Паміж 1834 і 1848–1849 гг. гаспадарамі, выбранымі на аснове Рэгламенту, былі Міхаіл Стурдза ў Малдове і Аляксандру Дзімітрые Гіка ды Георге Бібэску ў Валахіі.

10.3. Абсалютысцкі рэжым Габсбургаў у Трансільваніі і Букавіне

Аўстрыйскія імператары, якім у першай палове XIX ст. бездакорна служыў канцлер Клеменс фон Метэрніх, ажыццяўлялі кіраванне сваёй краінай у духу абсалютызму. Найпершымі іх лозунгамі былі цэнтралізацыя, анямечванне і акаталічванне, а дзеля правядзення іх у жыццё пры патрэбе шырока выкарыстоўваліся таемная паліцыя і цэнзура. З Вены ажыццяўлялася нават непасрэднае кіраванне Трансільваніяй, агульны сойм у якой не склікаўся аж па 1834 год, што, зрэшты, унутры краю не замінала панаваць вугорскай знаці. У пятым дзесяцігоддзі XIX ст. найбольш вострымі пытаннямі, якія абмяркоўваліся на мясцовых соймах, былі: зямельнае (бо сялянства па-ранейшаму было пазбаўленае ўсякага права валодаць зямлёю) і пытанне аб афіцыйнай мове. У перыяд з 1841 па 1843 г. у Трансільваніі павінен быў адбыцца пераход з лацінскай мовы ў якасці афіцыйнай на нейкую адну жывую. Натуральна, галасаваннем было вырашана, што такою мовай стане вугорская, бо румыны ў агульны сойме не былі прадстаўленыя, хоць румынскую мову ведала амаль усё насельніцтва. Барацьба румынскай нацыі за палітычныя правы ўступала ў новую фазу.

Захоп Аўстрыяй Букавіны ў 1775 г. стаў для Малдовы цяжкім ударам, бо яна страціла не толькі Чарнавіцкі павет і старажытную сталіцу краіны Сучáву, дзе знаходзілася магіла самага эмблематычнага яе гаспадара Штэфана Вялікага, але і адну з найбагацейшых і густа населеных частак сваёй тэрыторыі. Па 1849 год Букавіна не мела ніякай аўтаноміі і ўваходзіла ў склад правінцыі Галіцыя. Гэты факт палегчаў правядзенне ўладамі палітыкі змешвання насельніцтва: сярод румынаў рассялілі славян, пераважна ўкраінцаў, а таксама немцаў і габрэяў. Букавінскі епіскапат страціў натуральную сувязь з Малдаўскай мітраполіяй у Ясах і быў перападпарадкаваны, як і праваслаўная царква Трансільваніі, Сербскай мітраполіі ў Карлаўцах. Палітыка дэнацыяналізацыі карэннага румынскага насельніцтва стала відавочнай, што абудзіла і на гэтых землях хвалю нацыянальна-вызваленчага руху.

10.4. Бесарабія пад расійскаю акупацыяй

Частка Малдовы, якую ў 1812 годзе акупавала «апякунка» Расія, была трохі большай за сучасную Данію і складала прыкладна $^1/_5$ плошчы цяперашняй Вялікабрытаніі. Акрамя румынаў, якія складалі амаль 90% насельніцтва, у рэгіёне жылі славяне, габрэі, грэкі, армяне і гагаузы. Пачынаючы з 1828 г. Бесарабія страціла ўсякую аўтаномію, і расійская мова стала адзінай афіцыйнай моваю ў адміністрацыі, судаводстве ды іншых сферах дзяржаўнай дзейнасці. Пад уплывам палітыкі дэнацыяналізацыі шмат якія румыны страчвалі сваю этнічную ідэнтычнасць. Магутным інструментам дэнацыяналізацыі стала царква, якая ў расійцаў мела такую самую абраднасць, што і ў румынаў. У румынскія цэрквы прыйшлі расійскія святары; культавыя кнігі, царкоўныя набажэнствы былі пераведзеныя з румынскай мовы на расійскую. Але сувязі з Малдовай, а пазней, пасля 1859 г., з Румыніяй не знікалі ніколі, частка эліты захавала нацыянальную самасвядомасць свайго народа. У складаных умовах першых гадоў замежнага панавання асновы румынскай культуры ў гэтай частцы акупаванай Малдовы былі захаваныя і ўмацаваныя дзякуючы дзейнасці мітрапаліта Гаўрыіла Бэнулеску-Бадоні (памёр у 1821 г.).

10.5. Дабруджа пад панаваннем туркаў

Частка Валахіі, якая выходзіла да чарнаморскага ўзбярэжжа яшчэ ў XV ст. трапіла пад турэцкую акупацыю – гэтак сама, як Балгарыя, Сербія ці Албанія. У выніку румынскае насельніцтва змяшалася тут з турэцка-татарскім, балгарскім ды інш. і ўжо не складала большасці. Аднак і ў XVIII–XIX стст. румынская спецыфіка рэгіёна ўсё яшчэ захоўвалася, у т. л. дзякуючы міграцыі насельніцтва з іншых румынскіх правінцый, асабліва з Трансільваніі, адкуль прыбывалі пастухі («чабаны») са сваімі статкамі. Праз Дабруджу праходзіла частка шляхоў знешніх зносінаў Валахіі, якія набылі асаблівае значэнне пасля 1774 г., калі ўпершыню была парушаная турэцкая манаполія на гандаль румынскімі таварамі. Пасля аднаўлення ў 1829 г. румынскай улады над партамі на Дунаі, асноўнай мэтай знешнепалітычнай дзейнасці валашскіх румынаў стала вяртанне Дабруджы з-пад улады туркаў.

10.6. Румынская рэвалюцыя 1848–1849 гг.

1848 год быў названы «вясною народаў», бо ад Францыі і Італіі да Польшчы і румынскіх княстваў рэвалюцыйныя сілы падняліся на барацьбу супраць старых рэжымаў і кансерватыўнага духу, супраць перажыткаў феадалізму, замежнага прыгнёту і абсалютызму, за дэмакратыю, канстытуцыйнасць і г. д. Французы сваім паўстаннем у Парыжы ў лютым 1848 г. паказалі прыклад і далі штуршок нацыянальнаму абуджэнню народаў усёй Еўропы.

Румыны, якія жылі ў двух розных аўтаномных краінах і шматлікіх правінцыях, акупаваных аўстрыйцамі, расійцамі і туркамі, не мелі практычнай магчымасці ажыццявіць у 1848 г. супольную рэвалюцыю, як не маглі зрабіць гэтага з прычыны раздробленасці ні немцы, ні італьянцы. Але высокія ідэалы й мэты ў румынаў былі агульныя: увядзенне дэмакратычных правоў і свабодаў, скасаванне феадальных парадкаў, незалежнасць і шырокая аўтаномія краіны, ліквідацыя чужаземнай «апекі», прыняцце канстытуцыі, распрыгоньванне сялян і надзяленне іх правам валодаць зямлёю, нацыянальнае вызваленне, аб'яднанне румынскіх дзяржаваў.

У Малдове рэвалюцыя пачалася ў сакавіку 1848 г. падчас сойму ў Ясах, дзе была прынята даволі памяркоўная праграма з мэтай пазбегнуць немінучай інтэрвенцыі расійскіх войскаў, што стаялі па той бок Прута. На чале малдоўскай рэвалюцыі ў стаялі Васіле Аляксандры, Міхаіл Кагэлнічану, Алеку Руса, Аляксандру Ёан Куза і інш. Але іх дзеянні былі спыненыя гаспадаром, і шмат хто з рэвалюцыянераў быў вымушаны ўцякаць у Трансільванію. Там яны ўзялі ўдзел у Вялікім румынскім сойме ў Блажы, а ў траўні 1848 г. у Брашове пад іх уплывам была створаная новая, значна больш радыкальная праграма, якою прадугледжваўся падзел зямлі паміж сялянамі ды аб'яднанне Валахіі і Малдовы. Другая група малдаўскіх рэвалюцыянераў на чале з Міхаілам Кагэлнічану ўцякла ў Букавіну, дзе ўжо таксама разгаралася румынская рэвалюцыя, галоўным ініцыятарам якой быў Эўдоксій Гурмузакі. І тут таксама была распрацавана даволі радыкальная праграма, якая ставіла за мэту аб'яднанне румынскіх земляў і вызваленне сялян.

У Валахіі рэвалюцыянеры былі арганізаваныя лепш і здолелі захапіць уладу. Большасць з іх былі выхадцамі з румынскага асяродку ў Парыжы, дзе ў 1845 г. было створана рэвалюцыйнае таварыства студэнтаў. Валахі і малдаване меркавалі пачаць рэвалюцыю адначасова ў абодвух княствах. Але падзеі развіваліся імкліва, і таму адначасовае выступленне аказалася немагчымым. План прадугледжваў таксама, што, прынамсі, на поўдзень ад Карпатаў рэвалюцыя пачнецца паралельна ў чатырох месцах. Але ўлады перашкодзілі й гэтаму. Таму 9 чэрвеня 1848 г. рэвалюцыя ўспыхнула толькі ў Іслазе. Тут быў створаны першы рэвалюцыйны ўрад з удзелам Іона Эліядэ-Рэдулеску, Штэфана Галеску, Крысціяна Тэла ды інш., якія звярнуліся да народа з адозвай, што стала фактычна праграмаю рэвалюцыі. Рэвалюцыянеры рушылі на Бухарэст, дзе пад націскам народа

Міхаіл Кагэлнічану

гаспадар адрокся ад улады, і яна перайшла да рэвалюцыйнага ўрада, у які цяпер уваходзілі Нікалае Бэлчэску, Георге Магеру, А. К. Галеску, К. А. Разэці. Нягледзячы на адсутнасць досведу і пэўныя дапушчаныя памылкі, новы ўрад пачаў ажыццяўляць рэвалюцыйную праграму: адмяніў баярскія званні, зацвердзіў трохкаляровы нацыянальны сцяг, вызваліў палітычных вязняў, заняўся стварэннем арміі і вырашэннем сялянскага пытання, ініцыяваў новую канстытуцыю, ажыццявіў захады па прызнанні новага палітычнага рэжыму еўрапейскімі краінамі, звярнуўся з заклікам да аб'яднання «малдаўскіх братоў» і г. д. Але ў верасні 1848 г. турэцкія і расійскія войскі ўварваліся ў краіну, і, нягледзячы на адчайны супраціў, рэвалюцыя была задушаная.

Найбольш складаныя рэвалюцыйныя працэсы адбываліся ў Трансільваніі. Тут у барацьбу за прагрэс уключыліся і румыны, што складалі большасць насельніцтва, і вугорцы, і саксы, і сэкеі. Дзеянні саксаў і сэкеяў былі болей сціплымі і лакальнымі і мелі на мэце пашырэнне правоў для іх асобных этнічных групаў. Вугорцы ў сваіх дзеяннях падтрымлівалі сувязь з паўстанцкімі масамі супляменнікаў у Вугоршчыне. Што да румынаў, то яны змагаліся за нацыянальныя ідэалы, якія тычыліся ўсёй іхняй нацыі. Спачатку, увесну 1848 года., калі ўзніклі першыя беспарадкі, адбываліся першыя сходы й выступленні, румынская і вугорская моладзь, а таксама саксы і сэкеі дзейнічалі супольна, бо мелі агульныя мэты: ліквідацыю габсбургскага абсалютызму і аўстрыйскай акупацыі, адмену феадальных парадкаў і здабыццё дэмакратычных правоў і свабодаў. Натуральна, што прыгнечаныя Габсбургамі народы хацелі сфарміраваць уласныя нацыянальныя дзяржавы, вызваліцца і жыць у Еўропе свабодных і раўнапраўных нацый. З гэтага і пачаліся рознагалоссі. Ключавым момантам стаў дзень 15 сакавіка 1848 г., калі вугорскія рэвалюцыянеры ў Пешце апублікавалі праграму, якая сярод іншага прадугледжвала стварэнне Вялікай Вугоршчыны ў яе сярэднявечных межах, уключаючы Славакію, Харватыю, Трансільванію, Банат, Крышану, Марамурэш, Ваяводзіну і інш. Пры гэтым стваралася б вялікая дзяржава, дзе вугорцы складалі б меншасць, бо над імі колькасна пераважалі б іншыя нацыянальнасці – румыны, харваты, славакі, сербы, русіны (украінцы) і інш. Апроч таго, ніводзін з гэтых народаў не хацеў замены аўстрыйскай улады на вугорскую, бо такая

замена зводзіла б усю іх барацьбу на нішто, робячы бессэнсоўнай. Не дзіва, што трансільванскія румыны, якія складалі ⅔ насельніцтва краіны, запратэставалі супраць такога рашэння, прынятага без кансультацый з імі. Іх кіраўнікі – Сіміён Бэрнуцыу, Георге Барыцыу, Аўрам Янку, Андрэй Шагуна, Ёан Лемень, Аўгуст Трэбоніу Лаўрыян, Аляксандру Папіу-Іларыян, Арон Пумнул, Ціматэй Чыпарыу і інш. – арганізавалі 15–17 траўня 1848 г. у Блажы буйны нацыянальны сход, у якім узялі ўдзел каля 40 000 чалавек. Прысутнічалі і румынскія рэвалюцыянеры з Малдовы і Валахіі. На сходзе была абнародаваная «Нацыянальная петыцыя» – праграма румынскай рэвалюцыі, якою прадугледжвалася: нацыянальная незалежнасць румынаў Трансільваніі, вызваленне сялянства ад паншчыны без ніякіх кампенсацый з яго боку, стварэнне румынскай нацыянальнай гвардыі, увядзенне дэмакратычных свабодаў, забеспячэнне румынскай адукацыі на ўсіх узроўнях, распрацоўка канстытуцыі на прынцыпах свабоды, роўнасці і братэрства. Ад імя румынскай нацыі выказваўся «катэгарычны пратэст» супраць гвалтоўнага ўключэння Трансільваніі ў склад Вугоршчыны, і румыны абвяшчаліся «самастойнай нацыяй». Прагучалі нават заклікі да аб'яднання з Валахіяй. Удзельнікі сходу прынеслі



Нацыянальны сход у Блажы 15–17 траўня 1848 г.

ўрачыстую прысягу, якой абавязваліся паважаць «усе трансільванскія нацыі і ставіцца да кожнай з аднолькаваю пашанай», «не чыніць прыгнёту нікому і не цярпець яго ні ад кога». Быў абраны рэвалюцыйны ўрад, які атрымаў назву «Нацыянальнага камітэта», на чале з епіскапам Андрэем Шагунам і Сіміёнам Бэрнуцыу. Штаб-кватэру «Нацыянальнага камітэта» вырашана было размясціць у Сібіў. Камітэт сфарміраваў дзве дэлегацыі, адна з якіх павінна была ехаць у Вену, а другая – у Клуж, каб паведаміць, адпаведна, імператару і заканадаўчаму сойму Трансільваніі пра рашэнні, прынятыя ў Блажы на месцы, якое з таго часу атрымала назву Поля Свабоды.

Сойм нобіляў у Клужы, які ўсё яшчэ захоўваў сярэднявечную структуру, не прыняў да ўвагі патрабаванні румынаў і, скасаваўшы аўтаномію Трансільваніі, зацвердзіў яе ўключэнне ў склад Вугоршчыны адпаведна з рашэннямі вугорскай рэвалюцыі, прынятымі ў сакавіку 1848 года. Разам з тым, насуперак вугорскай рэвалюцыйнай праграме, клужскі сойм, які быў сходам землеўладальнікаў-феадалаў, адмовіўся адмяніць паншчыну, у чым румыны былі зацікаўленыя самым непасрэдным чынам, бо з іх большасць былі прыгоннымі. У выніку ўзнікаў жорсткі канфлікт паміж румынскімі рэвалюцыйнымі коламі, з аднаго боку, і, з другога, коламі як вугорскіх кансерватараў (знаці), так і вугорскіх рэвалюцыянераў, якія адмаўляліся прызнаваць права румынаў на нацыянальную і сацыяльную свабоду. Нічым не адрознівалася і сітуацыя, у якой знаходзіліся іншыя прыгнечаныя народы імперыі – славакі, харваты ці сербы, якіх гвалтоўна залучалі ў склад Вугоршчыны, спасылаючыся на даўно зніклыя акалічнасці сярэднявечнай мінуўшчыны. Усе гэтыя народы, уключаючы румынаў, вымушаныя былі недзе шукаць дапамогі – і знайшлі яе ў асобе габсбургскага ўрада, які абяцаў выступіць у якасці ўраўнаважвальнага чынніка, прызнаць нацыянальныя правы і аўтаномію краёў ды правінцый, хоць пры гэтым, безумоўна, пераследаваў у першую чаргу ўласныя імперскія інтарэсы. Іншымі словамі, апынуўшыся перад перспектывай, як і ў Сярэднія вякі, быць уключанымі ў склад Вугоршчыны без ніякай нацыянальнай аўтаноміі, трансільванскія румыны выбралі шлях збройнага супраціву. Яны абвінавацілі лідараў вугорскага рэвалюцыйнага руху ў тым, што тыя не паважаюць памкнення да свабоды ў іншых

народаў і не жадаюць прызнаць, што, калі вугорцы маюць права на нацыянальнае вызваленне, то і румыны маюць такое самае права. У нацыянальным пытанні лідары вугорскай рэвалюцыі ставалі на адну прыступку з вугорскімі нобілямі, узносячы «перавагі» вугорскай нацыі і праслаўляючы дабратворны ўплыў «дапамогі», якую вугорцы нясуць румынам, сербам, харватам, русінам і іншым, дорачы ім магчымасць уліцца ў «шчодрае ўлонне» шматнацыянальнай вугорскай дзяржавы, у якой вугорцы, нягледзячы на сваю колькасную меншасць, павінны панаваць. У ачмурэнні непамернага ксенафобскага нацыяналізму ў кансерватыўных вугорскіх колах вяліся размовы пра «цывілізатарскую місію Вугоршчыны ў Карпацкім рэгіёне», што гучала як абраза для астатніх тамтэйшых народаў.

Улетку і ўвосень 1848 года паміж румынамі і вугорцамі адбылося некалькі сутыкненняў, шмат якія румыны былі рэпрэсаваныя вугорскімі ўладамі. Тады ў верасні 1848 г. лідары румынскай рэвалюцыі склікалі ў Блажы новы сход, на які сабралося каля 60 000 узброеных чалавек. Было зноў заяўлена аб непрымальнасці незаконнай анэксіі краю Вугоршчынай, выстаўлена патрабаванне склікаць усенародны сход з прапарцыйным прадстаўніцтвам румынаў, вугорцаў і саксаў, у адпаведнасці з іх колькасцю ў насельніцтве Трансільваніі. Сход саксаў у Сібіў ухваліў гэтую рэзалюцыю румынскага сходу ў Блажы, а лідар саксаў Штэфан Людвіг Рот распаўсюдзіў яе сярод насельніцтва. Але знаць не пагаджалася на супрацоўніцтва і паранейшаму чыніла супраць румынаў узброеныя правакацыі. Урэшце Румынскім нацыянальным камітэтам было прынята рашэнне аб стварэнні збройнага рушэння дзеля абароны нацыянальнай ідэнтычнасці румынаў. Так былі сфарміраваныя румынскія ўзброеныя сілы – нацыянальная армія, якая складалася з пятнаццаці легіёнаў, падзеленых на сотні

Штэфан Людвіг Рот

на чале з прэфектамі і трыбунамі на ўзор былой арміі Старажытнага Рыма. Узначаліць войска даверылі маладому 24-гадоваму адвакату Аўраму Янку, якому было наканавана стаць нацыянальным героем пад мянушкаю «Уладар гор». Апусэні, дзе знаходзілася стаўка Аўрама Янку, сталі цэнтрам румынскага супраціву. Тым часам венскі імператарскі ўрад распачаў рэпрэсіі супраць удзельнікаў вугорскай рэвалюцыі, якія канфліктавалі з іншымі рэвалюцыйнымі рухамі прыгнечаных народаў рэгіёна, у тым ліку з румынамі. Паразуменне паміж вугорскімі і румынскімі рэвалюцыйнымі лідарамі сталася магчымым толькі ўлетку 1849 г., калі вугорскія лідары прызналі за румынскай нацыяй шэраг правоў і быў складзены праект румынска-вугорскага прымірэння. Але было ўжо надта позна, бо аўстрыйскія і расійскія царскія войскі агульнымі сіламі пачалі жорстка душыць любыя праявы рэвалюцыйнага духу.

Рэвалюцыйны рух на румынскіх землях пацярпеў паразу з дзвюх прычын – як з прычыны пэўнай сваёй унутранай слабасці, так і, што было галоўным чыннікам, з прычыны інтэрвенцыі трох імперый – расійскай, турэцкай і аўстрыйскай. У Трансільваніі румынскі рэвалюцыйны рух меў большы маштаб, з'яўляючыся, з аднаго боку, складоваю часткай агульнага руху ва ўсіх трох румынскіх дзяржавах, а з другога – падтрымліваючы адносіны з вугорскім і іншымі народнымі рэвалюцыйнымі рухамі Аўстрыйскай імперыі. Габсбургскія ўлады спрытна скарысталася з асобных пралікаў кіраўнікоў вугорскай рэвалюцыі ды іх разыходжання ў поглядах з румынскімі лідарамі. У практычным і фізічным плане рэвалюцыйны рух 1848–1849 гг. быў задушаны сілаю зброі, але ён перамог у ідэйным сэнсе і з пазіцыі погляду ў будучыню. Ён выпрацаваў дэмакратычную і прагрэсіўную праграму, якую ў 1848–1849 гг. удалося рэалізаваць толькі ў нязначнай ступені. Але яна стала праграмай мадэрнізацыі Румыніі да 1918 г. Усе стратэгічныя мэты, пастаўленыя рэвалюцыянерамі 1848 г. – перш за ўсё нацыянальнае адзінства, сацыяльная свабода і поўная незалежнасць краіны – былі паступова рэалізаваныя ў другой палове XIX стагоддзя і ў пачатку наступнага. Таму значэнне румынскай рэвалюцыі 1848–1849 гг. вялікае: яна не магла хутка змяніць тагачасны стан рэчаў, але істотна перайначыла будучыню румынаў і Румыніі ў прагрэсіўным і дэмакратычным сэнсе.

11. Нацыянальнае аб'яднанне і пабудова сучаснай Румыніі

Пасля 1848 г. галоўнаю мэтай румынаў, якія з XVII і асабліва ў XVIII стагоддзі пачалі ператварацца ў сучасную нацыю, стала дасягненне нацыянальна-палітычнага аб'яднання. Паноўная на той час ідэалогія сцвярджала, што кожная нацыя вартая таго, каб мець уласную ўнітарную дзяржаву, якая разглядалася як падмурак дзеля захавання і развіцця як усяго нацыянальнага арганізма, так і кожнага індывіда, які складоваю часткай гэтага арганізма з'яўляецца. Шматнацыянальныя імперыі і царствы праяўлялі прыкметы стомленасці, яны ўжо не былі здольныя трымацца сваіх састарэлых прынцыпаў часоў абсалютызму ці неаманархіі, а іх частковыя саступкі ўжо не задавальнялі заняволеныя імі народы. Час народаў «з гісторыяй» і «без гісторыі», «вышэйшых» і «ніжэйшых», «надзеленых гістарычнай місіяй» і «народжаных жыць у падпарадкаванні» ўжо мінуўся.

Пасля 1848 г. велізарнае жаданне румынаў аб'яднацца ў нацыянальную дзяржаву, актыўна і паслядоўна падаграванае адукаванай і актыўнай элітай, пачало спалучацца з міжнароднымі дзеяннямі, скіраванымі на тое, каб заручыцца падтрымкай вялікіх дзяржаваў. Румыны разумелі, што без падтрымкі пэўных вялікіх дзяржаваў адны толькі ўнутраныя іх высілкі не будуць мець поспеху і што аб'яднанне павінна праходзіць паэтапна, як гэта адбываецца ў італьянцаў, немцаў і некаторых іншых народаў. Было таксама зразумела, што перад тым, як імкнуцца да аб'яднання правінцый, якія фактычна знаходзіліся пад чужаземнай акупацыяй, спачатку трэба сфармаваць нацыянальна-дзяржаўнае ядро, аб'яднаўшы Валахію і Малдову, якія былі амаль незалежнымі краінамі са сваімі ўласнымі палітычнымі элітамі і дзяржаўнымі ўстановамі. Аб'яднанне румынаў у нацыянальную дзяржаву ўключала наступныя этапы:

1) 1848–1859–1866: аб'яднанне Малдовы і Валахіі у адзіную дзяржаву з афіцыйнаю назвай Румынія і яе прызнанне вялікімі дзяржавамі;
2) 1877–1878–1881: вайна за незалежнасць Румыніі і афіцыйнае прызнанне яе поўнай незалежнасці на міжнародным узроўні;

далучэнне да Румыніі Дабруджы і абвяшчэнне краіны каралеўствам;

3) 1916–1918–1920: удзел Румыніі ў Першай сусветнай вайне; далучэнне да Румыніі Бесарабіі, Букавіны, Трансільваніі, Баната, Крышаны і Марамурэша; прызнанне на міжнародным узроўні ўнітарнай румынскай дзяржавы.

Другая палова XIX ст. і наступныя некалькі дзесяцігоддзя сталі для многіх нацый перыядам утварэння ці кансалідацыі іх палітычнага адзінства. Так было з немцамі, італьянцамі, румынамі, дый з амерыканцамі таксама, якія ў выніку Грамадзянскай вайны (1861–1865) пазбеглі расколу і ўмацавалі сілы сваёй нацыі.

11.1. «Малое аб'яднанне»

Часам так называюць аб'яднанне Валахіі і Малдовы, чыя агульная тэрыторыя ў 1859 г. складала прыкладна трэцюю частку ўсіх румынскіх земляў. Астатнія дзве траціны ўвойдуць у склад Румыніі пазней, пераважна ў 1918 годзе. Але значэнне акта аб'яднання 1859 года палягала ў тым, што ён паказаў усю рашучасць настрою румынаў стварыць сваю ўнітарную дзяржаву і стымуляваў далейшы рух у гэтым напрамку. Насельнікі абедзвюх краін яшчэ з часоў Сярэднявечча ўсведамлялі, што яны – адзіны народ з агульным паходжаннем, мовай, рэлігіяй, традыцыямі і культурай і што палітычная мяжа, якою яны фармальна раздзеленыя, праведзеная не імі. Не менш было зразумела і тое, што трансільванскія румыны таксама належаць да таго ж самага народа, аднак улада ў іх краіне аддадзена ў рукі нацыянальнай меншасці, а самі яны пазбаўленыя магчымасці кіраваць ёю. Таму прадстаўнікі румынскай эліты вырашылі, што першым крокам павінна стаць аб'яднанне дзвюх дзяржаваў за Карпацкай дугою, дзе румыны былі самі сабе гаспадары. Вялікіх высілкаў унутры краін гэта не патрабавала: жаданне аб'яднацца было моцным і ўсеагульным. Страх перад аб'яднаннем і звязанымі з ім непазбежнымі арганізацыйнымі і дэмакратычнымі пераменамі адчувала толькі невялікая купка гаспадароў, якія бачылі ў гэтым пагрозу свайму становішчу. І яна сапраўды была. Прысутнічалі, вядома, і пачуццё настальгіі, і мясцовая фанабэрыя,

але не яны вызначалі кірунак тагачасных думак. А вось пераканаць вялікія дзяржавы ў неабходнасці гэтага аб'яднання было нашмат цяжэй. Першымі, хто ўзяўся за вырашэнне гэтай задачы, сталі былыя ўдзельнікі рэвалюцыі 1848 года, якія пасля задушэння руху масава высылаліся на Захад адноўленымі старарэжымнымі ўладамі, асабліва бухарэсцкай. Былымі рэвалюцыянерамі было створанае сапраўднае прарумынскае лобі ў італьянскіх дзяржавах, Англіі, Прусіі і самае моцнае – у Францыі, у Парыжы. Нікалае Бэлчэску, К. А. Разэці, Думітру Брэціяну і іншыя (нароўні з такімі знакавымі дэмакратычнымі фігурамі, як Джузэпэ Мадзіні) былі сябрамі розных дэмакратычных еўрапейскіх арганізацый і дбалі пра лепшую долю еўрапейскіх народаў. Па меры ўсведамлення таго, што новая агульнаеўрапейская рэвалюцыя – не больш, чым утопія, румынскія рэвалюцыянеры зразумелі, што дасягаць канкрэтных мэтаў кожнай асобнай нацыі можна паступова. Што да прычынаў, паводле якіх румынская дзейнасць за мяжой канцэнтравалася перадусім у Парыжы, то іх было шмат: у Францыі вучылася пераважная большасць румынскай моладзі; сучасная румынская культура развівалася пад уплывам французскай; французы, як і румыны, былі новалацінскім народам, Францыя была вялікай дзяржавай, чый голас у еўрапейскай палітыцы меў вагу; французская грамадская думка прыхільна ставілася да румынскай справы; французскі імператар Напалеон III і яго дарадцы былі зацікаўленыя дапамагчы



Думітру Брэціяну



Канстанцін Аляксандру Разэці

Нікалае Бэлчэску

румынам, няхай хоць бы й зыходзячы з уласных прагматычных матываў – эканамічных і палітычных інтарэсаў, якія Францыя мела ў Ніжнім Падунаўі.

Прарумынскі прапагандысцкі рух з цэнтрам у Францыі ахапіў амаль усю Еўропу. Так, у канцы Крымскай вайны (1853–1856), калі буйныя еўрапейскія дзяржавы дапамаглі Турцыі адолець Расію, Францыя падчас мірных перамоваў, што адбываліся ў Парыжы, паставіла пытанне пра аб'яднанне румынскіх краінаў на чале з кіраўніком, які мусіў быць прапанаваны замежнымі дзяржавамі. Такім чынам румынскае пытанне было ўзнятае на міжнародны ўзровень. Бурна пратэставалі дзяржава-сюзерэн Турцыя і Аўстрыя, якая валодала некалькімі правінцыямі з пераважна румынскім насельніцтвам, Англія ўстрымалася. Урэшце, мірным пагадненнем 1856 года было вызначана наступнае: сярод насельніцтва дзвюх краінаў мусіла быць праведзенае апытанне на тэму іх аб'яднання, Малдова і Валахія пераходзілі з-пад пратэктарату Турцыі і Расіі пад калектыўныя гарантыі сямі буйных дзяржаваў (акрамя дзвюх вышэйзгаданых, таксама Францыі, Англіі, Сардзініі, Прусіі й Аўстрыі), Малдове вярталіся тры раёны на поўдні Бесарабіі (захопленыя ў 1812 г. Расійскай імперыяй разам з усёй правінцыяй), што пазбаўляла Расію выхаду да Дуная.

Апытанне жыхароў дзвюх краінаў павінна было адбыцца на двух адмыслова скліканых выбарных сходах з прадстаўніцтвам усіх сацыяльных групаў Малдовы і Валахіі. Нягледзячы на спробы Аўстрыі і Турцыі сфальсіфікаваць вынікі галасавання, сходы 1857 года прынялі дзве амаль ідэнтычныя рэзалюцыі, якія адлюстроўвалі агульныя памкненні румынаў:

- аб'яднанне двух княстваў у адзіную дзяржаву з назвай Румынія;
- прызначэнне ў якасці кіраўніка спадчыннага прынца адной з кіроўных дынастый Еўропы, яго нашчадкі мусяць выхоўвацца ў традыцыях дзяржаўнай рэлігіі (праваслаўя);
- захаванне правоў і аўтаноміі новай дзяржавы на аснове старых румына-асманскіх пагадненняў;
- нейтралітэт дзяржавы і недатыкальнасць яе тэрыторыі;
- увядзенне ўсеагульных сходаў, надзеленых заканадаўчаю ўладай і ўпаўнаважаных рэпрэзентаваць інтарэсы ўсіх слаёў нацыі.

У 1858 годзе прадстаўнікі сямі буйных дзяржаваў ізноў сустрэліся на канферэнцыі ў Парыжы з мэтай абмеркаваць волю румынаў, выказаную імі на адмыслова праведзеных сходах. У выніку разыходжання ў поглядах паміж вялікімі дзяржавамі канчатковага вердыкту па аб'яднанню сфармуляваць не ўдалося. Аднак было дасягнута пагадненне, згодна з якім утвараўся саюз двух княстваў пад назвай «Аб'яднаныя княствы Малдовы і Валахіі» з аўтаноміяй, калектыўна гарантаванай усімі сямю вялікімі дзяржавамі, пры гэтым турэцкі пратэктарат заставаўся чыста фармальным; княствы захоўвалі кожнае свайго гаспадара (румынскага, а не замежнага паходжання), свае заканадаўчыя сходы, урады і сталіцы; ствараліся дзве цэнтральныя ўстановы – адна з паўнамоцтвамі распрацоўкі сумесных законаў, другая з паўнамоцтвамі агульнага вярхоўнага суда, месцазнаходжаннем гэтых установаў вызначаўся горад Факшаны, што на рацэ Мілкаў, якая сімвалічна падзяляла два княствы; акрэсліваліся пэўныя агульныя ўмовы – роўнасць усіх малдаван і валахаў перад законам, магчымасць абірацца на грамадскія пасады ў абедзвюх краінах; скасоўваліся ўсе манаполіі і феадальныя прывілеі, уводзіліся новыя выбарчыя правілы (заснаваныя на маёмасным цэнзе, г. зн. на ўзроўні даходаў); прадугледжвалася паляпшэнне становішча сялянства і г. д. Такі акт яшчэ не азначаў самога аб'яднання, але і не шкодзіў яму.

Новых гаспадароў павінны былі абраць на выбарчых сходах, якія мусілі адбыцца ў Ясах і Бухарэсце ў студзені 1859 года. У выніку магутнай прапаганды і ўдала праведзенай кампаніі з правядзеннем мітынгаў, выданнем адозваў, публікацый у прэсе і да т. п. нацыянальнай партыі ўдалося прыйсці да выбараў з выразна акрэсленай агульнай стратэгіяй. Першымі 5 студзеня 1859 г. прагаласавалі малдаване ў Ясах, якія выбралі гаспадаром палкоўніка Аляксандру Ёана Кузу, аднаго з кіраўнікоў рэвалюцыі 1848 г., чалавека новага, без шляхетнай крыві, але які горача выступаў за прагрэс і дэмакратыю. Нацыянальная партыя вырашыла, што дзеля таго, каб аб'яднанне адбылося дэ-факта, у Бухарэсце гаспадаром абавязкова павінны выбраць выбранніка малдаван. І вось 24 студзеня, пасля некалькіх драматычных тыдняў і асабліва апошніх сутак, калі народ не адыходзіў, абступіўшы залу пасяджэнняў, сход аднагалосна

прагаласаваў за абранне гаспадаром Валахіі таго самага Аляксандру Ёана Кузу.

Народная радасць была шчыраю і заслужанаю, увесь румынскі народ, у тым ліку жыхары правінцый, акупаваных чужынцамі, бачыў у гэтай падзеі зародак фарміравання сучаснай Румыніі. Міністра замежных справаў Францыі захапляла гэтая «прага да аб'яднання», якую праяўлялі румыны, а былы правадыр вугорскай рэвалюцыі Лаяш Кошут пісаў, што «такі дух неабходны нацыі, каб стварыць сваю бацькаўшчыну, ці, калі яна была страчаная, каб яе вярнуць».

11.2. Кіраванне Аляксандру Ёана I (1859–1866)

Кіраванне Кузы, які стаяў на чале дзяржавы пад імем Аляксандру Ёана I, можна падзяліць на два асобныя перыяды: першы, паміж 1859 і 1862 годам, калі ён змагаўся за міжнароднае прызнанне свайго падвойнага абрання і практычнае завяршэнне поўнага аб'яднання; і другі, паміж 1863 і 1865 годам, калі ён распачаў мадэрнізацыю Румыніі праз правядзенне глыбокіх рэформаў ва ўсім грамадстве. У 1859 г., дзякуючы руплівым дыпламатычным захадам, вялікія дзяржавы далі згоду лічыць Кузу за гаспадара адначасова ў Ясах і Бухарэсце, але адназначна прызнаць аб'яднанне дзяржавы не пагадзіліся; урэшце, калі было ўхвалена і яно, у студзені 1862 г. у Бухарэсце сабраліся першы аб'яднаны ўрад Румыніі і першы агульнарумынскі Нацыянальны сход. Гэта стала магчымым дзякуючы падтрымцы, якую аказвалі на міжнародным узроўні ў першую чаргу Францыя, а таксама Іта-

Аляксандру Ёан Куза

лія, Прусія і Расія. З дапамогай сваіх паплечнікаў гаспадар правёў поўную інтэграцыю ўсіх дзяржаўных інстытутаў – ад арміі да царквы, аб'яднаўшы, у тым ліку, заканадаўства, фінансы, нацыянальныя сімвалы і г. д. Усё гэта адбывалася ў той самы час, калі прэзідэнтам ЗША стаў Аўраам Лінкальн, а асобныя амерыканскія штаты аб'явілі аб сваім выхадзе са складу Федэрацыі. У Еўропе ў гэты перыяд найбольш актыўную дзейнасць выяўлялі італьянцы й немцы, асабліва іх палітычныя і ваенныя вярхі, якія імкнуліся стварыць адзіную Італію і адзіную Германію.

Румынскі гаспадар і яго бліжэйшы паплечнік прэм'ер-міністр Міхаіл Кагэлнічану выступалі гарачымі прыхільнікамі структурнай перабудовы грамадства ў духу праграмы 1848 года, але не рэвалюцыйнымі метадамі, а шляхам паступовага рэфармавання. Заканадаўчы сход, у якім пераважалі кансерватары, не хацеў гэтых зменаў і галасаваў супраць любой прапанаванай рэформы, якая тычылася іх інтарэсаў. Тым не менш урад Кагэлнічану быў цвёрда настроены правесці секулярызацыю манастырскіх маёнткаў, а гэта значыць перавесці ва ўласнасць дзяржавы прыкладна чвэрць наяўных у краіне сельскагаспадарчых земляў і іншай маёмасці, што знаходзілася ў манастырскай уласнасці. Такі закон выклікаў абурэнне не толькі ў Румыніі, але і па-за яе межамі, бо палова той маёмасці і багаццяў належалі румынскім манастырам, якія былі заснаваны яшчэ ў Сярэднявеччы і падпарадкоўваліся патрыярхам усяго Усходу і гары Афон – дзеля падтрымання аўтарытэту і дабрабыту гэтых Святых Земляў, якія тады знаходзіліся, як было прынята казаць, «у руках язычнікаў». Але з часоў Сярэднявечча да XIX ст. сітуацыя істотна змянілася, Грэцыя здабыла незалежнасць, і было ненатуральна, што чвэрць дзяржаўных земляў належыць духавенству і служыць замежным інтарэсам. Іначай кажучы, у цяперашняй сітуацыі выходзіла, што частка багаццяў адной краіны перацякае вонкі, пераважна ў іншую свабодную еўрапейскую краіну, якая больш не знаходзіцца пад уладаю «іншаверцаў». Румынская дзяржава дала грэцкім святарам пэўныя кампенсацыі і, нягледзячы на апазіцыю Турцыі, Расіі і Аўстрыі, у снежні 1863 года прыняла закон, паводле якога ўсе прыбыткі манастыроў у Румыніі належалі і заставаліся ў румынскай дзяржаве. Аналагічныя палажэнні былі

прынятыя цягам колькіх папярэдніх стагоддзяў цэлым шэрагам іншых дзяржаваў.

Каменем спатыкнення для ўрада Кагэлнічану стала аграрная рэформа, сфармуляваная дэмакратычнымі сіламі яшчэ ў 1848 г. Нацыянальны сход сістэматычна ўвогуле адхіляў усе прапанаваныя праекты, у тым ліку новы выбарчы закон. Пасля чарговага правалу галасавання прэм'ер-міністр падаў у адстаўку. Аднак гаспадар адмовіўся яе прыняць і ў траўні 1864 г. распусціў Нацыянальны сход, ажыццявіўшы дзяржаўны пераварот. З гэтага моманту кіраванне Кузы перайшло ў аўтарытарную фазу. Народным плебісцытам былі ўхваленыя новая канстытуцыя («Статут у развіццё Парыжскага пагаднення») і новы выбарчы закон. Былі пашыраныя прэрагатывы гаспадара, заснаваны новы заканадаўчы орган – Сенат, паменшаныя паўнамоцтвы Палаты дэпутатаў, створана Дзяржаўная Рада; выбарчае права пашыралася, але цэнз і пераважна ўскосныя выбары захаваліся. Новы Нацыянальны сход нарэшце прагаласаваў за «аграрны закон», якім уводзілася шматпакутная аграрная рэформа: прыкладна пяцьсот тысяч сялянскіх сем'яў атрымалі каля двух мільёнаў гектараў зямлі, але цягам пятнаццаці гадоў павінны былі выплаціць яе былым уладальнікам кампенсацыі. Рэформа, хоць і мела шэраг недахопаў, упершыню дала зямлю тым, хто стагоддзямі яе апрацоўваў, чым не толькі адкрыла шлях да мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі, але і стварыла глебу да сур'ёзных перакосаў, якія ў наступныя некалькі дзесяцігоддзяў прывялі да моцных узрушэнняў у жыцці сялянства і ўсёй румынскай супольнасці.

За кіраваннем Кузы былі рэфармаваныя сферы юстыцыі і фінансаў, армія і адукацыя. «Закон аб народнай адукацыі» вызначаў паслядоўную арганізацыю навучання на трох узроўнях – пачатковым, сярэднім і вышэйшым. Пачатковая чатырохгадовая адукацыя стала абавязковаю і бясплатнаю: Румынія была адной з першых краінаў у свеце, дзе такі парадак быў уведзены заканадаўча; расла колькасць ліцэяў, былі заснаваныя новыя сучасныя ўніверсітэты ў Ясах (1860) і Бухарэсце (1864). На французскі і італьянскі ўзор былі распрацаваныя грамадзянскі, крымінальны і гандлёвы кодэксы. Адбыўся пераход на сучасную метрычную сістэму і новую форму бухгалтарскага ўліку, было ажыццёўлены новы адміністрацыйны

падзел краіны. Існавалі таксама праекты, якія Куза не змог ці не паспеў рэалізаваць: стварэнне нацыянальнага банка, увядзенне нацыянальнай валюты *раманат* (лей мусіў выкарыстоўвацца толькі як падліковая адзінка), распрацоўка сістэмы дзяржаўных узнагарод і знакаў адрознення і г. д.

Яго рэжым актыўна развіваў сувязі з румынамі ў акупаваных румынскіх правінцыях, вылучаў сродкі на фінансаванне румынскіх школ і іншых установаў за мяжой, спрыяў інтэграцыі ў жыццё румынскай дзяржавы тых румынаў, што пераязджалі з акупаваных тэрыторый (пераважна з Трансільваніі) і асядалі ў Румыніі. Знешняя палітыка вызначалася актыўнасцю і годна рэпрэзентавала краіну ў стасунках з Асманскай імперыяй і вялікімі дзяржавамі, выступаючы за прынцып добрасуседства. Румынія спрыяла вызваленчым рухам на Балканах, барацьбе за незалежнасць Рэчы Паспалітай і Вугоршчыны.

Куза спяшаўся зрабіць шмат і за кароткі час, ужываючы хуткія метады і дапамогу людзей, якія былі не заўсёды сумленныя й шчырыя з іншымі. Вядома, з часам гэта прывяло да ўзнікнення апазіцыі, асабліва ў колах радыкальных лібералаў і кансерватараў (двух процілеглых лагерах, якія не прымалі гаспадара з розных прычынаў). Апроч таго, Куза дапусціў і шэраг памылак грамадскага і асабістага характару, перадусім у час свайго аўтарытарнага кіравання, што пагоршыла адносіны з вялікімі дзяржавамі і ўзмацніла абвінавачванні з боку ўнутранай апазіцыі. У канцы 1865 года гаспадар расчараваў шмат якіх сваіх прыхільнікаў, напісаўшы французскаму імператару і выступіўшы ў парламенце з заяваю, што гатовы пакінуць трон і саступіць яго замежнаму кіраўніку, як гэта прадугледжвалася рашэннямі надзвычайных выбарных сходаў 1857 года. Таму 11 лютага 1866 г. у выніку змовы гаспадар быў вымушаны пакінуць трон і краіну, заявіўшы: «Хай Госпаду будзе ўгодна, каб краіне жылося лепш без мяне, чым са мною! Жыве Румынія!» Куза памёр у 1873 г. у Германіі, але яго парэшткі прывезлі хаваць на радзіму. У жалобнай працэсіі ўдзельнічалі тысячы сялян, за чыю лепшую долю ён змагаўся ўсё жыццё. Куза застаўся ў гісторыі як адзін са стваральнікаў сучаснай Румыніі, які за сем гадоў свайго кіравання рэалізаваў значную частку таго, што было вызначана прагрэсіўнай праграмай 1848 года.

11.3. Кіраванне Караля I (1866–1914)

Пасля адхілення Кузы ад улады была сфарміравана кіраўнічая рада, чыёй задачай стала як мага хутчэйшае рашэнне праблемы вакантнага трона, бо асобныя вялікія дзяржавы сумняваліся ў патрэбе аб'яднанай Румыніі, і гэта было рэальнай пагрозай яе існаванню. Адзінае выратавальнае рашэнне заключалася ў запрашэнні аўтарытэтнага ў Еўропе замежнага прынца, які стаў бы дзейсным арбітрам паміж суперніцкімі ўнутранымі групоўкамі. Таму ў выніку плебісцыту 10 траўня 1866 года парламент урачыста абвясціў пра жаданне Румыніі застацца адзінай «на чале з гаспадаром Ка́ралем I з дынастыі Гагенцолернаў-Зігмарынгенаў». Неўзабаве нямецкі прынц прыбыў у краіну і заняў яе трон, а вялікія дзяржавы, перадусім Турцыя і Аўстрыя, зноў былі пастаўлены перад здзейсненым фактам.

Сярод першых актаў, ухваленых новым гаспадаром, трэба вызначыць новую канстытуцыю – першага сапраўды сучаснага асноватворнага закона, прынятага дэмакратычна абранымі прадстаўнікамі румынскага народа. Канстытуцыя 1866 года была пабудаваная з улікам патрэбаў румынскага грамадства, акрэсленых рэвалюцыйнай праграмай 1848 г., Парыжскай канвенцыяй 1858 г. і «Статутам» Кузы 1864 г., і мела за ўзор бельгійскую канстытуцыю. Яна дэкларавала шэраг асноватворных прынцыпаў, абвешчаных рэвалюцыямі XVIII ст., а менавіта – «асноўныя правы і свабоды грамадзяніна», «нацыянальны суверэнітэт», «падзел уладаў у дзяржаве», адказнасць міністраў, двухпалатную парламенцкую сістэму, канстытуцыйную спадчынную манархію, адказнасць манарха і да т. п. Асноўны закон

Караль I

зацвярджаў і афіцыйную назву краіны – Румынія. Гаспадар меў шырокія паўнамоцтвы як у выканаўчай, так і ў заканадаўчай уладзе. Але сама заканадаўчая ўлада належала ўсё-такі парламенту, які складаўся з Сената і Палаты дэпутатаў. Палата валодала правамі самакантролю, інтэрпеляцыі (дэпутацкага звароту) і стварэння ўласных следчых камісій. Сярод дэмакратычных правоў і свабодаў найважнейшымі былі: недатыкальнасць прыватнай уласнасці, поўная і безумоўная свабода друку без ніякай цэнзуры, права на палітычны прытулак для асобаў, што пераследуюцца ў балканскіх краінах, у царскай і аўстрыйскай (з 1867 года – аўстра-венгерскай) імперыях.

Канстытуцыя не ўтрымлівала ніякіх згадак ні пра які знешні пратэктарат і была ўведзеная гаспадаром без ніякіх аглядак на Турцыю ці дзяржавы-гаранты. Яна праслужыла румынскаму грамадству да пачатку XX ст. і, як паказаў час, была адною з самых сучасных канстытуцый у Еўропе.

Прызнанне поўнай незалежнасці і далучэнне Дабруджы да Румыніі

Пасля прыняцця Канстытуцыі галоўнаю мэтай стала прызнанне вялікімі дзяржавамі поўнай незалежнасці Румыніі і завяршэнне яе аб'яднання. Паралельна хуткімі тэмпамі працягвалася мадэрнізацыя грамадства. Узнікалі новыя прадпрыемствы й цэлыя галіны прамысловасці. З 1861 г. Румынія пачала экспартаваць ачышчаную нафту, а ў 1878 г. у краіне налічвалася ўжо дваццаць нафтаперапрацоўчых заводаў. Трансільванскі вугаль цаніўся на рынках Цэнтральнай Еўропы. Куза адмяніў мытныя пошліны на экспарт, а Караль I у 1875 і 1876 гадах заключыў гандлёвыя пагадненні з Аўстра-Венгрыяй і Расіяй без ніякіх кансультацый з Турцыяй, чым, па сутнасці, кінуў ёй выклік. У 1867 г. была ўведзена нацыянальная грашовая сістэма, Румынія распачала чаканку ўласнай манеты. У 1880 г., пасля пераходу на сучасныя прынцыпы крэдытавання, быў заснаваны Нацыянальны банк Румыніі. У 1850–1860-х гг. будуюцца першыя лініі чыгункі, а ў 1878 г. агульная даўжыня чыгуначнай сеткі ў Румыніі дасягае ўжо 1300 км. На пачатку XX ст. агульная даўжыня чыгунак Румыніі, Трансільваніі і Букавіны складала ўжо 7200 км. Хуткі эканамічны рост тармазіўся фармальным пратэктаратам Асманскай імперыі ды чужаземнай акупацыяй, пад якой усё яшчэ

жылі некалькі мільёнаў румынаў. Пачынаючы з 1870 г. імкненне да поўнай незалежнасці становіцца ўсё болей выразным.

З сярэдзіны XIX ст. адносіны Румыніі з Асманскаю Портай ператварыліся ў фармальныя, асманскі пратэктарат захоўваўся толькі на паперы ў выглядзе юрыдычнага дакумента. Гаспадар Караль і румынскія ўрады рабілі шматлікія дыпламатычныя захады дзеля прызнання поўнай незалежнасці Румыніі, але жаданага выніку гэтыя намаганні не давалі. Тым часам балканскія народы Босніі й Герцагавіны, Балгарыі, Сербіі і Чарнагорыі паўсталі супраць прыгнёту Асманскай імперыі, і Румынія ўскосна іх падтрымала. Але ўсе гэтыя нацыянальна-вызваленчыя рухі былі задушаныя. У 1876 г. да вайны з Турцыяй пачала рыхтавацца Расія. Дзеля гэтага яна папярэдне заручылася нейтралітэтам Аўстра-Венгрыі, якая сама разлічвала мець з той вайны пэўныя выгады. Румынія, са свайго боку, усяляк садзейнічала Расіі ў яе барацьбе супраць Турцыі, бо імкнулася атрымаць ад яе прызнанне поўнай сваёй незалежнасці. За гэта расійскія ўлады абмежаваліся ўсяго толькі патрабаваннем заключыць пагадненне аб праходзе расійскіх войскаў праз тэрыторыю Румыніі – пры ўмове абароны і захавання яе тэрытарыяльнай цэласнасці і палітычных правоў. Расійска-турэцкая вайна пачалася ў красавіку 1877 года артылерыйскім абстрэлам туркамі румынскіх паселішчаў і партоў на Дунаі. У адказ бухарэсцкі парламент прагаласаваў за разрыў усякіх стасункаў залежнасці Румыніі ад Асманскай імперыі і абвясціў стан вайны з гэтай дзяржавай. 9 траўня 1877 г. пасля палымянага выступу міністра замежных спраў Міхаіла Кагэлнічану Палата Дэпутатаў афіцыйна абвясціла пра незалежнасць Румыніі. Вялікія дзяржавы, за выключэннем Расіі, стрымана паставіліся да гэтага акту, а Турцыя абвінаваціла Румынію ў «бунце».

Ваенныя дзеянні з цяжкасцю прасоўваліся на поўдзень ад Дуная, дзе туркі мелі добра прадуманую сістэму фартыфікацыйных умацаванняў. Улетку 1877 г. пад Плеўнай расійская армія была на мяжы паразы. У сувязі з гэтым камандуючы расійскіх войскаў на Балканах 19 ліпеня звярнуўся да гаспадара Ка́раля з настойліваю просьбай аб дапамозе з боку румынскай арміі. Караль умяшаўся і паспрыяў таму, каб шалі ўрэшце схіліліся не на карысць Турцыі. У жніўні 1877 г. паміж румынскім гаспадаром і царом Расіі было заключанае пагад-

ненне, паводле якога Румынія станавілася практычным удзельнікам вайны супраць Асманскай імперыі. Румынская армія налічвала тады каля 100 000 чалавек, з якіх каля 60 000 – вайскоўцы баявых частак. Прыкладна 10 000 румынаў загінулі ці атрымалі раненні на палях той вайны. У студзені 1878 г. перамога расійска-румынскіх войскаў, да якіх далучыліся і балгарскія добраахвотнікі, стала відавочнай. Вайна супраць Турцыі была агульнай для ўсіх румынаў, прычым не толькі з Румыніі, а ўвогуле з усіх румынскіх земляў. Добраахвотнікамі запісаліся каля 4000 трансільванскіх румынаў, нямала такіх было і з Букавіны; на патрэбы фронту збіралі ахвяраванні і ўзносы, стваралі брыгады хуткай дапамогі і шпіталі; дзейнічалі жаночыя камітэты. У арміі ўпершыню была арганізаваная санітарная служба. На фронце – на палях Балгарыі, дзе вяліся баі, – прысутнічалі мастакі і літаратары, якія кожны сваімі сродкамі ўвекавечвалі намаганні румынскага народа. Сярод іх былі Васіле Аляксандры, Чыпрыян Парумбэску, Нікалае Грыгарэску, Тэадор Аман, Караль Поп дэ Сатмары і інш. Яны ўсялялі ў свой народ смеласць і ўпэўненасць.

Плёнам перамогі Расія вырашыла скарыстацца самастойна і ў лютым 1878 г. у Сан-Стэфана заключыла з асманамі сепаратны мір, які рабіў яе самай уплывовай дзяржаваю на Балканах. Іншыя вялікія дзяржавы, у прыватнасці Англія і Аўстра-Венгрыя, запратэставалі, і ў Берліне быў сабраны кангрэс для перагляду Сан-Стэфанскага і падпісання новага пагаднення, якое ў цэлым аднаўляла раўнавагу і задавальняла апетыты большасці ўдзельнікаў: Англія атрымлівала востраў Кіпр, Аўстра-Венгрыя – кіраванне Босніяй і Герцагавінай, Балгарыя ў паўночнай частцы Балканаў ператваралася ў аўтаномную правінцыю пад турэцкім пратэктаратам, а Расія атрымлівала тэрыторыі на Каўказе і Чарнаморскім узбярэжжы. Берлінскім трактатам прызнавалася таксама поўная незалежнасць Румыніі, Сербіі і Чарнагорыі. Але прычынаў адчуваць удзячнасць у Румыніі не было. Панёсшы значны ваенны і эканамічны ўрон, паспрыяўшы ў дасягненні тых вынікаў перамогі, якія былі прызнаныя міжнароднай супольнасцю, краіна, тым не менш, не была прызнаная за аднаго з пераможцаў у вайне і нават паўнапраўнага яе ўдзельніка. Мала таго, Расія, якая абавязвалася абараняць тэрытарыяльную цэласнасць Румыніі, зноў акупавала тры паветы на поўдні Бесарабіі, якія мелі вялікую



Берлінскі кангрэс 1878 г. Карціна Антона фон Вэрнера.

важнасць для выхаду да Дуная. І нават больш за тое, дзеля канчатковага прызнання сваёй незалежнасці вялікімі дзяржавамі Румынія абавязвалася даць на сваёй тэрыторыі грамадзянства жыхарам-нехрысціянам і змяніць на карысць нямецкіх банкіраў умовы чыгуначнай здзелкі (са Штраўсбергам), што цягнула за сабой вялікія страты.

Як бы там ні было, паводле прапановы Расіі вялікія дзяржавы пагадзіліся прызнаць далучэнне да Румыніі Цэнтральнай і Паўночнай Дабруджы, а таксама дэльты Дуная, якія пасля 450-гадовай асманскай акупацыі вярнуліся пад румынскую ўладу. Але гаворкі пра «шырокую рускую душу» тут не магло быць ніякай – там дбалі толькі пра ўласныя інтарэсы, бо, як казалі тады, «у 1878 годзе расійцы забралі ў нас тое, што было нашым (поўдзень Бесарабіі – частку Малдовы), а аддалі нам тое, што не было іхнім (Дабруджа была забраная ў Асманскай імперыі)».

Ператварэнне Румыніі ў каралеўства

Здабыццё Румыніяй поўнай незалежнасці мела для румынскага народа велізарнае палітычнае, маральна-духоўнае, эканамічнае і нацыянальнае значэнне. У стасунках з іншымі краінамі Румынія афіцыйна стала раўнапраўнай дзяржавай і годна ўвайшла ў лік свабодных нацый Еўропы; у 1881 г. яна была ператвораная ў каралеўства,

Акт абвяшчэння Каралеўства Румынія

і румынскі суверэн атрымаў тытул караля. Пасля доўгага перапынку румынская армія ўзяла ўдзел у сучаснай вайне з ужываннем найноўшых на той час відаў узбраення і паспяхова ў ёй вытрымала, што заслужыла высокую ацэнку ў спецыялістаў і ўхвальныя водгукі ў міжнароднай прэсе. Вялікі духоўны ўздым адзначыўся прыходам у 1870-я гады такіх класікаў румынскай літаратуры, як Міхай Эмінэску, Іон Кра́нгэ, Васіле Аляксандры, Ёан Славіч, Іон Лука́ Караджа́ле ды інш., а таксама мастакоў (Грыгарэску) і выбітных навукоўцаў ва ўсіх галінах навукі. Імкненне да сучасных зменаў і крытычны дух прывялі да ўзнікнення магутнага культурнага руху «Жунімя» («Маладосць»), які быў запачаткаваны ў Ясах на чале з Ціту Маёрэску. У эканамічнай сферы краіна здабыла поўную свабоду, каб абараняць свае інтарэсы, праводзіць пратэкцыянісцкую палітыку, вызначаць умовы на ўнутраным рынку і ствараць каналы для збыту сваіх вырабаў. У нацыянальным плане ўзнікла яснае ўсведамленне, што «румынскае сонца ўзыходзіць у Бухарэсце»; незалежная дзяржава пад назваю «Каралеўства Румынія» стала цэнтрам прыцягнення для ўсіх румынскіх правінцый, якія знаходзіліся пад замежнаю ўладай, і рух за нацыянальнае вызваленне ўвайшоў у завяршальную фазу, выяўляючыся ва ўзгодненым

узаемадзеянні румынаў Бесарабіі, Букавіны, Трансільваніі, Вугоршчыны з незалежнай румынскай дзяржавай. Сялянская і нацыянальная праблемы па-ранейшаму вызначаюць палітычнае жыццё Румыніі канца XIX ст., падзяляючы яго на дзве галоўныя палітычныя плыні – кансерватыўную і ліберальную, з якіх урэшце выходзяць першыя палітычныя партыі. Пад уплывам звонку пашыраецца левы рух з сацыял-дэмакратычнымі і сацыялістычнымі ўхіламі, а таксама яго мясцовыя варыянты – папаранізм і семенетарызм*, якія заяўляюць пра сябе ў 1900-я гады, у тым ліку ў культурна-мастацкай і літаратурнай сферах. Адным з элементаў некаторых рухаў, перадусім кансерватыўнага кірунку, быў антысемітызм, які культываваўся пэўнымі выданнямі і нават быў шырока распаўсюджаны ў грамадскай думцы.

11.4. Ад абвяшчэння незалежнасці да «вялікага аб'яднання» (1878–1918)

У 1870-я гады Італія і Германія завяршылі аб'яднанне кожная сваіх земляў, і Еўропа ўступіла ў новую эпоху свайго развіцця. У шматнацыянальных імперыях, якія трухлелі, перажыўшы свой век, і заставаліся цяжкаю спадчынаю мінулага, у якой не было будучыні, беспрэцэдэнтнымі тэмпамі набіралі моц нацыянальна-вызваленчыя рухі. І гэта было натуральна, бо цэлыя народы і нацыі на Балканах па-ранейшаму гібелі пад асманскім ці аўстра-венгерскім прыгнётам. Чэхі, славакі, палякі не мелі сваіх дзяржаваў, а палова румынаў жыла не ў Румыніі.

Бесарабія

У Бесарабіі царская імперыя пачала праводзіць магутную каланізатарскую палітыку, якая суправаджалася засяленнем краю

---

* Папаранізм (ад *рум.* popor – народ) – румынская версія нацыянал-папулізму, запачаткаваны ў 1890-я гг. румынскім пісьменнікам, публіцыстам і палітыкам Канстанцінам Стэрэ; семенетарызм (ад *рум.* sămănătorul – сейбіт: паводле назвы часопіса, які быў рупарам гэтай плыні) – літаратурна-ідэалагічны кірунак у румынскім культурным жыцці пачатку XX ст.

славянскім насельніцтвам і русіфікацыяй усіх грамадскіх сфераў жыцця: адміністрацыі, судаводства, царквы й школы. Аб'яднанне Малдовы і Валахіі мела ў Бесарабіі магутны водгук, таму расійскія ўлады зрабілі ўсё, каб абсекчы любыя зносіны з Румыніяй. У 1867 г. румынская мова ва ўсіх школах Бесарабіі была забароненая, а расійская стала абавязковай для вывучэння. Усе старажытныя царкоўныя кнігі на румынскай мове былі сабраныя ў Кішынёве і знішчаныя. І хоць доля румынаў ужо ў 1900 г. зменшылася да 50–60% (славяне складалі каля 30%, габрэі – каля 11%), царская імперыя ўсё адно заставалася незадаволенай павольным працэсам русіфікацыі.

Ва ўмовах найцяжэйшага царскага прыгнёту, калі румынская эліта была цалкам выкінутая з палітычнага жыцця або ў значнай ступені зрусіфікаваная, нацыянальны рух часцяком выбіраў кружны шлях – калі не ў палітычным, дык у культурным полі. Ён увасабляўся ў прэсе праз газеты «*Românul*» («Румын») і «*Basarabia*» («Бесарабія»), у дзейнасці настаўнікаў, святароў, культурных таварыстваў, што абапіраліся на падтрымку з Румыніі, у штодзённай працы такіх знакавых інтэлектуалаў як Іон Інкулец, Эмануіл Гаўрыліцэ, Ёан Пеліван, Замфір Árбарэ, Аляксандру Ноўр, Канстанцін Стэрэ, Пантэлімон Халіпа і інш. Але ў сваёй бальшыні насельніцтва Бесарабіі было непісьменным, і яе эканоміка знаходзілася ў стане відавочнага занядбання.

Anul al II-le N° 38 Bucureşci calea Mogoşoene N° 13. Vineri 5/17 Mai 1858

Luni şi vineri.

ROMÂNUL

Voieşte şi în poştă.

JURNAL POLITICU, COMERCIALU, LITERARIU.

BUCURESCI

POŞTA ROMÂNULUI.

Румынская газета, заснаваная ў 1857 г. К. А. Разэці

Трансільванія і Букавіна

Абедзве гэтыя вялікія правінцыі ўваходзілі ў склад Аўстрыйскай імперыі, якая ў 1867 годзе ператварылася ў Аўстра-Венгрыю. Нацыянальныя меншасці, узятыя ўсе разам, разам складалі большасць насельніцтва гэтай шматнацыянальнай дзяржавы, якая, пачынаючы

з 1848 года, зведала некалькі метамарфозаў: у 1849–1867 гг. у краіне панаваў неаабсалютызм, цэнтралізаваны аўтарытарны рэжым, якому імкнуліся надаць больш тонкія і дасканалыя рысы, але чаканых вынікаў гэта яе кіраўнікам не прынесла; у 1860–1867 гг. была зроблена спроба перайсці на ліберальна-федэралісцкі рэжым з аднаўленнем пэўнай аўтаноміі гістарычных правінцый і земляў; 1867–1918 гады былі перыядам аўстра-венгерскага двоеўладдзя. Кіраўнічыя колы Аўстрыі й Вугоршчыны знайшлі агульную мову і зразумелі, што, калі вугорцы будуць падвышаныя да рангу паноўнай нацыі на ўсходзе краіны, гэта дасць магчымасць захаваць імперыю і кіраваць ёю цвёрдай рукой. У кожны з гэтых перыядаў румынскі нацыянальна-вызваленчы рух вымушаны быў прыстасоўвацца да новых палітычных умоваў і дзейнічаў адпаведнымі часу метадамі.

У 1848 г. румынаў у Букавіне было ўдвая больш за ўкраінцаў, але ў 1900 г. украінскае насельніцтва ўжо трошкі перавышала румынскае. Палітыка прымусовай дэнацыяналізацыі румынаў адбывалася праз царкву і школу, але ў першую чаргу – праз шырокае засяленне рэгіёна ўкраінцамі, немцамі, палякамі, славакамі ды іншымі. Важную ролю ў грамадска-палітычным жыцці букавінскіх румынаў адыгрывалі царква і перыядычныя выданні – такія, як «Bucovina» («Букавіна»), «Gazeta Bucovinei» («Газета Букавіны»), «Patria» («Радзіма»), «Junimea literară» («Літаратурная Моладзь»), а таксама такія мерапрыемствы, як праведзеныя ў 1871 г. у Путне вялікія ўрачыстасці (на якія з'ехалася інтэлектуалы з усіх румынскіх рэгіёнаў, у тым ліку малады паэт Міхай Эмінэску), святкаванне ў 1904 г. чатырохсотых угодкаў па смерці Штэфана Вялікага і г. д. З 1892 г. нацыянальна-вызваленчую барацьбу ў Букавіне ўзначаліла Румынская нацыянальная партыя. У 1875 г. быў заснаваны Чарнавіцкі ўніверсітэт, дзе моваю выкладання была нямецкая і дзейнічала дазволеная ўладамі кафедра румынскай мовы і літаратуры.

Найбольшы размах румынскі нацыянальны рух меў у Трансільваніі, Банаце, Крышане і Марамурэшы, дзе ў 1900 годзе пад чужаземнай акупацыяй жыло каля трох мільёнаў румынаў – што, паводле афіцыйных, часта «падпраўленых», звестак, складала ад паловы да двух трацінаў насельніцтва гэтых правінцый. Астатнімі мясцовымі жыхарамі былі вугорцы (разам з сэкеямі), немцы, габрэі, цыганы ды

інш. Нямала хто з румынаў з гэтых земляў перабраўся ў Румынію, асабліва пасля 1877 г., а яшчэ большая іх колькасць эміграваала ў ЗША і Канаду. Пасля 1860 г., з лібералізацыяй рэжыму, надзеі румынаў выраслі. Хоць румынскія землі ў складзе Габсбургскай імперыі і не былі прызнаныя ў якасці адзінага аўтаномнага ўтварэння (Банат і заходнія часткі Трансільваніі, напрыклад, былі перададзеныя пад юрысдыкцыю Венгрыі), але аўтаномны статус гістарычнай Трансільваніі быў адноўлены. Паводле новага выбарчага закона, у якім быў зніжаны маёмасны цэнз, румыны атрымалі магчымасць удзельнічаць у выбарах. У выніку ў Трансільваніі ў 1863–1864 гг. быў выбраны і пачаў працаваць у Сібіў Заканадаўчы сойм, дзе румыны – першы і апошні раз – складалі адносную большасць. Гэты сойм прыняў два вельмі важныя законы: закон аб раўнапраўі румынскай нацыі й канфесіі з іншымі трансільванскімі нацыямі ды канфесіямі, а таксама закон аб афіцыйным статусе румынскай мовы нароўні з вугорскаю і нямецкаю. На жаль, гэтыя законы, якія маглі ўсталяваць у дзяржаве новы палітычны клімат, неўзабаве былі скасаваныя ў выніку правалу ліберальнай палітыкі. Каб пазбегнуць распаду імперыі, двор у Вене і аўстрыйскія ўлады знайшлі магчымасць пайсці на кампраміс, дзякуючы чаму яе агонія прадоўжылася яшчэ паўстагоддзя: статус Венгрыі быў падвышаны, і яна ператварылася з падначаленай краіны ў краіну кіроўную, у выніку чаго ўзнікла двухадзіная імперыя з дзвюма сталіцамі, двума ўрадамі (тры міністэрствы былі агульныя), двума парламентамі і г. д. У склад земляў вугорскай кароны (пад агульнаю назвай Транслейтанія) увайшлі Славакія, Харватыя, Ваяводзіна, Банат, Трансільванія, Крышана, Марамурэш і Закарпацце – рэгіёны, дзе вугорцы складалі меншасць. Увогуле, у гэтай дзяржаве, дзе зноў ажыла сярэднявечная хімера «Кароны святога Іштвана», вугорцы складалі прыкладна траціну насельніцтва. Што да Букавіны, то яна ўваходзіла ў склад земляў аўстрыйскай кароны (пад агульнаю назвай Цыслейтанія). Усе гэтыя тэрыторыі не мелі ані звання аўтаноміі. Шэраг нанова прынятых і толькі фармальна дэмакратычных законаў (сярод якіх былі выбарчы закон, законы аб нацыянальнасцях, прэсе, адукацыі і г. д.) перыядычна пераглядаўся і «ўдакладняўся», паступова занявольваючы нацыянальнае жыццё народаў, што ўваходзілі ў склад Венгрыі.

Вугорская нацыя была абвешчаная «адзінай і непадзельнай», а вугорская мова стала абавязковай у адміністрацыйнай дзейнасці і адукацыі. З румынскіх школаў засталіся толькі царкоўныя, якія фінансаваліся мясцовымі супольнасцямі і царквой. Нацыянальна-вызваленчая барацьба ў гэтых варунках набывала ўсё больш шырокі размах і добра арганізаваную форму. Румыны не прызналі законнасці стварэння дуалістычнай манархіі, бо з імі ніхто на гэтую тэму не раіўся. Першаю акцыяй пратэсту, якая мела магутны розгалас, стала прыняцце ў 1868 г. «Блажскай адозвы». У 1869 г. былі створаныя дзве нацыянальныя румынскія партыі, адна – у Банаце і заходніх частках старой Трансільваніі, другая – у самой Трансільваніі. У 1881 г. дзве гэтыя партыі аб'ядналіся ў адну пад назваю Румынскай нацыянальнай партыі. Нацыянальны дух актыўна падтрымлівалі культурныя таварыствы, чыёй найпершаю мэтай была абарона мовы (напрыклад АСТРА), перыядычныя выданні «Трансільванская газета», «Федэрацыя», «Румынскі тэлеграф», «Трыбуна», «Лучафэр» («Ранішняя зорка»), «Румын», «Сцяг» і інш., студэнцкія аб'яднанні. У такіх гарадах, як Блаж, Арад, Брашоў, Бэюш, Сібіў, Карансэбеш, былі арганізаваныя школы па вывучэнні старажытных традыцый. Усё гэта дазволіла выгадаваць цэлыя пакаленні румынскіх інтэлектуалаў і змагароў за нацыянальнае вызваленне. Рэзананснай румынскай акцыяй стала абнародаванне «Мемарандума румынаў Трансільваніі і Вугоршчыны» – дакумента, вакол якога з 1881 па 1895 год быў разгорнуты цэлы рух. Кіраўнікі руху – Ёан Рацыу, Георге Поп з Бэсэшць, Юліу Караяну, Эўджэн Бротэ, Васіле Лукачу, Сэптыміу Албінь і інш. – арганізавалі актыўныя дзеянні для ўручэння мемарандума імператару. У дакуменце засведчваўся і асуджаўся факт нацыянальнага прыгнёту румынаў і выстаўлялася патрабаванне вярнуць ім іх натуральныя правы. Яго складанне было прымеркаванае да стагоддзя абнародавання румынамі петыцый 1791–1792 гг. У 1892 г. дэлегацыя з трохсот румынаў прыбыла да імператарскага двара ў Вене, каб уручыць мемарандум манарху, але той яго не прыняў і пераправіў у венгерскі ўрад у Будапешце, які, у сваю чаргу, яго адкінуў. Румынскіх лідараў абвінавацілі ў «замаху на Венгерскую дзяржаву», прычым не гэтак за складанне самога мемарандума, як за тое, што ён распаўсюджваўся на мовах міжнародных зносінаў.

Падпісанты Мемарандума румынаў Трансільваніі і Вугоршчыны. Стаяць (злева направа): Дыянісіе Роман, Патрычыу Барбу, Д. О. Барчыану, Герасім Дамідэ, Тэадор Міхаль, Аўрэл Сучыу, Міхаю Велічыу, Рубін Патыца. Сядзяць (злева направа): Нікулае Крысця, Юліу Караяну, Георге Поп дэ Бэсэшць, Ёан Рацыу, Васіле Лукачу, Дзімітрые Комша, Сэптыміу Албінь

У 1894 г. у Клужы адбыўся судовы працэс, які асудзіў румынскіх актывістаў на шматгадовае зняволенне. Але мэта руху якраз і палягала ў тым, каб паведаміць міжнароднай грамадскасці аб гаротным становішчы румынаў у Трансільваніі, і гэтая мэта была дасягнутая: напраўду ніхто й не верыў, што імператар ці вугорская эліта пагодзяцца на раўнапраўе румынаў. На практыцы ж Клужскі працэс стаў новай падставай для згуртавання ўсіх румынаў і выклікаў хвалю сімпатыі да румынскай справы ў Трансільваніі ў колах міжнароднай дэмакратыі ад Францыі і Італіі да Злучаных Штатаў. Старшыня Румынскай нацыянальнай партыі Ёан Рацыу заявіў перад судом, што прыгнятальнікі дарма абмяркоўваюць існаванне румынскага народа, бо «існаванне народа не абмяркоўваецца – яно сцвярджаецца!»

Кіраўнікі румынскага нацыянальнага руху ў Трансільваніі арганізоўвалі шматлікія і разнастайныя масавыя выступленні, даходзячы да самых аддаленых вёсак і даводзячы кожнаму, што нацыянальная свабода ёсць усеагульнай каштоўнасцю і яе наяўнасць ці адсутнасць вызначае лёс усіх румынаў. Да нацыянальнага руху далучыліся і румынскія сацыялісты Венгрыі, якія на пачатку XX ст. мелі сваю разгалінаваную арганізацыю. Яны выступалі за спалучэнне са-

цыяльнай барацьбы з нацыянальнай. Некаторыя лідэры бачылі будучыню ў федэрацыі дунайскіх народаў пад эгідаю Аўстрыі, але ўрэшце гэтыя планы паказалі сваю ўтапічнасць. Моц румынскага руху ў Трансільваніі палягала, у тым ліку, і ў яго цесных сувязях з нацыянальна-вызваленчымі рухамі іншых народаў і народнасцяў імперыі, у прыватнасці з парламенцкімі групоўкамі венгерскіх славакаў і сербаў. Але ключавое значэнне для будучага поспеху мела пастаянная сувязь Трансільваніі з Румыніяй, асабліва пасля 1878–1881 гг., калі з боку Румынскага каралеўства пачала паступаць магутная падтрымка як у выглядзе афіцыйных акцый на дзяржаўным узроўні, так і, што асабліва каштоўна, ад разнастайных арганізацый і прыватных асоб.

11.5. Першая сусветная вайна

У канцы XIX – пачатку XX ст. Румынія перажывала значны эканамічны, перадусім індустрыяльны ўздым. Узнікалі новыя прадпрыемствы, сектары і нават цэлыя галіны прамысловасці. Развіваліся металургічная, здабыўчая і сыравінаапрацоўчая вытворчасць. На 1900 г. у Румыніі налічвалася 87 нафтаперапрацоўчых заводаў. У 1882 г. электрычнае асвятленне з'явілася ў Бухарэсце, а ў 1884 г. Тымішаара становіцца першым еўрапейскім горадам, у якім электрычнасць выкарыстоўваецца на асвятленне вуліц. Пашыраюцца аўтадарожная і чыгуначная сеткі, развіваюцца рачны і марскі транспарт. Паводле праекта румынскага інжынера Ангела Саліны ў Чарнаводэ будуецца адзін з найбуйнейшых у свеце і самы доўгі ў Еўропе мост цераз Дунай. Звязаўшы Дабруджу з астатняю часткай Румыніі, ён значна пашы-



Мост у Чарнаводэ

рыў тавараабмен і патокі людзей паміж Чорным морам і задунайскімі тэрыторыямі. На пачатку XX ст. у шэраг піянераў сусветнага самалётабудавання побач з братамі Райтамі й іншымі становяцца румынскія інжынеры Траян Вуя, Аўрэл Влайку і Анры Каандэ. Траян Вуя першым у свеце стварыў апарат, цяжэйшы за паветра, які змог адарвацца ад зямлі з дапамогаю ўласнага рухавіка*.

Траян Вуя і яго аэраплан

Усе гэтыя дасягненні азмрочваліся частымі сацыяльнымі ўзрушэннямі, у першую чаргу сярод сялянства, якое з 1888 па 1907 г. некалькі разоў уздымала паўстанні супраць паноў і абшарнікаў, што валодалі ўсімі землямі й навязвалі цяжкія ўмовы працы. Асобныя, пакуль яшчэ сціплыя акцыі былі арганізаваныя і рабочымі ў буйных гарадах; пад уплывам сацыялістычных ідэй усё большая іх колькасць пачала далучацца да Сацыял-дэмакратычнай партыі (заснаванай у 1883 г.), дзейнасць якой была яшчэ нестабільнай. Палітычнае жыццё ў Румыніі вызначалася дзвюма традыцыйнымі партыямі, якія ў поўнай меры аформіліся яшчэ ў 1870–1880-х гг., – нацыянальна-ліберальнай і кансерватыўнай. Яны па чарзе фарміравалі ўрад, стварыўшы своеасаблівую сістэму стабільнасці, названую «урадаваю ратацыяй». Усё большы аўтарытэт у гэтым тандэме набывала Нацыянальна-ліберальная партыя – партыя новых сілаў прамысловасці, гандлю і мясцовага капіталу, чыім палітычным лозунгам было «Усё сваімі сіламі й сродкамі». Цэлая дынастыя дзеячаў гэтай партыі паходзіла з сям'і Брэціану, якая пачала адыгрываць прыкметную ролю яшчэ з 1848 года. У 1876–1888 гг. румынскі ўрад

---

* Першы апарат братоў Райт запускаўся з катапульты (*заўв. перакладчыка*).

узначальваў Іон К. Брэціану, чыя ўзважаная палітыка была адзначаная шматлікімі дасягненнямі.

На жаль, мір у свеце апынуўся пад пагрозай, звязанай з падрыхтоўкаю да вайны, да якой падштурхоўвала варажнеча паміж вялікімі дзяржавамі. Стварэнне двух ваенна-палітычных блокаў – Траістага саюза Цэнтральных дзяржаў (Германіі, Аўстра-Венгрыі і Італіі) і Антанты (у якую ўваходзілі Англія, Францыя і Расія) – раскалола свет на два варожыя лагеры, кожны з якіх меў свае агульныя інтарэсы ці гістарычныя традыцыі. Румынія, якая знаходзілася ў неспакойным рэгіёне Балканаў і Цэнтральнай Еўропы, не магла заставацца па-за сістэмай альянсаў, бо мусіла дбаць пра сваю бяспеку. З 1877 г. стасункі паміж Румыніяй і Расіяй пачалі імкліва пагаршацца, асабліва пасля акупацыі расейцамі поўдня Бесарабіі і доўгага знаходжання расійскіх войскаў на тэрыторыі Румыніі. Стала відавочнай экспансіяністкая палітыка Расіі на Балканах, чые планы мелі на ўвазе ўключэнне ў арбіту расійскага ўплыву ў тым ліку й Румыніі. Гэта стала галоўнай прычынай падпісання Румыніяй у 1883 г. таемнага пагаднення аб абароне з Цэнтральнымі дзяржавамі. Безумоўна, з цягам часу румынская палітычная і грамадская думка не раз мяняла напрамак румынскай знешняй палітыкі ў адпаведнасці з нацыянальнымі інтарэсамі краіны. Але ўсе альянсы ствараюцца згодна з пэўнымі інтарэсамі, а найважнейшай мэтай Румыніі на пачатку XX ст. было аб'яднанне ўсіх румынскіх правінцый, гэта значыць суседніх тэрыторый з пераважна румынскім насельніцтвам. Было відавочным, што амаль палова румынаў жыве па-за межамі Румыніі, і іх уз'яднанне з радзімай не можа быць чыімсьці падарункам, а патрабуе пэўных ахвяраў. Таму далучэнне Румыніі да таго ці іншага ваенна-палітычнага блока звязвалася з дасягненнем нацыянальнага ідэалу. Канчатковае рашэнне было

Іон К. Брэціану.
Мал. Тэадора Маерхофера

надзвычай складаным, бо Аўстра-Венгрыя (удзельніца Траістага саюза) валодала Трансільваніяй, Банатам, Крышанай, Марамурэшам і Букавінай, дзе жылі мільёны румынаў, а Расія (удзельніца Антанты) уладарыла над Бесарабіяй, дзе румынскае насельніцтва было таксама шматлікім. Далучэнне да любога блока нават пры яго перамозе несла з сабою таксама страты. Генеральнаю рэпетыцыяй агульнаеўрапейскага канфлікту, які наспяваў, сталі Балканскія войны (1912–1913), калі хрысціянскія краіны Балканаў паспрабавалі вярнуць свае старажытныя тэрыторыі, дагэтуль кантраляваныя туркамі. На жаль, з прычыны ўзаемнай варожасці цалкам яны гэтай мэты не дасягнулі. Румынія, што выконвала ў рэгіёне ролю своеасаблівага арбітра, невыразна пазначыла свой удзел толькі ў Другой балканскай вайне, атрымаўшы паводле Бухарэсцкага міру (1913) Паўднёвую Дабруджу (або Кадрылатэр), дзе румыны не складалі большасці, што адно напружыла яе адносіны з Балгарыяй.

Ва ўмовах надзвычай заблытанай сітуацыі, якая склалася ў 1914 г. на момант пачатку Першай сусветнай вайны, Румынія афіцыйна абвясціла нейтралітэт, хоць праяўляла, разам з тым, прыхільнасць да краінаў Антанты. У той самы год памёр Караль I і румынскі трон перайшоў яго ўнуку Фердынанду I (1914–1927). Са смерцю Караля I, які кіраваў 48 гадоў, завяршылася цэлая эпоха румынскай гісторыі, азначаная яркай асобаю вялікага манарха і звязанымі з ёю вялікімі здзяйсненнямі. З 1916 г. падтрымліваць нейтралітэт без шкоды для нацыянальных інтарэсаў краіны стала немагчымым. У жніўні 1916 г. Румынія ўвайшла ў палітычны і ваенны саюз (у абодвух выпадках таемны) з Антантай, які прадугледжваў: неадкладнае ўступленне краіны ў вайну супраць Аўстра-Венгрыі; бесперабойнае забеспячэнне Антантай румынскай

Фердынанд I

Румынія падчас першай сусветнай вайны

арміі; падтрымку Румыніяй расійскіх войскаў у Дабруджы; удзел у наступальнай аперацыі саюзнікаў супраць балгарска-турэцкіх войскаў у напрамку Салонікаў (Грэцыя). У адказ краіны Антанты абавязваліся паважаць тэрытарыяльную цэласнасць Румыніі і забяспечыць ёй раўнапраўныя ўмовы пры падпісанні краінамі Антанты будучай мірнай дамовы; найважнейшым пунктам стала прызнанне Францыяй, Англіяй, Расіяй, Італіяй і іх саюзнікамі румынскіх спадзяванняў на ўз'яднанне з Румынскай дзяржавай Трансільваніі, Баната, Крышаны, Марамурэша і Букавіны. Атрымаўшы гарантыі, Румынія аб'явіла вайну Аўстра-Венгрыі, і яе армія агульнаю колькасцю больш за 800 000 чалавек распачала наступальную аперацыю ў Карпатах (з мэтаю вызвалення Трансільваніі), а таксама далучылася да ваенных дзеянняў супраць нямецка-балгарска-турэцкіх войскаў у Дабруджы (у значна меншых маштабах). Праціўнік меў прыкметную перавагу ў колькасці і ўзбраенні, і, паколькі абяцанай дапамогі з боку Антанты так і не паступіла, румынская армія пацярпела

паразу на Дунаі і, нягледзячы на пэўныя першапачатковыя поспехі, была вымушаная паступова адступіць з Трансільваніі. Аўстра-венгерскія і нямецкія войскі імкнуліся захапіць праходы праз Карпаты, і ў далінах рэк Жыў і Олт ім гэта ўдалося. Урэшце пасля амаль чатырохмесячных баёў 6 снежня 1916 г. нямецкія войскі ўвайшлі ў Бухарэст. Гэта азначала акупацыю Цэнтральнымі дзяржавамі дзвюх трацінаў тэрыторыі тагачаснай Румыніі. Каралеўскі двор, урад, цэнтральная адміністрацыя, частка насельніцтва з'ехалі ў Малдову – адзіную частку краіны, якая заставалася вольнай. На поўдні Малдовы фронт стабілізаваўся, але пагроза не знікла. Ва ўмовах жорсткай зімы, голаду і хваробаў, якія ахапілі мільёны людзей, румынскі супраціў рабіўся больш складаным. Парламент, урад і кароль прымалі захады дзеля выхаду з крызісу. Былі паабяцаныя аграрная і выбарчая рэформы, а частка архіваў, залаты запас румынскага каралеўскага двара і ўнікальныя каштоўнасці з нацыянальнай скарбніцы былі перададзеныя на часовае, як тады спадзяваліся, захоўванне ў Расіі. Большая частка перададзеных скарбаў застаецца там і дагэтуль: спачатку іх канфіскавалі бальшавікі, але сітуацыя не змянілася і пасля распаду СССР. Са свайго боку, ваенны рэжым, усталяваны немцамі і аўстра-венграмі на акупаванай частцы Румыніі, таксама безупынку рабаваў Румынію, вывозячы наземныя і падземныя багацці (усяго прыкладна на васямнаццаць мільярдаў леяў золатам).

Румынскім уладам, якія перасяліліся ў Малдову, удалося аднавіць баяздольную армію колькасцю прыкладна ў 460 000 чалавек і забяспечыць яе набытым за мяжой сучасным узбраеннем. Навучаннем арміі займалася французская ваенная місія на чале з генералам Анры-Матыясам Бэртло. Каралева Марыя ўзяла пад сваю апеку Чырвоны Крыж. Дзякуючы ўсяму гэтаму, калі войскі Цэнтральных дзяржаваў перайшлі ў вырашальны наступ з мэтаю канчаткова выбіць Румынію з вайны, румынская армія ў ліпені-жніўні 1917 г. здолела перамагчы ворагаў у бітвах пры Мэрэшці, Мэрэшэшці і Ойтузе і выратавала румынскую дзяржаву. Салдатаў натхняла ўрачыстае абяцанне караля раздаць пасля вайны зямлю, а таксама кліч генерала Эрэміі Грыгарэску: «Адсюль не сыдзем!» На жаль, румынскія перамогі мелі толькі маральнае значэнне, бо істотныя змены ў Расіі прывялі да таго, што Румынія страціла адзінага важнага саюзніка ў рэгіёне.

Расія заключыла з Цэнтральнымі дзяржавамі перамір'е, а пасля і сепаратны мір. І каб не знікнуць цалкам як незалежная дзяржава, тое самае вымушаная была зрабіць Румынія. Аднак у лістападзе 1918 г. ваенныя дзеянні супраць Цэнтральных дзяржаваў з боку Румыніі былі адноўленыя, і на момант падпісання перамір'я, якога прасіла Германія, яна зноў уваходзіла ў склад Антанты. Румынскія ўлады здолелі пераканаць традыцыйных саюзнікаў Румыніі, што замірэнне з Германіяй і Аўстра-Венгрыяй, падпісанае ў Бухарэсце ў траўні 1918 г., – не здрада (як меркавалі некаторыя), а ўсяго толькі часовы тактычны ход, і пры першым спрыяльным моманце яно будзе ануляванае. Страты Румыніі склалі 340 000 чалавек забітымі, 300 000 цяжка параненымі і 115 000 узятымі ў палон і зніклымі без вестак.

11.6. «Вялікае аб'яднанне»

Нягледзячы на ўсе прыніжэнні і панесеныя ахвяры, 1918 год падарыў Румыніі самае вялікае здзяйсненне ў яе сучаснай гісторыі: палітычнае аб'яднанне ўсіх румынаў. Першай правінцыяй, якая ўз'ядналася з роднай зямлёю, стала захопленая замежнікамі апошняй Бесарабія (акупаваная Расіяй у 1812 г.). Як ужо адзначалася, яе паўднёвая частка з Кагульскім, Ізмаільскім і Болградскім паветамі (жудэцамі) была перададзеная Малдове (а такім чынам і Румыніі) яшчэ раней – паміж 1856 і 1878 г. А цяпер, пасля больш як стогадовай акупацыі, Бесарабія вярталася ў склад Румынскай дзяржавы цалкам, будучы вельмі адсталаю тэрыторыяй, у якую яе ператварыў прыгнёт царскай імперыі. Увосень 1917 г. у Кішынёве быў сфармаваны Сфатул Цэрый (Краёвая Рада), дэмакратычна абраны прадстаўнічы орган насельніцтва між Прутом і Днястром, які абвясціў Бесарабію незалежнай і неўзабаве даў ёй новую назву – Малдаўская народная рэспубліка. А 27 сакавіка (9 красавіка) 1918 г. той самы Сфатул Цэрый, у які ўваходзілі, у тым ліку, прадстаўнікі нацыянальных меншасцяў, большасцю галасоў прыняў рашэнне аб аб'яднанні Бесарабіі з Каралеўствам Румынія.

Заставаліся яшчэ румыны Аўстра-Венгрыі, якія падчас вайны нярэдка былі абавязаныя ваяваць супраць свайго ж народа. Драму гэтых людзей таленавіта апісаў Лівіу Рэбрану ў рамане «Лес паве-

Акт аб аб'яднанні Бісарабіі з Каралеўствам Румынія

шаных». Яшчэ ў кастрычніку 1918 г. прадстаўнікі румынскага народа на чале з Сэкстылам Пушкарыу і Янку Фландорам вырашылі аб'яднаць Букавіну з Румыніяй. Была створана Румынская нацыянальная рада на чале з Янку Фландорам, якая пастанавіла дзейнічаць хутка – асабліва пасля таго, як у Букавіну ўвайшлі ўкраінскія войскі. 15 (28) лістапада 1918 г. у Чарнаўцах сабраўся Усеагульны букавінскі кангрэс, на якім былі прадстаўленыя румыны, палякі, немцы і русіны й які пераважнаю большасцю прагаласаваў за «безумоўнае і спрадвечнае адзінства Букавіны ў яе старажытных межах з Каралеўствам Румынія». Прадстаўнікі іншых нацый пазней таксама прызналі аб'яднанне Букавіны з Румыніяй.

Рух за аб'яднанне з Румыніяй быў вельмі актыўны таксама ў Трансільваніі. У кастрычніку 1918 г., калі імператар Карл I прапанаваў федэралізацыю Аўстра-Венгрыі, румыны адказалі дэкларацыяй аб незалежнасці, якую ў венгерскім парламенце зачытаў дэпутат Аляксандру Вайда-Ваявод. Паступова ўладу на месцах узялі румынскія нацыянальныя рады, а грамадскі парадак забяспечвалі румынскія гвардзейцы. Кіраўнічым органам усіх румынаў была Румынская Нацыянальная Рада, у якую ўваходзілі шэсць сяброў Румынскай нацыянальнай партыі і шэсць – Сацыял-дэмакратычнай (Тэадор Міхаль, Васіле Голдыш, Штэфан Чыча-Поп, Аўрэл Лазэр, Аўрэл Влад, Аляксандру Вайда-Ваявод, Іон Флуэраш, Базіл Сурду, Ёсіф Рэною і іншыя). Каб узаконіць новы стан рэчаў, Рада 18 лістапада (1 снежня) 1918 г. склікала ў Алба-Юліі – горадзе-сімвале, дзе ў 1600 г.

уладарыў Міхай Харобры, – Вялікі Народны Сход. Яго ўдзельнікамі сталі 1228 дэлегатаў з правам голасу ад кожнай сельскай і гарадской абшчыны, царкоўных і іншых арганізацый, якія рэпрэзентавалі, такім чынам, увесь румынскі народ з венгерскай часткі былой Аўстра-Венгрыі. Акрамя іх, прысутнічала яшчэ каля 100 000 румынаў з усіх куткоў Трансільваніі ды заходніх тэрыторый. Сход аднадушна аб'явіў (вуснамі Васіле Голдыша) аб далучэнні Трансільваніі, Баната, Крышаны і Марамурэша да Румыніі. Да поўнага аб'яднання з румынскай дзяржавай Сходам былі сфармаваныя Вялікая Нацыянальная Рада, якая мела заканадаўчыя функцыі і падпарадкоўвалася бухарэсцкаму парламенту, і Кіраўнічы Кансіліум, які меў выканаўчыя функцыі і падпарадкоўваўся ўраду Румыніі. У 1919 г. нацыянальныя меншасці рэгіёна (саксы, швабы, габрэі, асобныя венгерскія колы) афіцыйна прызналі акт за 1 снежня 1918 г. і прыналежнасць Трансільваніі да Румыніі. Венгрыя адмовілася прызнаць новую рэальнасць, а пасля прыходу да ўлады камуністаў Бэлы Куна здзейсніла ўзброены напад на Румынію (у красавіку 1919 г.). Гэтыя варожыя дзеянні, а таксама просьба краінаў Антанты спыніць пашырэнне камунізму ў цэнтры Еўропы) прымусілі румынскую армію даць адпор: у жніўні 1919 г. яны перайшлі Цісу, узялі Будапешт і скінулі савецкую ўладу ў Венгрыі.

Вялікі Народны Сход у Алба-Юліі

Акт 1 снежня 1918 г. азначаў сабою завяршэнне працэсу аб'яднання румынаў у адзіную дзяржаву. 24 снежня 1918 г. кароль Фердынанд выдаў дэкрэт аб уз'яднанні Трансільваніі са старажытнай Румыніяй, а ў 1922 г. манарх і каралева Марыя былі афіцыйна каранаваныя ў Алба-Юліі. У выніку вызваленчае барацьбы і ў сітуацыі, якая склалася ў канцы Першай сусветнай вайны, свае дзяржавы,

адначасова з румынамі, стварылі палякі, чэхі, славакі, югаславы, венгры, аўстрыйцы.

Усе гэтыя вялікія перамены сталі магчымымі ў выніку рэалізацыі народамі свайго права на самавызначэнне, сфармуляванага Прэзідэнтам ЗША Ўудра Ўілсанам у студзені 1918 г., і былі афіцыйна прызнаныя вялікімі дзяржавамі на Парыжскай мірнай канферэнцыі 1919–1920 гг. Асобныя дамовы, падпісаныя ў Сэн-Жэрмэн з Аўстрыяй, у Нёйі-сюр-Сэн з Балгарыяй і ў Трыаноне з Венгрыяй, зацвердзілі на міжнародным узроўні рашэнні, за якія румынскі народ прагаласаваў у 1918 г., вызначыўшы тым самым новыя межы Румыніі. Толькі Савецкая Расія (з 1922 г. – СССР), якая не брала ўдзелу ў Парыжскай мірнай канферэнцыі, не прызнала аб'яднання Бесарабіі з Румыніяй, нягледзячы на тое, што ўсе буйныя заходнія дзяржавы яго ўхвалілі. Новы палітыка-тэрытарыяльны падзел Цэнтральнай Еўропы, што склаўся пасля 1918 года, стварыў спрыяльныя ўмовы для развіцця нацый, але і ўтрымліваў у сабе зародак для ўзнікнення варожасці й спрэчак паміж дзяржавамі, якія абвастрыліся адразу з узмацненнем рэвізіянізму. Цэлыя народы, перадусім немцы, венгры, аўстрыйцы, якія ў выніку вайны пацярпелі найбольшыя тэрытарыяльныя страты, паступова, у тым ліку дзякуючы добра пастаўленай нацыяналістычнай прапагандзе, прыйшлі да пераканання, што сталі ахвярамі пераможцаў і незаслужана страцілі свае «гістарычныя землі», якія трэба вярнуць. Як бы там ні было, зацвярджаючы ў 1919–1920 гг. новую будову Еўропы, вялікія дзяржавы ўпершыню ў гісторыі прынялі пад увагу не толькі ўласныя інтарэсы, але і жаданні народаў. Гэтая будова не была дасканалай, але ў ёй ужо не было краінаў, дзе нацыянальная меншасць была б паноўнай і трымала б у сваім падпарадкаванні цэлыя народы.

Ўудра Ўілсан

12. Румынія паміж дзвюма сусветнымі войнамі

Пасля 1918 года нягледзячы на цяжкі пасляваенны крызіс, эпідэміі й вострую нястачу румыны жылі ў эйфарыі. Краіна нарэшце стала адзінай, увабраўшы ў сваё ўлонне амаль усіх румынаў. Безумоўна, за межамі заставаліся яшчэ пэўныя групы румынаў – на ўсходзе за Днястром, на поўнач ад Цісы ў гістарычным Марамурэшы, у Венгрыі, у сербскім Банаце, у Балгарыі, на Балканах (арамуны, мегленарумыны, істрарумыны), але ўсяго дасягнуць немагчыма, і таму ўтварэнне адзінай нацыянальнай дзяржавы ў 1918 г. стала надзвычайнай падзеяй. Дый у самой Румыніі жылі не толькі румыны: амаль чвэрць насельніцтва складалі нацыянальныя меншасці (8% вугорцаў, 4% немцаў, 4% габрэяў, а таксама славяне, армяне, туркі й татары, цыганы, грэкі ды інш.). Але межы, на жаль, не могуць паўтараць звілістага шляху рассялення розных этнічных групаў. Як бы там ні было, цяперашняя сітуацыя была зусім не падобная да той, што існавала да 1918 г., калі вялікія імперыі панавалі над народамі, цэлымі нацыямі або іх асобнымі часткамі, асуджанымі на нацыянальны прыгнёт. Праблемы нацыянальных меншасцяў, зрэшты, заставаліся вельмі актуальнымі ва ўсёй Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропе, і ўнітарная румынская дзяржава не заўсёды знаходзіла найлепшыя спосабы, каб гэтыя праблемы вырашаць і эфектыўна й дэмакратычна кіраваць тэрыторыямі, якія нядаўна ўвайшлі ў яе склад.

У 1918 г. Румынія займала плошчу каля 300 000 квадратных кіламетраў (прыкладна як Італія) і мела шаснаццаць мільёнаў насельніцтва. Большасць жыхароў была гатовая на вялікія ахвяры дзеля пабудовы лепшай будучыні. Надышлі два дзесяцігоддзі беспрэцэдэнтнага культурнага росквіту, дасягненне нацыянальнага ідэалу мела самы дабратворны ўплыў: узніклі сучасныя мастацкія школы й плыні, якія знаходзіліся ў агульным рэчышчы з тэндэнцыямі еўрапейскай і сусветнай думкі, з'явіліся творцы такога маштабу, як Лучыан Блага (філасофія і літаратура), Нікалае Ёрга (гісторыя і культура ў цэлым), Джорджэ Кэлінэску (гісторыя літаратуры і літаратурная крытыка), Джорджэ Энэску (музыка), Тудар Аргéзі

(паэзія), Канстанцін Брынку́ш (скульптура), Каміл Пэтрэску (літаратура) і шмат іншых.

12.1. Эканоміка і грамадства

Эканоміка аднаўлялася і з цяжкасцю ажывала. Толькі ў 1924 г. удалося дасягнуць даваеннага ўзроўню яе развіцця. Але эканамічны рост, ледзьве пачаўшыся, быў раптоўна спынены сусветным эканамічным крызісам 1929–1933 гг., які закрануў усё грамадства. Новы, паслякрызісны этап эканамічнага развіцця скончыўся ў 1939 г. з пачаткам Другой сусветнай вайны. Эканоміка краіны мела аграрна-індустрыяльны характар. Паспяховае развіццё сельскай гаспадаркі забяспечыла аграрная рэформа 1921 года, паводле якой амаль дзве траціны зямлі буйных землеўладальнікаў (шэсць мільёнаў гектараў) былі бясплатна размеркаваныя сярод сялянаў. З вынікаў гэтай рэформы, якая стала самай радыкальнай і дэмакратычнай пасляваеннай сельскагаспадарчай рэформай у краінах Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы, змаглі скарыстацца амаль паўтара мільёна сялянскіх сем'яў.

Раслі здабыча вугалю і нафты, металургічная вытворчасць, развіваліся новыя галіны прамысловасці, Румынія вырабляла сінтэтычны каўчук, выбуховыя рэчывы, касметыку, пад'ёмныя краны, лакаматывы, вагоны, аўтобусы, самалёты і г. д. У 1926 г. была ўрачыста адкрыта першая нацыянальная авіялінія, у 1928 г. у эфіры ўпершыню загучала румынскае радыё. У 1927 г. пачала функцыянаваць першая цэнтральная тэлефонная станцыя, а неўзабаве Румынія была ахоплена адной з найлепшых тэлефонных сетак у Еўропе. Пракладаліся новыя сучасныя аўтадарогі, будаваліся парты, развіваліся флот і чыгунка. Вырас экспарт, асабліва ў Францыю і Вялікабрытанію. Паскарэнню эканамічнага развіцця спрыяў прыток замежнага капіталу, пераважна англійскага, французскага і амерыканскага. У 1938–1940 гг. былі адзначаны першыя асцярожныя інвестыцыі румынскага капіталу за мяжой (у Югаславіі, Чэхаславакіі, Балгарыі). Натуральна, усе гэтыя змены забяспечылі паляпшэнне дабрабыту пэўнай часткі насельніцтва, але не маглі ліквідаваць беднасці й цяжкіх умоваў жыцця, у якіх знаходзілася значная коль-

касць румынаў. Тым не менш, сярэдні даход на аднаго жыхара склаў тады 110 долараў ЗША, што было больш, чым у Турцыі, Польшчы, Венгрыі, Грэцыі, Югаславіі ці Балгарыі. У 1930-х гг. Бухарэст выглядаў як адзін з самых сучасных гарадоў рэгіёна, за што яму была дадзеная мянушка «маленькі Парыж».

12.2. Унутраная палітыка

Кіраванне краінай было складаным і залежала ад паступовага правядзення ў жыццё рэформаў і новых законаў. У 1923 г. была прынятая новая канстытуцыя, у якой знайшлі адлюстраванне як сам факт утварэння ўнітарнай нацыянальнай дзяржавы, так і тыя дэмакратычныя пераўтварэнні, якія адбыліся ў ёй за апошнія гады. У параўнанні з канстытуцыяй 1866 г. новы асноўны закон пашыраў правы й дэмакратычныя свабоды, абвяшчаў усеагульнае і роўнае выбарчае права з непасрэдным і таемным галасаваннем (у якім маглі браць удзел, праўда, толькі мужчыны старэйшыя за 21 год), забяспечваў правы нацыянальных меншасцяў. Як і паўсюль, канстытуцыю і законы часам парушалі, што ўскладняла ажыццяўленне дэмакратыі і, натуральна, выклікала пратэстныя настроі. Канстытуцыя пракламавала, што носьбітам улады ёсць нацыя, якую ўвасабляе парламент. Урад быў падсправаздачны парламенту, утворанаму з сенатараў і дэпутатаў – сяброў палітычных партый, што ўдзельнічалі ў выбарах, а таксама невялікай колькасці так званых «сенатараў паводле права», якія не выбіраліся, а ўваходзілі ў Сенат паводле пэўных крытэраў – напрыклад, спадчынныя прынцы, кіраўнікі ўсіх прызнаных у дзяржаве канфесій, старшыня Румынскай акадэміі і г. д.

Сход першага Парламента ўз'яднанай Румыніі. Чытанне каралеўскага паслання на адкрыцці сесіі, 20 лістапада 1919

Галоўных партый, якія дамінавалі на румынскай палітычнай арэне, было дзве: Нацыянальна-ліберальная і Нацыянальна-сялянская. Кансерватыўная партыя, хоць яе ў розны час узначальвалі выдатныя асобы, у прыватнасці, Таке Ёнэску, перажыла некалькі расколаў і пасля аграрнай рэформы 1921 г., якая ліквідавала буйных землеўладальнікаў, цалкам знікла з палітычнага жыцця. Нацыянальна-лібэральная партыя – самая магутная ў тагачаснай Румыніі – прадстаўляла інтарэсы румынскага прамысловага і фінансавага капіталу. Яе лідарамі пераважна былі прадстаўнікі сям'і Брэціану (да 1927 г. – Іон І. К. Брэціану), але таксама і Іон Георге Дука, і Георге Тэтэрэску. Нацыянальна-сялянская партыя ўтварылася ў выніку аб'яднання Румынскай нацыянальнай партыі Трансільваніі і Сялянскай партыі Старога Каралеўства. Яна адлюстроўвала інтарэсы сялянства, сярэдніх фермераў, дробнай і сярэдняй буржуазіі. Узначальвалі яе Іон Міхалáке і Юліу Маніу. Сярод драбнейшых партыяў можна назваць Нацыяналістычна-дэмакратычную, якую ўзначальваў выбітны гісторык Нікалае Ёрга, Народную лігу на чале з генералам (пазней маршалам) Аляксандру Аверэску і некалькі партый нацыянальных меншасцяў, сярод якіх было дзве венгерскія, дзве нямецкія і дзве габрэйскія. Вельмі разрозненымі ў міжваенны час былі сацыялістычная і сацыял-дэмакратычная партыі, большай з іх была сацыял-дэмакратычная – выразнік інтарэсаў прамысловых рабочых. На крайнім левым флангу знаходзілася Камуністычная партыя Румыніі, якая па сутнасці ўяўляла сабой маскоўскае аддзяленне Камінтэрна (Камуністычнага Інтэрнацыянала).

Георге Тэтэрэску

Іон Георге Дука

Юліу Маніу

Нікалае Ёрга

Аляксандру Аверэску

Карнэліу Зэля Кадрану

Заснаваная ў 1921 г., яна не вызначалася масавасцю, але, называючы Румынію «імперыялістычнай дзяржавай», выступала за яе распад. У сувязі з гэтым у 1924 г. яна была пастаўленая па-за законам. Ні адзін кіраўнік гэтай партыі, якая з таго часу дзейнічала нелегальна, не быў румынам (у чым і заключалася палітыка Камінтэрна), і яе ўплыў на грамадска-палітычнае жыццё Румыніі быў слабы. На крайнім правым флангу знаходзіўся ўтвораны ў 1927 г. Легіён архангела Міхаіла, які пазней стаў больш вядомы пад назвамі Жалезная гвардыя, або Легіянерскі рух. Яго заснавальнікам і кіраўніком быў Карнэліу Зэля Кадрану, якога пасля яго забойства ў 1938 г. змяніў Хорыя Сіма. Высоўваючы антыкамуністычныя і антысеміцкія лозунгі, легіянеры змагаліся з дэмакратыяй, бачачы ў ёй бясплённае палітыканства, і патрабавалі «ачышчэння смерцю», дзеля чаго практыкавалі палітычны тэрор, часта выходзячы за рамкі закона і ўжываючы забойствы. У 1933 г. рух быў забаронены, аднак праз два гады, у 1935 г., зноў з'явіўся на палітычнай сцэне пад іншым імем. Легіянерамі былі забітыя дзясяткі палітычных дзеячаў, у тым ліку два прэм'ер-міністры. Пэўны час ім сімпатызавала моладзь і асобныя інтэлектуалы, якія хацелі надаць Румыніі новае маральнае аблічча. Але многія былі расчараваныя дзейнасцю легіянераў, і некаторыя нават цалкам з імі парвалі.

Урад, за вельмі малым выняткам, складаўся выключна з ліберал аў і аграрыяў, чаму спрыяў і выбарчы закон, надаючы буйным партыям, якія знаходзіліся пры ўладзе, прыкметную перавагу. У першае міжваеннае дзесяцігоддзе, пасля таго як змянілася некалькі ўрадаў,

узначаленых генераламі, кіраванне краінай перайшло да Нацыянальна-ліберальнай партыі, а ў перыяд эканамічнага крызісу 1929–1933 гг., калі змянілася восем урадаў, шэсць з іх фармавала Нацыянальна-сялянская партыя. Паміж 1934 і 1937 гг. урадам зноў кіравалі лібералы на чале з Георге Тэтэрэску. Прысутнасць караля ўраўнаважвала палітычнае жыццё – прынамсі, да смерці Фердынанда I ў 1927 г. А потым здарыўся дынастычны крызіс (1927–1930) – у сувязі з тым, што за два гады да бацькавай смерці спадкаемны прынц Ка́раль, замешаны ў любоўным скандале, быў вымушаны адрачыся ад трона, новым каралём стаў яго пяцігадовы сын Міхай I, і на час яго малалецтва была створаная рэгенцкая рада. У 1930 г. Караль II адсунуў сына ад трона і заняў яго самастойна. Узначальваючы Румынію да 1940 г., ён імкнуўся падпарадкаваць сабе палітычныя партыі й нават скампраметаваць іх дзейнасць, каб забраць усю паўнату ўлады ў свае рукі. У 1938 г. яму гэта ўдалося. Хоць палітыкі нярэдка парушалі дэмакратычныя прынцыпы, у цэлым у міжваеннай Румыніі пераважала дэмакратыя. Аўтарытарны рэжым Караля II спыніў дзеянне дэмакратычнай канстытуцыі, ліквідаваў палітычныя партыі і прафсаюзы і ўвёў некалькі жорсткіх законаў, што стала пралогам да ваеннай дыктатуры, якая і ўсталявалася ў 1940 г. пасля адхілення Караля II ад улады.

12.3. Знешняя палітыка

У 1919–1940-х гг. Румынія актыўна ўдзельнічала ў палітычным жыцці Еўропы. У сваёй знешняй палітыцы краіна сканцэнтроўвала намаганні галоўным чынам на падтрыманні стабільнасці і парадку, які ўсталяваўся на кантыненце пасля Першай сусветнай вайны, на захаванні міру й бяспекі і наладжванні сяброўскіх стасункаў з усімі суседзямі. Першачарговай задачай пасля 1918 года стала прызнанне вялікімі дзяржавамі межаў Каралеўства Румынія з далучанымі да яго Бесарабіяй, Букавінай і Трансільваніяй, што і было дасягнута ў перыяд з 1919 па 1920 г. Другім чыннікам было падтрыманне традыцыйных саюзніцкіх і сяброўскіх сувязяў з Францыяй і Англіяй ды паглыбленне адносінаў з ЗША. У Цэнтральнай Еўропе і на Балканах Румынія імкнулася стварыць сістэму саюзаў у агульных рамках калектыўнай бяспекі (што падтрымлівалася і французскаю дыпламатыяй) дзеля

папярэджання канфліктаў, прадухілення агрэсіі і супрацьстаяння спробам рэвізіі дамоўленасцяў 1919–1920 гг. Падобную палітыку ў рэгіёне праводзілі таксама Чэхаславакія, Югаславія, Польшча, Грэцыя ды інш. За перагляд пагадненняў выступалі Венгрыя і Балгарыя, чыю палітыку падтрымлівалі Германія і Італія, што патэнцыйна магло прывесці да ўзнікнення новага канфлікту. У Венгрыі «трагедыю Трыанона» разглядалі як сапраўдную гістарычную катастрофу, якая прывяла да страты краінай «дзвюх трацінаў плошчы й насельніцтва», і такое становішча трэба было выправіць за любы кошт. Каб запабегчы нападу Венгрыі, Румынія, Чэхаславакія і Югаславія заключылі ў 1921 г. абарончы саюз, які атрымаў назву «Малой Антанты». Гэтаксама дзеля абароны міру Румынія, Югаславія, Грэцыя і Турцыя заключылі ў 1934 г. ваенна-палітычны саюз Балканскай Антанты.



Нарада міністраў замежных справаў дзяржаваў Малой Антанты

Самымі складанымі сярод усіх суседніх краінаў у Румыніі былі адносіны з Венгрыяй і СССР, бо Венгрыя праводзіла рэвізіяністкую палітыку дзеля вяртання сабе любым спосабам Трансільваніі, а Савецкі Саюз, не пагаджаючыся на далучэнне Бесарабіі да Румыніі, адмаўляўся прызнаць мяжу паміж краінамі па Днястры і чыніў у дачыненні да Румыніі безупынныя правакацыі. І ўсё ж у 1934 г. пасля значных высілкаў дыпламатычныя адносіны паміж краінамі былі ўсталяваныя.

Румынія была адной з краін-заснавальнікаў створанай у 1919–1920 гг. Лігі Нацый са штаб-кватэрай у Жэневе. Галоўнымі мэтамі арганізацыі былі абарона міру і бяспекі й прадухіленне новай вайны. На пачатку 1930-х гг. тагачасны міністр замежных спраў Румыніі Нікалае Тытулеску двойчы абіраўся Старшынём Лігі Нацый, што стала прызнаннем як яго асабістага аўтарытэту, так і важкай ролі яго краіны. Ён меў вялікую веру ў сілу дыпламатыі паводле сфармуляванага ім у 1920-х гг. прынцыпу: «Калі мір пад пагрозай, праблема

вырашаецца не вайной, а ўмацаваннем міру». Яго вельмі хвалявалі ўздым фашызму, яго першыя агрэсіўныя дзеянні й падрыхтоўка да вайны. Румынія асудзіла ўсе акты агрэсіі канца 1930-х: ад анэксіі Германіяй Рура да расчлянення Чэхаславакіі, аншлюсу Аўстрыі і нападу нацыстаў на Польшчу. Румынія прытрымлівалася традыцыйных саюзніцкіх пагадненняў з Францыяй і Англіяй аж да 1940 г., калі ўсе гарантыі заходніх дзяржаваў перасталі мець усякае значэнне. У 1940 г. Румынія перажыла адну з самых вялікіх трагедый у сваёй гісторыі:

1) пад пагрозай савецкага ўварвання Румынія была вымушаная саступіць на карысць СССР Бесарабію, паўночную частку Букавіны і Герцаеўскі павет, прычым два апошнія рэгіёны ніколі Расіі не належалі (28 чэрвеня 1940 г.);

2) пад гвалтоўным дыктатам Германіі ды Італіі (вядомым як Венскі арбітраж) Румынія была вымушаная аддаць Венгрыі паўночна-ўсходнюю частку Трансільваніі плошчай больш за 40 000 квадратных кіламетраў з насельніцтвам больш за 2 500 000 жыхароў, палова з якіх былі румынамі, а венгры складалі меншасць (30 жніўня 1940 г.);

3) праз патранат Гітлера Румынія аддала Балгарыі паўднёвую частку Дабруджы – Кадрылатэр (верасень 1940 г.).

У гэтыя драматычныя моманты сваёй гісторыі Румынія засталася адна супраць усіх сваіх ворагаў – нягледзячы на сістэму калектыўнай бяспекі, якую яна так адстойвала. З усіх бакоў яе атачалі варожыя краіны: СССР, Венгрыя і Балгарыя – прычым дзве апошнія ўвесь час былі хаўруснікамі нацысцкай Германіі. Немцы акупавалі й падзялілі Чэхаславакію і Польшчу, Францыя капітулявала, Англія была атакаваная, а Гітлер са Сталіным у 1939 г. падпісалі дамову аб ненападзе (вядомую як пакт Молатава-Рыбентропа). У Румыніі заставалася толькі два шляхі: супраціўляцца і быць паглынутай нацысцкай Германіяй або паспрабаваць зблізіцца з ёю. Германія палічыла за лепшае ўскосную акупацыю Румыніі, замаскіраваную пад «саюз», каб мець магчымасць неабмежавана выкарыстоўваць стратэгічнае становішча, чалавечы і эканамічны патэнцыял Румыніі. На той частцы Трансільваніі, што адышла да Венгрыі, румынскае насельніцтва, якое ўяўляла сабою большасць, трапіла пад рэжым тэрору, а габрэі былі ўключаныя ў праграму поўнага вынішчэння ў канцэнтрацыйных лагерах Нямеччыны і акупаванай Польшчы, дзе іх загінула каля 120 тысяч.

13. Румынія і Другая сусветная вайна (1940–1945)

З пачаткам ваеннай агрэсіі Германіі і яе хаўруснікаў у Еўропе, асабліва пасля падзення Францыі (чэрвень 1940 г.) Караль II пачаў ускладаць усе свае надзеі захаваць трон і межы краіны на збліжэнне з Германіяй. Да ўлады пачало прыходзіць усё больш палітыкаў пранямецкай арыентацыі, нават Жалезная гвардыя, раней забароненая, была асцярожна запрошаная ўпершыню прапанаваць сваіх прадстаўнікоў ва ўрад. У 1938–1940 гг. быў прыняты шэраг законаў расісцкага (антысеміцкага) характару, якія тычыліся такіх сфераў жыцця, як сям'я, адукацыя, дазвол выконваць пэўныя функцыі ці займаць пасады, што адбывалася ў той час і шмат у якіх іншых краінах, якія імкнуліся ўбіцца ў ласку да новых гаспадароў Еўропы. Але гэта ўжо не магло выратаваць аўтарытарны рэжым Караля II і яго камарыллі, асабліва пасля значных тэрытарыяльных стратаў улетку 1940 г. Праз самавольныя рашэнні Гітлера й Сталіна Румынія ў адно імгненне страціла амаль 100 000 квадратных кіламетраў сваёй тэрыторыі і каля шасці мільёнаў жыхароў. Здавалася, што абрынаецца ўсё.

Падпісанне пакта Молатава-Рыбентропа, 23 жніўня 1939 года

У гэтай безвыходнай сітуацыі Караль II даручыў сфармаваць новы ўрад генералу Іону Антанэску, надзяліўшы яго надзвычайнымі паўнамоцтвамі. І ўжо 6 верасня 1940 г. кароль быў вымушаны адрачыся ад улады і пакінуць краіну. Новым каралём абвясцілі юнага Міхая I (1940–1947), але рэальна кіраўніком краіны стаў Іон Антанэску. Да новага дыктатарскага рэжыму далучылася Жалезная гвардыя, і Румынія была абвешчаная «нацыянальна-легіянерскай дзяржавай». У лістападзе

Маршал Іон Антанэску

1940 г. Антанэску афіцыйна падпісаў паперы аб уваходжанні Румыніі ў Траісты пакт (Германіі-Італіі-Японіі). Вымушанае супрацоўніцтва Антанэску з легіянерамі доўжылася амаль пяць месяцаў. Кіраўнік краіны, кадравы ваенны, выпускнік французскай Сэн-Сірскай ваеннай акадэміі, быў чалавекам парадку, прыхільнікам прафесіяналізму і меў даўнія сентыменты да Англіі ды Францыі. Ён змушана стаў германафілам у той момант, калі стары парадак быў знішчаны й трэба было ратаваць краіну. Легіянеры са сваёй шавіністычна-нацыяналістычнай ідэалогіяй, анархічным радыкалізмам, прагаю помсты ды галаслоўнымі лозунгамі, а больш за ўсё – імкненнем захапіць усю паўнату ўлады хутка пачалі раздражняць генерала. Да іх дзеянняў дадаліся забойствы дзясяткаў палітыкаў, некалькіх былых міністраў і прэм'ер-міністраў, выдатных спецыялістаў і навукоўцаў; у прыватнасці, быў забіты знакаміты гісторык і былы прэм'ер-міністр Нікалае Ёрга. Заручыўшыся падтрымкаю Гітлера, Антанэску скарыстаўся дзёрзкім путчам легіянераў у канцы студзеня 1941 г., калі яны паспрабавалі ўзяць усю ўладу ў свае рукі, і якраз-такі адхіліў іх ад улады цалкам, забараніўшы саму іх арганізацыю. Такім чынам, у адрозненне ад іншых краінаў, прафашысцкая групоўка ў хаўрусе з арміяй кіравала Румыніяй усяго пяць месяцаў. Пачынаючы з 1941 г. Румынія ператварылася ў таталітарную дзяржаву на чале з вайсковай і тэхнічнай інтэлігенцыяй,

Арышт путчыстаў-легіянераў

але прафашысцкага элементу ва ўладзе больш не было. Зрэшты, ва ўнутранай палітыцы антысеміцкія настроі не зніклі, і гэта прывяло да шматлікіх ахвяраў, хоць Румынія і адмовілася адпраўляць габрэяў-грамадзян Румыніі ў нямецкія канцлагеры смерці. У якасці варыянту «вырашэння габрэйскага пытання» ў 1943–1944 гг. румынскім габрэям было дазволена эміграваць на тэрыторыі, дзе пазней з'явілася дзяржава Ізраіль. Як хаўруснік Германіі (разам з Італіяй, Венгрыяй, Балгарыяй, Фінляндыяй і інш.), Румынія ўдзельнічала ў 1941–1944 гг. у вайне супраць СССР. Спачатку вайна мела шырокую народную падтрымку, бо ў ёй бачылі барацьбу за вызваленне румынскіх тэрыторый, акупаваных камуністамі – Бесарабіі, Герцаеўскага павета і поўначы Букавіны. Аднак перамясціўшыся на ўсход ад Днястра, ваенныя дзеянні прывялі да вялікіх чалавечых стратаў: загінула каля 150 000 вайскоўцаў і прыкладна 180 000 трапіла ў палон. З пачаткам нямецка-румынскага ваеннага супрацоўніцтва на ўсходнім фронце антысеміцкія і расісцкія акцыі пашырыліся на тэрыторыю Бесарабіі, Трансністрыі й Адэскай вобласці, сеючы смерць і асуджаючы на гаротнае існаванне шматлікіх нявінных ахвяраў. Да іх належалі таксама тысячы цыганоў, якія былі дэпартаваныя і ўтрымліваліся ў Трансністрыі ў нечалавечых умовах.

Бухарэсцкія габрэі ў чаканні размеркавання на працу

Кароль Міхай і палітычныя лідэры дэмакратычнага кірунку (Юліу Маніу, Канстанцін Брэціану і інш.) выказваліся супраць працягу вайны на Усходзе. Пачынаючы з 1943 г. пачасціліся палітыка-дыпламатычныя дзеянні па выхадзе Румыніі з хаўрусу з Германіяй; у іх падтрымку пачала нарастаць і хваля пратэстаў па ўсёй краіне. Некаторыя з тых выступаў былі таемна арганізаваныя нават самім Антанэску (які ў 1941 г. стаў маршалам) і набліжанымі да яго асобамі,

Румынія падчас другой сусветнай вайны

а некаторыя, прычым шматлікія, праходзілі пад патранатам караля Міхая і лідараў гістарычных партый. У Анкары, Стакгольме, Каіры вяліся найважнейшыя перамовы. Урэшце выхад Румыніі з альянсу з Германіяй адбыўся ў выніку ўзброенага ўнутранага акту, які меў нашмат большае значэнне, чым проста пераварот. Акт быў падрыхтаваны каралём і прыбліжанымі да палаца коламі ў саюзе з прадстаўнікамі Нацыянальна-ліберальнай, Нацыянальна-сялянскай, Сацыял-дэмакратычнай і Камуністычнай партый, а таксама асобных груповак вайскоўцаў. Усе гэтыя падзеі паскорылі набліжэнне лініі фронту да ўсходніх межаў Румыніі. Так, 23 жніўня 1944 г. у каралеўскім палацы адбыўся арышт маршала Антанэску і галоўных яго паслугачоў. Па радыё прагучаў зварот караля да краіны, у якім манарх аб'явіў пра фарміраванне новага ўрада, выхад Румыніі з вайны супраць Аб'яднаных Нацый і пачатак барацьбы на баку саюзніцкіх войскаў супраць Германіі за вызваленне паўночнай часткі Трансільваніі. Гітлер загадаў нямецкім войскам, што знаходзіліся ў Румыніі (а яны

налічвалі сотні тысяч вайскоўцаў), не дапусціць рэалізацыі планаў румынскага кіраўніцтва. Але ў выніку жорсткіх баёў, якія доўжыліся па 28 жніўня 1944 г., Бухарэст быў вызвалены, а 30 жніўня 1944 г. першыя савецкія ваенныя злучэнні ўступілі ў сталіцу Румыніі, не сустрэўшы ніякага адпору. Цягам верасня нямецкі супраціў быў задушаны на ўсёй тэрыторыі Румыніі, і ў верасні-кастрычніку 1944 г. румынскія і савецкія войскі ўжо вялі баі за вызваленне паўночнай Трансільваніі з-пад венгерскай акупацыі. У далейшым румынская армія як саюзнік антыгітлераўскай кааліцыі ваявала за вызваленне Венгрыі, Чэхаславакіі і Аўстрыі аж да самага дня заканчэння вайны 9 траўня 1945 года. Намаганні Румыніі былі значнымі: у баях на баку саюзніцкіх войскаў бралі ўдзел 37 румынскіх дывізій, якія налічвалі 540 000 салдат, з іх каля 150 000 загінулі. Румынская армія вызваліла амаль 4000 населеных пунктаў, а фінансава-эканамічны ўклад Румыніі ў перамогу дасягнуў 1 200 000 000 долараў ЗША ў пераліку на курс 1938 года. На міжнароднай арэне Румынія разглядалася як 4-я краіна ў свеце паводле яе ўкладу ў разгром Германіі.

Румынскія і савецкія вайскоўцы на Трансільванскім фронце

На жаль, па вялікім рахунку ўсе гэтыя намаганні аказаліся марнымі, бо вызваленне ад фашызму вылілася ў саветызацыю ўсяго рэгіёна. Лёс Румыніі быў вырашаны ў 1944–1945 гг., калі Чэрчыль прапанаваў Сталіну падзяліць Цэнтральную і Паўднёва-Усходнюю Еўропу на зоны ўплыву. Так, Расія атрымлівала 90% уплыву ў Румыніі, 75% – у Балгарыі, 50% – у Югаславіі, 10% – у Грэцыі і г. д. Цэлыя народы, самі таго не ведаючы, былі скласіфікаваныя і размеркаваныя паводле волі «вялікіх» гэтага свету.

14. Наперад… да камуністычнага таталітарызму (1944–1947)

Румыны нават не падазравалі, што ў іх за спінай робяцца такія дамоўленасці. Яны шчыра верылі ў сілу і сумленнасць вялікіх заходніх дэмакратый, якія, без ніякага сумневу, мусілі працягнуць руку дапамогі й выратаваць шматпакутныя народы, якія панеслі столькі ахвяраў. Усюды гучала: «Ідуць амерыканцы!» Румынія рыхтавалася да хуткага пасляваеннага пераходу да дэмакратыі, якой прагнуў увесь народ. Было адноўлена дзеянне Канстытуцыі 1923 г., вызваленыя палітвязні, скасавана таталітарнае, антысеміцкае і расісцкае заканадаўства. Аднак Чырвоная армія не падавала ніякіх прыкметаў таго, што збіраецца пакідаць Румынію. І гэтак Румынія зноў ператварылася ў акупаваную краіну. Паўсюль панавалі рабункі, разруха, гвалт і канфіскацыі, якія чыніліся савецкімі войскамі. Урэшце саветы пагадзіліся заключыць замірэнне з Румыніяй. Дакумент, падпісаны ў Маскве 12 верасня 1944 года, атрымаў назву «Канвенцыя аб замірэнні паміж Румыніяй і Аб'яднанымі нацыямі», але ў сапраўднасці гэта быў аднабаковы акт на карысць СССР: Румынія разглядалася ў ім як пераможаная краіна, а не як краіна, якая выйшла з вайны супраць дзяржаваў антыгітлераўскай кааліцыі дзякуючы сваім унутраным намаганням; ёй ставілася ў абавязак утрымліваць акупацыйную савецкую армію, на што толькі за 1944–1945 гг. мусіла быць выдаткаваная сума ў два мільярды амерыканскіх долараў; цягам двух дзесяцігоддзяў яна павінна была выплачваць на карысць СССР велізарныя ваенныя рэпарацыі; мяжа паміж Румыніяй і СССР усталёўвалася па Пруце, такім чынам Бесарабія, Герцаеўскі раён і паўночная частка Букавіны зноў анэксаваліся Савецкім Саюзам; наўзамен скасоўваўся Венскі дыктат, а тая частка Трансільваніі, якая ў 1940 г. была саступлена Венгрыі, пераходзіла пад часовую адміністрацыю Чырвонай арміі. Румынія абавязвалася накіраваць на вайну з Германіяй 12 дывізій, у той час як на той момант супраць Германіі ўжо і так ваявалі 37 румынскіх дывізій. Але ўсякія аргументы ўяўляліся марнымі: амерыканцы былі надта далёка, а савецкае кіраўніцтва мела поўную свабоду дзеянняў ва ўсходняй частцы Еўропы.

23 жніўня 1944 г. з ліку вайскоўцаў і рознагаліновых спецыялістаў быў сфармаваны ўрад на чале з генераламі Канстанцінам Сэнэтэску і Нікалае Рэдэску. Але паступова, у сувязі з пагрозамі, што гучалі з боку савецкіх акупацыйных уладаў, у яго склад былі ўведзеныя прадстаўнікі камуністычных сілаў і іх памагатыя – такія, як Тэахары Джарджэску, Георге Геаргіу-Дэж, Петру Гроза ды інш. Калі на жнівень 1944 г. Румынская камуністычная партыя налічвала некалькі соцень членаў, то ў 1947 г. яе колькасць вырасла ўжо да каля 800 000. Камуністычны рух у Румыніі меў самыя слабыя традыцыі ў параўнанні з усімі цэнтральнаеўрапейскімі краінамі, але прапаганда і ціск, амбіцыі ці наіўнасць у адных і вера ў абяцанкі пра бесклапотнае жыццё ў другіх забяспечылі імклівы колькасны рост Румынскай камуністычнай партыі (РКП). І ўсё ж камуністы ў складзе румынскай нацыі ўяўлялі сабою меншасць. Гэтая «хіба» кампенсавалася прысутнасцю савецкіх войскаў. 6 сакавіка 1945 г. кароль Міхай быў вымушаны зацвердзіць на чале ўрада доктара Петру Грозу, які ўзначальваў найбуйнейшую ў краіне сялянскую арганізацыю «Фронт земляробаў». Хоць гэта быў палітык яшчэ з міжваенных часоў і ніколі ў РКП не ўваходзіў, цяпер ён пачаў цалкам падыгрываць камуністам. У склад кантраляванага камуністамі ўрада не ўвайшоў ніводзін прадстаўнік старых традыцыйных партый – Нацыянальна-ліберальнай і Нацыянальна-сялянскай. Толькі два дзеянні з усіх, здзейсненых урадам Петру Грозы, здаецца, маглі, прынамсі часткова, быць прынятыя народам прыхільна: узяцце на сябе (з рук савецкіх вайскоўцаў) адміністрацыйнага кіравання паўночнаю Трансільваніяй і правядзенне аграрнай рэформы, паводле якой падлягалі канфіскацыі ўсе зямельныя надзелы, буйнейшыя за 50 га. Больш за мільён гектараў зямлі былі размеркаваныя паміж амаль 900 000 сялянскіх сем'яў.

Петру Гроза

З іншага боку, урад скасаваў свабоду прэсы, правёў чыстку дзяржаўнага апарата ад «буржуазных элементаў», арганізаваў лагеры для палітвязняў і заснаваў першыя «саўрумы» – своеасаблівыя сумесныя савецка-румынскія таварыствы, якія сталі прыладай для рабавання і эканамічнага кантролю над Румыніяй з боку СССР. Заручыўшыся падтрымкай урадаў ЗША і Англіі, кароль Міхай I выказаў з гэтай нагоды катэгарычны пратэст і ў жніўні 1945 г. абвясціў нават «каралеўскую забастоўку». У лістападзе 1945 г. з нагоды імянінаў караля моладзь Нацыянальна-ліберальнай партыі арганізавала дэманстрацыю, скіраваную супраць усталявання камуністычнай улады ў Румыніі, у якой удзельнічала каля 150 000 чалавек.. Былі ахвяры і 1000 арыштаваных. Пачаліся мерапрыемствы па ліквідацыі старых дэмакратычных партый, у 1946 г. у выніку прапагандысцкага працэсу «над буйнымі нацыянальнымі здраднікамі» былі асуджаныя і расстраляныя маршал Іон Антанэску і яго найбліжэйшыя паплечнікі. Тады ж скасавалі Сенат. У лістападзе 1946 г. прайшлі выбары, пасля якіх у выніку маштабных фальсіфікацый пераможцамі былі абвешчаныя камуністы ды іх сатэліты. Пачалі ажыццяўляцца захады для пераходу да цэнтралізаванай, цалкам кантраляванай дзяржаваю эканомікі, быў нацыяналізаваны Нацыянальны банк. У гэтых умовах Румынія вымушана страціла сваё былое пачэснае месца на міжнароднай арэне, бо не магла больш працягваць сваю традыцыйную знешнюю палітыку. У лютым 1947 г. у Парыжы быў падпісаны мірны дагавор, у якім за Румыніяй не прызнаваўся статус краіны-ўдзельніцы антыгітлераўскай кааліцыі, Савецкаму Саюзу афіцыйна перадаваліся Бесарабія, Герца і паўночная Букавіна, але разам з тым, нягледзячы на шырокую прапагандысцкую кампанію з боку Венгрыі, скасоўваўся Венскі дыктат. Кароль Міхай I цяпер заставаўся апошняю перашкодай на шляху поўнай саветызацыі Румыніі, уяўляючы сабой сапраўдны сімвал старога дэмакратычнага парадку. Маючы сваяцкія сувязі са шмат якімі каралеўскімі дама́мі Еўропы, ён мог гуртаваць вакол сябе хоць нейкую апазіцыю або служыць крыніцай хоць нейкіх надзеяў. На жаль, 30 снежня 1947 г. урад прымусіў Міхая I адрачыся ад улады і пакінуць краіну. Румынію абвясцілі «народнай рэспублікай». Уся паўната палітычнай улады належала цяпер камуністам.

15. «На шляху пабудовы сацыялізму…» (1948–1989)

Да 1989 г., калі румынам часта даводзілася цярпець нястачу, хадзіў жарт пра шматтомнік прамоваў прэзідэнта пад чырвонаю вокладкай. Выйшлі дзясяткі тамоў з загалоўкамі кшталту «Румынія на шляху пабудовы сацыялізму...» ці, пазней, – «Румынія на шляху пабудовы ўсебакова развітога сацыялістычнага грамадства...». Іх амаль ніхто не чытаў. А на пытанне, як будзе называцца апошні том гэтага збору, адказвалі – «Румынія пайшла па шляхах...» Жарт быў не пазбаўлены долі ісціны. Рэжым урэшце давёў краіну да таго, што было ў пару пусціцца з торбай. Але ж зыходзілі камуністы з тэарэтычна вельмі высакародных ідэй: роўнасць, справядлівасць, агульны дабрабыт, даступнасць культуры ды адукацыі й г. д. А шмат якія румыны раней сапраўды жылі бедна, цярпелі нягоды ў ваенны час, страцілі дарагіх людзей – і цяпер, калі гароты засталіся ззаду, усе шчыра імкнуліся да пазітыўных зменаў. Здавалася, што гэтыя змены вось-вось настануць. Моладзь пераязджала ў гарады, сутыкалася з нябачанымі на сяле выгодамі, ішла ў школы, універсітэты. Будаваліся цэлыя жылыя кварталы з прадугледжанымі ў іх усімі сучаснымі бытавымі ўмовамі, узводзіліся будынкі культурнага і эканамічнага прызначэння. Пэўны час некаторыя сапраўды шчыра верылі ў поспех пабудовы камуністычнага грамадства. Усё гэта аказалася ілюзіямі. Зрэшты, былі і пэўныя канкрэтныя дасягненні, бо людзі тады цалкам аддаваліся працы, творчасці. Але ж гэта былі дасягненні людзей, румынаў, а не збанкрутаванага камунізму. Ды нават у такіх умовах, нават пры тым, што рэжым станавіўся ўсё больш адчувальным, людзі жылі, мелі надзеі, працавалі й тварылі.

У тыя гады Румынія прайшла некалькі этапаў на шляху да поўнага банкруцтва:

1) 1948–1962, або «дакучлівае дзесяцігоддзе» (як яго назвалі ў літаратуры), перыяд спусташальнага сталінізму з выразным дамінаваннем камуністычнай ідэалогіі;
2) 1962–1975, або «адліга», калі будаваўся «сацыялізм з чалавечым тварам» з незалежнасцю ад Масквы і вяртаннем да пэўных нацыянальных традыцый;

3) 1975–1989, або «нацыянальны камунізм», які давёў краіну да катастрофы.

На першым этапе, у 1948–1950 гг. былі «нацыяналізаваныя» – іначай кажучы, канфіскаваныя – заводы, шахты, банкі, медыцынскія ўстановы й аптэкі, тэатры й кінатэатры, жылыя памяшканні й да таго падобнае. У 1949 г. пачалася гвалтоўная калектывізацыя, а па сутнасці – замаскіраваная канфіскацыя зямлі, што знаходзілася ў асабістай уласнасці, – якая, нягледзячы на супраціў, завяршылася ў 1962 г. У выніку шматлікіх перагібаў і парушэнняў 96% сельскагаспадарчых земляў апынулася ў «калектыўных сельскіх гаспадарках», які пазней пачалі называць «аграрнымі вытворчымі кааператывамі». Была праведзена і гвалтоўная індустрыялізацыя з ухілам на развіццё цяжкай прамысловасці. Усё перавялі на пяцігадовыя і дзесяцігадовыя планы, кожны з якіх мусіў прыводзіць толькі да «гістарычных поспехаў» ды «эпахальных здзяйсненняў». Камуністычная партыя, якая з 1948 па 1965 г. называлася Румынскай рабочай партыяй, кантралявала ўсё і кіравала ўсім. Усе іншыя партыі, уключаючы саюзніцкія, былі распушчаныя. На чале Камуністычнай партыі да 1965 г. знаходзіўся Георге Геаргіу-Дэж, а з 1965 па 1989 г. – Нікалае Чаўшэску. У 1967 г. Чаўшэску адначасова заняў і пасаду кіраўніка краіны. У дзяржаўным кіраванні панаваў прынцып «дыктатуры пралетарыяту», які апраўдваў любое злоўжыванне і любую несправядлівасць. Дзеля трыумфу пралетарыяту ўсе «класавыя ворагі» й «здраднікі» мусілі быць пакараныя і нават ліквідаваныя. У выніку фіктыўных працэсаў на шматгадовае зняволенне ў турмах Сігета, Аюда, Герлы, Пітэшця былі асуджаныя тысячы чалавек, якія належалі да міжваеннай эліты, выбітных інтэлектуалаў, святароў, дзяржаўных службоўцаў, палітычных лідараў – у прыватнасці, такіх, як Юліу Маніу, Іон Міхалаке, Георге І. Брэціану, Канстанцін К. Джурэску, Юліу Хосу, Міхаіл Манайлеску, Раду Разэці, Ёан

Георге Геаргіу-Дэж

Лупаш, Сілвіу Драгамір, Іон Петравіч, Дзімітрые Гусці, Ёан Худзіцэ і шмат іншых. Дзясяткі тысяч людзей памерлі на «Канале», гэта значыць на катаржнай працы па будаўніцтве канала «Дунай – Чорнае мора», у якім удзельнічалі вязні лагераў у Дабруджы.



Будоўля канала Дунай – Чорнае мора, распачатая і спыненая на загад Масквы

Румынія стала адзінай краінай савецкага блока, дзе аж па 1962 год у гарах (у Бучэджы, Фэгэрашы, Чарнагорах) чыніўся ўзброены супраціў камуністычнай уладзе. Пратэстныя дзеянні ладзілі праваслаўныя вернікі, прадстаўнікі іншых веравызнанняў і канфесій. Трагічны лёс напаткаў уніяцкую (грэка-каталіцкую) царкву, якая пад ціскам Масквы ў 1948 г. была ліквідаваная. Усе святары гэтай царквы былі кінутыя ў турмы (дзе большасць з іх і памерла), сярод іх апынуўся і будучы кардынал Юліу Хосу. Новы закон аб рэлігіях падпарадкаваў усе цэрквы камуністычнай дзяржаве. У 1956 г. у сувязі з падзеямі ў Венгрыі і Польшчы рэпрэсіі ўзмацніліся. Дзясяткі тысяч жыхароў Баната цэлымі вёскамі былі гвалтоўна перасселеныя ў Бэрэган (стэпавую раўніну ў паўднёва-ўсходняй Румыніі). Узнавіліся арышты інтэлектуалаў і студэнтаў, на камуністычны лад былі рэарганізаваныя Румынская Акадэмія, міністэрства адукацыі, навукова-даследчыя ўстановы; шмат якія прафесары былі адхіленыя ад выкладання; забараняліся дысцыпліны, якія лічыліся «буржуазнымі» і небяспечнымі. Усе грамадска-гуманітарныя дысцыпліны былі наскрозь нашпігаваныя ідэямі марксізму-ленінізму і сталінізму. Заахвочвалася палітызацыя нават матэматыкі, што прымушала асобных настаўнікаў казаць вучням (часам жартам, часам сур'ёзна), што «2 + 2 = 4 і ў нас, і ў СССР».

З 1958 года пачалі ўзнікаць кволыя намёкі на перамены: з Румыніі былі выведзены савецкія войскі (у іншых сацыялістычных краінах яны заставаліся па 1989 год), ажывіліся эканамічныя і дыпламатычныя стасункі з заходнімі ды іншымі краінамі (прычым з некаторымі, у якіх добрых адносінаў з СССР не было!), згорнуты савецкі план пераўтварэння Румыніі ў аграрны прыдатак СЭУ («Савет Эканамічнай Узаемадапамогі» – эканамічны альянс «сацыялістычных краінаў»), вызвалены з турмаў больш за 2500 палітвязняў, выпрацаваны новыя прынцыпы ўзаемаадносінаў паміж краінамі, у тым ліку «сацыялістычнымі», і г. д. Усе гэта ўспрымалася як прыкмета незалежнай палітыкі Румыніі і выклікáла ў Масквы яўнае раздражненне. Пасля смерці Георге Геаргіу-Дэжа (1965) у выніку «закулісных дамоўленасцяў» кіраўніком Румынскай кампартыі быў «выбраны» Нікалае Чаўшэску. Пачалі ўзнікаць прыкметы лібералізацыі таксама ў іншых галінах, што адкрывала шляхі для пэўнага эканамічнага прагрэсу; ажываў гандаль, заахвочвалася стварэнне малых прыватных прадпрыемстваў, былі дазволеныя замежныя паездкі (уключаючы навучанне і стажыроўку), паслаблены паліцэйскі рэжым, прыўзнята заслона для пранікнення асобных элементаў заходняй культуры (фільмы, пераклады, часопісы, кнігі) і адначасова вернуты на належны ўзровень нацыянальныя і традыцыйныя каштоўнасці. У 1968 г. Румынія, адзіная з краінаў Варшаўскай дамовы, адмовілася ўдзельнічаць ва ўвядзенні войскаў у Чэхаславакію і ад самага пачатку рэзка асудзіла гэты акт агрэсіі. Чаўшэску рабіў асаблівы акцэнт на шанаванні нацыянальных каштоўнасцяў, што пасля доўгага перыяду сталінскага інтэрнацыяналізму, калі шмат каго садзілі ў турму толькі за паважлівае стаўленне да румынскіх сімвалаў, выглядала абнадзейвальным і даўно чаканым жэстам, які быў станоўча ацэнены народам. Сімпатыю на Захадзе выклікалі і пэўныя крокі Румыніі ў знешняй сферы: усталяванне дыпламатычных адносінаў з Федэратыўнай Рэспублікай Германіі (1967), захаванне дыпламатычных адносінаў з Ізраілем пасля «шасцідзённай вайны» 1967 г., уваходжанне ў шэраг сусветных эканамічных арганізацый, дамова аб супрацоўніцтве з краінамі «Агульнага рынку» і інш.

На жаль, вельмі хутка высветлілася, што ўсё гэта зусім не мела на ўвазе адыходу ад «сацыялістычных каштоўнасцяў» і абмяжоўвалася

ўсяго толькі дэкаратыўнымі зменамі: «камуністычны ідэал» заставаўся ў сваёй сутнасці непарушным, а рэжым захоўваў і нават узмацніў жорсткае стаўленне да сваіх грамадзянаў. Пасля візіту ў Кітай і Паўночную Карэю ў 1971 г. Чаўшэску – які стаў «палітычным турыстам» планеты! – вярнуўся да жорсткай дыктатуры, раскрытыкаваў «касмапалітызм» (арыентацыю на Захад) і заклікаў засяродзіць увагу на нацыянальных дасягненнях. Культ ягонай асобы і сямейнасць у кіраванні (асабліва далучэнне да ўлады жонкі) выклікалі абурэнне ва ўсёй краіне.

Нікалае Чаўшэску

Цэнтралізм у кіраванні, гвалтоўнае навязванне празмерных рытмаў эканамічнага росту, перабольшаная ацэнка ролі металургічнай і нафтахімічнай прамысловасці, адсутнасць эканамічнага стымулявання работнікаў, няўхільны рост знешніх запазычанасцяў прывялі да глыбокага эканамічнага крызісу. Да ўсяго гэтага далучыліся дрэнныя ўраджаі й палітыка выплаты ўсяго знешняга доўгу (каля 11 000 000 000 долараў ЗША), што паскорыла збядненне насельніцтва. Паралельна квітнела будаўнічая гігантаманія, былі «закрытыя» буйныя гарады (у іх не дазвалялася законна прапісвацца ўсім, хто жадае), у сувязі з палітыкай павелічэння нараджальнасці забараняліся аборты, была ажыццёўлена тэрытарыяльная «сістэматызацыя», уведзены кантроль над распаўсюджваннем друкавальных машынак, пашыралася зневажальная крытыка дзеячаў культуры і да т. п. Састарэлыя тэхналогіі вытворчасці не замяняліся на новыя. У імя дэманстрацыі «перавагаў сацыялізму» патрабавалася, каб румынскія навукоўцы ўсё вынаходзілі «за адну ноч». Звычайны грамадзянін мог не заўважаць усяго гэтага, але бачыў, што ў яго няма нічога свайго, што ён не можа нічога купіць за грошы, не мае магчымасці выхоўваць дзяцей, купляць лекі, мерзне ў дамах зімою і сядзіць у цемры з прычыны эканоміі, не могучы нават паглядзець па тэлевізары фільм і г. д.

А разам з тым партыйная прапаганда казала толькі пра «перамогі», «росквіт», «рост жыццёвага ўзроўню», «геніяльнага правадыра», «залатую эпоху», «загніваючы капіталізм», у якім пануюць забастоўкі, беспрацоўе, ужыванне наркотыкаў і г. д. Пасля 1980 г. сітуацыя яшчэ больш пагоршылася: тады з крамаў зніклі тавары першай неабходнасці і прадукты харчавання – ад мыла, запалак і туалетнай паперы да мяса, малака, цукру, алею і рысу. Частка прадуктаў была пераведзена на «рацыянальнае размеркаванне»: іх выдавалі «па картках» у спецыяльных месцах, да якіх былі прыпісаны грамадзяне ў залежнасці ад месца пражывання.

Узмацненне ціску востра адчувалася амаль усім насельніцтвам, але асабліва – нацыянальнымі, рэлігійнымі й сэксуальнымі меншасцямі. Ідэя «стварыць адзіны працоўны народ» была глыбока непрымальнаю для ўсіх, уключаючы нацыянальныя меншасці, сярод якіх кожная мела свае мову, рэлігію, вераванні, звычаі, сімвалы. Школы з выкладаннем на мовах нацыянальных меншасцяў захоўваліся, але іх колькасць зменшылася, а з 1984 г. венгерскія і нямецкія ліцэі сталі «змяшанымі» – у іх па-ранейшаму выкладалі на венгерскай і нямецкай мовах, але былі ўведзены і румынскія класы з настаўнікамі-румынамі. У той жа час на пэўных факультэтах і аддзяленнях, якія лічыліся «ідэалагічнымі» (гісторыя, філасофія), ва ўніверсітэце Бабеш-Бояі ў Клуж-Напоцы былі расфарміраваныя групы з венгерскаю мовай навучання: іх пакінулі толькі на спецыяльнасцях, якія не ўяўлялі небяспекі рэжыму (матэматыка, інфарматыка, фізіка,



Мірча Эліядэ



Эміл Чаран



Джорджэ Эміл Паладэ

Джорджэ Энэску



Канстанцін Брынкуш

Эжэн Ёнэско

хімія, біялогія і да т. п.). Нацыянальныя меншасці былі занепакоеныя і праграмай «сістэматызацыі сёлаў», якую, хоць і ажыццяўлялі пераважна ў паўднёвых раёнах, дзе насельніцтва было амаль цалкам румынскае, лічылі за пагрозу гістарычнай спадчыне сваіх групаў.

Між тым, некаторыя румынскія інтэлектуалы, дый простыя людзі, пачалі ўсё часцей эміграваць на Захад (пераважна нелегальна). За мяжой расквітнела творчасць такіх румынскіх дзеячаў, як Джорджэ Энэску, Канстанцін Брынкуш (Бранкузі), Мірча Эліядэ, Эміл Чара́н, Эжэн Іанэску (Ёнэско), Джорджэ Эміл Паладэ. Паступова пакінулі краіну румынскія габрэі й немцы, чый ад'езд асабліва паскорыўся пасля падпісання з Ізраілем і Федэратыўнай Рэспублікай Германіяй адмысловых пагадненняў, паводле ўмоваў якіх такая кантраляваная эміграцыя прыносіла рэжыму немалы грашовы прыбытак. Але большасць румынаў мусіла несці свой крыж, бо «месца румынаў было ў Румыніі», як вяшчала ў сваіх радыёперадачах «Свабодная Эўропа». Гэтая радыёстанцыя, а таксама «Голас Амерыкі» і Бі-Бі-Сі падтрымлівалі ў румынах надзею, неслі мясцовым інтэлектуалам (дый не толькі) праўдзівую інфармацыю пра ўнутраныя і знешнія падзеі, паведамленні пра якія падлягалі ў Бухарэсце цэнзуры, і паказвалі, наколькі непрыглядна выглядае вобраз румынскага рэжыму пры позірку звонку. Гэтыя радыёхвалі даносілі таксама рэха пратэстнага руху ў Румыніі, у прыватнасці, расказвалі пра дзейнасці дысідэнткі з Клужа Дойны Корня. Грубае парушэнне правоў чалавека, адчуванне мільёнамі румынаў поўнае беспрасветнасці, безумоўна,



Нікіта Стэнэску

Ана Бландыяна



Марын Прэда

выклікалі ў Румыніі пэўны супраціў і дысідэнцкія настроі, але яны былі не такія, як у суседніх краінах, бо і сам румынскі камуністычны рэжым быў асаблівым, вылучаючыся якраз сілаю рэпрэсіўнай машыны. Зрэшты, здараліся ўсё-ткі й калектыўныя дысідэнцкія акцыі: страйк шахцёраў у даліне Жыў (1977), утварэнне «Свабоднага прафсаюза працоўных Румыніі» (1979), які ўзначаліў Паўл Гома, студэнцкая маніфестацыя ў Ясах (1987), пратэстная дэманстрацыя рабочых Брашова (1987) і г. д.

Нават ва ўмовах пастаяннай і рэальнай пагрозы шэраг інтэлектуалаў па-ранейшаму выяўляў нязломнасць, ствараючы вартасныя творы. Сярод такіх можна назваць Нікіту Стэнэску, Марына Прэду, Марына Сарэску, Ану Бландыяну, Міхая Батэза, Давіда Прада́на, Аўгусціна Бузу́ру, Нікалае Брэба́на, Мірчу Дынэску ды інш. Але найчасцей непрыманне сітуацыі было маўклівым, вызначалася агульным станам дыскамфорту, сораму і нават безнадзейнасці або праяўлялася ў спецыфічных формах – абыходкавых крытычных прыказках і палітычных анекдотах, у ліку прымаўкі тыпу: «Мамалыга – страва тыпова румынская, выбуху ў жываце ніколі не зробіць». І ў грамадстве таксама дзесяцігоддзямі нічога «не выбухала». Магчыма, не выбухнула б і ў 1989 г., калі б не ўзніклі адпаведныя ўмовы, у першую чаргу па-за межамі Румыніі. Але, перафразуючы словы Нікалае Бэлчэску, падзеі, якія адбыліся ў Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропе ў 1989 г. сталі не прычынай, а зручнай падставай для выбуху румынскай рэвалюцыі ў снежні таго самага года. Пры-

Тымішаара, 18 снежня 1989 года

чынаю ж было поўнае банкруцтва камуністычнага рэжыму, або, калі канкрэтней, – рэпрэсіі, зневажанне чалавечай годнасці, холад, пустыя лозунгі, цемра, культ асобы, прыніжэнні, ізаляцыя і г. д., і да т. п. Няважна, як і кім Румынская «рэвалюцыя» 1989 года была падрыхтаваная, якія – знешнія ці ўнутраныя – сілы паспрыялі таму, што яна ўрэшце выбухнула, – сапраўдным з'яўляецца факт, што больш за 99% яе тагачасных удзельнікаў шчыра верылі, што яны самі мяняюць румынскі свет, зрынаюць стары рэжым, вынішчаюць зло і робяць сапраўдную рэвалюцыю. Найбуйнейшыя дэманстрацыі 16–22 снежня 1989 г., у якіх узялі ўдзел мільёны людзей, даказваюць гэта. Кровапраліцце, як даніна ў адплату за волю, – чые маштабы былі тады крыху перабольшаныя, – тым не менш, здарылася сапраўды й было трагічным. Памерлыя гвалтоўнаю смерцю ў вялікай калатнечы – кіраўнікі і людзі з вуліцы, ахвяры і ка́ты – усе яны былі ўраўнаваныя тым актам астатняга ахвярапрынашэння. Больш як тысяча чалавек загінула, а магчыма, нават болей. Да іх трэба дадаць яшчэ ўсе папярэднія дзясяткі тысяч ахвяраў камуністычнага рэжыму Румыніі. Тым фінальным актам – гвалтоўным сконам сваёй камуністычнай дыктатуры – Румынія зноў-такі была «арыгінальнай» у сваёй трагедыі, як «арыгінальным» быў і камуністычны рэжым *à la roumaine*.

16. Надзеі, мары, дасягненні…

Жыццё без надзеі – бясплодная ніва. У румынаў усе іх вялікія надзеі і мары ажылі ў 1989 годзе. Тады ўяўлялася, што жыццё, нібыта на ўзмах чарадзейнай палачкі, пачне зараз жа мяняцца да лепшага. Цяпер ужо, казаў тады шмат хто, амерыканцы (заходнікі ўвогуле, якіх так чакалі ў 1945 г.) прыйдуць дакладна, і грамадства нарэшце пачне буйна квітнець! Аднак былі й скептыкі, якія якраз і аказаліся рэалістамі, – яны лічылі, што, каб квітнець, павінен прайсці пэўны час, бо адолець наступствы старога рэжыму будзе няпроста. Асобныя палітыканы крычалі, што трэба адхіліць ад улады ўсё старое «камуністычнае» пакаленне, – яно, маўляў, няздольнае пабудаваць новую Румынію. Але гэта было немагчыма. Было практычна нерэальна знайсці «чыстых» лідараў, бо ўся румынская палітычная эліта, з вельмі малым выняткам, была часткаю амаль чатырохмільённай Румынскай камуністычнай партыі. Астатнія румыны не мелі за душою нічога, апроч прагнага жадання. Сярод іх немагчыма было знайсці ні добрых менеджараў, ні добрых палітыкаў з выразнымі праграмамі, ні добрых банкаўскіх работнікаў, ні добрых знаўцаў капіталістычных стасункаў. Што да прадстаўнікоў румынскай дыя-

Першы дзень свабоды

спары, то яны, з аднаго боку, не карысталіся дастатковым даверам, бо іх занадта дэманізавала камуністычная прапаганда, а з другога, самі не наважваліся браць на сябе адказнасць. Сітуацыю, што склалася, алегарычна можна параўнаць з рыбнай заціркай: калі з капіталізму зрабілі камунізм, гэта, па сутнасці, было тое самае, як бы з вольнага мора рыб перасадзілі ў акварыум, а тады гэты акварыум ператварылі ў жалезны рондаль і пачалі варыць у ім з тых рыб зацірку. Калі ж настаў 1989 год, перад румынамі, як і перад іншымі народамі з постсацыялістычных краінаў, паўстала задача: вярнуць тое, што яшчэ заставалася жывым у зацірцы, з рондаля назад у мора, як было ад пачатку: зрабіць з камунізму капіталізм.

Першыя месяцы пасля снежаньскіх падзей 1989 года ў краіне панавала суцэльнае бязладдзе, якое выклікалася як агульным пачуццём няпэўнасці і няўпэўненасці, так і супярэчлівасцю першых захадаў, што прымаліся часовымі органамі ўлады. Простаму люду, які дзесяцігоддзямі кармілі адпаведнай ідэалогіяй, бліжэй была палітыка левага напрамку, і дзеячы, якія ўсё жыццё такой палітыкаю займаліся, ахвотна яе абяцалі. Адроджаныя «гістарычныя» партыі паўзначальвалі амаль невядомыя лідары, сярод якіх некаторыя толькі вярнуліся з эміграцыі, а той, хто не еў «соевага салямі», асаблівай падтрымкай у румынаў не карыстаўся. У гэтых умовах на першы план зноў выйшлі тыя, хто даўно стаяў пры камуністычнай уладзе, але на момант падзей 1989 г. займаў больш сціплыя пазіцыі ў грамадска-палітычнай іерархіі. Частка радыкальна настроенай інтэлігенцыі й моладзі патрабавала выключыць былых камуністаў з палітычнай дзейнасці, дзеля чаго на Універсітэцкай плошчы ў Бухарэсце быў арганізаваны вялікі страйк. У адказ на гэтую акцыю кіраўніцтва звярнулася па дапамогу да шахцёраў. Далейшыя падзеі атрымалі назву «Мінерыядаў» (ад *рум.* mineri – шахцёры). На другі дзень пасля закліку некалькі тысяч шахцёраў прыбылі з шахтаў Жыўльскай даліны ў Бухарэст і «дапамаглі», учыніўшы над дэманстрантамі гвалт, напаўшы і разбурыўшы штаб-кватэры апазіцыйных партый. Гэтыя дзеянні спарадзілі нестабільнасць у краіне і адмоўны розгалас за мяжой.

З 1989 года ў кіраўніцтве Румыніі змяніліся тры прэзідэнты: Іон Ілієску, былы камуністычны кіраўнік, які перайшоў на сацыяльна-дэ-

Іон Іліеску

Эміл Канстанцінэску

Траян Бэсэску

макратычныя пазіцыі; Эміл Канстанцінэску, таксама былы член РКП, які, праўда, не займаў у ёй высокіх пасадаў, а пазней стаў выказнікам ідэй хрысціянска-дэмакратычнай кааліцыі; і Траян Бэсэску, сябар Ліберальна-дэмакратычнай партыі, да 1989 г. – камерцыйны прадстаўнік Румыніі ў Антвэрпэне. Пачынаючы з 1991 г. прэзідэнцкія выбары, як і дзейнасць усіх дзяржаўных установаў, ажыццяўляліся на аснове новай дэмакратычнай канстытуцыі.

Адпаведна прэзідэнтам мянялася і палітычная арыентацыя румынскага ўрада: да 1996 г. ім кіравалі сацыял-дэмакраты, якіх у пэўных палітычных колах называлі «неакамуністамі», у 1996–2000 г. урад складалася пераважна з хрысціянскіх дэмакратаў і лібералаў, пасля 2000 г. да ўлады зноў вярнуліся сацыял-дэмакраты, а ў 2004 г. выбары выйграла апазіцыя, прадстаўнік лібералаў стаў прэм'ер-міністрам, але прэзідэнтам абралі выхадца з аднаго з адгалінаванняў сацыял-дэмакратаў – іх «ліберальна-дэмакратычнага крыла» (з Ліберальна-дэмакратычнай партыі). Усё гэта сведчыць, што ў Румыніі, нягледзячы ні на што, усталявалася пэўная дэмакратыя, вядома, пакуль недасканалая, са шматлікімі скачкамі і ваганнямі ўзад і ўперад, але ўсё ж дэмакратыя. Для апісання пераходу ад дыктатуры да дэмакратыі можна зноў вярнуцца да метафары з морам, акварыумам і заціркаю. У Румыніі гэтая «заціркa» аказалася надта рэдзенькай, таму ніводная партыя і ніводная палітычная кааліцыя пакуль не здольныя здзейсніць цуд.

Суіснаванне ліберальных дэмакратаў і нацыянал-лібералаў ва ўрадзе трывала нядоўга. Спроба стварыць кааліцыю з сацыял-дэмакратамі аказалася таксама марнай. У 2009 г. прэзідэнцкія выбары зноў выйграў Траян Бэсэску, які зацвердзіў урад з прадстаўнікоў сваёй партыі (ліберал-дэмакратаў), партыі вугорскай нацыянальнай меншасці і асобных «незалежных» парламентарыяў, якія спынілі сяброўства ў тых партыях, з дапамогай якіх трапілі ў парламент. Апазіцыя, рэпрэзентаваная пераважна сацыял-дэмакратамі і нацыянал-лібераламі, не вызначаецца згуртаванасцю і ўяўляецца няздольнай арганізаваць сябе так, каб з ёю лічыліся.

Надзеі й памкненні, якія пэўны час яшчэ жылі ў народзе, паступова і дастаткова хутка пачалі слабець, яны страцілі той градус і той імпэт, што былі на пачатку. Адразу пасля 1989 г. румынам карцела як мага хутчэй выйсці з усякіх камуністычных альянсаў і блокаў, навязаных «вялікім усходнім суседам», ім вельмі хацелася ўступіць у НАТО і Еўрапейскі Саюз. Апытанні грамадскай думкі паказвалі, што за далучэнне сваёй краіны да еўраатлантычных структур выступаюць 80–90% румынаў, што было самым высокім паказчыкам сярод усіх посткамуністычных краін. Але гэта было не так проста, як румынам уяўлялася. Сітуацыя, якую краіна атрымала ў спадчыну, была катастрафічнай і надалей пагаршалася: цэнтралізаваная эканоміка з прамысловымі гігантамі, якія ледзьве ліпелі і сталі бескарысным цяжарам; беднасць, шматлікія кінутыя бацькамі дзеці-сіроты, СНІД, беспрацоўе, інфляцыя, карупцыя, масавая эміграцыя, парушэнні правоў чалавека і да т. п. Усё гэта стала прычынай таго, што румыны не прайшлі адбор у лік «лаўрэатаў», запрошаных у НАТО: «галаўны

Клаус Яханіс, Прэзідэнт Румыніі з 2014 г.

атрад» склалі палякі, чэхі, славакі й венгры. Расчараванне тады, у 1997 г., было велізарным. Тым не менш падчас візіту ў Бухарэст лідара ЗША і ўсяго свету прэзідэнта Біла Клінтана, які адбыўся ў той самы год, румыны зладзілі яму надзвычай цёплы прыём. Яны ўжо чакалі сустрэчы з Захадам пяцьдзясят гадоў, яны былі гатовыя пачакаць трошкі яшчэ, бо дасягненне еўрапейскага ідэалу вартае любых ахвяр. На жаль, неабходнасць такіх ахвяр з боку румынаў прызнала і ўсведамляла толькі частка насельніцтва, астатнія чакалі, што ўсё адбудзецца само сабою праз нейкі цуд. На фоне чаканняў у людзей раслі расчараванне й незадаволенасць, а ў дадатак да таго час ад часу ўзнікала якая-небудзь «Касандра», якая пачынала палохаць румынаў новым прыходам здані з усходу, прадракала, што ім наканавана вечна заставацца «ў шэрай зоне», служачы буферам паміж «цывілізаваным светам» і «варварамі».

Тым часам яшчэ адною прыкметай празаходняй настроенасці й праеўрапейскай арыентаванасці румынскай нацыі у 1999 г. стаў (перад тым некалькі разоў перанесены на просьбу Румынскай праваслаўнай царквы) візіт Папы Рымскага Яна Паўла II у Румынію – першую за ўвесь час праваслаўную краіну ў свеце, на афіцыйную сустрэчу з кіраўніцтвам якой прыязджаў Галава Касцёла. Пантыфіка выйшлі вітаць сотні тысяч людзей, поўных рэдкімі ў сваіх праявах хрысціянскай любоўю і чалавечаю шчырасцю. Святы Айцец асвяціў румынаў сваёй міласэрнасцю і падараваў ім сваё дабраславенне, што стала знакам заступніцтва й для ўсёй краіны. Вядома, Румынія зараз жа не адолела ўсе цяжкасці, што перад ёй стаялі. Але ў выніку ледзь прыкметных, але пазітыўных зрухаў ва ўнутранай сітуацыі і рэзкай зменай міжнароднага становішча з прычыны тэрарыстычнага акту 11 верасня 2001 г. Румынія спа-

Папа Ян Павел II і патрыярх Румынскі Феактыст

чатку, у 2002 г., атрымала афіцыйнае запрашэнне ўступіць у НАТО, а ў 2004 г. яна стала паўнапраўным сябрам гэтай арганізацыі. У Бухарэст прыехаў новы прэзідэнт ЗША Джордж Буш, які быў радасна сустрэты насельніцтвам, і над бязвоблачным далягляда зноў запалілася цэлая вясёлка надзеяў. Людзі змаглі нарэшце спакойна ўздыхнуць, задаволеныя тым, што над імі раскрыўся нарэшце доўгачаканы парасон бяспекі, хоць адчувалі яны яго яшчэ досыць цьмяна і ўзровень жыцця заставаўся яшчэ досыць нізкім.

29 сакавіка 2004 г.
Румынія – паўнапраўны сябар НАТО

Пасля ўступлення ў НАТО узрасла інтэнсіўнасць перамоваў аб уваходжанні краіны паміж Карпатамі і Дунаем таксама ў Еўрапейскі Саюз. Тут крытэры былі нашмат болей строгія, і патрабавалася прыкладаць нашмат больш намаганняў, беручы пад увагу і ўскладненне міжнароднай сітуацыі, і ўзмацненне тэрарызму, і ўзнікненне пэўнай напружанасці паміж Злучанымі Штатамі ды іх даўнімі еўрапейскімі саюзнікамі. Але Румыніі ўдалося паспяхова завяршыць перамовы і ў 2007 г. стаць паўнапраўным сябрам Еўрапейскага Саюза. Усё гэта, безумоўна, адкрывала цудоўныя перспектывы для падвышэння дабрабыту, але і прадугледжвала гатоўнасць ісці на пэўныя

Падпісанне Дамовы аб далучэнні Румыніі да Еўрапейскага Саюза.

ахвяры і выконваць пэўныя абавязацельствы, што людзі паступова пачалі ўсведамляць.

На жаль, у 2009 г. выбухнуў нябачаны з часоў Другой сусветнай вайны эканамічны крызіс, які ахапіў пераважную большасць краін Еўропы і асабліва востра адчуваўся ў Румыніі. Ён прывёў да новых стратаў у эканоміцы, што павысіла эміграцыю румынаў у развітыя краіны і ўзмацніла недавер да палітыкаў. Агульны заняпад выклікаў серыю сацыяльных і палітычных беспарадкаў, наступствы якіх цяжка прадбачыць ва ўмовах нарастання нестабільнасці ў еўрапейскім свеце. Тым не менш сёння, ва ўмовах пашырэння працэсаў глабалізацыі, Румынія, з'яўляючыся сябрам НАТО і Еўрапейскага Саюза, спадзяецца годна пераадолець згаданыя цяжкасці дзякуючы кансалідацыі высілкаў усіх краін-сябраў гэтых арганізацый.

На дэмакратычны шлях развіцця сталі таксама румыны былога Савецкага Саюза, прычым нават яшчэ да таго, як быў афіцыйна аформлены распад гэтай штучнай структуры. На дзіва, пасля амаль пяці дзесяцігоддзяў савецкага панавання з яго палітыкай дэнацыяналізацыі румынскасць паўстала тут з новаю сілай, паказаўшы ўсім сапраўдную нацыянальную ідэнтычнасць мільёнаў жыхароў на левым беразе Прута. Шэраг падзей, якія адбыліся, пачынаючы асабліва з 1989 г., меў лёсавызначальнае значэнне для рэгіёна: гэта і вяртанне да лацінскай графікі, і абвяшчэнне румынскай мовы дзяржаўнай, зацвярджэнне трыкалора нацыянальным сцягам, дэкларавание дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Малдова, адмена пакта Молатава-Рыбентропа (за 23 жніўня 1939 г., які прызнаваў Бесарабію сферай савецкага ўплыву), абвяшчэнне краіны «суверэннай, незалежнай і дэмакратычнай дзяржавай» (27 жніўня 1991 г.), зацвярджэнне нацыянальным гімнам «Deşteaptă-te, române» (Прачніся, румын), увядзенне нацыянальнай валюты – лея, прыняцце Рэспублікі Малдова ў ААН і г. д. Усё гэта прынесла глыбокія змены ў лёс жыхароў паміж Днястром і Прутам, спрыяла вяртанню да традыцыйных гістарычных і культурных каштоўнасцяў, якія замоўчваліся бальшавікамі й савецкай уладай. Пачаўся рознабаковы працэс збліжэння з Румыніяй і ўвогуле ўсімі румынамі свету, пачынаючы ад «мастоў з кветак» цераз Прут, якія з энтузіязмам ладзіліся інтэлігенцыяй, і заканчваючы палітычным дыялогам паміж кіраўнікамі дзвюх краінаў. Пера-



Мост кветак цераз раку Прут

ход да шматпартыйнасці хутка прывёў да ўтварэння двух полюсаў палітычнага жыцця – нацыянальна-праеўрапейскага, з аднаго боку, і камуністычна-прарасійскага, з другога, кожны з якіх меў выразна адрозную скіраванасць. Пракамуністычная славянская (расійска-ўкраінская) меншасць абвясціла так званую «Прыднястроўскую Малдаўскую Рэспубліку» са сталіцай у Ціраспалі, захапіўшы тэрыторыю пераважна па левы бераг Днястра, кантраляваную акупацыйнай чатырнаццатай расійскай арміяй. Іншыя нацыянальныя меншасці, у прыватнасці, гагаузы, таксама пачалі праяўляць памкненне да незалежнасці. У 1991–1992 гг. сепаратысцкія, камуністычныя і прарасійскія сілы Прыднястроўя пачалі падтрыманую Масквой вайну, якая прывяла да шматлікіх чалавечых ахвяраў і значных матэрыяльных стратаў. Людзям спрабавалі ўнушыць, што маладая малдаўская дзяржава не зможа існаваць без апекі Расеі. Сёння Прыднястроўе практычна застаецца нікім не прызнаным у міжнародным плане сепаратысцкім анклавам, які разарваў усе сувязі з цэнтральнай уладай Малдовы, але рознабакова падтрымліваецца Масквою. Разам з тым, Канстытуцыя Рэспублікі Малдова гарантуе дэмакратычныя правы і свабоды ўсім сваім грамадзянам і аднолькавую павагу поглядаў як нацыянальных меншасцяў, так і тытульнай нацыі.

На змену прэзідэнтам Мірчу Снегуру і Пятру Лучынскаму, якія, нягледзячы на ўсе ваганні, абаранялі нацыянальныя інтарэсы

краіны і румынскую ідэнтычнасць яе насельніцтва, да ўлады ў Малдове прыйшоў камуністычны ўрад, і прэзідэнтам быў абраны лідар малдоўскіх камуністаў Уладзімір Варонін. Так Рэспубліка Малдова стала адзінай пасля 1989 г. еўрапейскай краінай, якой на працягу васьмі гадоў кіравала камуністычная партыя. Той перыяд быў адзначаны масаваю прапагандай, скіраванай на аддаленне малдоўскага насельніцтва ад Румыніі, культываванне малдоўскага сепаратызму, дэманізацыю міжваеннай «румынскай буржуазіі» і румынаў увогуле як «фашыстаў і нацыяналістаў». Толькі пасля 2009 г., з сыходам Вароніна ў адстаўку, пачало назірацца паступовае вяртанне да нармалізацыі, паляпшаюцца адносіны з Румыніяй, узнавіліся намаганні па еўрапейскай інтэграцыі. Румынія, са свайго боку, заўсёды і незалежна ад таго, як пасля 1989 г. мянялася палітычная арыентацыя яе ўрадаў, падтрымлівала Рэспубліку Малдову – часам мацней, часам меней дзейсна – у сцвярджэнні ёю сваёй незалежнасці і ў яе еўраатлантычных памкненнях у напрамку агульнадэмакратычных каштоўнасцяў. Сёння, як і раней на розных адрэзках гісторыі, румыны застаюцца адным народам з дзвюма румынскімі дзяржавамі, якія маюць адну і тую ж афіцыйную мову (няважна, як яе называюць), адны і тыя ж нацыянальныя сімвалы, адны і тыя ж культурныя каштоўнасці і нават аднаго і таго ж нацыянальнага паэта, Міхая Эмінэску, а таксама – аднолькавае ўспрыманне жыцця і свету, пачынаючы ад нараджэння, калі настае «ўзрост кахання», да «адыходу ў вечнасць», ад народнага танца да незмаўкальнай мелодыі дойны...

Гісторыя румынаў не лепшая і не горшая за гісторыі іншых народаў. Яна не была крышталёва чыстай і не абышлася без плямаў, але ў ёй былі далёка не адны жахі й няшчасці. Яна была разнастайная, як само жыццё, бо гісторыя і ёсць жыццё. Галоўнае – ведаць, што паміж іншымі народамі свету ёсць і румыны, якія маюць сваю дзяржаву (ці нават дзве) з багатым гістарычным мінулым, з Карпатамі і Дунаем, з сялянамі Марамурэша, нібыта застылымі ў часе, з маляўнічымі манастырамі Малдовы, з дэльтаю Дуная і Чорным морам, са славутымі віннымі скляпамі ў Крыкаве, з Міхаем Эмінэску, Лучыанам Благам, Джорджэ Энэску, Канстанцінам Бранкузі і ўсімі тымі, да каго вядомасць яшчэ прыйдзе ў будучым. Румынам ёсць што перадаць сусветнай супольнасці, і яны глыбока ў душы гадуюць сваё пасланне.

Поп, Ё.-А.

П57 Гісторыя румынаў. / Ёан-Аўрэл Поп ; пер. з румынскай Зміцер Колас. — Мінск : Выдавец Зміцер Колас, 2019. — 232 с. [іл.].

ISBN 978-985-23-0072-8.

Кніга ўяўляе сабой паслядоўны аповед пра тое, якім чынам сфармаваліся румынская мова і румынская нацыя. Аўтар, аўтарытэтны румынскі гісторык, прэзідэнт Румынскай Акадэміі навук Ёан-Аўрэл Поп у папулярным стылі паказвае няпросты шлях, які прайшлі румыны, каб стварыць сваю незалежную дзяржаву, і тлумачыць абставіны, у сувязі з якімі даўней румынскіх дзяржаваў было тры – Валахія, Малдова і Трансільванія – і дагэтуль застаецца дзве – Румынія і Рэспубліка Малдова, хоць людзі ў іх гавораць адною мовай.

Адрасуецца ўсім, хто цікавіцца гісторыяй.

УДК 94(498)
ББК 63.3(4Рум)

Навукова-папулярнае выданне

Ёан-Аўрэл Поп

ГІСТОРЫЯ РУМЫНАЎ

Рэдактар *Лявон Баршчэўскі.*
Адказны за выпуск *Зміцер Колас.*

9 789852 300728

+12

Падпісана да друку 15.08.2019. Фармат 60×84 $^{1}/_{16}$.
Папера афсетная. Друк афсетны.
Ул.-выд. арк. 12,48. Ум. друк. арк. 14,50.
Наклад 500 асобнікаў. Заказ № 275.

Выдавец індывідуальны прадпрымальнік Зміцер Колас.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вытворцы, распаўсюдніка
друкаваных выданняў № 1/291 ад 17.04.2014.
Пр. Незалежнасці, 105-14, 220023, Мінск.

Надрукавана ў друкарні ТАА «Бізнесафсет»
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вытворцы, распаўсюдніка
друкаваных выданняў № 2/28 ад 12.12.2013.
Пр. Незалежнасці, 95, к. 7, п. 3, 220043 Мінск

Аўтар, аўтарытэтны румынскі гісторык,
прэзідэнт Румынскай Акадэміі навук Ёан-Аўрэл Поп,
у папулярным стылі паказвае няпросты шлях, які прайшлі
румыны, каб стварыць сваю незалежную дзяржаву,
і тлумачыць абставіны, у сувязі з якімі даўней румынскіх
дзяржаваў было тры – Валахія, Малдова і Трансільванія –
і дагэтуль застаецца дзве – Румынія і Рэспубліка Малдова.

ГІСТОРЫЯ РУМЫНАЎ

Ёан-Аўрэл Поп